View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

А.А. Савіч

# НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гады): ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

Брэст – 2012

УДК 930.(476)
ББК 63(4Беи)

Навуковы рэдактар:
Доктар гістарычных навук, прафесар
**А.А. Каваленя**

Рэцэнзенты:

Доктар гістарычных навук, прафесар
**Г.У. Карзенка**

Доктар гістарычных навук, дацэнт
**І.І. Шаўчук**

**Савіч, А.А.**
Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады) : гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А.А. Савіч ; навук. рэд. А.А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2012. – 288 с.

У манаграфіі на падставе шырокага кола гістарыяграфічных крыніц паказаны працэс развіцця і ўзбагачэння гістарыяграфіі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў. Гістарыяграфія праблемы аналізуецца на фоне развіцця беларускай гістарычнай навукі, прасочваецца пашырэнне і ўмацаванне крыніцазнаўчай базы даследаванняў, выяўляецца дынаміка змянення і ўдакладнення даследчыцкіх вывадаў і ацэнак. Абагульнены станоўчыя вынікі даследавання, пазначаны малавывучаныя, недастаткова распрацаваныя ці пададзеныя тэндэнцыйна аспекты тэмы, якія патрабуюць больш глыбокай і грунтоўнай навуковай распрацоўкі.

Адрасавана вучоным, аспірантам, выкладчыкам і студэнтам ВНУ, усім, хто цікавіцца гісторыяй.

УДК 930.(476)
ББК 63(4Беи)
**С 13**

ЗМЕСТ

Уводзіны ........................................................................ 4

Глава 1. Гістарыяграфія, крыніцы і метадалогія гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі ................ 9

Глава 2. Адлюстраванне нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1920-я – першай палове 1950-х гадоў ................................................................ 21

2.1. Вытокі разгортвання даследаванняў у 1920–1930-я гады. Заходнебеларуская праблематыка ў канцы 1930-х – першай палове 1950-х гадоў ........................................ 21

2.2. Асноўныя накірункі і акцэнты гістарыяграфіі заходнебеларускага нацыянальнага руху ............................ 37

Глава 3. Нацыянальна-вызваленчы рух Заходняй Беларусі ў даследаваннях другой паловы 1950-х – 1980-х гадоў............................................................................ 45

3.1. Гістарыяграфічны паварот другой паловы 1950-х гадоў і яго наступствы. Гістарыяграфія КПЗБ ............................ 45

3.2. Адлюстраванне гісторыі беларускіх палітычных партый... 84

3.3. Даследаванне пытанняў рабочага руху........................................ 103

3.4. Асвятленне гісторыі сялянскага руху ........................................ 125

3.5. Партызанскі рух на старонках навуковых выданняў........... 147

Глава 4. Асноўныя накірункі гістарыяграфіі Заходняй Беларусі ў 1990-я – 2000-я гады ................................ 155

4.1. Арганізацыйна-метадалагічнае ўдасканаленне вывучэння заходнебеларускай праблематыкі ................................... 155

4.2. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў айчынных даследаваннях 1990-х – 2000-х гадоў ................. 169

4.3. Перыядызацыя гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі ...................................................................................... 206

Заключэнне ......................................................................... 216

Спіс выкарыстаных крыніц .......................................... 222

Гісторыю Беларусі трэба вывучаць,
гледзячы на яе з Мінска,
а не з Варшавы ці Масквы.

*У.М. Міхнюк*

# Уводзіны

Айчынная гістарыяграфія з’яўляецца прамым наступствам і адлюстраваннем айчыннай гісторыі, якая на працягу стагоддзяў характарызавалася іншаземным панаваннем, гвалтоўным навязваннем і дамінаваннем чужых для беларусаў традыцый, звычаяў, ідэй. Відавочнай слабасцю беларускай савецкай гістарыяграфіі была няздольнасць адкрыта ўздымаць і аргументавана адстойваць нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы Беларусі, гаварыць аб “сваёй” гісторыі на адпаведным адрэзку часу, на пэўнай тэрыторыі. Усё сказанае адносіцца і да гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў, якая доўгі час ішла ў агульным рэчышчы савецкай гістарыяграфіі і не магла ўсталёўваць каштоўнасці нацыянальна-дзяржаўнага характару ў навуцы, ідэалогіі, бараніць інтарэсы нацыянальнага адзінства, міжканфесійнай згоды беларусаў у міжваеннай Польшчы, адстойваць межы этнічнай тэрыторыі. Акрамя іншага гэта тлумачылася немагчымасцю “памяркоўнай беларускай савецкай гістарыяграфіі” парушаць той хісткі міжнацыянальны спакой, які ўлады СССР падтрымлівалі рознымі сродкамі. Гістарыяграфія незалежнай Рэспублікі Беларусь сёння дэманструе рашучае жаданне сцвярджаць беларускія інтарэсы, у тым ліку тэрытарыяльныя. Гэта адзначыў 24 верасня 2009 года дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі А.А. Каваленя на адкрыцці Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі” [319, с. 10, 12, 35]. Гістарычная навука павінна ўздымаць складаныя пытанні гістарычнага мінулага, у тым ліку дзяржаўна-тэрытарыяльнага характару, якія ў мінулым мелі вырашальнае ўздзеянне на грамадска-палітычнае развіццё Беларусі, на дзейнасць палітычных партый і арганізацый, паўсядзённае жыццё беларускага народа.

Адной з яркіх і драматычных старонак у гістарычным летапісе барацьбы беларускага народа за незалежнасць і нацыянальную кансалідацыю быў нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гадах. У выніку польска-савецкай вайны Беларусь была падзелена на дзве часткі. У кастрычніку 1920 года польскія войскі захапілі г. Вільню і тэрыторыю Віленскага, Свянцянскага, частку Трокскага паветаў, якія засталіся ў складзе польскай дзяржавы. Паводле Рыжскай мірнай дамовы ад 18 сакавіка 1921 года да Польшчы адышлі Гродзенская губерня,

Навагрудскі, Пінскі, частка Слуцкага, Мазырскага і Мінскага паветаў Мінскай губерні, Лідскі, Ашмянскі і Дзісенскі паветы Віленскай губерні.

На гэтых землях быў уведзены прыняты ў Польшчы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел – ваяводствы, паветы, гміны. За тэрыторыяй Віленскага, Навагрудскага, Палескага і часткі Беластоцкага ваяводстваў замацавалася неафіцыйная назва “Заходняя Беларусь”. У склад яе ўваходзілі паветы з пераважна беларускім насельніцтвам, а таксама некалькі паветаў са змешаным беларускім і польскім, беларускім і ўкраінскім, беларускім і літоўскім этнасамі. Плошча яе складала больш чым 113 тыс. км$^2$, а насельніцтва – 4,6 млн. чалавек (у 1931 годзе) [541]. Панаванне манаполій і буйнога памешчыцкага землеўладання, зямельная і падатковая палітыка польскага ўрада, малазямелле і паўперызацыя сялян абвастралі сацыяльныя супярэчнасці. Палітыка паланізацыі і асіміляцыі ва ўмовах нявырашанасці асноўных сацыяльна-эканамічных праблем і абмежаванай дэмакратыі яшчэ больш паглыблялі супярэчнасці паміж народам і польскай адміністрацыяй. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі быў адказам беларускага народа на ціск і гвалт, якім падвяргаліся беларусы, іх мова, культура, іх грамадзянскія правы ў Польшчы.

З самага пачатку захопу беларускіх зямель Польшчай беларуская палітычная эліта, якая фарміравалася ў складаных умовах панавання на беларускіх землях іншанацыянальных ідэйных плыняў, выказалася рашуча супраць такіх паводзін былой прыгнечанай царызмам Польшчы. Рознанакіраваныя палітычныя групоўкі рашуча адмаўлялі Рыжскія дамовы, ставячы барацьбу супраць іх у якасці асноўнага элементу сваёй палітычнай платформы. Аднак паступова беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, нягледзячы на амаль агульную незалежніцкую антыпольскую накіраванасць, аказаўся падзелены на некалькі плыняў, прадстаўнікі якіх кожны па-свойму ўяўлялі сабе будучыню Заходняй Беларусі і ўвогуле сваёй Бацькаўшчыны. Безумоўна, такое становішча не спрыяла поспеху ў барацьбе. Дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), якая ўтварылася ў 1923 годзе і ўзначаліла левpадыкальную плынь у нацыянальна-вызваленчым руху, ставіла сваёй мэтай дабіцца перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі, уз’яднання Заходняй Беларусі з БССР і ажыццявіць сацыялістычныя пераўтварэнні накшталт тых, якія ўжо былі праведзены ў Савецкай Беларусі. У сваёй паўсядзённай практыцы прадстаўнікі левардыкальнага крыла ўсяляк прапагандавалі дасягненні БССР у сацыялістычным будаўніцтве.

Але палітыка дыктатуры пралетарыяту, эканамічныя пераўтварэнні, калектывізацыя і палітычныя рэпрэсіі ў БССР, якая першапачаткова складалася ўсяго толькі з шасці паветаў, актыўна адштурхоўвалі насельніцтва Заходняй Беларусі, асабліва інтэлігенцыю, ад сацыялістычных

ідэй. Тым больш, што знаходжанне БССР у складзе СССР разглядвалася імі як становішча падначаленага “малодшага брата”, якое з царскай імперыі трансфарміравалася ў “саюз непарушны рэспублік свабодных”. Таму прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнай плыні ў нацыянальна-вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі, бачачы бесперпектыўнасць сацыялістычных пераўтварэнняў, асабліва вырашэння нацыянальнага пытання, па-іншаму ўяўлялі сабе перспектывы развіцця беларускай дзяржаўнасці і далейшага лёсу Заходняй Беларусі. Яны не адмаўляліся ад супрацоўніцтва і ўзаемакантактаў з іншымі так званымі непралетарскімі палітычнымі арганізацыямі, у адносінах да польскай дзяржавы займалі пазіцыі ад відавочна незалежніцкіх да паланафільства. Палітычная палітра атрымлівала сваю большую каляровую разнастайнасць з-з таго, што беларускі фактар з’яўляўся даволі значным у геапалітычнай архітэктуры Усходняй Еўропы і меў пэўнае ўвасабленне ў дзейнасці, напрыклад, літоўскіх і нямецкіх палітыкаў, якія завязвалі дастаткова трывалыя кантакты з беларускімі дзеячамі, ці за іх спінамі.

Адзначаныя разыходжанні тлумачыліся яшчэ і тым, што палітычныя сілы розных плыняў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху не былі самастойныя ў палітычных і матэрыяльных адносінах. Вядома, што КПЗБ атрымлівала падтрымку ў БССР як ідэалагічную, так і матэрыльную. З’яўляючыся складовай часткай Кампартыі Польшчы (КПП), свае намаганні КПЗБ прыкладвала не столькі для дасягнення дабрабыту заходнебеларускага насельніцтва, колькі на карысць прапаганды і распаўсюджвання камуністычных ідэй. У сваю чаргу беларускія дэмакратычныя партыі і арганізацыі ў Заходняй Беларусі, найперш паланафільскія, якія заяўлялі аб сваёй некамуністычнай арыентацыі, разглядваліся як супрацьвага камуністычнаму ўплыву і падтрымліваліся ў розных формах польскімі палітычнымі сіламі і групоўкамі. Імкненне да ўсталявання ў палітыцы сапраўды незалежніцкіх пляцовак, напрыклад заходнебеларускіх хрысціянскіх дэмакратаў, прыводзіла партыю да стану “вайны на два фронты”: з праўрадавымі і блізкімі да яго арганізацыямі з аднаго боку, і прабальшавіцкімі – з другога.

Акрамя гэтага, адмоўнай з’явай, што характарызавала беларускі рух у Польшчы, была наяўнасць пастаянных міжасабовых канфліктаў паміж рознаскіраванымі дзеячамі. Перакананыя ў сваіх поглядах, яны з неверагоднай зацятасцю накідваліся на сваіх палітычных апанентаў, разрывалі агульны фронт змагання за Беларусь, гэтым прыносілі карысць ворагам беларускай справы, якія з лёгкасцю маніпулявалі беларускім пытаннем.

Уз’яднанне ў верасні 1939 года беларускага народа паставіла кропку ў спрэчцы аб будучыні Заходняй Беларусі паміж яе рознымі палітычнымі

групоўкамі. Цікава, і гэта вельмі важна адзначыць, што вырашэнне з дапамогай вайсковай сілы польскага і заходнебеларускага пытання не адбілася станоўча як на палітычным лёсе нацыянальных беларускіх партый у Заходняй Беларусі, так і на лёсе прадстаўнікоў камуністычнага руху. Апошнія, як вядома, у 1930-я гады падвяргаліся з боку савецкай улады рэпрэсіям. Але іх праца не аказалася дарэмнай. У 1920–1930-я гады заходнебеларускае насельніцтва, дзякуючы камуністычнай прапагандзе, было ў асноўным падрыхтавана да прыходу ўлады Саветаў, да сацыялістычных пераўтварэнняў і першапачаткова ў вялікай большасці ставілася да іх са спагадай.

Савецкая гістарыяграфія па метадалагічных прычынах адмоўна ставілася да дзейнасці ў Заходняй Беларусі партый і арганізацый нацыянальна-дэмакратычнай плыні. За прадстаўнікамі гэтых партый трывала замацаваліся фармулёўкі накшталт “беларускія буржуазныя нацыяналісты”, ”згоднікі”, “здраднікі” і іншыя, якія вымушаны былі ўжываць даследчыкі. Асноўная ўвага да пачатку 1990-х гадоў надавалася даследаванню пытанняў гісторыі станаўлення і развіцця рэвалюцыйнага руху ў розных формах яго праяўлення. У адзначаны час даследчыкамі праведзена значная праца па навуковым вывучэнні гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў, асабліва дзейнасці Кампартыі Заходняй Беларусі, камсамолу Заходняй Беларусі (КСМЗБ), а таксама грамадска-палітычных арганізацый, якія ў тым ці іншым аб’ёме знаходзіліся пад уплывам кампартыі. Тэматычнае пашырэнне і паглыбленне гісторыі заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху адбылося ў 1990–2000-я гады пасля таго, як гістарычная навука пазбавілася жорсткага панавання марксісцка-ленінскай метадалогіі. У сярэдзіне 1950-х – 2000-я гады розныя аспекты гэтых шматгранных праблем айчыннымі гісторыкамі прааналізаваны і адлюстраваны ў 50 кандыдацкіх і 6 доктарскіх дысертацыях (Падлічана аўтарам) [255, С. 19], у амаль 100 манаграфіях і брашурах, сотнях навуковых артыкулаў, у зборніках дакументаў і матэрыялаў, а таксама кнігах успамінаў актыўных членаў КПЗБ і ўдзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Важнейшыя пытанні тэмы асветлены ў абагульняльных працах па гісторыі СССР і БССР, КПСС і КПБ, у шматлікіх артыкулах энцыклапедычных выданняў, перш за ўсё ў “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі”. Да гэтага трэба дадаць і тую літаратуру 1920–1940-х гадоў, якая ствáралася па гарачых слядах тагачасных падзей без дастатковай гістарычнай дыстанцыі і дакументальнага матэрыялу, але якая не страціла свайго гістарыяграфічнага і фактаграфічнага значэння. У апошняе дваццацігоддзе ў Беларусі, а таксама ў Польшчы прайшлі навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя разгляду розных пытанняў гісторыі Заходняй

Беларусі, выдадзеныя матэрылы якіх з’яўляюцца змястоўнымі гістарыяграфічнымі крыніцамі. Беларуская гістарычная навука сёння, такім чынам, мае значную колькасць прац, у якіх даследаваны асноўныя накірункі і формы нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Пры гэтым разнапланавая і рознаскіраваная навуковая літаратура мае істотныя недахопы, якія тлумачацца, апрача іншага, метадалагічнымі падыходамі і зніжаюць навуковасць вынікаў і высноў даследаванняў.

Вывучэнне гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў было і застаецца адным з прыярытэтных напрамкаў айчыннай гістарычнай навукі. Гістарыяграфія гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі не даследавалася паслядоўна і ў цэлым. Вывучаліся толькі некаторыя асобныя яе пытанні ў рэчышчы даследавання больш буйных праблем гістарыяграфіі гісторыі Беларусі і на ўзроўні гістарыяграфічных аглядаў доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Ва ўмовах існавання вялікай колькасці навуковых прац па азначанай праблематыцы, значная большасць якіх падрыхтавана на падставе марксісцка-ленінскай метадалогіі, існуе аб’ектыўная неабходнасць падвядзення вынікаў праведзенай навуковай працы, высвятлення накірункаў далейшых даследаванняў, дыскусійных пытанняў, удакладнення некаторых палажэнняў і пунктаў гледжання.

Мэта даследавання – на аснове аналізу гістарыяграфічных крыніц раскрыць у праблемна-храналагічным плане працэс станаўлення, развіцця і ўзбагачэння гістарыяграфіі нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў па гісторыі КПЗБ, рэвалюцыйных і нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, партызанскай барацьбы, сялянскага і рабочага руху. Прадметам даследавання з’яўляецца айчынная навуковая гістарычная літаратура 1920–2000-х гадоў.

Працэс станаўлення і развіцця гістарыяграфіі гісторыі нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі даследуецца на шырокім коле гістарыяграфічных крыніц. Гэтае даследаванне паказвае працэс развіцця навуковых ведаў у савецкай краіне па актуальнай і палітычна значнай праблеме, якой з’яўлялася і з’яўляецца гісторыя Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў, калі яна ўваходзіла ў склад Польшчы, адлюстроўвае развіццё і трансфармацыю даследаванняў заходнебеларускай праблематыкі ва ўмовах існавання Рэспублікі Беларусь, умацавання яе незалежнасці і суверэнітэту.

# Глава 1
# Гістарыяграфія, крыніцы і метадалогія гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі

Асэнсаванне і даследаванне гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў, у тым ліку і пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху, пачалося адразу пасля Рыжскага мірнага дагавору. Што тычыцца гістарыяграфічнага дыскурсу праблемы, то адлюстраванне сутнасці і накіраванасці тагачасных публікацый адбывалася на старонках палемічных прац, аўтарамі якіх былі дзеячы беларускага руху. Як правіла, ацэнка іх навукова-публіцыстычнай вартасці зыходзіла з неабходнасці вырашэння пэўных задач ідэйна-палітычнай канкурэнцыі. Так, А. Станкевіч у сваёй працы “Беларускі хрысціянскі рух (гістарычны нарыс)”, закончанай ім у 1936 годзе, даў характарыстыку публікацый, якія выходзілі ў БССР і, на яго думку, былі праявай у БССР жорсткай барацьбы з беларускім нацыянальным рухам. Правадыр беларускіх хадэкаў акцэнтаваў увагу на відавочнай тэндэнцыйнасці камуністычных выданняў, у прыватнасці працы А. Гарадоцкага “Як беларуская Хадэцыя гандлюе крывёю рабочых і сялян. Вільня, 1934.” (“брашура, поўная зневажаючых БХД небыліцаў, яўнай ілжы і выдумкаў”) і “Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии и Зап. Украине. Минск, 1935” (“у гэтай кніжцы... БХД адмалявана цалком фальшыва, тэндэнцыйна, злосна і зьняважліва”) [794, с. 535].

Своеасаблівым пачаткам падвядзення вынікаў навукова-даследчыцкай працы па заходнебеларускай праблематыцы, у тым ліку і нацыянальна-вызваленчага руху, была праца беларускага даследчыка Я. Залеўскага. Ён, па інфармацыі В.А. Астрогі, у 1930-я гады падрыхтаваў два бібліяграфічныя зборнікі, дзе прыводзіліся звесткі пра публікацыі па гісторыі Заходняй Беларусі пасля Рыжскага дагавору. Аднак гэтая праца, на жаль, не перарасла ў паўнавартасныя гістарыяграфічныя даследаванні.

Пасля палітычнай рэабілітацыі КПЗБ падчас працы XX з’езда КПСС з другой паловы 1950-х гадоў у друку пачалі з’яўляцца публікацыі, у якіх разам з іншымі ўздымаліся праблемы вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі, акрэсліваўся стан іх даследаванасці, у прыватнасці гісторыі КПЗБ. Так, напрыклад, у рэдакцыйным артыкуле “Да пытання аб гісторыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі” ў часопісе “Камуніст Беларусі”, аўтарам якога быў М.С. Арэхва, гаварылася, што гісторыя КПЗБ мала вядома шырокай грамадскасці. Без канкрэтыкі і памылкова адзначалася, што ў некаторых публікацыях пра КПЗБ, якія выйшлі пасля 1939 года, у шэрагу выпадкаў скажалася праўда аб рэвалюцыйным руху ў Заходняй Беларусі, як быццам бы да 1939 года публікацыі вызначаліся праўдзівасцю і аб’ектыўнасцю. На думку М.С. Арэхвы, які выяўляў ідэалагічныя

памкненні кампартыі, неабходна стараннае даследаванне і “праўдзівае асвятленне” гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, што патрабуе сумесных намаганняў многіх гісторыкаў і павінна быць неад’емнай часткай даследавання і асвятлення гісторыі Беларусі [337, с. 25].

Пытанні вывучэння гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ўздымаліся ў дысертацыйных працах. Асаблівасць гістарыяграфічных аглядаў кандыдацкіх дысертацый заключаецца ў тым, што іх аўтары акцэнтавалі сваю ўвагу на тых даследаваннях, у якіх закраналіся пытанні, блізкія да іх тэм, характарызуючы іх пераважна ў бібліяграфічным плане. Пры гэтым амаль усе аўтары дысертацый у якасці каталізатара актывізацыі навукова-даследчыцкай працы называлі “гістарычныя рашэнні” XX з’езда КПСС, якія далі магчымасць гісторыкам прыступіць да вывучэння гісторыі КПЗБ і іншых заходнебеларускіх праблем.

Так, І.В. Палуян у кандыдацкай дысертацыі, прысвечанай пытанням рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1929–1933 гадах, адзначыў, што гэты перыяд вывучаны асабліва слаба. Фактычна няма ніводнай колькі-небудзь значнай працы, якая была б непасрэдна прысвечана разгляду пытанняў рэвалюцыйнай барацьбы мас, адзначыў даследчык, абвяргаючы сваё ўласнае сцверджанне згадкай некалькіх прац па гісторыі знаходжання Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы. Як найбольш значную ён выдзеліў неапублікаваную кандыдацкую дысертацыю А.У. Царука “Рэвалюцыйны вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг.”, дадаючы, што ў рамках адной дысертацыі немагчыма было даць хаця б адносна поўнае асвятленне ўсіх пытанняў. А.У. Царук ажыццявіў у асноўным і правільнае, але павярхоўнае асвятленне перыяду 1929–1933 гадоў. І.В. Палуян узгадаў манаграфію Ц.С. Гарбунова “Воссоединение белорусского народа в едином Советском социалистическом государстве” і шэраг іншых, якія, на думку даследчыка, у некаторай ступені закраналі пытанні рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1929–1933 гадах. Акрамя гэтага, гісторык назваў працы М.С. Арэхвы і С.Р. Анісава, зборнік успамінаў актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху “У суровыя гады падполля” [685, с. 3–4].

А.М. Мацко ў сваім даследаванні, прысвечаным вывучэнню пытанняў сумеснай барацьбы беларускага і польскага народа супраць жорсткіх праяваў польскай дзяржавы, кваліфікаваныя ім як фашызм, назваў асноўныя працы, у якіх у розных маштабах асвятляліся асобныя аспекты праблемы. Аўтар прыйшоў да высновы, што ў гістарыяграфіі адсутнічаюць працы, спецыяльна прысвечаныя асвятленню пытанняў згаданай тэмы [517, с. 3–5].

Ва ўмовах пачатай “адлігі” як відавочная праява духу сталінізму гучалі рэзка негатыўныя характарыстыкі дзейнасці Беларускай сялянска-

работніцкай грамады (БСРГ), атрыманыя ёй на старонках беларускіх савецкіх выданняў у 1930–1940-я гады. На гэтым фоне абгрунтавана гучала сцвярджэнне У.А. Палуяна, які ў кандыдацкай дысертацыі, прысвечанай гісторыі БСРГ, канстатаваў крайне недастатковае асвятленне тэмы ў гістарычнай літаратуры. Ім былі згаданы апублікаваныя ў 1927–1932 гадах па праблеме брашуры папулярнага характару, напісаныя без архіўных матэрыялаў, у якіх падаваліся агульныя звесткі пра дзейнасць БСРГ. Рашэнні XX з'езда КПСС і заява цэнтральных камітэтаў пяці камуністычных і рабочых партый аднавілі праўду аб кампартыі Польшчы і адкрылі новыя магчымасці для вывучэння гісторыі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, у тым ліку і Грамады. У.А. Палуян звярнуў увагу на працу Г. Анаціка "Беларуская сялянска-рабочая грамада", якая была апублікавана ў ПНР. Аднак пры гэтым падкрэсліў, што спецыяльных навуковых распрацовак тэмы ні савецкімі, ні замежнымі даследчыкамі не праводзілася [679, с. 2–4].

Т.Ю. Глінская, як і ўсе астатнія даследчыкі, вырашальнай падзеяй гістарыяграфіі КПЗБ лічыла яе палітычную рэабілітацыю ў 1956 годзе. Залішне ўсхваляючы тагачасны грамадска-палітычны клімат, даследчыца сцвярджала, што рашэнні XXI і XXII з'ездаў партыі канчаткова вызвалілі гістарычную навуку ад "догмаў", якія існулі на вучоных у часы культу асобы. Яна справядліва лічыла каштоўнымі для даследчыкаў пачатку 1960-х гадоў зборнікі успамінаў, дакументаў і матэрыялаў "У суровыя гады падполля" і першы том "Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение". Гістарыяграфічны аналіз дазволіў Т.Ю. Глінскай зрабіць выснову пра тое, што ў марксісцкай гістарычнай літаратуры на той час яшчэ не атрымалі належнага аналізу і асвятлення многія бакі дзейнасці КПЗБ: арганізацыйныя формы і метады працы, тактыка партыі на розных этапах, барацьба партыі з буржуазна-нацыяналістычнай ідэалогіяй беларускіх і польскіх нацыяналістаў і іншае [139, с. 3–6].

Больш змястоўным бачыцца гістарыяграфічны агляд у кандыдацкай дысертацыі І.П. Хаўратовіча. Даследчык звярнуў асаблівую ўвагу на вывучэнне гісторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гады. Ён справядліва адзначыў, што першыя крокі ў асвятленні прадмета яго навуковай цікавасці зроблены кіруючымі работнікамі. Гэта былі невялікія брашуры, якія выдаваліся ў падпольных друкарнях (М. Курковіч, М. Падгайскі, Я. Крыўда), а таксама артыкулы ў газетах і часопісах (І. Лагіновіч, Л. Родзевіч, С. Альшэўскі, С. Будзінскі, М. Якаўлеў, А. Цукерман). У іх працах, па меркаванні даследчыка, зроблена першая спроба на падставе дакументаў, а часцей за ўсё асабістых уражанняў і ўспамінаў, прааналізаваць асобныя праблемы пралетарскага, сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху, стану эканомікі Заходняй Беларусі. Пасля

вызвалення Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны і ўз'яднання іх з БССР і УССР у Маскве і Мінску выйшла некалькі брашур (В. Мінаеў, Р. Ягораў, Г. Мінскі), асноўная ўвага ў якіх надавалася пытанням гістарычнага мінулага заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх зямель, тэрыторыі, народанасельніцтва, стану эканомікі, палітычнаму, нацыянальнаму і эканамічнаму прыгнёту з боку польскіх улад. І.П. Хаўратовіч выказаў абгрунтаваныя думкі адносна развіцця рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху (падаваўся як стыхійны працэс, павярхоўна, схематычна), а таксама палітычнага і арганізацыйнага кіраўніцтва рэвалюцыйнай барацьбой (роля КПЗБ замоўчвалася і ігнаравалася) [849, с. 4–5].

Найбольш важныя працы савецкіх і польскіх гісторыкаў прыведзены ў калектыўнай манаграфіі "Революционный путь Компартии Западной Белоруссии" [719, с. 9–12], якая неаднойчы кваліфікавалася як надзвычай аўтарытэтнае выданне ў наступных даследаваннях. Напрыклад, у гістарыяграфічным аглядзе кандыдацкай дысертацыі П.І. Зялінскага, прысвечанай вывучэнню ролі друку КПЗБ у рэвалюцыйным руху. Аўтар прааналізаваў асноўныя працы савецкіх і польскіх вучоных, адзначыў, што пытанні друку КПЗБ закраналіся толькі часткова і не з'яўляліся прадметам спецыяльных даследаванняў. У прыватнасці, аўтар узгадаў працу З. Млынарскага "Очерки деятельности революционной печати в Польше (1866–1938 гг.)", у якой маюцца раздзелы пра камуністычны друк у Польшчы 1918–1938 гадах. Аднак, як заўважыў П.І. Зялінскі, аналізуючы пытанні дзейнасці друку кампартыі Польшчы, З. Млынарскі нічога не сказаў пра друк КПЗБ [294].

У іншых дысертацыйных працах па заходнебеларускай праблематыцы іх аўтары, як і ў вышэйпрыведзеных працах, галоўнай мэтай гістарыяграфічнага аналізу бачылі абгрунтаванне неабходнасці больш глыбокага і ўважлівага вывучэння адпаведных тэм з-за недастатковасці асвятлення ці поўнай адсутнасці прац, спецыяльна прысвечаных пытанням гісторыі Заходняй Беларусі, якія яны выстаўлялі ў якасці прадмета даследавання [45; 103; 107; 152; 155; 204; 338; 402; 500; 560].

Новым крокам у гістарыяграфічным аналізе названых праблем з'явіўся артыкул І.П. Хаўратовіча. Ён быў падрыхтаваны на аснове дакладу, з якім аўтар выступіў на навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю ўтварэння КПЗБ і КСМЗБ, і апублікаваны ў зборніку яе матэрыялаў [848]. У ім сістэматызавана і ў агульных рысах ахарактарызавана літаратура па гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі – даследчыцкія манаграфіі, брашуры і важнейшыя артыкулы, дакументальныя зборнікі мемуарных публікацый, якія выйшлі ў свет да пачатку 1970-х гадоў. Пры гэтым І.П. Хаўратовіч назваў і некаторыя працы польскіх гісторыкаў, якія асвятлялі асобныя аспекты гісторыі КПЗБ як складовай часткі КПП.

Больш змястоўнымі і разгорнутымі з’яўляюцца гістарыяграфічныя агляды доктарскіх дысертацый, якія пачалі абараняць беларускія гісторыкі з канца 1960-х гадоў [292; 343; 403; 513; 681]. Першая доктарская дысертацыя па гісторыі Заходняй Беларусі была абаронена А.М. Мацко. Ён прывёў працы па гісторыі Польшчы, польскага рабочага руху, гісторыі КПП, зборнікі дакументаў і матэрыялаў, творы кіраўнікоў польскага рабочага і камуністычнага руху. Узгадваючы некаторыя публікацыі, якія выйшлі пасля верасня 1939 года, аўтар пагадзіўся з І.П. Хаўратовічам, што развіццё рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху выкладалася ў іх павярхоўна, схематычна і паказвалася як стыхійны працэс, у іх нічога не гаварылася аб палітычным і арганізацыйным кіраўніцтве з боку кампартыі. А.М. Мацко выдзеліў працы І.Ф. Лочмеля напэўна з-за таго, што ў іх прагучала КПЗБ, лічыў, што ў гэтых даследаваннях развіццё рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху паказана коратка, але аб’ектыўна [513, с. 8–12].

На думку У.А. Палуяна, артыкулы і брашуры 1927–1935 гадоў не насілі даследчыцкага характару, таму ўяўляюць цікавасць як крыніцы. У іх разам з правільнымі мелі месца недакладныя і памылковыя ацэнкі і вывады, напрыклад, аб характары масавых арганізацый, аб узроўні рэвалюцыйнай барацьбы і інш. Пазней, асабліва ў сувязі з неабгрунтаваным роспускам Кампартыі Польшчы ў 1938 годзе, у гістарычнай літаратуры 1939–1955 гадоў мелі месца памылковыя ацэнкі самога развіцця класавай барацьбы, прыніжалася ці замоўчвалася кіруючая роля КПЗБ, перабольшвалася стыхійнасць у рэвалюцыйным руху, няправільна ацэньваўся сацыяльна-палітычны характар масавых народных арганізацый, якія трактаваліся як дробнабуржуазныя. Нярэдка скажалася развіццё рэвалюцыйна-вызваленчага руху. У.А. Палуян справядліва палічыў агульным недахопам прац аб рэвалюцыйным вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі, напісаных у 1927–1955 гадах, тое, што яны слаба абапіраліся на дакументальныя матэрыялы.

Гістарыяграфічную сітуацыю з другой паловы 1950-х гадоў У.А. Палуян небеспадстаўна характарызаваў як пачатак карэннага павароту ў савецкай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі. Называючы працы А.У. Царука, І.В. Палуяна, Б.С. Клейна, Т.Ю. Глінскай, А.М. Мацко, І.П. Хаўратовіча, гісторык адзначыў іх наватарства ў распрацоўцы заходнебеларускіх праблем і ўвядзенні ў навуковы ўжытак новых архіўных матэрыялаў. Аднак у асобных працах праяўляліся спробы трактаваць пытанні рэвалюцыйнай барацьбы з пазіцый і ўяўленняў, якія існавалі да XX з’езда КПСС, у некаторых даследаваннях відавочна адчуваўся недахоп фактычнага матэрыялу, што не дазваляла паўней раскрыць пастаўленыя пытанні ці зрабіць дастаткова абгрунтаваныя

высновы. Амаль ва ўсіх гэтых працах сялянскі рух асвятляўся часткова і таму яны не даюць шырокай і цэласнай карціны барацьбы сялянства, канстатаваў У.А. Палуян, не называючы, на жаль, канкрэтныя працы. На яго думку, больш грунтоўна, на багатым фактычным матэрыяле рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі асветлены ў манаграфіі “Революционный путь Компартии Западной Белоруссии”.

Вывучэнне гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі з другой паловы 1960-х гадоў, як слушна заўважыў У.А. Палуян, пайшло галоўным чынам па лініі распрацоўкі асобных пытанняў гэтай праблемы. Гісторык узгадаў шэраг сваіх публікацый, а таксама даследаванні А.А. Сарокіна, А.М. Мацко, У.Ф. Ладысева, некалькі абагульняльных прац па гісторыі СССР, БССР, Польшчы, даследаванні літаратуразнаўчага характару, у якіх былі адлюстраваны асобныя бакі нацыянальна-вызваленчай барацьбы і грамадска-палітычнага жыцця ў Заходняй Беларусі, шэраг прац польскіх гісторыкаў [682, с. 7–13].

Асноўныя савецкія даследаванні па пытаннях гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў, рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху былі ў бібліяграфічным плане ахарактарызаваны ў працах У.М. Міхнюка і сумеснай працы У.М. Міхнюка, П.Ц. Петрыкава і Г.Г. Сяргеевай [537; 820]. У вышэйадзначаных даследаваннях асноўная ўвага аўтараў звярталася на пералік і аналіз гістарыяграфічных крыніц, але амаль заставалася па-за полем зроку гісторыя дзейнасці навуковых арганізацый і ўстаноў, якія найперш займаліся распрацоўкай заходнебеларускай праблематыкі, у прыватнасці, у 1920–1930-я гады. Гэты прабел быў у значнай ступені запоўнены дзякуючы манаграфіі У.М. Міхнюка “Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.)”. У ёй адлюстравана дзейнасць заходняга сектара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры прэзідыуме Інбелкульта, а потым Акадэміі навук і Інстытута польскай пралетарскай культуры. Даследчык звярнуў увагу на вызначальны ўплыў партыйнага кіраўніцтва на распрацоўку праблем заходнебеларускай праблематыкі. Бюро і Сакратарыят ЦК КП(б)Б разам з інстытутам Маркса-Энгельса-Леніна, падкрэсліў У.М. Міхнюк, ажыццяўлялі пастаяннае кіраўніцтва дзейнасцю Інстытута гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі, вызначалі яго структуру і канкрэтызавалі накірункі навуковых даследаванняў. У прыватнасці, у маі 1931 года Інстытуту даручалася падрыхтоўка даследаванняў па гісторыі КПЗБ, рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі [538, с. 56–57].

У.М. Міхнюк і Г.В. Вахтомаў у сумеснай працы ахарактарызавалі навуковую і выдавецкую дзейнасць заходняга сектара, камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі, замежнай рэдакцыі КПЗБ. Імі прааналізавана значная

колькасць публікацый 1920–1930-х гадоў, прысвечаных заходнебеларускай праблематыцы. Аўтары адзначылі, што недахоп кваліфікаваных кадраў, маладаступнасць рэпрэзентатыўных крыніц вымушалі даследчыкаў пісаць працы галоўным чынам на фактах, якія давала само жыццё і якія былі зафіксаваны перыядычным друкам. І таму асвятленне гісторыі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў значнай меры было фрагментарным, для 1920–1930-х гадоў характэрна больш эмпірычнае апісанне падзей, чым іх глыбокі навуковы аналіз на аснове шырокага кола дакументальных крыніц. Разам з тым у работах, напісаных па гарачых слядах, не заўсёды правільна ацэньваліся падзеі, што патрабуе крытычных адносін да разгледжанай літаратуры [86]. Навуковы аналіз і сістэматызацыя У.М. Міхнюком дысертацыйных даследаванняў атрымалі свой працяг у выглядзе адмысловых бібліяграфічных паказальнікаў [255; 540].

У другой палове 1980-х гадоў былі абаронены тры кандыдацкія дысертацыі па праблемах развіцця і ўдасканалення гістарычнай навукі БССР у другой палове 1940-х – 1970-х гадах. У асобных раздзелах В.Ц. Леанаўца, Л.П. Храпко, І.І. Шаўчука ўвага звернута на асноўныя моманты фарміравання гістарыяграфіі Заходняй Беларусі [448, 854, 881]. В.Ц. Леанавец апублікаваў змястоўны артыкул, спецыяльна прысвечаны працэсу вывучэння пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі ў 1960-я гады [445].

Як значныя гістарыягрыяграфічныя факты трэба разглядваць рэцэнзіі на навуковыя працы па гісторыі Заходняй Беларусі. Асабліва шматлікімі яны былі ў 1960–1980-я гады і з’яўляліся своеасаблівай рэакцыяй на публікацыю гістарычных навуковых прац. У перыядычным друку выходзілі рэцэнзіі і водгукі на манаграфіі і зборнікі дакументаў і матэрыялаў. За вельмі нязначным выключэннем мелі кампліментарны характар і ўтрымлівалі станоўчыя ацэнкі публікацый [9; 49; 57; 151; 348; 407; 434; 441; 454; 518; 534; 844].

Гістарыяграфічная сітуацыя ў Беларусі карэнным чынам змянілася ў пачатку 1990-х гадоў, калі пасля ўсталявання незалежнасці Рэспублікі Беларусь з’явіліся ўмовы для пераадолення сфарміраваных у савецкія часы догмаў і стэрэатыпаў. Пачалі выходзіць працы, у якіх закраналіся і метадалагічна-гістарыяграфічныя аспекты вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў. Такімі, напрыклад, былі артыкулы У.Ф. Ладысева, які адзначыў неабходнасць выпрацоўкі новых падыходаў да вывучэння нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, ролі ў ім розных палітычных партый і арганізацый [416; 417; 420]. Канстатуючы найбольшую распрацаванасць дзейнасці леварадыкальных партый і плыняў сацыялістычнай арыентацыі, галоўную ролю сярод якіх мела КПЗБ, аўтар назваў і тыя аспекты, якія не знайшлі глыбокага навуковага асвятлення або падаваліся ў аднабаковай трактоўцы [420, с. 81].

У асэнсаванне гістарыяграфічных пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі зрабілі ўнёсак гродзенскія вучоныя А.М. Нечухрын, Г.У. Васюк, М.М. Ганчароў, Д.У. Караў, І.І. Коўкель, Т.Т. Кручкоўскі і І.А. Фёдараў пры распрацоўцы тэмы “Этнасацыяльныя і палітычныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі ў 1921–1939 гг.” [605]. Яны звярнулі ўвагу на тое, што многія аспекты тэмы або зусім не распрацаваныя, або даследаваліся недастаткова і аднабакова з пэўнай ідэалагічнай накіраванасцю. Гэта асабліва характэрна для савецкай гістарыяграфіі, прадстаўнікі якой у асноўным займаліся вывучэннем рэвалюцыйна-вызваленчага руху і сацыяльна-эканамічнага становішча заходнебеларускіх зямель у складзе польскай дзяржавы ў рамках строга акрэсленай схемы, якая склалася ў канцы 1950-х – пачатку 1960-х гадоў. Пры гэтым нельга адназначна пагадзіцца з выказаным меркаваннем адносна “граху” сучаснай беларускай і польскай гістарыяграфіі: “Калі ў савецкай і польскай гістарыяграфіі часоў ПНР з дадатнага боку асвятлялася дзейнасць КПЗБ і КПП, то сёння гэта падаецца наадварот. Плюсы памяняліся на мінусы, забываючыся, што ісціна ляжыць дзесьці пасярэдзіне.” [605, с. 75–76]. Гэты погляд пэўным чынам спрошчвае сітуацыю і стан гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі.

Адметнасцю дысертацыйных прац па гісторыі Заходняй Беларусі 1990-х гадоў [70; 192; 724; 817] з’яўляецца тое, што ў гістарыяграфічных аглядах даследчыкі звярнулі ўвагу на найбольш значныя недахопы і перакосы ў асвятленні пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі, звязаныя з панаваннем у гістарычнай навуцы марксісцка-ленінскай метадалогіі і ідэалагічным кантролем над даследаваннямі з боку партыйных і дзяржаўных органаў. Так, напрыклад, В.В. Даніловіч справядліва канстатаваў, што недахопам даследаванняў савецкага часу была “аднабаковая, толькі з пазіцыі пануючай на той час камуністычнай ідэалогіі, характарыстыка фактаў і падзей. Галоўная ўвага аўтараў сканцэнтравана на асвятленні ўзаемадзеяння арганізацыі (“Змаганне”. – *А.С.*) з Кампартыяй. У большасці прац адсутнічаюць спробы крытычнага аналізу гісторыі змаганцаў” [194, с. 10]. Неабходна пагадзіцца з М.Б. Сямёнчыкам у тым, што пад канец 1990-х гадоў не было абагульняльнай працы, у якой пытанні рабочага руху разглядаліся б у комплексе ўзаемазвязаных праблем: стан прамысловасці і ўплыў на яе развіццё эканамічнай палітыкі Польшчы; колькасны склад, становішча прамысловых рабочых, перыядызацыя, характарыстыка і дынаміка выступленняў рабочых; уплыў палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў на рабочы рух. Даследчык адзначыў, што дзейнасць арганізацый камуністычнага накірунку ў рабочым руху даследавана даволі шырока, але аднабакова. Роля ж іншых партый і арганізацый вывучана толькі фрагментарна [817, с. 4–5].

В.А. Астрога ў кандыдацкай дысертацыі і апублікаваных артыкулах [23–27] звярнуў увагу на праблемы развіцця гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі, стварэння, функцыянавання і згортвання дзейнасці навуковых установ, якія займаліся вывучэннем заходнебеларускай праблематыкі ў 1920–1930-я гады. Пры гэтым аўтар звярнуў увагу на палітычныя рэпрэсіі ў дачыненні да беларускіх гісторыкаў. На думку даследчыка, вывучэнне гісторыі Заходняй Беларусі вырашала розныя задачы партыйных і савецкіх органаў, у тым ліку ідэалагічныя.

У гістарыягафічных артыкулах В.Ф. Кушнера, прысвечаных аналізу навуковага вывучэння пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі ў 1990-я гады, упершыню ў беларускай гістарыяграфіі падведзены першапачатковыя вынікі вывучэння праблемы ў постсавецкі час [391; 918]. Думка аб ідэалагічным забеспячэнні пры дапамозе беларускага друку мерапрыемстваў, якія праводзіліся на шляху практычнай рэалізацыі планаў бальшавіцкага кіраўніцтва ў адносінах да Заходняй Беларусі і Польшчы, адлюстравана ў працы М.П. Касцюка. Напрыклад, аўтар паведаміў пра тое, што была выпрацавана пастанова ЦК КП(б)Б, зацверджаная палітбюро ЦК УКП(б), аб мерапрыемствах па “абароне Беларускай сялянска-рабочай грамады”. У прыватнасці, планавалася выданне спецыяльнай брашуры аб працэсе над Грамадою [335, с. 191].

Адной з характэрных рыс савецкай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі была амаль поўная адсутнасць навуковых гістарыяграфічных даследаванняў, прысвечаных асэнсаванню асабістага ўкладу вучоных у арганізацыю і распрацоўку пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі. У наш час выявілася тэндэнцыя да пераадолення гэтага недахопу, яскравым сведчаннем якой з’яўляецца арганізаваная і праведзеная ў БДПУ імя Максіма Танка навуковая канферэнцыя, прысвечаная дзейнасці вядомага аўтара па гісторыі Заходняй Беларусі – А.М. Мацко. Гэты гістарыяграфічны факт, а таксама публікацыю зборніка матэрыялаў названай канферэнцыі можна ацэньваць як новую з’яву ў гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі [1].

Гістарыяграфія гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі была даследавана ў абароненай у 2002 годзе кандыдацкай дысертацыі і артыкулах А.А. Савіча [727–752]. Падсумаванне навукова-даследчыцкай працы па гісторыі Заходняй Беларусі і нацыянальна-вызваленчага руху ажыццяўлялася на старонках рознага кшталту абагульняльных прац па гісторыі гістарычнай навукі Беларусі М.В. Біча, В.А. Белазаровіча, Г.У. Карзенкі, Р. Лінднэра, А.П. Мініча і інш. [34; 43; 358; 359; 450; 451; 526]. Разам са звесткамі пра здабыткі і напрацоўкі айчынных даследчыкаў гэтыя публікацыі ўтрымліваюць і змястоўную інфармацыю сацыяметрычнага характару. Заслугоўвае ўвагі інфармацыя І.І. Шаўчука, які ў манаграфіі і

доктарскай дысертацыі, аргументавана звяртаючы ўвагу на грамадска-палітычную абумоўленасць развіцця гуманітарных навук у 1920–1930-я гады, у тым ліку на негатыўнае вырашальнае ўздзеянне на гуманітарныя навукі палітычных рэпрэсій, спыніўся на дзейнасці навуковых устаноў, іх кадравым забеспячэнні, прафесійным і сацыяльным абліччы супрацоўнікаў, у тым ліку Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі (КЗБ) [878; 879].

Постсавецкая айчынная гістарыяграфія паступова пачала пазбаўляцца істотнага недахопу, звязанага з выхадам камплiментарных рэцэнзій, якія скіраваны былі ў першую чаргу на падкрэсліванне дасягненняў тых ці іншых аўтараў публікацый, а не на ўласна крытычны аналіз, які з'яўляецца асновай для ўдасканалення навуковых даследаванняў. Паказальныя ў гэтым сэнсе рэцэнзіі палемічнага характару, аўтары якіх, напрыклад, А. Пашкевіч, А. Чарнякевіч, грунтуюцца на глыбокім валоданні гістарыяграфіі і крыніцазнаўства адпаведных праблем [632; 640; 643; 644; 648; 649; 658]. Неабходна адзначыць змястоўныя працы з элементамі гістарыяграфічнага даследавання А.М. Сідарэвіча, У.М. Конана, А.Ф. Вашкевіча і А.В. Пашкевіча пра навукова-публіцыстычную спадчыну А. Луцкевіча, А. Станкевіча, В. Гадлеўскага і інш. [92; 95; 355; 475–478; 794]. Уяўляе цікавасць гістарыяграфічнае даследаванне Э.А. Мазько, прысвечанае аналізу савецкай гістарыяграфіі заходнебеларускага нацыянальнага руху [497].

Асаблівасці працэсу даследавання пытанняў нацыянальна-культурнага жыцця Заходняй Беларусі адлюстраваны ў працах А.М. Вабішчэвіча [61; 64; 65–68; 73; 74; 78]. Вучоны выказаў слушнае меркаванне аб немалым значэнні ў актывізацыі даследавання заходнебеларускай праблематыкі таго, што сярод аўтараў прац былі ўраджэнцы заходняй часткі Беларусі, якія ведалі аб жыцці ў складзе Польшчы з уласнага вопыту [67, с. 20]. У 2000-я гады айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі папоўнілася гістарыяграфічнымі аглядамі цэлага шэрагу кандыдацкіх дысертацый па заходнебеларускай праблематыцы, у тым ліку прысвечаных вывучэнню пытанняў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў складзе ІІ Рэчы Паспалітай [51; 129; 145; 175; 275; 371; 465; 470; 498; 549; 646; 660; 697; 705; 754; 803; 828; 860; 862; 865; 880]. З дысертацыямі савецкага перыяду іх аб'ядноўвала апраўданае жаданне абгрунтаваць неабходнасць паглыбленага вывучэння адпаведных тэм на фоне іх недастатковага навуковага асвятлення. Пры гэтым некаторыя з названых даследаванняў адрознівае высокі гістарыяграфічны ўзровень. Так, напрыклад, слушнымі з'яўляюцца высновы А.В. Пашкевіча, які звярнуў увагу на памяркоўныя адносіны беларускага савецкага друку сярэдзіны 1920-х гадоў у дачыненні нават да апанентаў пракамуністычнай Грамады. Аднак з цягам часу афіцыйная савецкая гістарыяграфія,

адлюстроўваючы ўсе асноўныя тэндэнцыі палітычнага і грамадскага развіцця ў СССР, праводзіць больш выразнае размежаванне. Аўтар адзначыў, што ў 1930-я гады адбыўся радыкальны паварот савецкай партыйнай і дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да заходнебеларускага руху, з-за чаго кардынальна змянілася і раней станоўчая ацэнка іх дзейнасці ў тагачаснай савецкай гістарыяграфіі, якая ўсё больш страчвала навуковы характар. Пры гэтым, нягледзячы на тое, што месцам выдання гэтых брашур пазначалася Вільня, усе яны выдаваліся ў Мінску і прызначаліся выключна для прапагандысцкіх мэтаў [647, с. 10].

Праблемы гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі ўздымаліся ў час навуковых канферэнцый, якія былі прысвечаны гісторыі айчыннай гістарычнай навукі [10; 134; 809]. У матэрыялах канферэнцый змяшчаюцца і гістарыяграфічныя агляды асобных пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі [28; 165–167; 177; 190; 374; 633; 859].

Трэба адзначыць, што ў пералічаных вышэй публікацыях даследчыкі звярнулі ўвагу і на даследаванні польскіх вучоных. Бачыцца перспектыўнай навуковая дзейнасць па стварэнні гістарыяграфічных даследаванняў, прысвечаных адлюстраванню гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў у польскай гістарыяграфіі. Тым больш, што такога кшталту праца была праведзена І.І. Коўкелем [364] , М.Б. Сямёнчыкам [816] і І.Р. Кулевіч [388], а В.А. Матусевіч абараніла кандыдацкую дысертацыю, прадметам якой стала польская гістарыяграфія беларускіх палітычных партый і арганізацый [508].

Такім чынам, беларуская гістарыяграфія мае значную колькасць прац па гістарыяграфіі гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў. Аднак яны не даюць цэласнага ўяўлення аб прадмеце даследавання. У беларускай гістарыяграфіі адсутнічаюць працы, спецыяльна накіраваныя на вывучэнне асноўных пытанняў станаўлення і развіцця гістарыяграфіі гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі перыяду 1921–1939 гадоў. Дадзеная манаграфія, якая выканана на разнастайным коле гістарыяграфічных і гістарычных крыніц, у тым ліку архіўных, дае магчымасць прасачыць станаўленне і развіццё навуковых ведаў па гісторыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў складзе Польшчы ў 1921–1939 гадах.

Названыя публікацыі з’яўляюцца змястоўнымі гістарыяграфічнымі крыніцамі для падрыхтоўкі дадзенага даследавання. У якасці гістарыяграфічных крыніц выступілі і іншыя навуковыя працы па гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў, якія былі падрыхтаваны і апублікаваны на працягу апошніх дзевяноста гадоў – манаграфіі, навуковыя артыкулы, матэрыялы навуковых канферэнцый, аўтарэфераты кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. У дадзенай манаграфіі выкарыстаны

і найбольш значныя для рэканструкцыі працэсу вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі дысертацыйныя даследаванні.

Акрамя гэтага, вялікую цікавасць як крыніцы па гісторыі навукі ўяўляюць зборнікі дакументаў і матэрыялаў, якія непасрэдна і ўскосна раскрываюць і адлюстроўваюць магістральную скіраванасць гістарыяграфіі праблемы на адпаведных этапах яе развіцця. Гэта тычыцца дакументальных, а таксама наратыўных матэрыялаў у выглядзе перапіскі, мемуараў, успамінаў, справаздач як апублікаваных, так і тых, якія знаходзяцца на архіўным захаванні. Аўтар зыходзіць з безумоўнага перакanання, што архіўныя матэрыялы таксама трэба разглядваць як гістарыяграфічныя крыніцы, якія адлюстроўваюць арганізацыйна-метадалагічнае бачанне пэўных гістарычных працэсаў не толькі гісторыкамі-архівістамі, але і прадстаўнікамі дзяржаўнага і партыйнага кіраўніцтва. Апошнія праз адпаведную апрацоўку наяўных дакументаў своеасабліва садзейнічалі фарміраванню архіўных фондаў, спрыялі захаванню суб’ектыўна важных для іх дакументаў і знішчалі матэрыялы, якія змяшчалі непажаданую ці надзвычай канфідэнцыйную інфармацыю. Таму ў манаграфіі выкарыстаны дакументы Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці (ДзАБВ), Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці (ДзАГВ) і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Многія матэрыялы ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.

Метадалагічную аснову даследавання склалі прынцыпы гістарычнага пазнання – гістарызму, аб’ектыўнасці, сістэмнага і каштоўнаснага падыходаў. Яны, як і разнастайныя метады гістарычнай навукі, прымяняліся з улікам спецыфікі гістарыяграфічнага даследавання і былі арыентаваны на асэнсаванне даследуемага прадмета з улікам яго вызначальных паказчыкаў: грамадска-палітычнай сітуацыі і яе ўплыву на фарміраванне гістарыяграфічнай традыцыі асэнсавання заходнебеларускай праблематыкі, актуальнасці і гістарычнага значэння даследуемых пытанняў, арганізацыйна-метадалагічных умоў, стану крыніцазнаўства, дынамікі колькасці і якасці даследаванняў, шырыні тэматычнага дыяпазону, трансфармацыі акцэнтаў і фармулёвак на адпаведных этапах развіцця гістарыяграфіі заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

# Глава 2
# Адлюстраванне нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1920-я – першай палове 1950-х гадоў

## 2.1. Вытокі разгортвання даследаванняў у 1920–1930-я гады. Заходнебеларуская праблематыка ў канцы 1930-х – першай палове 1950-х гадоў

Пасля польска-савецкай вайны Савецкая Расія вымушана была пайсці на падпісанне Рыжскага мірнага дагавору, згодна з якім заходняя частка Беларусі адышла да Польшчы. Рыжскі мір быў адназначна адмоўна ўспрыняты беларускім народам, прадстаўнікамі беларускіх палітычных партый, якія заяўлялі пра свае рашучыя намеры змагацца за яго адмену як несправядлівага, заключанага без удзелу беларусаў. Першая Усебеларуская канферэнцыя (1921 год, Прага) прыняла рэзалюцыю “Аб Рыжскім трактаце”. У ёй гаварылася, што беларускі народ вёў, вядзе і будзе весці змаганне за незалежнасць і непадзельнаць Беларусі. Усе актыўныя беларускія сілы заклікаліся да рашучай рэвалюцыйнай барацьбы супраць падзелу Беларусі, ворагам беларускага народа лічыўся кожны, хто згодзіцца прызнаць Рыжскі трактат. Яго не прызнала і Другая Усебеларуская канферэнцыя, якая адбылася ў кастрычніку 1925 года ў Берліне [543, с. 144–145]. Вядома, што арыентаваныя на незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць беларускія дзеячы рыхтавалі і праводзілі значныя кампаніі палітычнага і нават ваеннага характару, гераічнай старонкай якіх з’яўляецца так званая заходнебеларуская партызанка.

Савецкае кіраўніцтва таксама не магло пагадзіцца з вынікамі польска-савецкай вайны і разглядвала знаходжанне заходняй часткі Беларусі ў складзе Польшчы як часовае становішча. Кіраўнік савецкай дзяржавы У.І. Ленін яшчэ ў кастрычніку 1920 года перспектывы ўз’яднання беларускага народа бачыў у развіцці рэвалюцыйнага руху ў самой Польшчы. “Вырашэнне пытання аб Беларусі, – пісаў ён, – мы прадугледжваем не сілай зброі, а выключна толькі шляхам развіцця барацьбы ўнутры Польшчы” [447, с. 320]. Пасля няўдалага паходу на Варшаву і заключэння Рыжскай дамовы вырашэнне лёсу Заходняй Беларусі звязвалася з развіццём класавай, рэвалюцыйнай нацыянальна-вызваленчай барацьбы, рэалізацыяй на практыцы ідэі сусветнай рэвалюцыі.

Аднак, Савецкая Расія, а потым СССР, якія аб’ядналі агромністыя тэрыторыі былых нацыянальных ускраін, маючы ў сваім распараджэнні магутныя ваенна-палітычныя сродкі, пашырэнне межаў сацыялістычнай дзяржавы, у першую чаргу, меркаваў шляхам ваеннай экспансіі, рыхтуючы пралетарскія рэвалюцыі паўсюдна, дзе можна было адпаведным чынам

разварушыць грамадства. Геаграфічнае становішча Польшчы ставіла яе ў чарзе да рэвалюцыі на першае месца [555]. Да гэтага ж, Польшчу зручна было "варушыць", выкарыстоўваючы праблемы этнічных меншасцей, у тым ліку ў Заходняй Беларусі, дзе набіраў свае імклівыя абароты беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Савецкае ваенна-палітычнае камандаванне заяўляла аб пастаяннай гатоўнасці да паходу на Польшчу, каб вызваліць "сваіх адзінакроўных братоў". Больш таго, падрыхтоўка і ажыццяўленне такіх планаў, ваенна-рэвалюцыйная рыторыка былі значным аргументам у спрэчках за ўладу ў асяродку бальшавіцкага кіраўніцтва [449; 525; 842].

Ідучы па шляху рэалізацыі гэтых планаў, савецкае кіраўніцтва актыўна праводзіла працу па інспірацыі і падтрымцы антыпольскіх настрояў у Заходняй Беларусі. Найбольш яркім прыкладам праяўлення такіх захадаў была арганізацыя партызанскіх груп на тэрыторыі БССР з наступнай перасылкай іх на Заходнюю Беларусь, дзе ўзгаданыя партызанскія фарміраванні абрасталі мясцовым насельніцтвам і дастаўлялі шмат клопату польскім уладам.

Для забеспячэння максімальнага поспеху прадпрымаемых з боку кіраўніцтва СССР і БССР захадаў па развіцці масавага антыпольскага, антыакупацыйнага руху ў Заходняй Беларусі ўзнікала неабходнасць ідэалагічнай падтрымкі ўзгаданых мерапрыемстваў. Найважнейшымі ў гэтым сэнсе былі дзеянні па выкрыванні ў перыядычным друку рознага кшталту мерапрыемстваў польскіх уладаў у Заходняй Беларусі, тым больш, што палітыка Польшчы ў дачыненні да беларусаў на "крэсах" была ў канчатковым выніку скіравана на іх паланізацыю.

Таму ўжо ў пачатку 1920-х гадоў у перыядычным друку, у газетах і часопісах БССР з'явіліся артыкулы, прысвечаныя заходнебеларускай праблематыцы [33; 267–269; 270; 304; 336; 491; 834; 899 і інш]. Аўтары названых прац у сваіх публікацыях уздымалі пытанні знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, давалі ацэнку эканамічнаму і палітычнаму становішчу, якое складвалася ў той час на "крэсах", разглядвалі актуальныя пытанні рэвалюцыйнай барацьбы, задачы, тактыку і лозунгі кампартыі. Акрамя таго, што ўзгаданыя публікацыі разам з рэзалюцыямі партыйных з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК КПП і КПЗБ з'яўляліся кіраўніцтвам да дзеянняў камуністаў, першым марксісцкім асвятленнем тагачаснай гісторыі Польшчы і Заходняй Беларусі, яны вырашалі і чыста ідэалагічныя задачы. Сутнасць гэтых задач была ў тым, каб давесці да ведама шырокай грамадскасці інфармацыю пра тэрор і гвалт польскіх уладаў у дачыненні да мясцовага беларускага жыхарства, а зыходзячы з гэтага даказаць справядлівасць і неабходнасць разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз'яднанне з БССР. Такім чынам, публікацыі ў

перыядычным друку павінны былі садзейнічаць уздыму рэвалюцыйнага руху ў краі, аказаць маральна-палітычную падтрымку яго ўдзельнікам у змаганні з польскім рэжымам.

Але пасля таго, як партызанскі рух у Заходняй Беларусі паступова пайшоў на спад і да канца 1925 года быў згорнуты, спадзяванні на вырашэнне заходнебеларускай праблемы з дапамогай збройнай сілы не апраўдалі сябе. У гэтых умовах узгаданая вышэй публіцыстычная праца не магла задаволіць савецкае кіраўніцтва, якое вельмі ўважліва сачыла за становішчам у Заходняй Беларусі. Для задавальнення такой цікавасці выразна выявілася неабходнасць стварэння ўстаноў, якія б на навуковым узроўні вывучалі і аналізавалі сітуацыю ў Заходняй Беларусі, выказваючы свае абгрунтаваныя думкі. Такімі навуковымі і выдавецкімі цэнтрамі ў 20–30-я гады XX стагоддзя былі Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі (КЗБ), заходні сектар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б (ЗС), Інстытут польскай пралетарскай культуры (ІППК) БАН, а таксама Цэнтральная рэдакцыя КПЗБ.

Вялікая роля ў справе вывучэння і асвятлення ў друку пытанняў гісторыі рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі належыла Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі. Яна была створана ў 1926 годзе пры Прэзідыуме Інстытута беларускай культуры. На КЗБ ускладалася задача аналізу палітычнага і эканамічнага становішча заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы, даследаванне гісторыі “рэвалюцыйнай і вызваленчай барацьбы рабочага класа і працоўнага сялянства, інтэлігенцыі супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту” [86, с. 118]. І.І. Шаўчук наступным чынам дэталяваў пастаўленыя перад КЗБ задачы: даследаваць эканамічную і сацыяльную структуру Заходняй Беларусі, палітычнае жыццё, гэта значыць праграмы, тактыкі, уплывы, структуры варожых (некамуністычных) партый, дзейнасць рэвалюцыйных арганізацый і ў першую чаргу кампартый Польшчы і Заходняй Беларусі; вывучаць Заходнюю Беларусь як плацдарм вайны, якая рыхтуецца польскім імперыялізмам і беларускім нацыянал-фашызмам супраць СССР; весці масавую прапагандысцкую працу. Асаблівае месца займала сувязь камісіі з цэнтрамі беларускай рабочай эміграцыі ў Еўропе і Амерыцы [878, с. 46–47]. Па інфармацыі В.А. Астрогі, КЗБ была створана 28 лютага 1927 года. У першапачатковы яе склад увайшлі У. Ігнатоўскі, А. Сянькевіч, І. Абрамчук [27, с. 156].

Камісія рыхтавала і публікавала рознага кшталту навукова-папулярныя брашуры і прапагандысцкія матэрыялы, выпускала інфармацыйны бюлетэнь. Інфармацыйны бюлетэнь даводзіў да ведама грамадскасці звесткі аб найважнейшых падзеях палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі [127; 798; 835; 838], рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбе супраць польскага

рэжыму, якая праводзілася пад кіраўніцтвам камуністаў, на што акцэнтавалася асаблівая ўвага [18; 601; 696; 811].

Аб першых трох нумарах бюлетэня бібліяграфічных звестак няма. Увогуле, яго назва некалькі разоў мянялася. Так, у 1931–1932 гадах ён называўся "Інфармацыйны бюлетэнь", з 1933 годзе – "Інфармацыйны бюлетэнь аб Заходняй Беларусі", у 1934–1936 гадах ён выходзіў на рускай мове і называўся "Информационный бюллетень. Комиссия по изучению Западной Белоруссии при Академии наук Белорусской ССР". У 1935 і 1936 гадах выйшла ў свет па 12 нумароў бюлетэня [86, с. 119].

За гады свайго існавання КЗБ падрыхтавала і выдала два зборнікі дакументальных матэрыялаў [312; 368], на старонках інфармацыйнага бюлетэнь ажыццяўлялася публікацыя крыніц па гісторыі Заходняй Беларусі, КПЗБ і КСМЗБ [271; 510]. Акрамя гэтага камісія на працягу сваёй дзейнасці выдала шэраг прац у выглядзе асобных брашур і зборнікаў артыкулаў, прысвечаных розным пытанням заходнебеларускай праблематыкі [31; 556; 678; 824].

Аб шырокай тэматычнай скіраванасці камісіі сведчыць тое, што тэматычны план яе навукова-даследчыцкай работы на 1935 год уключаў чатырнаццаць пазіцый. У план былі ўнесены пытанні аб сацыяльна-эканамічнай структуры, становішчы сельскай гаспадаркі і прамысловасці, аграрнай і нацыянальнай палітыцы ў краі. КЗБ працавала над нарысамі гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1917–1934 гады [86, с. 119].

Дзейнасць і лёс камісіі з'яўляюцца вельмі паказальнымі ў адносінах да таго, як вывучэнне і асвятленне пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі знаходзілася ў прамой залежнасці ад зменаў грамадска-палітычнай сітуацыі ў СССР, ад увагі да заходнебеларускай праблематыкі партыйных і дзяржаўных органаў, якія імкнуліся скіраваць распрацоўку ўзгаданых пытанняў для забеспячэння, у першую чаргу, ідэалагічных патрэб. За дзесяць год існавання КЗБ пазнала шмат чыстак і рэарганізацый, якія былі выкліканы рэпрэсіямі ў адносінах да супрацоўнікаў гэтай установы [27].

Значная частка яе супрацоўнікаў трапіла ў лік "ворагаў народа" па сфабрыкаванай справе "Саюз вызвалення Беларусі" ў 1930 годзе. У выніку рэпрэсій камісія апынулася на мяжы знікнення. У гэты час адзіным яе супрацоўнікам быў сакратар Штэйнберг, выпускнік Камуністычнага ўніверсітэта нацыянальных меншасцяў Захаду [612, с. 156].

У гады сусветнага эканамічнага крызісу ў сувязі з абвастрэннем эканамічнай, а ўслед за ёй і грамадска-палітычнай сітуацыі ў Польшчы і Заходняй Беларусі, грамадскасць БССР, па словах М.С. Арэхвы, які ўзначальваў КЗБ увосень 1931 года, праяўляла павышаную цікавасць да Заходняй Беларусі, а сістэматычнай, грунтоўнай інфармацыі не было. Артыкулы, якія паяўляліся час ад часу ў савецкім друку, не задавальнялі

цікавасці грамадскасці. Таму перад супрацоўнікамі камісіі, склад якіх быў значна павялічаны, была пастаўлена задача актывізаваць дзейнасць КЗБ. Як адзначыў далей М.С. Арэхва, ажыццяўленню гэтай задачы ў многім садзейнічаў прэзідэнт Беларускай акадэміі навук П.В. Горын, працай камісіі цікавіўся старшыня СНК БССР М.М. Галадзед [612, с. 156].

Партыйная пастанова восені 1931 года аб мэтазгоднасці далейшай дзейнасці КЗБ зацвярджала яе склад і кіраўніцтва, куды акрамя М.С. Арэхвы (старшыня) уваходзілі Ю. Кавальскі, Л. Родзевіч, Лідзін, М. Блінчыкаў і іншыя. Паводле пастановы штат супрацоўнікаў гэтай навуковай установы мусіў камплектавацца выключна з камуністаў і камсамольцаў. Ставілася канкрэтная задача па найхутчэйшай актывізацыі дзейнасці камісіі ў накірунку “вывучэньня рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы рабочае клясы ды працоўнага сялянства Заходняе Беларусі, аналізу яе палітыка-эканамічнага стану як пляцдарму імпэрыялістычнай агрэсіі на СССР” [27, с. 159–160]. Прыведзеная фармулёўка сведчыць пра відавочную першапачатковую зададзенасць будучых навуковых даследаванняў. Дзейнасць камісіі набыла ярка выражаную ідэалагічную афарбоўку.

У студзені 1932 года ў разгар крызісу ў Польшчы і нарастання хвалі рэвалюцыйных падзей у Заходняй Беларусі новым кіраўніком КЗБ быў прызначаны актыўны ўдзельнік нацыянальна-вызваленчага руху П. Мятла. У той час павялічыўся колькасны склад камісіі. Аднак, летам-восенню таго ж года была арыштавана большасць супрацоўнікаў камісіі: П. Мятла, Л. Бабровіч, Я. Бабровіч, І. Дварчанін, А. Салагуб, Л. Родзевіч і іншыя. Амаль усе яны праходзілі па справе “Беларускага нацыянальнага цэнтра” [652]. Па пытаннях працы ў складзе камісіі ім інкрымінавалася вядзенне ў паўсакрэтнай акадэмічнай установе прапаганды нацыяналізму, кулацкіх і фашыстоўскіх ідэй, іншых контррэвалюцыйных дзеянняў [27, с. 161–162].

У 1933 годзе камісіі нададзены статус аддзела ЦК КП(б)Б і яго кіраўніцтва зрабіла актыўныя захады з мэтай стымулявання працы ўстановы. Пры КЗБ быў створаны літоўскі сектар для вывучэння становішча літоўскага народа ў Польшчы. Але з цягам часу выявілася, што “не абарона нацыянальных інтарэсаў беларусаў, і нават не навука ставіліся прыярытэтнымі” ў дзейнасці камісіі. На думку яе кіраўніцтва, пры вывучэнні Заходняй Беларусі камісія павінна была мець на ўвазе:

1. Чырвоную Армію, маючую патрэбу ў дакладных зьвестках пра стан чыгункі, тэлеграфнай і тэлефоннай сувязі, пра гаспадарчыя рэсурсы краіны, пра стан прамысловасьці і г.д.

2. Дзяржпалітупраўленне (ДПУ), якое для барацьбы з контрарэвалюцыяй мусіць добра ведаць клясавага ворага.

3. Праца Камісіі можа аказаць вялікую дапамогу ў справе ўмацавання інтэрнацыянальнага выхавання рабочых і калгасьнікаў.

4. Вынікі дасьледаваньняў будуць карысныя для братніх камуністычных партыяў [27, с. 163–164].

Па інфармацыі І.І. Шаўчука, яшчэ ў пачатку 1935 года дырэктар камісіі Л. Янкоўская адчувала сябе настолькі ўпэўнена, што пры дапамозе П. Горына звярталася да першага сакратара ЦК КПБ з прапановай далучыць да КЗБ Заходні сектар Інстытута гісторыі партыі. Але ў гэты час мяняюцца асноўныя напрамкі не толькі ўнутранай, але і знешняй палітыкі СССР. Пачынаюцца рэпрэсіўныя дзеянні Камінтэрна ў дачыненні да КПП і КПЗБ, хаця ў адносінах да дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі яны мелі месца яшчэ раней – у 1933 годзе (справа Беларускага нацыянальнага цэнтра). Палітыка-ідэалагічныя, прапагандысцкія, эканамічныя і сацыялагічныя напрацоўкі работнікаў КЗБ становяцца непатрэбнымі. Гэта, на думку І.І. Шаўчука, і абумовіла яе ліквідацыю.

21 мая 1936 года пастановай Бюро ЦК КП(б)Б Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі была зліквідавана як самастойная структура. Тэматыка і штат супрацоўнікаў былі перададзены Інстытуту гісторыі Беларускай Акадэміі навук, дзе была створана секцыя па вывучэнні Заходняй Беларусі (СЗБ). Але надышоўшы трагічны для ўсяго беларускага народа 1937 год быў апошнім, калі існавала асобная навуковая структура, якая непасрэдна займалася вывучэннем гісторыі Заходняй Беларусі: рашэннем Прэзідыума АН БССР 13 мая 1937 года СЗБ была ліквідаваная і “функцыі яе працы” (на рабоце пакінуты адзін чалавек і шэсць звольнены) перададзены секцыі гісторыі Захаду Інстытута гісторыі [878, с. 47].

Своеасаблівы вынік працы КЗБ быў падведзены ў студзені 1938 годзе спецыяльнай камісіяй, якая правярала дзейнасць Акадэміі навук. У справаздачы гэтай камісіі гаварылася: “Асабліва вялікая шпіёнская праца праводзілася праз г. зв. Камісію па вывучэнні Заходняе Беларусі. …Яны (ворагі народу) цалкам запоўнілі склад Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі, якая ў адзін час лічылася на становішчы аддзела ЦК КП(б) [675, с. 70]. Акрамя гэтага, было прызнана, што “прадукцыя камісіі… павінна быць забрана як контрарэвалюцыйная” [27, с. 166].

Такім чынам, на лёс Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі трагічна паўплывалі палітычныя працэсы супраць беларускай навуковай інтэлігенцыі і палітычная лінія савецкага кіраўніцтва на ліквідацыю КПП, КПЗБ, фізічнае знішчэнне іх кіраўнікоў. З-за гэтага праца КЗБ па даследаванні пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі і публікацыі ў друку матэрыялаў, прысвечаных заходнебеларускай праблематыцы, была прызнана шкоднай і, больш таго, варожай.

Другім важным цэнтрам вывучэння праблем рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, КПЗБ і КСМЗБ з'яўляўся Сектар гісторыі рэвалюцыйнага руху на Захадзе (заходні сектар, ЗС) Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б. Створаны ён быў у красавіку 1931 года ўжо пасля таго, як па Беларусі пракацілася першая хваля палітычных рэпрэсій, звязаных са справай "Саюза вызвалення Беларусі". Можна выказаць меркаванне, што стварэнне гэтай навуковай структуры павінна было стаць надзейнай падпоркай савецкай ідэалагічнай машыне, якая пачала даваць збоі на ідэалагічным фронце барацьбы за Заходнюю Беларусь.

Што тычыцца дакладнай даты адкрыцця навукова-даследчыцкіх устаноў, то ў гэтай справе ёсць розначытанні, якія маюць пад сабой метадалагічныя падставы і палягаюць у розніцы разумення пачатку гісторыі той ці іншай установы: яна бярэ сваё жыццё ад пастаноў ЦК КП(б)Б ці Прэзідыўма БелАН, зацвярджэння яе статута, афіцыйнага і ўрачыстага адкрыцця і г.д. Пры гэтым трэба адзначыць, што айчынная гістарычная навука намаганнямі сучасных даследчыкаў стварае важкія падставы для паспяховага вырашэння акрэсленых праблем. У якасці прыкладу можна прывесці вызначэнне часу адкрыцця Інстытута гісторыі партыі І.І. Шаўчуком, які абапіраецца на шырокае кола разнастайных архіўных матэрыялаў. Даследчык, адзначаючы адсутнасць адзінага пункту погляду на гэтае пытанне, спаслаўся на меркаванне У.М. Міхнюка, які ўслед за В. Сярбентам лічыў, што Інстытут гісторыі партыі пачаў сваё існаванне з 1 кастрычніка 1929 года, такой самай пазіцыі прытрымліваюцца Р. Лінднэр і Р. Платонаў. І.І. Шаўчук на падставе выяўленага ім архіўнага дакумента канстатуе, што "...з лістапада 1929 г. на падставе пастановы ЦК КП(б)Б і дырэкцыі Інстытута Леніна Гістпарт Беларусі быў рэарганізаваны ў інстытут". У дакуменце ўтрымліваецца просьба беларускага ЦК да сакратарыяту ЦК ВКП(б) "зацвердзіць ІГП, таму што незацвярджэнне азначала бы... аслабленне барацьбы на фронце гісторыі партыі... а таксама патрабавала бы заснавання асобнай арганізацыі для... выдання сачыненняў Леніна". Даследчык лічыць магчымым зрабіць выснову, што такое зацвярджэнне адбылося 21 жніўня 1930 года, хаця яшчэ ў кастрычніку 1930 года новы дырэктар ІГПРР В. Сярбента інфармаваў Інстытут Леніна аб магчымым зацвярджэнні канчатковага палажэння аб інстытуце не раней як праз месяц [879, с. 77].

Супрацоўнікі заходняга сектара працавалі над даследаваннем праблем партызанскага, рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, займаліся збіраннем успамінаў удзельнікаў і кіраўнікоў партыйнага падполля. Сектар рыхтаваў для выдання на польскай мове зборнік "Кампартыя Польшчы ў матэрыялах і дакументах (1918–1925 гг.)", тры тамы "КПЗБ у рэзалюцыях", хрэстаматыю па

гісторыі рэвалюцыйнага руху і хроніку важнейшых падзей барацьбы сялян і рабочых Заходняй Беларусі супраць капіталістаў і памешчыкаў. Была закончана работа над кнігай “Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя і сэцэсія”. Рыхтаваліся брашура аб Грамадзе, зборнік дакументаў і ўспамінаў аб КСМЗБ. Было пастаўлена пытанне аб падрыхтоўцы і выданні кнігі В.С. Міцкявічуса-Капсукаса “Нарысы рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі і Літве” [86, с. 119–120]. Але ў сувязі з пагаршэннем палітычнай абстаноўкі ў БССР здзейсніцца гэтым планам было немагчыма.

Пры заходнім сектары дзейнічала гісторыка-рэвалюцыйная камісія, якая займалася разглядам і распрацоўкай прынцыповых пытанняў гісторыі партыі і рэвалюцыйнага руху, якія распрацоўваліся сектарам і Камісіяй па вывучэнні Заходняй Беларусі. Сектар падтрымліваў творчыя сувязі з польскай групай Інстытута Леніна пры ЦК УКП(б), з сектарам і камісіяй па вывучэнні Заходняй Украіны, якія дзейнічалі ў складзе Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)У і АН УССР, а таксама з камісіяй па вывучэнні Заходняй Беларусі. Сектар сабраў значны архіў па гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. У 1936 годзе 597 спраў былі перададзены польскай секцыі Выканкама Камінтэрна і 599 здадзены ў партархіў ЦК КП(б)Б [86, с. 120]. Але, на жаль, з-за неспрыяльнай палітычнай сітуацыі ў краіне гэтыя дакументы не маглі быць даступнымі для далейшай навуковай апрацоўкі і засталіся нявыкарыстанымі. І толькі з другой паловы 1950-х гадоў матэрыялы сталі значнай перадумовай актыўнага вывучэння пытанняў Заходняй Беларусі, КПЗБ і КСМЗБ.

Што тычыцца далейшага лёсу заходняга сектара, то згодна з партыйным рашэннем ад 16 ліпеня 1938 года сам Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б быў ліквідаваны і 21 жніўня 1938 года спыніў сваю дзейнасць [675]. І.І. Шаўчук лічыць магчымым канстатаваць, што ўжо нават на пачатку, не гаворачы пра сярэдзіну-канец, 1937 года гістпарт ЦК КП(б)Б спыніў існаванне як дзеяздольная навукова-даследчая ўстанова. Даследчык не лічыць такое становішча выключэннем з правілаў тагачаснага жыцця, спасылаючыся на ліст дырэктара Інстытут Маркса – Энгельса – Леніна У. Адарацкага, атрыманы ЦК КП(б)Б 10 чэрвеня 1938 года У ім названы асноўныя прэтэнзіі да дзейнасці гістпартаў, на падставе якіх У. Адарацкі канстатаваў няздольнасць “мясцовых гістпартаў” апраўдваць сваё існаванне і прадстаўленых ім вялізарных сродкаў. У сваю чаргу в.а. дырэктара інстытута Я. Пузыроў і загадчык аддзела агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б у запісцы на імя першага сакратара П. Панамарэнкі выказалі згоду з пазіцыяй У. Адарацкага: у інстытуце ёсць толькі 2 навуковыя супрацоўнікі, патрэбна 18, у тым ліку 2 загадчыкі сектараў і г.д., таму: “...трэба пагадзіцца з прапановай дырэкцыі ІМЭЛ пра ліквідацыю ІГП пры ЦК КП(б)Б”. Выказаныя

меркаванні знайшлі падтрымку ў ЦК. Яго бюро 20 ліпеня 1938 года пастанавіла закрыць ІГПКР, які спыніў сваю працу са жніўня [879, с. 81].

Акрамя названых вышэй навуковых установ вывучэнне пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі праводзіў і Інстытут польскай пралетарскай культуры (ІППК), які меў сваю перадгісторыю ў выглядзе заснаванага яшчэ 30 сакавіка 1925 года Польскага аддзела ў складзе Інбелкульта, а з 1926 года – польскага сектара. Агульным напрамкам дзейнасці былі даследаванне польскай культуры на Беларусі, але не выключалася і праца над праблемамі агульнапольскага характару, у тым ліку і над заходнебеларускай праблематыкай. Непасрэдна пытаннямі гісторыі займалася гістарычная камісія (Я. Віткоўскі, С. Гельтман, Б. Вансоўскі, Б. Будкевіч і інш.). Пасля пераўтварэння Інбелкульта ў Беларускую Акадэмію навук 15 кастрычніка 1929 года Прэзідыум Акадэміі прыняў рашэнне аб арганізацыі Інстытута гістарычных навук, у склад якога ўвайшла і гістарычная камісія Польскага аддзела. Сам аддзел пачаў называцца польскім сектарам БАН (ПС).

Па меркаваннні В.А. Астрогі, у 1931 годзе польскі сектар быў ператвораны ў Інстытут польскай пралетарскай культуры з гістарычнай камісіяй. Аднак тут неабходна спаслацца на даследаванне І.І. Шаўчука, які аргументавана сцвярджае, што арганізацыю нацыянальных інстытутаў у складзе Беларускай акадэміі навук, у тым ліку польскага, трэба аднесці да восені 1932 года [879, с. 72]. Найбольш актыўнымі прадстаўнікамі гістарычнай камісіі ІППК у 1931–1935 гады былі Я. Віткоўскі, В. Фрышман, В. Карніенка, Я. Бабровіч і іншыя. Летам 1935 года нацыянальныя інстытуты АН аб’ядналіся ў адзіны Інстытут пралетарскай культуры нацыянальных меншасцяў (ІПКНМ) з яўрэйскай, польскай, латышскай і літоўскай секцыямі. Адсутнасць кваліфікаваных работнікаў у польскай секцыі звужала яе магчымасці для паўнавартаснай працы. У 1936 годзе пасля чарговай рэарганізацыі, у выніку якіх ІПКНМ спыніў сваю дзейнасць, яго гістарычныя камісіі ўвайшлі ў склад Інстытута гісторыі АН БССР. Польская секцыя ўвайшла ў склад секцыі гісторыі Захаду. Але і гэтыя мерапрыемствы не змаглі надаць імпульсу ў разгортванні навуковых даследаванняў і прыблізна да 1938 года сама секцыя гісторыі Захаду спыніла свае існаванне [23, с. 254–255].

Такім чынам, Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі і заходні сектар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б праводзілі пэўную працу па вывучэнні і асвятленні ў друку пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі. Аднак дзейнасць гэтых устаноў была таксама карысна ДПУ-НКУС і яе рэзідэнцыям, што дзейнічалі на Заходняй Беларусі. А. Бергман сцвярджала, што Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б з’яўлялася падраздзяленнем ДПУ-НКУС [41]. Паводле ж Р.І. Налівайкі, “прадстаўніцтва

непасрэдна кіравала… школай КПЗБ і часткай Цэнтральнай рэдакцыі… накіроўвала дзейнасць камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Акадэміі навук БССР і заходняга сектара Гістпарта” [558, с. 91]. Не дзіўна, што “патрэбная інфармацыя, якая паступала ў аддзел вайсковай выведкі Дзяржпалітупраўленьня, павінна была дапамагчы зарыентавацца ў грамадзкім ды палітычным жыцьці суседняе краіны, дасканала ведаць заходнебеларускую спэцыфіку. Бо тое, пра што хлусілі маскоўскія ды менскія газэты пра быццам бы надыходзячую ў Польшчы пралетарскую рэвалюцыю, зусім не адпавядала рэчаіснасьці. Каб весьці эфэктыўную шпіёнскую ды падрыўную дзейнасьць на ”крэсах”, неабходна была дакладная аналітычная інфармацыя” [27, с. 164]. Аднак, нягледзячы на тое, што названыя ўстановы досыць уважліва ставіліся да адпаведных запытаў з боку бальшавіцкага кіраўніцтва, іх дзейнасць не атрымала прызнанне савецкіх уладных структур.

У дадзеным выпадку маем нагоду для выказвання згоды з нямецкім даследчыкам беларускай гістарыяграфіі Р. Ліндэрам, які выказаў слушную думку: “Гісторыя беларускай гістарыяграфіі ў Савецкім Саюзе эпохі Сталіна была гісторыяй яе ліквідацыі. Ні беларусізацыя з “коренизацией”, ні пастаяннае пашырэнне яе інстытуцыйных асноў не маглі прадухіліць гэтага. Індывідуальныя біяграфіі гісторыкаў сведчаць, што партыя ні на хвілю не паслабляла цугляў і не ішла на палітычныя саступкі беларускім гісторыкам з-за іхнай беларускасці” [450]. Гэтаксама будзе дарэчы ўзгадаць меркаванне І.І. Шаўчука адносна ўздзеяння на функцыянаванне навуковых устаноў з боку савецкай нацыянальнай палітыкі. Разглядаючы функцыянаванне нацыянальных навуковых структурных падраздзяленняў у складзе акадэмічнай навукі, аўтар падкрэсліваў палітычную матывацыю іх стварэння. Сапраўды, аналізуючы грамадска-палітычныя падзеі ў БССР, нельга не прыйсці да высноў пра відавочнае жаданне партыйных і навуковых дзеячаў небеларускага паходжання абмежаваць і звузіць рэальныя магчымасці беларусізацыі навукі ў БССР. І.І. Шаўчук лічыць, што пік росквіту самастойнай арганізацыйнай навуковай працы прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў рэспублікі ў сістэме БелАН абумоўліваўся першым масавым пагромам беларускага нацыянал-дэмакратызму (СВБ). Магчыма як сродак працідзеяння менавіта яму павышаўся статус нацыянальных сектараў да ўзроўню інстытутаў. Але такому росквіту не наканавана было доўжыцца працяглы час [879, с. 72–73].

Нельга пакінуць па-за ўвагай выдавецкую дзейнасць Цэнтральнай рэдакцыі КПЗБ, якая была створана пры ЦК КПЗБ у канцы 1923 года. Яна збірала і рыхтавала да выдання партыйную і камсамольскую, масавую і прапагандысцкую падпольную літаратуру. Цэнтральная рэдакцыя была

звязана, з аднаго боку, з сакратарыятам ЦК КПЗБ як дырэктыўным органам, а з другога – з Цэнтральнай тэхнікай, якая займалася стварэннем падпольных друкарняў, выданнем і распаўсюджваннем нелегальнага камуністычнага друку. Сувязь з краявым сакратарыятам ЦК КПЗБ выражалася ў тым, што па меры патрэбнасці сувязныя сакратарыята дастаўлялі рэдакцыі матэрыялы для выкарыстання ў друку. Члены сакратарыята пастаянна сачылі за зместам выданняў, сустракаліся з супрацоўнікамі Цэнтральнай рэдакцыі для больш дэталёвага абмеркавання яе задач. Рэдакцыя атрымлівала ад сакратарыята справаздачы і інфармацыю акружкамаў. Акрамя таго, яе работнікі сустракаліся з работнікамі аддзелаў ЦК, інструктарамі, сакратарамі акружкамаў, з кіраўнікамі камсамола як для абмеркавання рэдакцыйных матэрыялаў, так і для атрымання падрабязнай інфармацыі аб становішчы на месцах.

Ва ўмовах нелегальнай працы сувязь Цэнтральнай рэдакцыі з Цэнтральнай тэхнікай ажыццяўлялася праз спецыяльных сувязных, якія атрымлівалі падрыхтаваныя да друку матэрыялы і перадавалі іх у падпольныя друкарні. Пад час гэтых сустрэч работнікі рэдакцыі атрымлівалі ад сувязных экземпляры надрукаваных выданняў. У мэтах канспірацыі толькі ў асобных выпадках прадстаўнікам рэдакцыі дазвалялася сустракацца з кіраўнікамі Цэнтральнай тэхнікі.

Па меркаванні П.І. Зялінскага і М.А. Ракевіча, Цэнтральная рэдакцыя была ўкамплектавана даволі падрыхтаванымі кадрамі. У ёй працавалі ў розныя часы: Р.С. Каган (“Роза”, “Наста”), Д.І. Розеншэйн (“Віктар”, “Белавежац”, “Вінчук”), М.А. Блінчыкаў (“Якаўлеў”), А.А. Альшэўскі (“Юрка”), А.І. Цукерман (“Зоркі”, “Зарэцкі”). Доўгі час працавалі ў Цэнтральнай рэдакцыі Л.І. Родзевіч (“Анатоль”, “Васіль”, “А.Сталевіч”), С.Я. Будзінскі (“Традыцыя”, “Стах”, “С.Б.Т.”), якія з’яўляліся аўтарамі многіх палемічных, прапагандысцкіх артыкулаў і матэрыялаў [291, с. 10–11].

У падпольных выданнях КПЗБ, акрамя супрацоўнікаў рэдакцыі, выступалі кіруючыя дзеячы партыі і камсамолу: І.К. Лагіновіч (“Корчык”, “Паўлючонак” і іншыя псеўданімы), М.С. Арэхва (“Пётр”, “Барысевіч” і інш.), В.З. Харужая (“Вера”, “Шыпшына” і інш.), К.І. Асіпік (“Даніла” і інш.), А.М. Розеншайн (“Роберт”, “Максімоўскі”), С.Ц. Міллер (“Партыец”, “Рабочы” і інш.), М.С. Майскі (“Бенэк”), Х.Р. Геллер (“Косця”), Г. Дуа (“Гершон”, “Боген”) і іншыя. Былі сярод іх людзі з немалым журналісцкім вопытам працы як у легальнай, так і ў нелегальнай прэсе. Выступалі ў друку таксама сакратары акружкамаў і іншыя актывісты партыі і камсамолу [291, с. 12].

Цэнтральная рэдакцыя ЦК КПЗБ складалася з краявой рэдакцыі, якая знаходзілася ў падполлі ў Вільні, Беластоку ці Варшаве, а таксама з рэдакцыі пры прадстаўніцтвае ЦК КПЗБ у Мінску (замежная рэдакцыя).

Замежная рэдакцыя КПЗБ адыгрывала вялікую ролю ў асвятленні актуальных праблем рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Прадукцыя замежнай рэдакцыі, як і ўвесь друк КПЗБ, мела пераважна агітацыйны і прапагандысцкі характар. Яе супрацоўнікамі былі ў асноўным актыўныя ўдзельнікі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Напрыклад, у пачатку 1930-х гадоў у склад рэдакцыі ўваходзілі Л. Родзевіч (кіраўнік), А. Альшэўскі, С. Будзінскі, Р. Каган, П. Клінцэвіч, Е. Камянецкі, В. Таўлай, М. Арэхва. Калектыў, абмяркоўваючы тэарытычныя пытанні, рыхтаваў да друку часопісы, газеты, брашуры, улёткі. У іх асвятляліся найбольш значныя падзеі рэвалюцыйнай барацьбы, тактыка і лозунгі КПЗБ, аўтары выступалі супраць увядзення надзвычайных судоў, выкрывалі "антысавецкія ваенныя прыгатаванні", тлумачылі сутнасць калектывізацыі сялянскіх гаспадарак, якая праводзілася ў БССР. Рэдакцыя выдала на польскай і беларускай мовах брашуры "За ленинскую линию", "Боевой отпор карательным экспедициям", "Не платите ни гроша налогов фашистскому правительству", "Правда о Центролеве", "Облик вождей ППС и их сообщников на Брестском процессе", якія былі адрасаваны жыхарам Заходняй Беларусі [612, с. 153].

Падзеі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі атрымалі ў 1920–1930-я гады адлюстраванне ў шматлікіх перыядычных выданнях КПП, КПЗБ, БСРГ, арганізацыі "Змаганне" і Таварыства беларускай школы [152; 153; 291]. Некаторую выдавецкую дзейнасць па асвятленні пытанняў заходнебеларускай праблематыкі праводзіла выдавецтва МАДРа [789; 877].

Адлюстраванне пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі ў прапагандысцка-агітацыйным рэчышчы праводзіў часопіс "Бальшавік Беларусі". На яго старонках у 1920–1930-я гады надрукавана вялікая колькасць артыкулаў, прысвечаных пытанням эканамічнага і палітычнага становішча ў Заходняй Беларусі [791; 792; 819; 882], унутрыпартыйнага жыцця КПЗБ, яе ўдзелу і ролі ў рэвалюцыйным руху [2; 277; 360–362; 509; 689: 790; 791].

Адметнай з'явай грамадска-палітычнага жыцця савецкага грамадства ў пачатку 1930-х гадоў сталі апублікаваныя ў Маскве лісты з польскай турмы В.З. Харужай [672; 726], якія атрымалі шырокія водгукі і ўрачыста-хвалебныя рэцэнзіі, у тым ліку ад Н.К. Крупскай [379].

Трэба адзначыць, што намаганнямі даследчыкаў 1920-х – пачатку 1930-х гадоў, якія відавочна былі супрацоўнікамі КЗБ, Заходняга сектара і замежнай рэдакцыі КПЗБ, была створана вялікая колькасць прадукцыі навукова-даследчыцкага характару ў выглядзе аналітычных запісак, абагульняльных матэрыялаў да пасяджэнняў розных партыйных і дзяржаўных органаў БССР, КПЗБ, КПП. Некаторыя з іх уяўляюць сабой

шматстаронкавыя даведнікі, якія змяшчаюць інфармацыю аб тэрыторыі і насельніцтве Заходняй Беларусі, сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных, рэлігійна-канфесійных асаблівасцях краю. Так, у прыватнасці, такога кшталту даследаванне "Інфармацыя ЦК Кампартыі Заходняй Беларусі аб аграрным пытанні ў Заходняй Беларусі, аб стане ў вёсцы і задачах партыі, аб беларускай рабоча-сялянскай грамадзе і інш." захоўваецца ў выглядзе аднайменнай справы ў НАРБ і фактычна ўяўляе сабой своеасаблівую абагульняльную працу па гісторыі Заходняй Беларусі [585]. Аналагічны матэрыял пад назвай "Матэрыялы па аграрным пытанні і статыстыцы Заходняй Беларусі" знаходзіцца ў іншым вопісе таго ж фонду і змяшчаецца ў асобнай справе [562]. Гэтыя матэрыялы ўтрымліваюць, апрача іншых, працу Р. Паўстынскага "Статыстыка Заходняй Беларусі", на якую як на аўтарытэтнае даследаванне пры вызначэнні тэрыторыі і насельніцтва Заходняй Беларусі спасылаліся беларускія даследчыкі, у прыватнасці У.Ф. Ладысеў [412, с. 166] і В.Э. Рабышка (яе крыніца знаходзіцца ў НАРБ. – Воп. 1. – Спр. 117, дзе відавочна захоўваецца адна з машынапісных копій) [698, с. 4]. Такога кшталту інфармацыя ўяўляе вялікую цікавасць, яна адлюстроўвае салідны ўзровень распрацоўкі адпаведных пытанняў Заходняй Беларусі, праведзены з выкарыстаннем разнастайных дакументальных крыніц у выглядзе пастаноў, справаздач, пратаколаў, улётак, фінансавых і іншых дакументаў, у тым ліку якія праходзілі па разнастайных дзяржаўных і партыйных інстанцыях і сфарміравалі адпаведныя архіўныя фонды, напрыклад, фонд 242п НАРБ – Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б. Трэба адзначыць, што матэрыялы гэтай установы былі каштоўнай крыніцай для выпрацоўкі і карэкціроўкі камінтэрнаўскім кіраўніцтвам курса палітычных кампаній у Заходняй Беларусі. Але разам з гэтым яны ўтрымлівалі і непрыемныя для камуністаў звесткі пра тэндэнцыі стабілізацыі сацыяльна-эканамічнага жыцця ў Заходняй Беларусі, несуцяшальную інфармацыю аб нездавальняючым стане партыйнага жыцця КПЗБ, адыходзе насельніцтва ад актыўнага супрацьстаяння мерапрыемствам польскай улады, пасіўнасці, раўнадушшы рабочых і сялян у дачыненні да заклікаў кампартыі. Аднак такога кшталту інфармацыя "для ўнутранага карыстання" не агучвалася на старонках выданняў, бо разбурала б штучна створаныя для ўкаранення патрэбных ідэалагем вобразы заходнебеларускай рэчаіснасці.

Неабходна адзначыць, што выданні БССР, а таксама камуністычнага друку Заходняй Беларусі, адрозніваліся своеасаблівасцю крыніцавага забеспячэння. Акрамя названых крыніц Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ, інфармацыя чэрпалася з матэрыялаў НКУС, якія здабываліся ў выніку спецаперацый і ў час допытаў з прымяненнем фізічнага ўздзеяння. Як паведаміў падманам вывезены ў СССР, арыштаваны і сасланы на Салаўкі

П. Каруза, у час допытаў следчыя патрабавалі ад яго ўласнаручных сведчанняў, якія “будуць выдадзены асобнай брашурай і змогуць дыскрэдытаваць сярод насельніцтва Ярэміча, Станкевіча і іншых” [609; 794, с. 1017–1018]. Рашэнне пра фінансаванне выдаткаў на падрыхтоўку і выданне кніг прымалася на дзяржаўным узроўні. Напрыклад, СНК БССР у кастрычніку 1926 года пастанавіў выдаць з рэзервовага фонду 10 500 руб. на забеспячэнне падрыхтоўкі да друку кніг “Заходняя Беларусь” і “Збор Інтэрпэляцыяў” [692, с. 69].

Асаблівасцю ідэйна-палітычнага зместу, сацыяльна-эканамічнай накіраванасці ад вышэйзгаданых адрозніваюцца выданні дзеячаў беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, якія былі апанентамі пракамуністычных арганізацый і праз публікацыі ажыццяўлялі прапаганду беларускіх нацыянальна-дзяржаўных і культурных каштоўнасцей, на іх падставе праводзілі працу сярод беларускага насельніцтва. Навукова-публіцыстычныя працы А. Луцкевіча, А. Станкевіча, В. Гадлеўскага і іншых дзеячаў беларускага руху, неангажаванага камінтэрнаўскімі сіламі, адлюстроўвалі памкненні адпаведных грамадска-палітычных колаў. У вострых дыскусіях на старонках заходнебеларускай перыёдыкі палітыкі адстойвалі партыйныя і асабістыя інтарэсы [112–114; 475–479; 481–484; 793–796]. Бадай што найбольшай увагі заслугоўваюць нататкі А. Луцкевіча і А. Станкевіча, у працах якіх адлюстраваны важнейшыя падзеі нацыянальнага беларускага руху, пазіцыі і паводзіны яго правадыроў, пададзена іх ацэнка. Большай аб’ектыўнасцю поглядаў на нацыянальна-вызваленчы рух і ўвогуле гісторыю Беларусі выдзялялася праца беларускага нацыянальнага дзеяча Я. Найдзюка, які ў 1940 годзе выдаў лацінскім шрыфтам першае, а ў 1944 годзе – другое выданне “Беларусь учора і сяньня” [557].

Аднак неабходна адзначыць, што прыведзеныя публікацыі як савецкіх, так і прадстаўнікоў нацыянальна-дэмакратычнай плыні не мелі выключна навуковага характару. Яны, з’яўляючыся рэалізатарамі сваіх уласных поглядаў і праваднікамі поглядаў адпаведных партыйных, грамадскіх арганізацый на падзеі жыцця ў Заходняй Беларусі, утрымлівалі шматлікія суб’ектыўныя ацэнкі і сёння ўяўляюць цікавасць як крыніцы.

Такім чынам, нягледзячы на недахоп кваліфікаваных кадраў, абмежаваныя магчымасці выкарыстання архіўных крыніц і на палітычныя ўплывы, супрацоўнікі навукова-выдавецкіх цэнтраў, партыйныя работнікі, актыўныя ўдзельнікі рэвалюцыйнага руху падрыхтавалі значную колькасць публікацый. Яны напісаны галоўным чынам на фактах, якія давала само жыццё і якія былі зафіксаваны перыядычным друкам. І таму асвятленне гісторыі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, КПЗБ і КСМЗБ, масавых грамадскіх арганізацый у

значнай меры было фрагментарным. Для работ 1920–1930-х гадоў характэрна больш эмпірычнае апісанне падзей, чым іх глыбокі навуковы аналіз [86, с. 125]. Але гэтыя артыкулы, брашуры, манаграфіі, падрыхтаваныя на небагатай крыніцазнаўчай базе, пазначылі галоўныя напрамкі даследавання праблем і ў цэлым раставілі навуковыя і палітычныя акцэнты згодна марксісцка-ленінскіх падыходаў пры асвятленні гістарычных з'яў. Разам з тым у работах, напісаных па гарачых слядах, пад дыктоўку тагачасных ідэалагічных і палітычных задач, падзеі нацыянальна-вызваленчага руху ацэньваліся тэндэнцыйна з улікам іх карысці камуністычнаму руху, а фактычна бальшавіцкаму кіраўніцтву. У іх знайшлі адлюстраванне асобныя памылковыя погляды і вывады, якія былі тады ў КПЗБ, КПП і Камінтэрне, перабольшвалася правая небяспека ў кампартыі, сцвярджалася, што г. зв. буржуазныя нацыяналісты – галоўныя ворагі працоўных у барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, пераацэньвалася рэвалюцыйнасць мас на пэўных этапах барацьбы і інш.

Што тычыцца абмежаваных магчымасцей выкарыстання архіўных крыніц, то трэба адзначыць, што беларускія савецкія гісторыкі, якія даследавалі заходнебеларускую праблематыку, мелі доступ да разнастайных дакументаў. У прыватнасці, В. Шэваховіч у сваёй працы "Беларуская "рэвалюцыйная" арганізацыя і контррэвалюцыйная "сецэсія", напісанай у сярэдзіне 1930-х гадоў і прызнанай у той час шкоднай, "шырока выкарыстоўваў архіўныя дакументы, успаміны ўдзельнікаў, паведамленні тагачаснай прэсы… многія "ідэалагічна шкодныя" крыніцы ім не проста пераказваліся, але нават цытаваліся [659, с. 60]. Разнастайнымі дакументальнымі матэрыяламі з архіва Прадстаўніцтва КПЗБ, якое кантралявала КЗБ і Заходні сектар, напэўна карысталіся супрацоўнікі названых устаноў, іх працы потым друкавалі ў выглядзе брашур, на старонках перыядычных выданняў, у тым ліку падпольных. Іншая справа, што не заўсёды магчыма было дакументальна сцвердзіць патрэбныя тэзісы, бо яны разыходзіліся з канкрэтнай сітуацыяй у Заходняй Беларусі і практыкай паўсядзённай працы КПЗБ і падкантрольных ёй арганізацый. Таму публікацыі падганяліся пад палітычныя лозунгі і кампаніі камуністаў, грунтаваліся на афіцыйных дакументах КПЗБ у выглядзе пастановаў, рэзалюцый, адозваў, якія змяняліся і патрабавалі дадатковых удакладненняў і тлумачэнняў. Гэта прыводзіла да рэвізіі наяўнай друкаванай прадукцыі, у тым ліку яе знішчэння.

Савецкая партыйна-ідэалагічная машына час ад часу выносіла катэгарычны прысуд публікацыям, якія гублялі сваю каштоўнасць з-за недапушчальных фармулёвак ці асобы аўтараў, якія ў выніку палітычных працэсаў і рэпрэсій станавіліся "ворагамі народа". Так, напрыклад, паводле загаду Галоўліту БССР ад 3 чэрвеня 1937 года сярод іншых, прызначаных

да спальвання выданняў, былі ўсе кнігі Ф. Аляхновіча, Р. Астроўскага, У. Ігнатоўскага, А. Смоліча, І. Некрашэвіча, а таксама Я. Багданскага і Л. Бабровіча “Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады”. (Менск: Беларуская Акадэмія навук, камісія Заход. Беларусі, 1932), П. Гарбацэвіча “Паланізацыя Заходняй Беларусі”. (Менск, 1932), П. Мятлы “Аб Таварыстве беларускае школы і яго барацьбе.” (Менск: Беларуская Акадэмія навук, камісія па вывучэнні Заходняе Беларусі, 1932), А. Сталевіча “Беларускі нацыянал-фашызм. Яго вытокі, тэорыя і практыка”. (Менск: Бел. дзярж. выд-ва, 1930) і інш. [474].

Вялікая Айчынная вайна запаволіла развіццё гістарычнай навукі БССР, у тым ліку і навуковую распрацоўку розных аспектаў гісторыі Заходняй Беларусі. З сярэдзіны 1940-х гадоў у перыядычным друку пачалі з’яўляцца артыкулы пераважна агітацыйна-прапагандысцкага-характару [164; 328; 662]. Галоўнай іх мэтай было відавочнае імкненне падкрэсліць гаротнае жыццё беларускага народа ў складзе Польшчы, ухваліць паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, а таксама поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ва ўз’яднанай Беларусі.

Выніковасць пры асвятленні пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў прадэманстраваў у 1940-я гады Ц.С. Гарбуноў, які у 1948 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю [255, с. 77] і апублікаваў шэраг сваіх прац [119–122; 163]. Палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і нацыянальнае жыццё жыхароў Заходняй Беларусі, развіццё рэвалюцыйнага руху, сацыялістычныя пераўтварэнні пасля верасня 1939 года коратка асветлены ў брашурах Н.В. Каменскай. Яны насілі прапагандысцкі характар і выйшлі з друку да дзясятай гадавіны ўз’яднання беларускага народа [327; 329].

У першай палове 1950-х гадоў паступова складваліся навукова-тэарытычныя перадумовы паглыбленага вывучэння гэтых праблем. Яны былі звязаны з тым, што ў той час група маладых гісторыкаў звярнулася да навуковага аналізу вопыту сацыялістычных пераўтварэнняў у заходніх абласцях БССР у верасні 1939 – пачатку 1950-х гадоў і падрыхтавала шэраг кандыдацкіх дысертацый. У некаторых працах разглядваліся асобныя аспекты гісторыі рэвалюцыйнай вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі. Так, К.І. Дамарад прааналізаваў сацыяльна-эканамічныя адносіны, стан сельскай гаспадаркі, становішча сялянства і абвастрэнне класавых супярэчнасцяў у заходнебеларускай вёсцы ў 1919–1939 гады [256] У 1954 годзе І.А. Юхо абараніў кандыдацкую дысертацыю “Установление советской власти в Западной Белоруссии в 1939 г.” [901]. Першай кандыдацкай дысертацыяй па гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі была праца А.У. Царука, падрыхтаваная і абароненая ім у БДУ ў 1955 годзе [857].

Ва ўмовах нарастання супярэчнасцей паміж СССР і краінамі Захаду характэрнай з'явай тагачаснай гістарычнай навукі была падрыхтоўка і абарона ў 1956 годзе ў Маскоўскім дзяржаўным педагагічным інстытуце кандыдацкай дысертацыі В.П. Панамарэнкі “Каталіцкая царква Заходняй Беларусі – зброя каланіяльнай палітыкі буржуазна-памешчыцкай Польшчы (1919–1939 гг.)”. Яна арганічна ўпісвалася ў тагачасны агульнасаюзны гістарыяграфічны дыскурс. Прынцыпова важным з'яўляецца тое, што даследаванне ажыццяўлялася на падставе архіўных дакументаў Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва, Архіва Цэнтральнай бібліятэкі АН Літоўскай ССР, Брэсцкага, Гродзенскага і Пінскага абласных архіваў. Аўтар працаваў з такой цікавай, змястоўнай і разам з тым неадназначнай крыніцай, як “Кароткі нарыс беларускага пытання”, створанага супрацоўнікамі II аддзелу польскага генеральнага штаба ў 1928 годзе, шырокае знаёмства беларускага чытача з якой адбылося зусім нядаўна [642, с. 99].

Навуковую значнасць і важнасць публікацый зніжала адсутнасць у даследчыкаў магчымасці працаваць з дакументальнымі матэрыяламі. Архівы па гэтых праблемах не былі даступныя для гісторыкаў. Падобная тэматыка не ўключалася ў планы навукова-даследчыцкіх устаноў. Перыядычны друк асвятляў гэтыя сюжэты толькі ў агітацыйна-прапагандысцкім рэчышчы, павярхоўна, у схематычнай форме. Якасны зрух у вывучэнні гісторыі нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі пачаўся з радыкальным змяненнем палітычнай сітуацыі ў СССР у сярэдзіне 1950-х гадоў.

## 2.2. Асноўныя накірункі і акцэнты гістарыяграфіі заходнебеларускага нацыянальнага руху

У выніку ажыццяўлення даследавання гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гады былі сфармуляваны асноўныя накірункі і падыходы да вывучэння праблемы. Да найбольш распаўсюджаных тэм адносіліся пытанні палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча беларускага народа ў Заходняй Беларусі. Пры іх разглядзе беларускімі савецкімі аўтарамі назіралася, што зразумела, адзінадушша ў адносінах да ацэнкі тых ці іншых падзей узгаданых праблем. Увага акцэнтавалася на сацыяльным, эканамічным прыгнёце з боку польскіх улад, палітычным бяспраўі беларускага народа ў Заходняй Беларусі. Падкрэслівалася, што эканоміка ў Заходняй Беларусі мела характар каланіяльны, аграрна-сыравінны, які дапаўняўся малазямеллем сялян, насаджэннем асадніцтва, камасацыяй, закрыццём беларускіх школ, праваслаўных цэркваў і іншым [48; 116; 312; 488; 617; 877; 883; 884].

Гэткім чынам павінна была вырашацца ідэалагічная задача: давесці грамадскасці думку пра тое, што Заходняя Беларусь пакутуе пад "ярмом" польскіх паноў, у параўнанні з тым, што людзі ў БССР жывуць намнога лепш, чым іх адзінакроўныя браты ў Заходняй Беларусі. Такія высновы павінны былі прывесці да думак аб небходнасці разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы супраць польскіх улад, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа. Пры гэтым ад імя заходнебеларускага насельніцтва выказвалася надзея на дапамогу ў вызваленні з боку Савецкага Саюза [736].

Неабходна адзначыць, што аўтары, якія закраналі пытанні рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, ацэньвалі развіццё рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі як працэс узрастаючы, даводзілі, што рух за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне мацнеў і ахопліваў усё больш шырокія колы насельніцтва Заходняй Беларусі, прычым Кампартыі Заходняй Беларусі бясспрэчна адводзілася авангардная роля ў гэтай барацьбе. "У Заходняй Беларусі элементы грамадзянскай вайны, нарастаючы з кожным днём, могуць хутка перарасці ў адкрыты бой з фашызмам і кіраўніцтва гэтым боем належыць КПЗБ", – пісаў Л. Якаўлеў у 1931 годзе [902, с. 86].

Зыходзячы з вышэйадзначанага палажэння ў літаратуры значная ўвага надавалася асвятленню розных бакоў дзейнасці КПЗБ, як галоўнай, авангарднай сілы, якая ўзначальвала рэвалюцыйную барацьбу насельніцтва Заходняй Беларусі. Напрыклад, аўтары брашуры "Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады" (Мн., 1932) даюць наступны пералік спраў КПЗБ: наладжванне дэманстрацый салідарнасці прамысловага пралетарыяту з супрацьпадаткавым змаганнем сялян, змаганне за права нацый на самавызначэнне, аж да аддзялення, арганізацыя змагання з камасацыяй, дэмаскаванне польскага імперыялізму ў падрыхтоўцы вайны з СССР, вядзенне барацьбы супраць пераследу беларускіх школ, беларускага настаўніцтва, беларускіх служачых, няўхільнае тлумачэнне масам здрадніцкай контррэвалюцыйнай ролі правадыроў згодніцкіх арганізацый у Заходняй Беларусі і іншае.

У публікацыях тых гадоў асвятляліся таксама пытанні стварэння КПЗБ, прычым у пачатку 1930-х гадоў з'явіўся тэзіс аб тым, што КПЗБ утварылася з арганізацый КПРП, якія праводзілі сваю працу ў буйных гарадах Заходняй Беларусі яшчэ да стварэння КПЗБ. Такім чынам, гэтак званая тэорыя "двухкарэннасці" КПЗБ, згодна з якой КПЗБ утварылася з арганізацый КПРП, Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі і некаторых дробнабуржуазных нацыяналістычных арганізацый, абвяргалася [81].

Заўважым, што гэтая выснова была зроблена пасля рэпрэсій з боку савецкіх уладаў у адносінах да былых кіраўнікоў БРА, якія разам з іншымі

актыўнымі ўдзельнікамі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі выехалі ў БССР у выніку абмену палітвязнямі паміж СССР і Польшчай. Да гэтага часу дзейнасць БРА не падвяргалася крытыцы. Пасля вышэйузгаданых рэпрэсій у беларускай гістарычнай літаратуры былі зроблены высновы пра тое, што КПЗБ, прымаючы ў свае шэрагі БРА цэлай арганізацыяй, зрабіла вялікую палітычную памылку таму, што разам з часткай сапраўдна па-камуністычнаму настроеных элементаў такім шляхам пралезла ў КПЗБ група буржуазных нацыяналістаў, якая ўступіла ў кампартыю з мэтай узначалення рэвалюцыйнага руху і разгрому яго знутры [678, с. 265–266]. У гэтых меркаваннях лёгка заўважыць спробу апраўдання рэпрэсій над былымі ўдзельнікамі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, што зрабіць трэба было зноў жа па ідэалагічных прычынах. Трэба было растлумачыць грамадскасці тэрор і гвалт над яго прадстаўнікамі.

Не пакінулі даследчыкі без увагі пытанне аб гэтак званай “сэцэсіі” у КПЗБ. Не ўдаваючыся ў падрабязнасці справы, аўтары публікацый спяшаліся без прывядзення сур’ёзных аргументаў абвінаваціць “сэцэсію” і яе ўдзельнікаў у правядзенні антыпартыйнай, падрыўной працы, якая заключалася ў патрабаванні стварэння самастойнай, незалежнай ад Кампартыі Польшчы, Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі з большым ухілам у бок нацыянальна-вызваленчых, а не леварадыкальных камуністычных мэтаў.

Яшчэ больш жорсткім характарыстыкам у друку БССР і падпольным камуністычным пачала падвяргацца “сэцэсія” пасля рэпрэсіяў у БССР у адносінах да былых членаў БРА. Адзначалася, што “пралезшыя ў КПЗБ буржуазныя нацыяналісты з БРА хутка паспрабавалі правесці раскол у партыі і захоп кіраўніцтва пад выглядам г. зв. “сэцэсіі”. “Сэцэсія была контррэвалюцыйнай групай, зарганізаванай правакатарскімі элементамі, якія пралезлі ў партыю і працавалі пад кіраўніцтвам польскай дэфензівы (ахранкі) і буржуазных нацыяналістаў па абодва бакі мяжы (Ігнатоўскі, Гурын-Маразоўскі). Асноўны касцяк “Сэцэсіі” складалі выхадцы з БРА (Сталевіч, Радзевіч, Капуцкі, Гарбацэвіч і інш.). Ідэалогія “Сэцэсіі” поўнасцю вырастала з ідэалогіі БРА” [678, с. 266].

Прыблізна такога кшталту высноў вымушаны быў прытрымлівацца і былы правадыр БРА І.К. Лагіновіч у сваім артыкуле, прысвечаным праблемам БРА і “Сэцэсіі” [362]. Цікавай з’яўляецца гісторыя твора В. Шэваховіча “Беларуская “рэвалюцыйная” арганізацыя і контр-рэвалюцыйная “сецэсія”, напісанага ў сярэдзіне 1930-х гадоў. Нягледзячы на відавочную навуковую значнасць (В. Шэваховіч выкарыстоўваў архіўныя дакументы), даследаванне было прызнана шкодным з-за няправільнай акцэнтацыі: шмат увагі БРА і “сэцэсіі”, мала – барацьбе КПП і КПЗБ з “раскольнікамі” [659, с. 60]. Можна меркаваць, што з-за

гэтага не была апублікавана праца М. Ракіты "Адказ беларускім нацыянал-фашыстам. Праўда аб СССР і праўда аб тых, хто нацкоўвае на СССР": мала "праўды аб СССР", у тэксце заўважаецца перакос у бок асвятлення гісторыі і сутнасці "белбурнацаў". Гэты прапагандысцкі перл быў напісаны пасля 1933 года, і зараз яго рукапіс захоўваецца ў НАРБ. Паводле аўтара, У. Ігнатоўскі ўжо ў 1924 годзе "ўплянаваў супольна з польскай дэфэнзывай разьбіцьцё маладое яшчэ тады КПЗБ. …Ён даваў інструкцыі Гурыну і фінансаваў яго і перад і пасьля расколу" [711, арк. 103].

Вялікую ўвагу даследчыкаў у другой палове 1920-х – 1930-я гады прыцягнула гісторыя ўзнікнення Беларускай сялянска-работніцкай грамады, пераўтварэнне яе ў масавую рэвалюцыйную арганізацыю, сацыяльна-палітычны характар БСРГ, яе роля і значэнне ў развіцці рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі [31; 35; 282; 283]. У працах, прысвечаных Грамадзе, гэтая арганізацыя характа-рызуецца як самая ўплывовая ў Заходняй Беларусі. Аўтары, знаёмячы з асноўнымі пунктамі праграмы Грамады, верагодна жадаючы замаскіраваць арганізацыйную сувязь Грамады з КПЗБ, даводзілі, што ў яе праграме і дзеяннях пераважала не рабочая, а сялянская ідэалогія, падкрэслівалі дробнабуржуазны, некамуністычны характар БСРГ. Але пры гэтым падкрэслівалася, што Грамада бліжэй за іншыя палітычныя арганізацыі стаіць да партыі пралетарыяту.

Абавязковым бадай што для ўсіх прац было выкрыванне "правакацыйных" заяў польскага буржуазнага друку і прадстаўнікоў беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый аб "як быццам бы існуючай сувязі Грамады з камуністычным рухам, удзельнікі якога атрымалі магчымасць легальнай працы". "Дзейнасць і хуткі рост уплыву Грамады ўстрывожыў польскі буржуазны ўрад і грамадскую думку. Увесь польскі буржуазны друк, не выключаючы і левай часткі, адкрыў жорсткую кампанію супраць Грамады, усяляк даказваючы, што гэта партыя з'яўляецца камуністычнай арганізацыяй, і калі прыняла іншую назву, то толькі для таго, каб атрымаць магчымасць легальнай працы". Аўтары папракалі, напрыклад, БХД, якая "сама нямала садзейнічала распаўсюджванню ілжывых чутак аб апошняй (аб Грамадзе) і ўсяляк даказвала дачыненне Грамады да камуністычнага руху і яе анты-дзяржаўнай дзейнасці" [283, с. 206, 211].

Паступова, па меры аддалення ад часу, калі існавала БСРГ, фармулёўкі пачалі крыху мяняцца. "БС-РГ, не зьяўляючыся камуністычнай арганізацыяй, як гэта ёй прыпісвала дэфензіўная ўлада і беларускія нацыянал фашысты, але, аднак, яна была выяўнікам інтарэсаў шырокіх працоўных сялянскіх колаў Заходняе Беларусі", – адзначылі Я. Багданскі і Л. Бабровіч [31, с. 23]. А ўжо ў кнізе "Политические партии в Польше, Зап.

Белоруссии и Зап. Украине (Мн., 1935)” прама гаварылася: “Пад кіраўніцтвам КПЗБ… вырастае стотысячная баявая нацыянальна-вызваленчая арганізацыя – Грамада” [678, с. 25]. Спрошчана і палітызавана падавалася дзейнасць Таварыства беларускай школы [556]. І гэта зразумела: аўтар, адзін з правадыроў ТБШ – П. Мятла, які ў хуткім часе пасля выхаду працы будзе арыштаваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання, не мог шчыра і аб’ектыўна распавядаць пра праўдзівую гісторыю арганізацыі, даваць абгрунтаваныя ацэнкі яе дзейнасці.

Значнае месца ў апісанні палітычнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі адводзілася паказу дзейнасці беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый. Гэты працэс хутчэй за ўсё можна назваць шальмаваннем, бо дзейнасць гэтых арганізацый і яе членаў увесь час паказвалася рознымі сродкамі як варожая беларускаму народу, згодніцкая ў адносінах да польскіх уладаў [116; 602; 603; 788]. Але неабходна адзначыць, што гэткім чынам шмат было зроблена і на карысць гістарычнай навукі. Прааналізаваўшы працы, у якіх асвятляліся розныя бакі дзейнасці такіх арганізацый, як Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя, Беларускі Сялянскі Саюз, Беларуская Санацыя і іншыя, трэба адзначыць, што разам са шматлікімі ідэалагічнымі штампамі накшталт “непрамірымыя ворагі рэвалюцыйнай барацьбы”, “платныя арганізацыі”, “палітычныя адбросы”, “беларускія нацыянал-фашысты”, “агенты дэфензівы” ў гэтых публікацыях змешчана шмат карыснай для даследчыкаў інфармацыі, якая дае магчымасць азнаёміцца з асноўнымі праграмнымі ўстаноўкамі і палітычнай практыкай гэтых арганізацый. Галоўная ж думка такіх прац заключалася ў тым, што беларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі з’яўляюцца злейшымі ворагамі КПЗБ, БСРГ, БССР і не маюць уплыву сярод шырокіх пралетарскіх і сялянскіх мас [747, с. 35].

З цягам часу надзеі савецкага кіраўніцтва на перамогу пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы пачалі згасаць, бо ў грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне ў цэлым і ў Заходняй Беларусі ў прыватнасці не было аб’ектыўных перадумоў для перарастання хваляў рэвалюцыйных выступленняў ва ўзброенае паўстанне, якое б вырашыла праблему Заходняй Беларусі. У такой сітуацыі заходнебеларускае пытанне магло быць вырашана іншымі спосабамі.

Больш таго, у сярэдзіне – другой палове 1930-х гадоў чарговая хваля палітычных рэпрэсій у БССР захапіла і дзеячаў рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі. Не пазбеглі такога лёсу і кіраўнікі КПП і КПЗБ. Паступова ўвесь камуністычны рух у Польшчы быў скампраметаваны, што не магло не адбіцца на асвятленні ў друку пытанняў яе рэвалюцыйнага руху. Колькасць публікацый меншае, у іх пакрыху пачынаюць знікаць назвы кампартый Польшчы і Заходняй Беларусі.

Выканкам Камінтэрна, які ў 1938 годзе прыняў рашэнне аб роспуску КПП, знаходзіўся пад уплывам кіраўніцтва СССР. І.В. Сталіну стала зразумела, што польскае, у тым ліку і заходнебеларускае пытанне, вырашыцца хутчэй за ўсё ў выніку рэалізацыі намераў Гітлера пашырыць жыццёвую прастору для "арыйскай" нацыі за кошт Польшчы. Як вядома, так яно і адбылося, прычым Савецкі Саюз прыняў самы актыўны ўдзел у ліквідацыі польскай дзяржавы, далучыў да сябе Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. У гэтай сітуацыі мерапрыемствы па інспірацыі і падтрымцы рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, а таксама ідэалагічнае абгрунтаванне неабходнасці развіцця гэтай барацьбы адыходзілі на задні план [731].

Адзначым, што дзейнасць Інстытута польскай пралетарскай культуры, Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі, а таксама Інстытута гісторыі партыі з заходнім сектарам была згорнута менавіта ў другой палове 1930-х гадоў. У 1936 годзе замежная мінская частка цэнтральнай рэдакцыі КПЗБ поўнасцю згарнула сваю дзейнасць. Спынілася выданне тэарэтычнага часопіса ЦК КПЗБ "Бальшавік" [612, с. 209]. Гэтак сама неактуальнай і непатрэбнай станавілася вывучэнне дзейнасці КПП і КПЗБ.

Вынікам рашэння аб роспуску ў 1938 годзе КПЗБ, як складовай часткі КПП, стала змяненне акцэнтаў і фармулёвак у беларускай гістарыяграфіі ў асвятленні пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху. Гэтаму спрыяла ўз'яднанне восенню 1939 года Заходняй Беларусі з БССР у выніку паходу Чырвонай Арміі. Пасля згаданых падзей гісторыя КПЗБ амаль не вывучалася, палітычнае і арганізацыйнае кіраўніцтва рэвалюцыйнай барацьбой з боку кампартыі ігнаравалася ў большасці публікацый [118; 263; 673].

Выключэннем з гэтага шэрагу з'яўляюцца кніга І.Ф. Лочмеля [472] і калектыўная праца "Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне". У апошняй, напрыклад, гаварылася: "У авангардзе рэвалюцыйных баёў ішоў нешматлікі рабочы клас Заходняй Беларусі. Рэвалюцыйнай барацьбой кіравала Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, якая працавала ў надзвычай цяжкіх умовах падполля, была акружана шпіёнамі і правакатарамі і падвяргалася жорсткі рэпрэсіям" [289, с. 58]. Адносна стварэння Грамады сцвярджался, што арганізацыя была створана з дазволу "ўраду акупантаў", які, садзейнічаючы гэтаму, "разлічваў узяць яе пад свой нагляд і кіраўніцтва, абясшкодзіць масавы рух, разлажыць яго знутры і, нарэшце, разграміць… паставіў на чале Грамады сваіх агентаў-правакатараў з лагеру сваіх прыслужнікаў – беларускіх нацыяналістаў" [289, с. 56].

Што да пытання рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, то яго развіццё пасля роспуску КПЗБ у гістарычнай літаратуры паказвалася як стыхійны працэс, выкладалася павярхоўна, схематычна. "Працоўныя

Заходняй Беларусі неаднаразова паўставалі супраць сваіх прыгнятальнікаў. …На чале гэтай барацьбы знаходзіўся беларускі пралетарыят. …Сяляне неаднаразова рознымі сродкамі вялі барацьбу супраць памешчыкаў і польскіх акупантаў”, – даводзіў аўтар [263, с. 32, 34].

Пасляваенная беларуская савецкая гістарыяграфія праблемы, яе акцэнты і фармулёўкі ў асноўным працягвалі ўсталяваную ў другой палове 1930-х гадоў традыцыю. У прыватнасці, Ц.С. Гарбуноў традыцыйна рабіў акцэнт на разглядзе і канстатацыі цяжкага становішча працоўных Заходняй Беларусі, адлюстраваў вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў верасні 1939 года, дзейнасць Народнага Сходу Заходняй Беларусі. Пры гэтым публікацыі Ц.С. Гарбунова ўтрымлівалі цэлы шэраг вульгарызаваных ацэнак і высноў. Беларускі рэвалюцыйна-дэмакратычны накірунак вызваленчай барацьбы і яго кіраўнікі ацэньваліся як нацыяналістычныя, БСРГ, а значыць і яе кіраўнікі, характарызаваліся як дробнабуржуазныя, сцвярджалася, што аўтарытэту і папулярнасці Грамады, стварэнне якой санкцыянаваў сам Ю. Пілсудскі, садзейнічала падтрымка яе з боку кампартыі Беларусі. У адной з сваіх прац гісторык асобны параграф прысвяціў адлюстраванню дзейнасці беларускіх нацыянальных дзеячаў, назваўшы яго красамоўна “Здрадніцкая роля беларускіх нацыяналістаў”. Прадстаўнікі беларускага руху агулам, без уліку партыйнай прыналежнасці, абʼяўліся агентамі польскіх акупантаў. Неабходна адзначыць знішчальна-здзеклівы тон, з якім аўтар падаваў трагічныя для асобаў і ўвогуле беларускага нацыянальна-вызваленчага руху падзеі: “Разграміўшы Беларуска-Сялянска-Работніцкую Грамаду і Таварыства беларускай школы, пілсудчыкі наладзілі суд над усімі актыўнымі кіраўнікамі гэтых арганізацый, не выключаючы сваіх агентаў. Праўда, А. Луцкевіч, Р. Астроўскі былі ў хуткім часе вызвалены, але Рак-Міхайлоўскі, Б. Тарашкевіч, Мятла і іншыя былі прыгавораны да турэмнага зняволення разам з грамадоўцамі. Пілсудчыкі стваралі сваім агентам папулярнасць у масах, каб зноў выкарыстоўваць іх для агіднай здрадніцкай працы”. Прайшоўся Ц.С. Гарбуноў і па дэмакратычным ладзе Польшчы, не прамінуўшы і тут прынізіць беларускіх дзеячаў – паслоў у польскі сейм і сенат: “Часцей за ўсё гэта былі падстаўныя агенты польскай дэфензівы” [163, с. 119, 137, 140].

Для далейшага даследавання праблем гісторыі рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі прынцыповае значэнне мела заява прадстаўнікоў ЦК камуністычных партый Савецкага Саюза, Балгарыі, Фінляндыі, Італіі і Польскай абʼяднанай рабочай партыі, якую яны зрабілі ў 1956 годзе падчас працы ХХ зʼезда КПСС. У заяве гаварылася, што абвінавачванне было ілжывым, а роспуск партыі неабгрунтаваным. Давалася высокая ацэнка рэвалюцыйнай дзейнасці КПП,

у тым ліку і КПЗБ. Аднаўленне гістарычнай справядлівасці ў адносінах да КПП і КПЗБ стварыла спрыяльныя ўмовы для навуковага асвятлення іх гісторыі, а таксама праблем рэвалюцыйнай нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі. Гэтыя падзеі адкрывалі новы перыяд у даследаванні гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў [738, с. 53].

Такім чынам, пачатак навуковага асвятлення праблем гісторыі рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі быў закладзены ў 1920–1930-я гады, калі дзейнічалі навуковыя ўстановы, якія займаліся распрацоўкай пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі. Такімі ў той час з'яўляліся Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Інбелкульце, а затым пры Беларускай Акдэміі навук, заходні сектар пры Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КП(б). Навуковая праца па згаданай праблематыцы праводзілася таксама і ў Інстытуце польскай пралетарскай культуры БАН. Шырокую выдавецкую дзейнасць ажыццяўляла Цэнтральная рэдакцыя КПЗБ.

На актыўнасць працы навуковых устаноў вялікі уплыў аказвала грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне і цікавасць да становішча ў Польшчы з боку савецкага кіраўніцтва, якое лічыла знаходжанне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў складзе Польшчы часовым. Вывучэнне і асвятленне ў друку пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі выконвала ў першую чаргу ідэалагічную задачу, якая заключалася ў тым, каб давесці да шырокіх пластоў насельніцтва інфармацыю пра гаротнае жыццё народа ў Заходняй Беларусі і абгрунтаваць неабходнасць рэвалюцыйнай барацьбы супраць польскай улады.

Перыяд вывучэння акрэсленых праблем у 1921 – першай палове 1950-х гадоў неабходна падзяліць на два этапы. Першы – ад 1921 года да пачатку 1930-х гадоў, другі этап – 1930-я – першая палова 1950-х гадоў. Гэтыя этапы адрозніваюцца, перш за ўсё, грамадска-палітычнымі ўмовамі правядзення навукова-даследчыцкай і выдавецкай працы. У пачатку 1930-х гадоў беларуская гістарычная навука была падвергнута жорсткім рэпрэсіям, што не магло не аказаць адмоўнага ўплыву на яе развіццё. У той час падвяргаліся рэпрэсіям былыя кіраўнікі і актыўныя ўдзельнікі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, якіх залічылі да "ворагаў народа", была распушчана Кампартыя Заходняй Беларусі як складовая частка КПП, а большасць яе членаў таксама падвергнуты праследам. Гэтыя акалічнасці аказалі вырашальны ўплыў на вывучэнне гісторыі Заходняй Беларусі і растаноўку палітычных акцэнтаў у публікацыях. У сувязі з гэтым доўгі час азначаныя пытанні не даследаваліся.

# Глава 3
# Нацыянальна-вызваленчы рух Заходняй Беларусі ў даследаваннях другой паловы 1950-х – 1980-х гадоў

## 3.1. Гістарыяграфічны паварот другой паловы 1950-х гадоў і яго наступствы. Гістарыяграфія КПЗБ

Інтэнсіфікацыя вывучэння гісторыі нацыянальна-вываленчага руху, а дакладней яго рэвалюцыйнай плыні – КПЗБ і КСМЗБ, пачалася ў другой палове 1950-х гадоў пасля палітычнай рэабілітацыі КПЗБ падчас працы XX з'езда КПСС. Гэтае рашэнне было адным з важнейшых эпізодаў распачатай у СССР дэсталінізацыі, для ажыццяўлення якой факт роспуску ў 1938 годзе камуністычных партый, якія фактычна дзейнічалі па распрацаваных у Маскве дырэктывах, успрымаўся як відавочнае злачынства Сталіна. Аб'ектыўна такая сітуацыя адкрывала шырокія магчымасці для вывучэння гісторыі дзейнасці кампартыі, у тым ліку і КПЗБ.

Даследаваннем розных аспектаў праблемы заняўся шэраг даследчыкаў, якія прыступілі да падрыхтоўкі кандыдацкіх дысертацый. На іх матэрыялах былі апублікаваны першыя арыгінальныя артыкулы, а затым і манаграфічныя працы. Сфарміраваліся навуковыя накірункі ў вывучэнні праблем гісторыі рэвалюцыйнага вызваленчага руху, прычым дамінуючай стала гісторыка-партыйная тэматыка, каардынуючым цэнтрам у даследаванні якой стаў Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

Такі паварот з энтузіязмам быў успрыняты ветэранамі рэвалюцыйнага руху – былымі членамі КПЗБ. Іх аб'ядноўваў своеасаблівы карпаратыўны інтарэс, жаданне асабістай палітычнай рэабілітацыі, яны з рознай актыўнасцю ўключыліся ў працу па стварэнні гісторыі партыі, якой, акрамя асобных вышэйзгаданых разрозненых ідэйна-тэарэтычна і змястоўна, фактычна не было. Атрымліваючы магчымасць інтэрпрэтацыі падзей недалёкага мінулага, ветэраны атрымалі своеасаблівы карт-бланш у асвятленні падзей так, як яны гэтыя падзеі суб'ектыўна бачылі і ацэньвалі, і, не выключана, рабілі гэта так, як ім было патрэбна і зручна. Да гэтага трэба дадаць тое, надзвычай важнае, якое звязана з іх дзейнасцю ў Заходняй Беларусі як супрацоўнікаў па лініі НКУС-Камінтэрна: на момант 1950-х гадоў былыя ветэраны прайшлі шматлікія партыйныя праверкі, удзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, у тым ліку ў якасці кіраўнікоў спецатрадаў НКУС на акупаванай тэрыторыі, прайшлі службу на адказных пасадах у Войску польскім і фактычна былі ветэранамі дзяржбяспекі СССР.

Менавіта ветэраны першымі гучна сказалі сваё слова ў справе рэабілітацыі КПЗБ і дзеячаў беларускага камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі. Яшчэ ў канцы 1950-х гадоў дзякуючы іх намаганням убачылі

свет зборнікі артыкулаў і ўспамінаў: у 1958 годзе апублікаваны зборнік успамінаў “У суровыя гады падполля” [836], а ў 1960 годзе Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ на рускай і беларускай мове выдаў кнігу аб В.З. Харужай, якая ўтрымлівала яе лісты, артыкулы і ўспаміны паплечнікаў па падпольнай барацьбе [776–778]. Былы заходнебеларускі камсамольскі кіраўнік С.Р. Анісаў зрабіў важкі падмурак пад гістарыяграфію камсамолу Заходняй Беларусі (КСМЗБ), апублікаваўшы свае ўспаміны [12–14].

Шмат для выхаду гэтых публікацый зрабіў былы член цэнтральнага кіраўніцтва КПЗБ М.С. Арэхва. З яго асобай звязана вялікая арганізацыйна-навуковая і асабістая даследчыцкая праца па вывучэнні гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага вызваленчага руху Заходняй Беларусі. З 1956 года да пачатку 1980-х гадоў М.С. Арэхва працаваў старшым навуковым супрацоўнікам у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Нагадаем, што ў пачатку 1930-х гадоў ён быў супрацоўнікам замежнай рэдакцыі КПЗБ, а потым узначальваў некаторы час Камісію па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Беларускай акадэміі навук.

Гістарычная рэабілітацыя КПЗБ і ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху мела цяжкасці. Відавочна, і ў партыйна-дзяржаўным кіраўніцтве, і ў навуцы знаходзіліся тыя, якім не падабалася, што былыя “ворагі народу”, каго калісьці знішчалі маральна і фізічна, выступаюць на старонках партыйнага друку, не толькі апраўдваюць сваю “варожую” дзейнасць, але і гераізуюць яе. Патрэбны былі значныя арганізацыйныя захады, каб актывізаваць працэс даследаванняў КПЗБ і яе папулярызацыі на старонках друку.

У ліпені 1956 года па ініцыятыве М.С. Арэхвы была склікана нарада былога актыву КПЗБ і камсамолу Заходняй Беларусі. Нарада абмеркавала асноўныя накірункі распрацоўкі гісторыі КПЗБ і КСМЗБ. У верасні таго ж года часопіс “Камуніст Беларусі” апублікаваў рэдакцыйны артыкул “Нарада па пытаннях гісторыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі”, у якім падрабязна выкладаліся абмеркаваныя на нарадзе пытанні і прынятыя рэкамендацыі аб актывізацыі вывучэння гісторыі КПЗБ.

У 1957 годзе надрукавана ў выглядзе рэдакцыйнага артыкулу ў “Камуністце Беларусі” першае даследаванне М.С. Арэхвы па гісторыі КПЗБ [337]. У ім акцэнт рабіўся на цяжкім становішчы рабочага класа, працоўнага сялянства і інтэлігенцыі Заходняй Беларусі і зацікаўленасці падаўляльнай большасці народу ў знішчэнні існуючага ладу і ўсталяванні “ўлады рабочых і сялян”. У лаканічнай форме былі ахарактарызаваны ўмовы ўтварэння КПЗБ, асноўныя этапы яе дзейнасці і кіруючая роля ў рэвалюцыйным і нацыянальна-вызваленчым руху, названы кіруючыя дзеячы партыі, дадзена ацэнка неабгрунтаванаму роспуску КПП і яе састаўных частак – КПЗБ і КПЗУ. КПЗБ прадстаўлялася арганізатарам і кіраўніком барацьбы рабочых і

сялян, масавых арганізацый нацыянальна-вызваленчага характару, натхняльнікам і арганізатарам Грамады і ўсёй яе дзейнасці.

У наступнай працы той жа аўтар паказаў барацьбу працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за ўз'яднанне з БССР. Як і ў папярэднім артыкуле, М.С. Арэхва акцэнтаваў кіруючую ролю КПЗБ у развіцці рэвалюцыйнага руху. Змагаючыся з усталяваным стэрэатыпам КПЗБ як варожай партыі, даследчык намагаўся прывесці ўсе даступныя яму аргументы, якія маглі быць ацэнены як заслугі перад сацыялістычнай айчынай і Камуністычнай партыяй: "У гэтых складаных палітычных умовах тым ярчэй выступае роля КПЗБ як адзінай рэвалюцыйнай партыі, якая, працуючы нелегальна, часам з памылкамі і недахопамі, разам з кампартыяй Польшчы настойліва, у цяжкай барацьбе з ворагамі, прапагандавала ідэі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, прымяняла на практыцы марксізм-ленінізм. КПЗБ змагалася супраць буржуазіі і памешчыкаў, за перамогу пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы, за дыктатуру пралетарыяту, за правы рабочых, за зямлю для сялян без выкупу, за права самавызначэння аж да аддзялення Заходняй Беларусі ад Польшчы, абараняючы прынцыпы пралетарскага інтэрнацыяналізму, выступаючы супраць падрыхтоўкі вайны ў абарону СССР" [22, с. 9].

Акрамя М.С. Арэхвы і С.Р. Анісава, актыўна займаліся асвятленнем у друку пытанняў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі В.П. Ласковіч, Я.Г. Міско, Ф.Б. Пірышка, іншыя ветэраны, якія ў сваіх працах папулярызавалі гісторыю нацыянальна-вызваленчага руху, прапагандавалі ідэі і гісторыю КПЗБ, усхвалялі яе дзеячаў [432; 434–441; 532–535; 665–668].

Заслугоўвае ўвагі змешчаны ў маі 1964 года ў часопісе ЦК КПСС "Камуніст" артыкул "За правильное освещение истории Компартии Западной Белоруссии", які напісалі М.С. Арэхва, А.М. Мацко пры ўдзеле І.П. Хаўратовіча [612, с. 284]. У публікацыі ўтрымлівалася высокая ацэнка дзейнасці КПЗБ, у чарговы раз сцвярджалася яе кіруючая роля ў нацыянальна-вызваленчым руху Заходняй Беларусі, а таксама падвяргаліся крытыцы дапушчаныя КПЗБ памылкі левасектанцкага і правааапартуністычнага характару [287].

Безумоўна, згаданыя вышэй публікацыі ў партыйных часопісах станоўча паўплывалі на разгортванне навуковай працы не толькі па праблемах КПЗБ, але і па іншых пытаннях заходнебеларускай тэматыкі. Але ў першую чаргу яны мелі важнае метадалагічнае значэнне таму, што акрэслівалі падыходы да ацэнкі і адлюстравання тых ці іншых падзей нацыянальна-вызваленчага руху, вызначалі станоўчыя моманты, заслугі, поспехі, ці, наадварот, недахопы і памылкі ў дзейнасці КПЗБ. Маючы перад сабой такую своеасаблівую праграму-схему, гісторыкам заставалася напоўніць яе фактамі, падзеямі, высновамі, якія павінны былі пацвердзіць

загадзя прапанаваныя пазіцыі. Ва ўсялякім выпадку, названыя канцэптуальныя падыходы замацаваліся і панавалі ў гістарыяграфіі да пачатку 1990-х гадоў, вызначаючы змест навуковых даследаванняў.

Важна падкрэсліць, што кандыдацкія дысертацыі і падрыхтаваныя на іх аснове публікацыі напісаны на шырокім коле архіўных і літаратурных крыніц. Гэта матэрыялы Цэнтральнага партархіва Інстытута марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС, партыйных архіваў Інстытутаў гісторыі партыі пры ЦК кампартый Беларусі і Літвы, а таксама Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літоўскай ССР, дзяржаўных архіваў Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Даследчыкі ўвялі ў навуковы ўжытак шэраг крыніц, якія захоўваліся ў партыйных і дзяржаўных архівах Польскай Народнай Рэспублікі. Аўтары выкарыстоўвалі пратаколы і стэнаграфічныя справаздачы з’ездаў і канферэнцый КПЗБ, пленумаў яе ЦК, іх рэзалюцыі і пастановы бюро і сакратарыяту, а таксама перапіску з мясцовымі партарганізацыямі, справаздачы, адозвы і звароты ЦК КПП і ЦК КПЗБ, акруговых і раённых партыйных камітэтаў. У фондах дзяржаўных архіваў вывучаліся штомесячныя справаздачы ваявод ва ўрадавыя інстанцыі, данясені паліцыі, даносчыкаў і канфідэнтаў, іншыя матэрыялы і дакументы, у якіх асаблівая ўвага надавалася дзейнасці КПЗБ.

Значнай крыніцай фактычных сведчанняў па гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага руху з’яўляўся падпольны перыядычны камуністычны друк. Перш за ўсё гісторыкі выкарыстоўвалі нелегальныя партыйныя выданні: часопісы “Бальшавік” і “Партработнік”, газеты КПЗБ, БСРГ, “Змагання”; выданні Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі “Інфармацыйны бюлетэнь”, “Бюлетэнь” і іншыя, на старонках якіх асвятляліся пытанні тэорыі, стратэгіі і тактыкі рэвалюцыйнага руху, унутрыпартыйнага жыцця, барацьбы рабочых, сялян, інтэлігенцыі супраць польскай улады. Пры гэтым трэба адзначыць, што матэрыялы перыядычнага друку ўрадававага і праўрадавага накірунку, сацыялістычных, дробнабуржуазных партый і арганізацый, беларускіх палітычных груповак, амаль цалкам ігнараваліся, акрамя тых выпадкаў, калі асобныя выказванні маглі быць устаўлены ў пэўную схему і сцвердзіць неабходныя тэзісы.

Такім чынам, гісторыкі ўвялі ў навуковы зварот вялікую колькасць фактычнага матэрыялу, пачэрпнутага ў архівах. Знаёмства з іх фондамі паказала, што многія дакументы КПЗБ аказаліся згубленымі ці знішчанымі, у прыватнасці матэрыялы I канферэнцыі, шэрагу акруговых, гарадскіх і раённых камітэтаў партыі. Гэта ў першую чаргу тлумачыцца тым, што ва ўмовах падполля і строгай канспірацыі партыйнае справаводства было абмежаваным, многія рашэнні пісьмова не фіксаваліся, а павінны былі запамінацца адказнымі партыйцамі [449, с. 401].

Безумоўна, усе гэтыя крыніцы павінны былі быць падвергнуты і падвяргаліся крытычнаму аналізу, бо ў іх (асабліва ў дакументах і матэрыялах афіцыйных устаноў Польшчы) прысутнічалі дакументы, публікацыя якіх далёка не спрыяла б усталяванню ў вачах грамадскасці патрэбнага іміджу КПЗБ як партыі, якая самаахвярна адстойвала інтарэсы простых працаўнікоў. Напрыклад, аб наяўнасці ў шэрагах партыі агентаў і канфідэнтаў дэфензівы, інфармацыя аб гэтым сёння ў значнай колькасці ўведзена ў навуковы зварот.

Эфектыўнаму развіццю гістарыяграфіі праблемы садзейнічала шырокая публікацыя дакументаў і матэрыялаў, а таксама мемуараў актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, ветэранаў КПЗБ. Калектыў супрацоўнікаў Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, Інстытута гісторыі АН БССР, Архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР падрыхтаваў і ў 1962 годзе выдаў першы том зборніка дакументаў і матэрыялаў аб барацьбе працоўных Заходняй Беларусі за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз’яднанне з БССР, у 1972 годзе – другі том [53; 54]. У зборніку апублікаваны дакументы КПП, КПЗБ і КСМЗБ, пастановы і рэзалюцыі цэнтральнага, акружных і раенных камітэтаў партыі і камсамолу, якія захоўваліся ў партархіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, Брэсцкага і Гродзенскага абласных дзяржархіваў, ЦДА Літоўскай ССР. У 1978 годзе быў выдадзены зборнік дакументаў і матэрыялаў па пытаннях рэвалюцыйнага руху на Віленшчыне [718]. Цікава, што выданні ўтрымлівалі дакументы, якія дысанансна гучалі ў дачыненні да ўкаранёных стэрэатыпаў адносна “буржуазна-памешчыцкага ладу”, “грабежніцкай эксплуатацыі”. Дакументы адлюстроўваюць заклапочанасць польскай улады кепскім станам сацыяльна-эканамічнага жыцця насельніцтва, беспрацоўем, нізкімі заробкамі, нежаданнем прадпрыймальнікаў улічваць інтарэсы рабочых, разуменне законнасці адстойвання рабочымі сваіх правоў праз забастоўкі, мітынгі і інш. [53, с. 162–164;172–175,410, 424, 472, 473, 477–478, 486–487, 539–540, 551–553, 553–554, 560; 54, с. 22–23, 25, 32, 115, 151, 210–214, 225–227, 230, 280–282, 392, 425–426, 455–456, 464–465; 718, с. 70–73, 171–172, 186–187, 219–221, 295–296, 306, 335]. Напрыклад, справаздачы інспекцыі працы аб канфліктах паміж прадпрыймальнікамі і рабочымі на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў ад снежня 1928 года падаюць інфармацыю аб арбітражнай дзейнасці інспектараў працы, адзначаюць вінаватасць уладальнікаў прадпрыемстваў у індывідуальных і калектыўных канфліктах, моцную эксплуатацыю наёмнай працы ў сельскай гаспадарцы, дзе “зусім адсутнічае ахова працы і юрыдычная абарона”, зарплата рабочых “увогуле нізкая і недастатковая” [53, с. 551–554].

Палітычная рэабілітацыя КПЗБ стымулявала напісанне і публікацыю мемуараў яе ветэранаў, актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Акрамя ўжо згаданых кніг С.Р. Анісава, былога сакратара ЦК КСМЗБ, пра ўдзел камсамолу і моладзі ў рэвалюцыйным руху, былі выдадзены зборнікі ўспамінаў, у якіх, на думку стваральнікаў, аднаўлялася “яркая і праўдзівая карціна мужнай барацьбы працоўных пад кіраўніцтвам КПЗБ за сваё вызваленне” [99; 611]. Ва ўспамінах С.А. Ваўпшасава былі адлюстраваны найбольш значныя моманты партызанскага руху ў Заходняй Беларусі ў першай палове 1920-х гадоў, актыўным удзельнікам якіх з’яўляўся сам аўтар [83–85]. Змястоўнай крыніцай па гісторыі камуністычнага падполля Заходняй Беларусі, узаемадносін КПЗБ, “Змагання” і ТБШ з’яўляецца кніга ўспамінаў Г.М. Мухі-Мухноўскага [551], а таксама мемуары М.П. Малочкі [545]. Вялікую цікавасць выклікаў выхад успамінаў Паўліны Мядзёлкі, у якіх маюцца звесткі і пра беларускі рух у Польшчы [552].

Трэба адзначыць, што інфармацыя названых публікацый была накіравана не на ўсталяванне аб’ектыўнай інфармацыі, а на сцвярджэнне патрэбных тагачаснай савецкай ідэалогіі гістарычных уяўленняў. Такая сітуацыя можа тлумачыцца відавочным і эфектыўным кантролем з боку кампетэнтных партыйна-дзяржаўных органаў за працэсам напісання і публікацыі мемуараў і даследаванняў. Такі кантроль быў і з боку былых адказных работнікаў КПЗБ, удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Яны мелі значную цэнзурную ролю ў фарміраванні гістарыяграфічнай традыцыі адлюстравання названых пытанняў. Той самы М.С. Арэхва выконваў своеасаблівую ролю пасярэдніка-фільтра паміж аўтарамі мемуараў – былымі ўдзельнікамі рэвалюцыйнага руху, якія даверліва ставіліся да яго як свайго былога кіраўніка, і выдавецтвамі, куды паступалі ўспаміны пасля наступнага зацвярджэння і адпаведнага рэцэнзавання. Здаралася, што ўжо на гэтым этапе матэрыялы спыняліся, бо выяўлялася відавочнае імкненне іх аўтараў гаварыць пра забароненыя тэмы, у прыватнасці, пра рэпрэсіі ў дачыненні да іх як падазроных членаў забароненай КПЗБ, якія прайшлі праз суды і незаслужана адбылі пакаранне. Пры гэтым, як у выпадку з успамінамі Г.М. Мухі-Мухноўскага, які перадаў для знаёмства М.С. Арэхва свой тэкст, відавочна выяўлялася “нежаданне савецкай улады праліваць святло на “нязручныя” факты ў зусім яшчэ нядаўняй гісторыі” [652, с. 102].

Былыя рэвалюцыянеры-партыйцы выступалі ў адкрытым друку і з рэцэнзіямі на навуковыя працы па пытаннях гісторыі КПЗБ, выказваючы пры гэтым свае далёка не лагодныя заўвагі аўтарам, якія, на думку ветэранаў, прыходзілі да няправільных вывадаў. Па іх меркаванні, рукапісы работ па гісторыі КПЗБ, як і па іншых праблемах рэвалюцыйнага і

нацыянальна-вызваленчага руху, мэтазгодна было б абмяркоўваць у адпаведных “навукова-даследчыцкіх установах” з удзелам былых актыўных дзеячаў КПЗБ. Толькі пры гэтай умове, сцвярджалі ветэраны, можна будзе пазбегнуць у будучых працах памылак і недахопаў [613, с. 74].

Відавочнаму рэдагаванню падвяргаліся і ўспаміны ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху. Так, напрыклад, у прадмове да зборніка ўспамінаў “Люди нарочанского края” А.І. Залескі ад імя рэдактараў і складальнікаў зборніка выказаў “глыбокую падзяку былым кіруючым работнікам КПЗБ М.С. Арэхва і Д.І. Разенштэйну за каштоўныя заўвагі, якія яны выказалі па ўспамінах першай часткі гэтай кнігі ў працэсе яе падрыхтоўкі да друку” [98, с. 8]. Таму не дзіўна, што ў названым зборніку ўспамінаў адсутнічае непажаданая для куратараў выдання інфармацыя, напрыклад пра трагедыю КПЗБ 1938 года і пра рэпрэсіі ў адносінах да былых удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі: асвятленне пытанняў гісторыі КПЗБ павінна было ісці толькі ў адпаведным, загадзя вызначаным рэчышчы. Тое самае можна сказаць і пра кнігу ўспамінаў М.С. Арэхвы. Як і ў папярэдніх выданнях, ва ўспамінах М.С. Арэхвы маральна-этычных разважанняў, шкадаванняў, незразумеласці больш, чым жадання паказаць сапраўдную карціну падзей, якія характарызавалі прычыны, падрыхтоўку і непасрэдна роспуск партыі, лёс былых партыйцаў. М.С. Арэхва працягнуў папярэдне ўсталяваную традыцыю разважання дысцыплінаванага партыйца, які, нягледзячы на такі страшэнны ўдар па партыі, застаецца верным, самаахвярным змагаром: “Партыя была распушчана, але камуністы працягвалі барацьбу” [612, с. 247–251].

Нягледзячы на дастаткова вялікую колькасць даступных для даследчыкаў дакументаў і матэрыялаў, самымі аўтарытэтнымі крыніцамі пры падрыхтоўцы прац па пытаннях гісторыі Заходняй Беларусі, нацыянальна-вызваленчага руху, гісторыі КПЗБ, іншых палітычных партый і арганізацый у Заходняй Беларусі заставаліся творы класікаў марксізму-ленінізму, кіраўнікоў савецкай дзяржавы, партыйныя дакументы – рашэнні, ухвалы, адозвы, рэзалюцыі, пастановы з’ездаў, пленумаў ЦК і іншыя. Тое самае тычыцца і артыкулаў у партыйных часопісах, газетах 1920–1930-х гадоў, спасылка на якія лёгка забяспечвала пацвярджэнне неабходных высноў аб сітуацыі ў Заходняй Беларусі, стане нацыянальна-вызваленчага руху.

Як своеасаблівую перадумову стваральнага развіцця гістарыяграфіі нацыянальна-вызваленчага руху неабходна адзначыць знаёмства беларускіх гісторыкаў з працамі польскіх аўтараў. Айчынныя вучоныя мелі на ўвазе польскую гістарыяграфію праблемы, выкарыстоўвалі напрацоўкі польскіх вучоных, апублікаваныя ў ПНР зборнікі дакументаў і матэрыялаў. Пра гэта сведчаць згадкі ў гістарыяграфічных частках дысертацыі. Гэта

было тым больш карысна, што польская гістарычная навука, у тым ліку па гісторыі Заходняй Беларусі 1920–1930-х гадоў, мела больш спрыяльныя грамадска-палітычныя ўмовы дзейнасці і меншую заідэалагізаванасць даследаванняў [508].

Першыя кандыдацкія дысертацыі 1960-х гадоў па заходнебеларускай праблематыцы, падрыхтаваныя і абароненыя І.В. Палуянам, А.М. Мацко, Б.С. Клейнам, У.А. Палуянам, былі прысвечаны, адпаведна, развіццю ў 1929–1933 гады рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, сумеснай барацьбе працоўных Польшчы і Заходняй Беларусі супраць фашызму ў 1933–1939 гады, гісторыі стварэння і дзейнасці Беларускай сялянска-работніцкай грамады, антыфашысцкаму вызваленчаму руху ў Вільні ў 1926–1939 гады [338; 517; 679; 680; 685; 686]. Пры гэтым Б.С. Клейн, пэўным чынам парушаючы агульную канцэптуальную ўзгодненасць тагачасных даследаванняў, дазволіў сабе выказаць крытычныя заўвагі ў адносінах да навуковай пазіцыі І.В. Палуяна і У.А. Палуяна. Выдадзеная імі кніга, на думку Б.С. Клейна, “усё ж не вольная ад шэрагу істотных недахопаў у асвятленні барацьбы гарадскіх рабочых”, аўтары “не ўлічылі ў неабходным памеры спецыфіку рабочага руху ў трыццатыя гады і дапусцілі вядомую недаацэнку поспехаў барацьбы пралетарыяту Вільнюса і Заходняй Беларусі”. Крытыка даследчыка становіцца больш зразумелай, калі прааналізаваць задачы яго даследавання, напрыклад, “вызначыць значэнне таго ўкладу, які зрабіў шматнацыянальны атрад вільнюскіх рабочых”, а таксама фармулёўкі накшталт “Вільнюс гістарычна сфарміраваўся як горад са шматнацыянальным складам насельніцтва” [338, с. 5–6, 8]. Хутчэй за ўсё прычына пазіцыі Б.С. Клейна заключалася ў ігнараванні І.В. Палуянам і У.А. Палуянам яўрэйскага пытання ў гісторыі Заходняй Беларусі, у прыватнасці, гісторыі Вільні і іншых заходнебеларускіх гарадоў, дэмаграфічная асаблівасць якіх праяўлялася ў колькаснай перавазе яўрэйскага насельніцтва, у тым ліку сярод рабочых, а адпаведна ў іх вырашальнай ролі ў рабочым руху. Дададзім, што Б.С. Клейн абараніў кандыдацкую дысертацыю ў Літве.

Прыведзеныя кандыдацкія дысертацыі змяшчалі асобныя тэарытычныя і канкрэтна-гістарычныя аспекты фарміравання КПЗБ і яе дзейнасці як палітычнага авангарду працоўных Заходняй Беларусі. Гэтыя даследаванні, канцэптуальна звязваючы арганізацыю “барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне” і КПЗБ, выводзячы партыю з забыцця, надоўга і трывала замацоўвалі за КПЗБ імідж бадай што адзінай палітычнай сілы, якая паслядоўна, з “правільных” пазіцый ажыццяўляла кіраўніцтва барацьбой.

Кандыдацкія дысертацыі сцвярджалі тэзіс пра цеснае супрацоўніцтва КПП і КПЗБ па кіраўніцтве рэвалюцыйнай барацьбой польскіх і беларускіх працоўных, сумеснымі выступленнямі супраць палітыкі польскага ўраду – “фашысцкага тэрору”, салідарнасцю з іспанскім народам, які змагаўся з фашысцкімі мяцежнікамі. Аўтары падкрэслілі, што ў выніку рэвалюцыйнай творчасці мас і арганізатарскай працы КПЗБ узнікла Беларуская сялянска-рабочая грамада, якая па свайму сацыяльнаму і палітычнаму характару з’яўлялася народнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыяй. Дзейнасць БСРГ ажыццяўлялася пад непасрэдным кіраўніцтвам КПЗБ. Метадалагічная зададзенасць і адначасова вузкасць не дазвалялі фарміраваць больш аб’ектыўную праўдзівую гісторыю, у тым ліку Грамады, якая сваім нараджэннем абавязана прадстаўнікам беларускага нацыянальнага руху, напрыклад А. Луцкевічу, які меў выключна важнае значэнне ў вызначэнні абрысаў будучай беларускай партыі [760]. Пры гэтым нельга адмаўляць часам вызначальны ўплыў на БСРГ з боку кіраўніцтва КПЗБ, якое фарміравала палітычны твар Грамады з улікам сваіх інтэрнацыяналісцкіх памкненняў [655]. Аднак сінтэз нацыяльна-беларускага і савецка-беларускага камінтэрнаўскага чыннікаў адбываўся ў своеасаблівых умовах, народжаных агульным зместам беларусізацыі. У сярэдзіне 1920-х гадоў дасягнутыя поспехі беларускай дзяржаўнасці ў асобе БССР давалі добрыя парасткі, у БССР рабілі відавочныя крокі да кансалідацыі беларускага руху па розныя бакі мяжы, можна нават гаварыць пра своеасаблівую рэабілітацыю ў Мінску БНР і яе ідэй. Аднак пры гэтым трэба памятаць пра тое, што ў рэшце-рэшт савецкае кіраўніцтва ў першую чаргу намагалася падтрымліваць беларускі рух дзеля вырашэння сваіх задач, і нават гандлю беларускім пытаннем.

У даследаваннях атрымала рэзкую негатыўную ацэнку палітыка розных “буржуазных” (эндэкі, хрысціянскія дэмакраты і інш.) і “дробнабуржуазных згодніцкіх партый” (ППС, Бунд, “Вызволенне”), якія, на думку аўтараў, абаранялі інтарэсы памешчыкаў і капіталістаў, станоўча ставіліся да захопу беларускіх, украінскіх і літоўскіх тэрыторый, вялі раскольніцкую працу сярод рабочых і сялян, адцягвалі народныя масы ад рэвалюцыйнага руху. Вучоныя асабліва акцэнтавалі ўвагу на тым, што супраць КПЗБ і рэвалюцыйнай барацьбы працоўных выступалі і беларускія палітычныя партыі – БХД, Беларускі сялянскі саюз і іншыя. Бунд і сіяністкія партыі насаджвалі нацыяналізм і вялі антыкамуністычную прапаганду сярод яўрэйскага насельніцтва.

Відавочна прасочваецца палітычная абумоўленасць акцэнтаў і фармулёвак накшталт “буржуазныя” і “дробнабуржуазныя” партыі. Яны ўзніклі ў выніку ўкаранення ў гістарычнай навуцы марксісцка-ленінскай метадалогіі з яе класавай тэрміналогіяй. Паводле гэтага, панаваўшая у той

час тэорыя класавай барацьбы патрабавала ад гісторыкаў пошуку і пацвярджэння адпаведных схемаў, што не магло быць адназначна даказана на ўзроўні крыніцазнаўчай базы. Гэта прыводзіла да метадалагічных казусаў. Так, напрыклад, заходнебеларускія сяляне мелі пэўную прыватную ўласнасць, па розных прычынах наймалі парабкаў, г.зн. паводле КПСС, займаліся эксплуатацыяй, дэманструючы прыклады буржуазнага парадку. Пры гэтым беларускія савецкія гісторыкі ад імя такіх "буржуяў" гаварылі пра цяжкае жыццё і жаданне будаваць сацыялізм, праявы незадаволенасці сялян эканамічнай палітыкай польскай улады імкнуліся кваліфікаваць як палітычную рэвалюцыйную барацьбу. Самі ж беларускія сяляне з рознай ступенню ахвоты ўступалі ў шэрагі небеларускіх палітычных партый, падтрымлівалі іх у час выбараў.

Даследчыкі адзінадушна падкрэслівалі, што толькі КПЗБ, узброеная вучэннем марксізму-ленінізму, якая цвёрда стаяла на прынцыпах пралетарскага інтэрнацыяналізму і брацкай салідарнасці з Савецкім Саюзам, змагла згуртаваць шматнацыянальныя масы працоўных і павесці іх разам з рабочымі і сялянамі Польшчы на барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, устанаўленне савецкай улады і ўз'яднанне з БССР. У дадзеным выпадку маем справу з настойлівым жаданнем беларускай савецкай гістарыяграфіі наблізіць гісторыю КПЗБ да прынятых у КПСС ідэйна-палітычных канонаў. На самой справе не ўсё было проста з "пралетарскім інтэрнацыяналізмам" (згадаем хаця б тую ж "сэцэсію", архіўныя дакументы згадваюць нацыянальныя, у прыватнасці, асобныя беларускія і яўрэйскія ячэйкі [586, арк. 26]), згуртаваннем шматнацыянальных працоўных мас (яўрэі і літоўцы, палякі і беларусы мелі свае легальныя нацыянальныя партыі і арганізацыі, у складзе якіх яны актыўна праводзілі нацыянальна арыентаваныя мерапрыемствы). КПЗБ на самой справе была далёкая ад канстатаваных гісторыкамі пазіцый і здзяйсненняў, у тым ліку з-за відавочных цяжкасцей арганізацыйна-кадравага складу: шматлікія правалы, здрады-правакацыі, слабая падтрымка насельніцтва, якое часам ішло ў партыю з-за магчымасці атрымаць сродкі і ўплыў, былі пастаяннай з'явай гісторыі партыі [433, 544].

Непасрэдна па гісторыі КПЗБ першыя кандыдацкія дысертацыі былі абаронены Т.Ю. Глінскай і І.П. Хаўратовічам. Разам з агульнымі пытаннямі рэвалюцыйнага руху ў іх прааналізаваны праблемы ўтварэння і арганізацыйнага ўмацавання КПЗБ і яе ролі "ў мабілізацыі працоўных на барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне", раскрыты асаблівасці арганізацыйных форм і метадаў дзейнасці, яе праграмныя ўстаноўкі, а таксама стратэгія і тактыка на розных этапах рэвалюцыйнай барацьбы, па ўкаранёнай у савецкай гістарыяграфіі перыядызацыі – у перыяд частковай, адноснай стабілізацыі капіталізму і сусветнага эканамічнага крызісу

(1924–1933 гады) [139; 849]. У гэтых дысертацыях разгледзены гістарычныя ўмовы, у якіх аформілася КПЗБ, раскрыты прычыны ўтварэння, яе колькасны і якасны рост. На значным фактычным матэрыяле прааналізавана дзейнасць партыі па стварэнні масавых легальных арганізацый (БСРГ, ТБШ і інш.), паказана палітычнае кіраўніцтва імі і пераўтварэнне іх у “апорныя цэнтры рэвалюцыйнай барацьбы працоўных”. Аўтары выявілі легальныя і нелегальныя формы і метады дзейнасці КПЗБ па кіраўніцтве рэвалюцыйнымі выступленнямі рабочых і сялян, раскрылі змест важнейшых яе лозунгаў, якія прызывалі працоўных змагацца супраць польскага рэжыму, за рабоча-сялянскі ўрад, за зямлю для сялян без выкупу, самавызначэнне прыгнечаных народаў аж да аддзялення і іншае.

Такім чынам, КПЗБ гістарыяграфічна ўздымалася ў цэнтр сацыяльна-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі. Гісторыкі па марксісцкай схеме сцвярджалі, што партыйныя арганізацыі заўважна актывізавалі дзейнасць на буйных прамысловых прадпрыемствах і на чыгуначным транспарце. Нягледзячы на тое, што рабочы рух адчуваў на сабе значнае, вельмі часта вырашальнае ўздзеянне ППС, Бунда, іншых палітычных арганізацый, савецкія гісторыкі пад кіраўніцтва КПЗБ намагаліся падвесці як мага больш забастовак рабочых, у якіх патрэбна было абавязкова шукаць палітычны характар.

Таму даследчыкі вымушаны былі падаваць і абгрунтоўваць загадзя прапанаваныя ў партыйным друку тэзісы 1920–1930-х гадоў, сцвярджаць пра тое, што пад уплывам пралетарскага руху і пад кіраўніцтвам КПЗБ узмацнілася барацьба сялян за зямлю, супраць непасільнага падаткавага прыгнёту і памешчыцкай кабалы. Па ўсталяванай партыйнай схеме сцвярджалася думка аб ідэйнай блізкасці да КПЗБ прадстаўнікоў розных сацыяльных груповак. Напрыклад, аб тым, што КПЗБ разам з вялікай працай сярод пралетарыяту і сялянства рабіла шмат намаганняў па прыцягненні на свой бок інтэлігенцыі і нават дробнай гарадской буржуазіі. Даследчыкі намагаліся ўсё больш глыбока і відавочна падкрэсліць бальшавісцкі характар КПЗБ, у прыватнасці, звярталі ўвагу на тое, што ацэньваючы сітуацыю, якая склалася ў краіне ў канцы 1932 года, VI з’езд КПП канстатаваў, што Польшча ўшчыльную набліжаецца да крызісу. Узяўшы курс на рэвалюцыйны выхад з яго, КПЗБ, як і ўся КПП, імкнулася пераўтварыць эканамічныя забастоўкі ва ўсеагульную палітычную стачку. Яна ўзмоцнена прапагандавала неабходнасць падрыхтоўкі ўзброенага паўстання як адзінага сродку звяржэння ўлады буржуазіі. КПЗБ сапраўды, і не толькі ў пачатку 1930-х гадоў, рыхтавала ўзброенае паўстанне. Гэта было і ў 1923–1924 гады, потым у т. зв. грамадоўскі перыяд. Як паказваюць архіўныя крыніцы, камуністы актыўна распаўсюджвалі чуткі пра магчымасць паўстання і ў перыяд сусветнага эканамічнага крызісу. У

прыватнасці, паводле сітуацыйнай справаздачы Брэсцкай павятовай каменды дзяржпаліцыі ад 4 красавіка 1933 года аб “руху выўратовым”, “на ўсіх раённых пасяджэннях інструктары ЦК запэўніваюць членаў Кампартыі, што рэвалюцыя ў Польшчы выбухне ў любы дзень, што партыя мусіць быць да яе падрыхтавана” [212, арк. 22]. Іншая справа, на чыю карысць рыхтавалася гэтае паўстанне: беларускія камуністы, ідэйна перакананыя ў правільнасці камінтэрнаўскіх лозунгаў, аб’ектыўна працавалі на СССР і заваяванне ім геапалітычных прастораў, а не на паляпшэнне жыцця насельніцтва Заходняй Беларусі.

Пацвярджаючы гераізм і адданасць камуністаў у барацьбе, значная ўвага гісторыкамі надавалася паказу “жорсткага тэрору” з боку ўлад супраць Кампартыі. Падкрэслівалася, што ў турмах “буржуазнай Польшчы” пастаянна знаходзілася больш чым 3 тыс. членаў – амаль палова агульнай колькасці КПЗБ. Улічваючы цяжкасці з высвятленнем дакладнай лічбы колькаснага складу КПЗБ на розных этапах яе гісторыі, дадзеная лічба не можа быць прынята без агаворак, аб чым будзеісці гаворка ніжэй.

У даследаваннях выразна прасочваецца жаданне аўтараў пераканаўча падкрэсліць, што КПЗБ з’яўлялася палітычным авангардам, які выказваў і абараняў карэнныя класавыя інтарэсы працоўных, і была адзінай сілай, здольнай павесці іх на рэвалюцыйную барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Пры гэтым, і трэба аддаць належнае гісторыкам, якія разам са станоўчымі момантамі паказвалі недахопы ў дзейнасці партыі, у выданнях звярталася ўвага на тое, што ў дзейнасці кіруючага актыву праяўляліся погляды і метады працы, якія былі абумоўлены распаўсюджанымі тады ў КПП, ды і ва ўсім міжнародным камуністычным руху, гэтак званай тэорыі сацыял-фашызму. Гісторыкі ўслед за партыйнай традыцыяй 1920–1930-х гадоў назвалі гэтыя погляды і метады сектанцкімі. Згодна гэтай памылкавай тэорыі сацыял-дэмакратычныя і сялянскія партыі разглядаліся як складовая частка фашысцкага лагеру. Адзначалася, што гэта вельмі адмоўна адбілася на працы партыі па ўстанаўленні адзінства дзеянняў камуністаў з працоўнымі, якія знаходзіліся ў шэрагах і пад уплывам ППС, Стронніцтва Людовага, беларускіх нацыянальных партый і арганізацый, хрысціянскіх прафсаюзаў і іншых арганізацый. І.П. Хаўратовіч, у прыватнасці, адзначыў, што з вясны 1933 года, калі відавочна намецілася ўмацаванне фашысцкай рэакцыі і нарастанне ваеннай небяспекі з боку гітлераўскай Германіі, КПЗБ, як і ўся КПП, “пачала паступова пазбаўляцца г. зв. сектанцкіх памылак і праводзіць больш рэалістычную, гнуткую палітыку ў пытаннях адзінства рабочага класу” [849, с. 20]. Разважаючы пра т. зв. сектанцкія погляды і метады КПЗБ, трэба мець на ўвазе не толькі тое, што, як было справяліва адзначана вышэй, яны абумоўлены распаўсюджанай

тады ў КПП, ды і ва ўсім міжнародным камуністычным руху, гэтак званай тэорыі сацыял-фашызму. У першую чаргу неабходна весці гутарку пра відавочна палітычны валюнтарызм савецкага вышэйшага палітычнага кіраўніцтва і яго настойлівае жаданне рэалізоўваць у грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі патрэбныя схемы, накіраваныя на ажыццяўленне расколу ў грамадстве па прынцыпе "падзяляй і пануй". І таму нельга пагадзіцца з выказаным меркаваннем І.П. Хаўратовіча пра тое, што КПЗБ пачала пазбаўляцца адзначаных недахопаў, наадварот, вышэйшае савецкае кіраўніцтва праз Камінтэрн дазволіла і прадыктавала неабходнасць змены тактыкі ў адносінах да палітычных апанентаў.

Падрыхтоўка кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый з'явілася спрыяльнай умовай з'яўлення даследаванняў па гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага руху, спачатку артыкулаў, а затым манаграфій, якія былі апублікаваны гісторыкамі на працягу працы над кандыдацкімі даследаваннямі і на іх падставе. Найбольш значнымі працамі былі публікацыі Т.Ю. Глінскай, Б.С. Клейна, А.М. Мацко, У.А. Палуяна і І.В. Палуяна, у якіх асветлены вышэй названыя сюжэты [138; 140; 141; 340; 344; 345; 511; 512; 614, 620–622; 624; 683]. Гэтыя даследаванні сталі ў канцы 1950-х – 1960-я гады своеасаблівым прарывам у вывучэнні гісторыі заходнебеларускага нацыянальнага руху, бо аднаўлялі гісторыю партый і асоб, на якія ў 1930-я гады быў прымацаваны ганебны ярлык ненадзейных элементаў ці нават ворагаў.

У дачыненні да названых прац пачатку 1960-х гадоў можна пагадзіцца з меркаваннем А.В. Пашкевіча, які лічыць, што распачынанне імі фактычна з нуля навуковага даследавання адпаведных праблем вызначыла як вартасці, так і недахопы адпаведных публікацый. Кожнае з выданняў з'яўлялася ў пэўным сэнсе наватарскім, бо разглядала новую, раней практычна недаследаваную тэму, уводзячы ў навуковы ўжытак шматлікія архіўныя дакументы. Аднак іх аўтары з самага пачатку падпарадкоўваліся пэўным канонам у асвятленні тэмы, поўнасцю адпаведным пануючай у дзяржаве камуністычнай ідэалогіі, якая практычна не пакідала месца на даследаванне, у прыватнасці, парламенцкага змагання беларусаў Польшчы, бо апошняе апрыёрна разглядалася як другараднае ў параўнанні з рэвалюцыйнай барацьбой і таму не вартае больш пільнай увагі [647, с. 12].

У сумеснай працы У.А. Палуяна і І.В. Палуяна, па-сутнасці першай навуковай манаграфіі па гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху абагульняльнага характару, даследчыкі падверглі сумніву існаваўшую да гэтага канцэпцыю аб узрастанні рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Аўтары пераканаўча даказалі, што яго развіццё на розных этапах адрознівалася сваёй актыўнасцю. На гэтай падставе гісторыкі выдзелілі

чатыры перыяды ў развіцці рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі:

I. 1921–1924 – гады пасляваеннага рэвалюцыйнага ўздыму, пачатку адноснай стабілізацыі капіталізму. Спецыфічнай асаблівасцю рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху гэтых гадоў з’явіўся партызанскі рух.

II. 1925 – першая палова 1929 года – у асноўным гады адноснай стабілізацыі капіталізму. Пераважалі рэвалюцыйна-дэмакратычныя формы барацьбы, шырокае спалучэнне легальнай і нелегальнай працы Камуністычнай партыі, удзел у руху масавых легальных арганізацый працоўных – БСРГ, ТБШ і інш. Першыя гады гэтага перыяду адрозніваліся ўздымам рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, апошнія – спадам.

III. Другая палова 1929 – 1933-я гады супадае з сусветным эканамічным крызісам. Гэтыя гады адрозніваліся новым уздымам рэвалюцыйнай барацьбы рабочага класа і сялянства, абвастрэннем яе форм і метадаў.

IV. 1934–1939 – для капіталістычнага свету перыяд гаспадарчай дэпрэсіі, новага эканамічнага крызісу, наступлення фашызму і падрыхтоўкі II Сусветнай вайны. Гэтыя гады адзначыліся ўзмацненнем барацьбы Камуністычнай партыі за ўмацаванне адзінства рабочага класу і стварэнне антыфашысцкага народнага фронту [683, с. 7–8].

Недакладнасць такога падыходу відавочная. У ім, па-першае, праглядваецца жаданне даследчыкаў дапасаваць падзеі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі пад тагачасную агульнапрынятую перыядызацыю. Па-другое, такая перыядызацыя была абумоўлена жаданнем суаднесці адпаведныя падзеі з гісторыяй КПЗБ, і па-сутнасці яна была перыядызацыяй камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі. І гэта нягледзячы на тое, што ў 1938 годзе КПЗБ была распушчана, але яшчэ раней некалькі гадоў партыя была фактычна абезгалоўлена ў выніку арышту і рэпрэсій у СССР яе кіраўніцтва.

Разгорнутыя ў другой палове 1950-х гадоў даследаванні, а таксама публікацыя дакументаў і матэрыялаў па гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага руху стварылі кадравыя, тэарэтычныя і фактычныя перадумовы для падрыхтоўкі абагульняльнай працы “Революционный путь Компартии Западной Белоруссии”, якая была выдадзена ў 1966 годзе [720]. Калектыўная манаграфія была падрыхтавана супрацоўнікамі Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ М.С. Арэхва, А.М. Мацко, І.П. Хаўратовічам, а таксама выкладчыкамі БДУ Т.І. Прытыцкай і А.У. Царуком. На думку М.С. Арэхвы, гэта была першая навуковая праца па гісторыі КПЗБ, напісаная з марксісцка-ленінскіх пазіцый.

Аўтары імкнуліся як мага найбольш глыбока і ўсебакова прааналізаваць пройдзены КПЗБ шлях, сцвердзіць яе кіруючую ролю ў барацьбе працоўных, на падставе наяўных матэрыялаў і ў межах панаваўшай метадалогіі паказалі ўтварэнне, арганізацыйную структуру, ідэйна-палітычнае ўмацаване партыі, формы і метады яе нелегальнай і легальнай працы "па мабілізацыі рабочых, бяднейшых слаёў сялянства і перадавой інтэлігенцыі на звяржэнне эксплуататарскага ладу". У кнізе адлюстраваны імёны актыўных членаў КПЗБ, ўдзельнікаў рэвалюцыйнай барацьбы. У працы акрамя ўсяго гэтага адзначаны і памылкі, якія дапускала кампартыя "ў пошуках прымянення ленінскай стратэгіі і тактыкі" ў канкрэтных умовах рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі.

Трэба адзначыць тое, што на некалькі дзесяткаў гадоў манаграфія стала для айчынных даследчыкаў своеасаблівым арыенцірам, з якім яны суадносілі свае напрацоўкі. Цяжка знайсці тыя сюжэты ў працах беларускіх савецкіх даследчыкаў, якія не атрымалі свайго пэўнага асвятлення на старонках калектыўнай манаграфіі. Тое самае тычыцца і канцэптуальнага вырашэння разнастайных пытанняў усёй гісторыі Заходняй Беларусі. Для таго часу даследаванне было не толькі актуальным па сваёй навізне і глыбіні, але і дастаткова аб'ектыўным ва ўмовах панавання марксісцка-ленінскага дыскурсу. І хоць, зразумела, у тых умовах цяжка было адлюстраваць у як магчыма больш аб'ектыўнай форме нават найважнейшыя пытанні характару і сутнасці КПЗБ, шматгранных аспектаў нацыянальна-вызваленчага руху, сёння названае даследаванне неабходна кваліфікаваць як надзвычай змястоўную працу, якая заслугоўвае яе новага прачытання.

Кніга "Революционный путь Компартии Западной Белоруссии" сваеасаблівым чынам падвяла вынікі дзесяцігадовай актыўнай навуковай працы і адначасова дала новыя імпульсы для далейшай распрацоўкі праблем, пачаўся паглыблены аналіз асобных новых аспектаў гісторыі КПЗБ, рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. У заходнебеларускай гістарыяграфіі па-ранейшаму прыярытэтнай заставалася гісторыка-партыйная праблематыка, што абумовіла выключную большасць навуковых даследаванняў КПЗБ. У яе гісторыі адбывалася тэматычная дыферэнцыяцыя, выдзяляліся новыя сюжэты, абгрунтоўвалася неабходнасць іх даследавання і асвятлення.

У цэлым, у другой палове 1950-х – 1970-х гадах сфарміраваліся навуковыя накірункі ў даследаванні гісторыі КПЗБ і КСМЗБ, распрацоўка асобных з іх была завершана ў 1980-я гады ў выглядзе кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, якія суправаджаліся разнастайнымі публікацыямі, у тым ліку і манаграфічнымі.

У кандыдацкіх даследаваннях прааналізаваны такія аспекты гісторыка-партыйнай тэматыкі, як удасканаленне арганізацыйнай

структуры і ўнутрыпартыйнай працы КПЗБ – Р.І. Налівайка [560], дзейнасці партыі па мабілізацыі працоўных на барацьбу за дэмакратычныя правы і свабоды, стварэнне адзінага рабочага і народнага фронту супраць фашызму і вайны – У.Ф. Ладысеў, І.Ф. Дзяшко [204; 402], па інтэрнацыянальным выхаванні працоўных – Г.Б. Ватковіч, С.У. Кабяк, Т.А. Гойдзь [107; 155; 350]. Патрэбна адзначыць, што блізкія па ідэйна-палітычным характары дысертацыі былі абаронены А.Я. Красіўскім і І.В. Пылыпівым ва Украіне [369; 693].

Традыцыйная для савецкай гістарыяграфіі тэма атэістычнага выхавання насельніцтва, барацьбы з клерыкалізмам, выкрыцця антынароднай сутнасці каталіцызму і ўніяцтва атрымала сваё развіццё ў выглядзе кандыдацкіх дысертацый. У даследаваннях А.П. Курносава, І.А. Фёдарава, Н.В. Анцыповіча, М.М. Ганчарова гэтыя аспекты атрымалі сваё даследаванне з відавочнай акцэнтацыяй выключнай ролі КПЗБ у правядзенні мерапрыемстваў, накіраваных на абмежаванне шкоднага і варожага ўплыву рэлігіі і асабліва каталіцызму [16; 159; 389; 840]. У такім кантэксце падавалася канфесійная гісторыя Заходняй Беларусі і ў манаграфіі Я.Н. Мараша [503; 504].

У самастойны даследчыцкі накірунак гісторыка-партыйнай навукі склалася гісторыя Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі, які трывала замацаваў за сабой статус “баявога памочніка партыі ў кіраўніцтве барацьбой працоўных за звяржэнне буржуазна-памешчыцкага ладу”. У 1970-я гады былі падрыхтаваны дзве кандыдацкія дысертацыі, прысвечаныя пытанням гісторыі камсамолу Заходняй Беларусі – А.А. Віхрава і А.М. Бобера [45; 103].

Паколькі Вільня і былы Віленскі край у кастрычніку 1939 года былі перададзены Літве і знаходзіліся ў складзе Літоўскай ССР, то праблемы дзейнасці КПЗБ на Віленшчыне вывучаліся і літоўскімі гісторыкамі. Розныя аспекты дзейнасці КПЗБ і гісторыі рэвалюцыйнай вызваленчай барацьбы на Віленшчыне з’явіліся аб’ектам навуковай увагі Ю.І. Марцінкявічуса і К.К. Манкявічуса, якія абаранілі кандыдацкія дысертацыі па ўзгаданых праблемах [506; 548].

Разуменне выключнай значнасці друку для разгортвання актыўнай дзейнасці і паспяховай барацьбы за электарат сфарміравала яшчэ адзін накірунак заходнебеларускай праблематыкі – ролю і месца друку ў нацыянальна-вызваленчым руху Заходняй Беларусі. Натуральна, што ў савецкія часы ў якасці прадмета даследавання маглі выступаць толькі адпаведна арыентаваныя друкаваныя органы: друк КПЗБ і так званы дэмакратычны друк, які быў прадстаўлены тымі сродкамі інфармацыі, якія, як правіла, былі праваднікамі палітычнай лініі Камінтэрна (друк Грамады, “Змагання”, ТБШ і інш.). Такім чынам, у кандыдацкіх дысертацыях

П.І. Зялінскага, С.У. Говіна і М.А. Ракевіча па праблемах падпольнага камуністычнага і дэмакратычнага друку [152; 294; 710], абароненых ў канцы 1960-х – пачатку 1970-х гадоў, у большай ці меншай ступені адлюстроўвалася гісторыя кампартыі і камсамолу Заходняй Беларусі, іх роля ў ідэйна-палітычнай барацьбе на заходнебеларускіх абшарах. Дадзеную праблематыку дапаўняла кандыдацкая дысертацыя І.Я. Мараша, прадметам якой стала распаўсюджванне прац У.І. Леніна ў Польшчы і Заходняй Беларусі [492; 493].

Праблемы гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі даследаваны ў пяці доктарскіх дысертацыях. Чатыры з іх гісторыка-партыйнага характару (А.М. Мацко, Б.С. Клейн, У.Ф. Ладысеў, П.І. Зялінскі) [292; 343; 403; 513], і толькі адна, абароненая на падставе манаграфіі, напісана ў аспекце грамадзянскай гісторыі (У.А. Палуян) [681], хаця і ў ёй адведзена шмат месца асвятленню “мабілізуючай і кіруючай ролі КПЗБ у класавай барацьбе працоўных за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, усталяванне савецкай улады і ўз’яднанне з БССР”. Усе доктарскія дысертацыі былі апублікаваны ў выглядзе асобных манаграфій [293; 341; 401; 516; 682].

Названыя доктарскія дысертацыі напісаны ў рэчышчы аналізу асноўных пытанняў гісторыі КПЗБ, якія былі раней пастаўлены ў кандыдацкіх дысертацыях і апублікаваных працах. Хаця, бясспрэчна, яны значна пашырылі і паглыбілі асвятленне важнейшых аспектаў дзейнасці КПЗБ, узбагацілі гістарыяграфію праблемы фактамі, палажэннямі і вывадамі. Сярод гэтых даследаванняў прынцыпова новым з’явілася дысертацыя Б.С. Клейна пра палітычную дзейнасць КПЗБ па арганізацыі супраціўлення праследванням з боку польскіх дзяржаўных рэпрэсіўных органаў, забяспячэнню самааховы ва ўмовах нелегальнага становішча. Ён першы з гісторыкаў сфармуляваў, абгрунтаваў і распрацаваў у якасці самастойнага аб’екта вывучэння праблему барацьбы палітычнай партыі супраць рэпрэсій ва ўмовах падполля Заходняй Беларусі. Цікавым гістарыяграфічным фактам з’яўляецца наяўнасць двух цалкам аналагічных па змесце аўтарэфератаў доктарскай дысертацыі Б.С. Клейна. Першы аўтарэферат быў выдадзены ў Мінску ў 1986 годзе, другі – у 1988 годзе ў Вільнюсе, дзе гісторык і абараніў доктарскую дысертацыю ў Вільнюскім універсітэце імя В. Капсукаса [342; 343]. Напэўна, аўтар адчуў, што паспяховай яго абароне ў Мінску існуе пагроза, магчыма з-за яго згаданай вышэй крытыкі, а таксама з-за яго палітычных поглядаў (у другой палове 1960-х гадоў ён выказваў негатыўнае стаўленне да палітыкі цэнтральнага кіраўніцтва СССР, асуджаў увядзенне савецкіх войскаў у Чэхаславакію, за што быў выключаны з партыі, пазбаўлены навуковых ступені і звання, але ў 1970-х гадах былі аднаўлены яго членства ў партыі, вучоныя ступень і

званне), таму палічыў за лепшае паехаць у Літву, дзе, мусіць, яго былая апазіцыйнасць не была адназначным грахом.

Назапашванне новых ведаў па гісторыі КПЗБ стварыла перадумовы для вузкатэматычнай спецыялізацыі ў яе вывучэнні. Напрыклад, ва ўсіх папярэдніх працах толькі часткова закраналіся такія пытанні, як унутрыпартыйная праца і арганізацыйная структура КПЗБ за ўвесь перыяд яе дзейнасці. Спецыяльнае комплекснае даследаванне гэтай праблемы правёў Р.І. Налівайка. У кандыдацкай дысертацыі і артыкулах [558–561] ён прааналізаваў формы і метады партыйнай працы ва ўмовах глыбокага падполля і жорсткага тэрору, прынцыпы пабудовы партыі і асаблівасці яе складу. Паказаў ідэйна-палітычную барацьбу з рознымі ўхіламі ў КПЗБ, у тым ліку з “сэцэсіяй”, якую ён кваліфікаваў як антыпартыйную і контррэвалюцыйную нацыяналістычную арганізацыю. Аўтар акцэнтаваў увагу на намаганні кіраўніцтва КПЗБ па ўмацаванні адзінства партыйных шэрагаў, па авалодванні ідэйнымі, тактычнымі і арганізацыйнымі асновамі бальшавізму.

Даследчык прааналізаваў працу і важнейшыя рашэнні трох канферэнцый і двух з’ездаў КПЗБ, якія адбыліся ў 1923–1935 гадах і адыгралі вялікую ролю ў арганізацыі і ідэйна-палітычным развіцці партыі, далейшай яе бальшавізацыі. Пры гэтым Р.І. Налівайка асабліва акцэнтаваў “братнюю дапамогу і падтрымку” Кампартыі Заходняй Беларусі з боку КП(б)Б, арганізацыю ёй у БССР на карысць КПЗБ гучных кампаній салідарнасці і пратэсту, дапамогу ў арганізацыі ў Мінску школы КПЗБ і іншых праявах “братняга супрацоўніцтва і салідарнасці”. Акрамя гэтага, гісторык агучыў шырока ўжывальную савецкімі ўладамі практыку перакідкі ў Заходнюю Беларусь на падпольную партыйную працу актыўных камуністаў – ураджэнцаў Польшчы і Заходняй Беларусі [558, с. 87–88]. Пры гэтым аўтар традыцыйна гаварыў пра інтэрнацыянальныя сувязі беларускага і польскага народаў, КПЗБ і КПП, маючы на ўвазе пытанні дзейнасці Бюро дапамогі, а потым Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б.

Аднак інфармацыя Р.І. Налівайкі не была поўнай. Справа ў тым, што ў палітычнай сітуацыі сярэдзіны 1920-х гадоў праяўлялася суперніцтва паміж КПП і беларускімі дзеячамі ў КПЗБ, якое можна праназіраць на падставе гісторыі Бюро дапамогі і Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. Яны пэўным чынам характарызуюць адносіны паміж беларускім і польскім бакамі ў іх змаганні за КПЗБ і Заходнюю Беларусь. Вядома, што ў хуткім часе пасля стварэння КПЗБ і ўваходжання ў яе склад БРА ў ліпені 1924 года пры садзейнічанні прадстаўніцтва ЦК КПРП пры Выканкаме Камінтэрна з мэтай арганізацыі дапамогі КПЗБ было створана Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б (“Закардоннае бюро”). У яго склад уваходзілі вышэйшыя дзяржаўна-партыйныя дзеячы БССР, у тым ліку

У. Ігнатоўскі, які да кастрычніка 1924 года кіраваў тэхнічнай работай і арганізоўваў выкананне рашэнняў [410; 580; 581, арк. 6].

Асоба У. Ігнатоўскага і яго дзейнасць паказальныя. Менавіта пад яго патранажам дзейнічаў М. Гурын-Маразоўскі (Ханевіч, "Ян", "Стах"), будучы правадыр "сэцэсіі", накіраваны рашэннем Бюро ЦК КП(б)Б ад 28 лютага 1924 года ў Заходнюю Беларусь і ўведзены ў склад ЦК КПЗБ, падтрымліваў сувязь з Замежным бюро ЦК КП(б)Б і асабіста з У. Ігнатоўскім, дасылаў туды лісты, атрымліваў дырэктывы, у канцы 1924 года фактычна выконваў функцыі сакратара ЦК КПЗБ. М. Гурын-Маразоўскі і "сэцэсія", магчыма са згоды У. Ігнатоўскага, мелі прамое дачыненне да выпрацоўкі і прыняцця на II канферэнцыі курса КПЗБ на арганізацыйную і палітычную падрыхтоўку да ўзброенага паўстання з мэтай вызвалення з-пад Польшчы, аб'яднання Заходняй Беларусі і БССР.

Пасля ўзнікнення ў складзе КПЗБ беларускай нацыянальнай фракцыі – т. зв. сэцэсіі, у лютым 1925 года Бюро дапамогі было скасавана. Замест яго было створана Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б, якое працавала пад кіраўніцтвам Прадстаўніцтва КПП пры Выканкаме Камінтэрна ў Маскве і фактычна лічылася яго філіялам у Мінску. Так польскія камуністы, ліквідаваўшы "сэцэсію", змаглі пазбавіцца значнай, часам вырашальнай ролі камуністаў-беларусаў, навязаць КПЗБ свой кантроль, выводзячы яе з-пад уплыву КП(б)Б, якая дэманстравала сваю незадаволенасць і патрабавала своечасовага інфармавання па пытаннях палітычнай работы ў Заходняй Беларусі [419].

Гісторыкі савецкага часу вымушаны былі шукаць у дзейнасці партыі тое, што ёй было не зусім характэрна, напрыклад абгрунтоўваць дэмакратызм КПЗБ. Таму даследчыкі займаліся вывучэннем і абагульненнем "вопыту КПЗБ у барацьбе за дэмакратычныя правы і свабоды, супраць рэакцыі і тэрору акупацыйнага рэжыму ўраду санацыі". Гэтыя пытанні сталі прадметам спецыяльнага аналізу ў кандыдацкай і доктарскай дысертацыйных працах, а таксама ў апублікаваных на матэрыялах гэтых даследаванняў артыкулах і кнігах У.Ф. Ладысева [400; 401; 404; 406; 414; 415; 421]. У іх раскрыта дзейнасць КПЗБ па арганізацыі супраціўлення працоўных мас пад кіраўніцтвам КПЗБ наступленню на эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя правы. Аўтар адзначыў рэзкае абвастрэнне ўсіх супярэчнасцяў у сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і нацыянальна-рэлігійным жыцці Заходняй Беларусі пасля сусветнага эканамічнага крызісу, узмацненне акупацыйнага рэжыму, яркім праяўленнем чаго было стварэнне канцэнтрацыйнага лагеру ў Бярозе-Картузскай у чэрвені 1934 года. Аналізуючы дзейнасць КПП і КПЗБ у сярэдзіне 1930-х гадоў, аўтар прыйшоў да высновы, што яны недастаткова актыўна вялі барацьбу ў абарону дэмакратычных свабод і выстаўлялі на першы план непасрэдную задачу барацьбы за сацыялістычную рэвалюцыю [402, с. 13].

У названых вышэй даследаваннях У.Ф. Ладысева, а таксама працах І.Ф. Дзяшко [204–207] значная ўвага надавалася ўсталяванню патрэбнага савецкай уладзе і ідэалогіі вобраза кампартыі, дзейнасць якой па згуртаванню ўсіх прагрэсіўных сіл у барацьбе за дэмакратыю, супраць рэакцыі, фашызму і тэрору, за стварэнне адзінага рабочага і шырокага народнага фронту на падставе рашэнняў VII кангрэсу Камінтэрна адпавядала інтарэсам пралетарыяту. Даследчыкі справядліва адзначалі рэальныя поспехі, якія былі наступствамі бачнага пацяплення адносін камуністаў з прадстаўнікамі іншых партый. На шырокім фактычным матэрыяле гісторыкі паказалі розныя грамадска-палітычныя кампаніі, якія правяла КПЗБ у другой палове 1930-х гадоў. Адной з такіх кампаній быў рух працоўных, усіх дэмакратычных сіл краіны за вызваленне палітвязняў. У яго ўключыліся і прадстаўнікі ППС, Бунда, Стронніцтва людовага, прагрэсіўнай інтэлігенцыі. У студзені 1936 года польскі ўрад вымушаны быў вызваліць з турмаў каля 4 тыс. палітычных вязняў, каля 5 тыс. вязням быў скарочаны тэрмін судовых прыгавораў [204, с. 19; 402, с. 21], і гэта пры тым, што польскі рэжым адназначна падаваўся як фашысцкі. Важнай вяхой на шляху стварэння народнага фронту з'явіўся і магутны рух працоўных Польшчы і Заходняй Беларусі ў абарону маладога рэвалюцыянера С.В. Прытыцкага, які па даручэнні КПЗБ у студзені 1936 года страляў у правакатара Я. Стрэльчука. Даследчыкі паказалі, што рух у абарону С.В. Прытыцкага па сваёй масавасці, размаху, працягласці і актыўнасці з'явіўся буйнейшай антыфашысцкай кампаніяй не толькі ў Польшчы, але і ў міжнародным маштабе. Аднак дысанансна гучаць разважанні пра барацьбу за дэмакратычныя правы і свабоды з выкарыстаннем відавочна тэрарыстычных метадаў, якія, хутчэй за ўсё, былі накіраваны на арганізацыю шумнай антыўрадавай кампаніі.

Вядома, што на працягу свайго існавання КПЗБ ажыццяўляла вялікую колькасць палітычных кампаній, накіраваных на мабілізацыю мас на барацьбу за мір, у абарону Савецкага Саюза ад пагрозы фашысцкай агрэсіі. Гісторыкі, якія ў якасці асноўных крыніц мелі партыйныя дакументы, на падставе іх на старонках сваіх даследаванняў сцвярджалі думку аб міралюбівасці СССР, імкнуліся выкрыць падрыхтоўку "польскага фашызму" да нападзення і г.д., пры гэтым заяўляючы аб патрабаванні працоўных ад ураду санацыі заключэння дружалюбнага саюзу з СССР. Хаця вядома, што ў міжваенны перыяд савецкія ваенныя планы не былі такімі міралюбівымі, як паказвалі савецкія агітацыйныя выданні. Да таго ж, насельніцтва неахвотна прыслухоўвалася да "антываеннай" рыторыкі камуністаў, якія з-за гэтага часам не адважваліся нават выказвацца адносна "пагрозы міру і абароны СССР" [574, арк. 4].

У даследаваннях атрымала асвятленне і кампанія “салідарнасці з барацьбой іспанскага народа супраць міжнароднага фашызму”, якая была праведзена пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ. У ёй прынялі ўдзел розныя слаі насельніцтва, ППС, Бунд і прафсаюзы рознай палітычнай арыентацыі. У 1936–1938 гадах у Іспанію прыбыло з Польшчы і Заходняй Беларусі каля 6 тысяч добраахвотнікаў – палякаў, беларусаў, украінцаў і прадстаўнікоў другіх народаў [204, с. 23]. Тут неабходна выказаць перасцярогу ў адназначным прыняцці дадзенай інфармацыі. Справа ў тым, што сярод тых, хто змагаўся ў Іспаніі, былі асобы, якіх цяжка назваць добраахвотнікамі, напрыклад, М. Дворнікава, С. Ваўпшасава і іншых удзельнікаў заходнебеларускага камуністычнага падполля, якія атрымалі ад бальшавіцкага кіраўніцтва заданне на камандзіроўку на Пірэнейскі паўвостраў. Акрамя гэтага трэба ўлічваць і тое, што добраахвотнікі з розных еўрапейскіх краін, у тым ліку і з Польшчы, змагаліся і на баку генерала Франко. Аб гэтых аспектах беларуская савецкая гістарыяграфія маўчала.

Гісторыкі дастаткова рэпрэзентатыўна імкнуліся даказаць, што барацьба супраць рэакцыі і фашызму, за мір, дэмакратыю і сацыяльны прагрэс у другой палове 1930-х гадоў з’явілася галоўнай стратэгічнай лініяй Кампартыі Польшчы і яе складовай часткі КПЗБ. Камуністы самаахвярна змагаліся за стварэнне адзінага рабочага і шырокага народнага фронту ўсіх працоўных, накіраванага як супраць польскага рэжыму, які аўтары назвалі фашысцкім, так і супраць агрэсіўных памкненняў фашысцкай Германіі, за дружбу і супрацоўніцтва з СССР. Сапраўды, доля праўды ў такіх сцвярджэннях ёсць, аднак зразумела, што гэтыя лозунгі і дзеянні мелі папулісцкае гучанне і былі накіраваны на ўмацаванне пазіцый кампартыі ў грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі, фарміраванне ў свядомасці насельніцтва Заходняй Беларусі станоўчага вобразу СССР і савецкай улады.

Нягледзячы на пэўныя карэкціроўкі гістарыяграфічнай схемы адносна нераўнамернасці развіцця нацыянальна-вызваленчага руху, на старонках навуковых даследаванняў захоўваліся ўяўленні аб нарастанні сілы антыакупацыйнай барацьбы, пры гэтым перабольшвалася месца, роля і ўзровень уздзеяння КПЗБ на тагачасную сацыяльна-палітычную сітуацыю ў Заходняй Беларусі. Даследчыкам даводзілася сцвярджаць, што моцны ўздым рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы і Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам камуністаў падрываў асновы буржуазна-памешчыцкага ладу, аднак рэжым санацыі ўстаяў. Прычыну гэтага гісторыкі бачылі ў няўзгодненасці выступленняў рабочага класу і сялянства, узмацненні тэрору з боку польскіх уладаў. Але самая галоўная прычына, лічылі гісторыкі, заключалася ў тым, што не было адзінства дзеянняў рабочага класа і ўсяго дэмакратычнага лагеру.

Адмаўляючы адказнасць КПЗБ за такое становішча, нягледзячы на яе сектанцкія, дэструктыўныя паводзіны ў дачыненні да сацыял-дэмакратычных і сялянскіх партый, гісторыкі перакладвалі асноўны цяжар адказнасці на плечы кіраўніцтва ППС, Бунда, Стронніцтва людовага і іншых партый і арганізацый, беларускіх "буржуазных нацыяналістаў", якія стаялі на антыкамуністычных і антысавецкіх пазіцыях, адмовіліся ад сумеснай з камуністамі барацьбы за стварэнне ў краіне адзінага рабочага і шырокага народнага фронту. Віна такіх арганізацый была ў тым, што яны адцягвалі працоўных ад рэвалюцыйнай барацьбы і штурхалі іх на шлях рэформ, чаго савецкая заідэалагізаваная навука не магла вітаць.

Да гонару айчынных гісторыкаў савецкага часу трэба адзначыць, што яны разам з названымі прычынамі слабасці нацыянальна-вызваленчага руху назвалі і "неапраўданыя" рэпрэсіі, якім у 1933 годзе падвергліся ў БССР былыя кіраўнікі БСРГ і "Змагання". Былыя дэпутаты польскага сейма П. Валошын, Ф. Валынец, І. Гаўрылік, І. Грэцкі, І. Дварчанін, П. Крынчык, П. Мятла, С. Рак-Міхайлоўскі, а крыху пазней Б. Тарашкевіч былі ілжыва абвінавачаны ў контррэвалюцыйнай змове і антысавецкай дзейнасці і арыштаваны. Разам з імі былі арыштаваны таксама і некаторыя кіраўнікі КПЗБ: Я. Бабровіч, А. Капуцкі, П. Клінцэвіч (Гарбацэвіч), Л. Родзевіч і іншыя. Адмоўна ахарактарызавалі аўтары і прынятыя пасля гэтых арыштаў ЦК КПЗБ у 1934 годзе дзве рэзалюцыі "Агонь барацьбы супраць нацыянал-апартунізму" і "Аб асноўных крыніцах нацыянал апартунізму ў КПЗБ", паводле якіх Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя кваліфікавалася як агентура беларускага нацыяналізму ў шэрагах партыі, прыняцце яе членаў у партыю асуджалася [414, с. 131–132; 682, с. 252–253; 720, с. 311].

Зразумела, што сёння адзначаныя вышэй прычыны няўдач вызваленчага руху бачацца, мякка кажучы, няпоўнымі: відавочна, што беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у міжваеннай Польшчы адчуваў вырашальнае ўздзеянне з боку бальшавіцка-камінтэрнаўскага кіраўніцтва, якое адпаведнымі сродкамі, у тым ліку фінансава і шляхам ціску, нават фізічнага знішчэння, аказвала ўздзеянне на палітычныя групоўкі і асобных дзеячаў, рэгулявала такім чынам актыўнасць і ўзровень беларускага руху. Красамоўным сведчаннем гэтага з'яўляецца перапіска супрацоўнікаў савецкага пасольства ў Варшаве, якія ажыццяўлялі на практыцы планы ўздзеяння савецкага кіраўніцтва на беларускіх дзеячаў рознай палітычнай арыентацыі [588].

Адным з накірункаў гістарыяграфіі гісторыі КПЗБ, які сфарміраваўся ў другой палове 1950-х і атрымаў паглыбленае развіццё ў 1970-я гады, з'явілася даследаванне дзейнасці КПЗБ па інтэрнацыянальным выхаванні працоўных. Са шматлікіх аспектаў рэвалюцыйнага руху і гісторыі КПЗБ гэтая тэма была найбольш ідэалагізаваная, зыходзіла з марксісцка-

ленінскіх пастулатаў, накіраваных на нівіляванне нацыянальнага кампаненту ў грамадска-палітычным жыцці. Гісторыкі апублікавалі шэраг навуковых артыкулаў і манаграфій, у якіх былі акумуляваны дасягнутыя вынікі [108; 109; 206; 349; 351; 352; 858].

У дысертацыях, апублікаваных артыкулах і манаграфіях адлюстраваны асноўныя накірункі і формы, якія выкарыстоўвала КПЗБ у правядзенні інтэрнацыянальнага выхавання працоўных Заходняй Беларусі, раскрыта яго роля ў дзейнасці партыі і яе цэнтральнага камітэта. Адным з важных аспектаў, які атрымаў асвятленне, з'явілася суперніцтва паміж КПЗБ і нацыянальна-дэмакратычнымі партыямі за ўплыў на насельніцтва, падкрэсліваўся яго складаны, бескампрамісны характар. Непрымірымую пазіцыю КПЗБ апраўдвалі ленінскім палажэннем: "Хто хоча служыць пралетарыяту, той павінен аб'яднаць рабочых усіх нацый, змагацца з буржуазным нацыяналізмам і "сваім" і "чужым" [352, с. 63]. Інтэрнацыянальнае выхаванне працоўных, іх мабілізацыя на барацьбу супраць буржуазна-памешчыцкага ладу з'яўлялася адной з важнейшых палітычных задач дзейнасці КПЗБ, адзначылі даследчыкі. У гэтым рэчышчы атрымала асвятленне дзейнасць рознага кшталту нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, якія існавалі ў 1920–1930-я гады ў Заходняй Беларусі. З беларускіх гэта, перш за ўсё, Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД) і Беларускі сялянскі саюз (БСС), з польскіх – Нацыянальна-дэмактратычная партыя (НДП), Нацыянальная рабочая партыя (НРП), Хрысціянская дэмакратыя (ХД), Польская сацыялістычная партыя (ППС), "Пяст", "Вызваленне", з яўрэйскіх – Бунд і Паалей-Цыён, якія, на думку вучоных, знаходзіліся на нацыяналістычнай платформе і былі кваліфікаваны як дробнабуржуазныя. На Віленшчыне дзейнічалі літоўскія арганізацыі – Хрысціянская дэмакратыя, ляўдзеннікі.

Разам з тым, як адзначыў С.У. Кабяк, вастрыё барацьбы КПЗБ супраць буржуазнага нацыяналізму было накіравана ў першую чаргу супраць ідэалогіі і палітыкі беларускіх нацыянальных партый і арганізацый – БХД, Беларускага сялянскага саюзу, "Часовай рады", якія аўтар, намагаючыся падкрэсліць іх варожасць, у тагачасных традыцыях назваў нацыяналістычнымі [352, с. 63].

Даследчыкі, раскрываючы сутнасць г. зв. нацыяналістычных буржуазных і дробнабуржуазных партый, зыходзілі з марксісцка-ленінскага палажэння аб тым, што любы нацыяналізм – беларускі, польскі, яўрэйскі, літоўскі – меў адну і тую ж класавую сутнасць: быццам бы ён абараняў інтарэсы буржуазіі, а значыць па сваёй сутнасці партыі не пралетарскага характару лічыліся варожымі. Разам з гэтым гісторыкі імкнуліся падкрэсліць, што КПЗБ з першых дзён свайго ўтварэння, ва ўмовах падполля і жорсткага тэрору з боку ўлад мужна і паслядоўна

абараняла інтарэсы ўсіх эксплуатуемых працоўных, не зважаючы на іх нацыянальную прыналежнасць, цвёрда стаяла на прынцыпах пралетарскага інтэрнацыяналізму, гэтаму ў значнай ступені спрыяў і нацыянальны склад партыі, якая аб'ядноўвала ў сваіх шэрагах беларусаў, яўрэяў, палякаў, літоўцаў, украінцаў.

Звернем увагу на нацыянальнае аблічча КПЗБ. Вышэй адзначаныя тэзісы пазіцыянуюць партыю як адназначна тэрытарыяльную арганізацыю, якая ў Заходняй Беларусі аб'ядноўвала пад сацыялістычнымі сцягамі прадстаўнікоў рознай нацыянальнасці. Гэта адпавядала заяўленым у 1923 годзе прынцыпам арганізацыйнага будаўніцтва КПП, якая паводле рашэнняў II з'езда партыі складалася з тэрытарыяльных арганізацый. КПЗБ, як тэрытарыяльная арганізацыя КПП, не мела сваёй праграмы і статуту. Змест, напрыклад, кнігі "Революционный путь Компартии Западной Белоруссии" прасякнуты думкай аб інтэрнацыянальным адзінстве, аб працы партыі па польскай, літоўскай, яўрэйскай праблеме, з чаго вынікае тэрытарыяльны характар КПЗБ. Аднак, акцэнтуючы ўвагу на гэтым, калектыўная манаграфія тут жа, у першай главе, гаворыць аб стварэнні "нацыянальнай камуністычнай арганізацыі – КПЗБ". Гэтым, а таксама абвастрэннем партызанскай барацьбы, абумоўлівалася ўзмацненне апазіцыйных настрояў і левых плыняў беларускай інтэлігенцыі і дзеячаў дробнабуржуазных партый і арганізацый, якія групаваліся вакол Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні. Стварэнне нацыянальнай КПЗБ павінна было адпаведным чынам уздзейнічаць на беларускіх паслоў у сейме [720, с. 68–70].

У дадзеным выпадку мы маем справу з шырока распаўсюджаным спосабам дзейнасці камуністаў, якія, прыстасоўваючыся да ўмоў грамадска-палітычнага жыцця краю, заяўляючы аб падтрымцы нацыянальных лозунгаў, імкнуліся маніпуляваць беларускім нацыянальным рухам і яго дзеячамі. Стварэнне КПЗБ, на самой справе тэрытарыяльнай часткі КПП, падавалася як узнікненне беларускай нацыянальнай партыі ў Польшчы. Што тычыцца інфармацыі калектыўнай манаграфіі, то тут, відавочна, мы маем справу з агаворкай аўтара першай главы, кіраўніка аўтарскага калектыву М.С. Арэхвы, аднаго з функцыянераў КПЗБ, які добра ведаў практычны бок дзейнасці партыі і распавёў пра метады ўздзеяння на беларускіх дзеячаў.

Пра тое, як КПЗБ ставілася да ленінскага лозунгу права нацый на самавызначэнне ажно да аддзялення, распавёў у сваім даследаванні П.І. Зялінскі. Ён паказаў як часта, калі і пад уздзеяннем чаго мяняліся адносіны Кампартыі Заходняй Беларусі да дадзенага стрыжнёвага пытання. Фактычна можна на падставе тэксту манаграфіі зрабіць выснову аб відавочным маніпуляванні камуністамі-інтэрнацыяналістамі праблемай самавызначэння Заходняй Беларусі [293, с. 99–103].

Комплексна разглядаючы праблему дзейнасці КПЗБ па інтэрнацыянальным выхаванні, даследчыкі шмат увагі надавалі раскрыццю розных форм і накірункаў гэтай працы. Яны адзначылі, што вялікую ролю ў інтэрнацыянальным згуртаванні рабочых і сялян адыгралі міжнародныя рэвалюцыйныя святы – 1 мая, гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, Парыжскай Камуны, дзень памяці У.І. Леніна і іншыя. Як важны аспект дзейнасці КПЗБ па мабілізацыі працоўных на выкананне свайго інтэрнацыянальнага доўга даследчыкі адзначылі арганізацыю масавай барацьбы супраць “агрэсіўных дзеянняў імперыялістаў”, іх намаганняў развязаць вайну супраць СССР. Камуністы Заходняй Беларусі актыўна прапагандавалі дасягеннні сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР і БССР, арганізоўвалі рэвалюцыйныя выступленні ў абарону краіны Саветаў. Вялікае значэнне ва ўмацаванні інтэрнацыянальных сувязяў працоўных Заходняй Беларусі з рабочымі і калгаснікамі, інтэлігенцыяй БССР мелі пастаянныя і шматпланавыя кантакты кіраўніцтва КПЗБ і КП(б)Б, узаемныя паездкі дэлегатаў працоўных. У дысертацыях і апублікаваных працах на вялікім фактычным матэрыяле асветлена салідарнасць працоўных Заходняй Беларусі з рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбой народаў Польшчы і Заходняй Украіны, замежных краін.

Агучаныя тэзісы патрабуюць звярнуць увагу на тое, што савецкія даследчыкі заходнебеларускай праблематыкі стваралі гісторыю афіцыйную, дагматычную, якая грунтавалася выключна на вузкапартыйных інтарэсах і дыктавалася камуністычнай прапагандай. Нават тыя партыйныя дакументы, якія выходзілі ў гады існавання КПЗБ, вельмі часта не мелі нічога блізкага да рэальнай практычнай дзейнасці партыі, яны ўяўлялі сабой дэкларацыі, папулісцкая сутнасць якіх павінна была наблізіць да левардыкальнай, часам дэструктыўна-тэрарыстычнай арганізацыі як мага больш спачуваючых, каб забяспечыць ёй неабходную падтрымку і ўплыў у грамадстве.

Сказанае тычыцца і Міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МАДР, МОПР), дзейнасць якой у Заходняй Беларусі таксама не засталася без увагі даследчыкаў і, на іх думку, спрыяла ўмацаванню інтэрнацыянальных сувязяў працоўных. У Заходняй Беларусі яна была створана ў 1924 годзе і працавала на нелегальным становішчы пад непасрэдным кіраўніцтвам КПЗБ. Розныя аспекты дзейнасці МАДРа закраналіся ў дысертацыях Г.Б. Ватковіча, І.Ф. Дзяшко, С.У. Кабяка, У.Ф. Ладысева, але спецыяльнае даследаванне арганізацыя атрымала ў кандыдацкай дысертацыі і апублікаваных працах Т.А. Гойдзь (Лугачовай) [155–158]. Яна прааналізавала асноўныя накірункі, змест, формы і метады працы мопраўскіх арганізацый. Даследчыца прыняла шмат звестак з мэтай падкрэсліць братэрскія ўзаемаадносіны і дапамогу адпаведных структур

СССР, ЗША, Англіі, Францыі, Аргенціны і іншых краін МАДРу Заходняй Беларусі. Асаблівая ўвага была нададзена дзейнасці МАДРа па аказанні матэрыяльнай, маральнай і юрыдычнай падтрымкі палітычным вязням і іх сем'ям, ролі МАДРа ў барацьбе з ціскам польскіх улад, за амністыю і вызваленне іх з турмаў, за стварэнне антыфашысцкага народнага фронту.

Праца Т.А. Гойдзь выканана ў гісторыка-партыйным рэчышчы, і таму акцэнт у ёй зроблены на вызначальнай ролі партыі па кіраўніцтве дзейнасцю гэтай арганізацыі ў Заходняй Беларусі. Падкрэслівалася, што КПЗБ пастаянна займалася арганізацыяй дапамогі рэвалюцыянерам. МАДР пад кіраўніцтвам КПЗБ, небеспадстаўна зрабіла выснову даследчыца, унесла вялікі ўклад у развіццё рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, у аказанне дапамогі палітвязням і ва ўмацаванне сяброўскіх сувязяў працоўных, іх інтэрнацыянальнае выхаванне. Дадзенае даследаванне мела на мэце ўхваленне КПЗБ і МАДРа. Але дэструктыўныя паводзіны мопраўцаў у дачыненні нават да сваіх саюзнікаў па барацьбе агучаны не былі і аб'ектыўнай ацэнкі ва ўмовах тагачаснай гістарыяграфічнай традыцыі не атрымалі. Так, будучы правадніком палітыкі Камінтэрну, МАДР дыферэнцавана падыходзіла да аказання матэрыяльнай падтрымкі пацярпелым ад пераследу праваахоўных органаў. Пэўным чынам "выкручвала рукі" грамадоўцам, схіляючы іх да супрацоўніцтва па пажаданым для камуністаў сцэнары. Прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху ў 1928 годзе вымушаны былі прадпрымаць захады дзеля арганізацыі збору сродкаў для падтрымкі арыштаваных грамадоўцаў, у прыватнасці, дэпутатаў, якія пасля забароны БСРГ знаходзіліся ў турме, ад імя "Дабрачыннага таварыства", бо "МАДР безнадзейны і абыходзіць беларусаў". Саветнік паўпрадства СССР у Варшаве Ю.М. Кацюбінскі у справаздачы аб сваіх перамовах са старшынёй беларускай дэпутацкай фракцыі "Змагання" Я.Е. Гаўрылікам паведаміў, што "з вялікай цяжкасцю адгаварыў іх ад гэтай справы" [299, с. 35]. Паводле сведчання архіўных дакументаў, нават у турмах, у тым ліку сярод камуністаў, узнікалі вострыя спрэчкі, якія прыводзілі да канфліктаў і скаргаў у акруговыя камітэты, апрача іншага і па пытаннях забеспячэння па лініі МАДРа. Так у сакавіку 1927 года, ужо пасля разгрому Грамады, палітычныя зняволеныя гродзенскай турмы ў сваім пісьмовым звароце да падпольных функцянераў МАДРа падалі спіс з 189 вязняў турмы, якія прэтэндавалі на дапамогу гэтай арганізацыі. Аднак яны падкрэслілі: "Сюды не ўваходзіць 13 чалавек грамадыстаў, якія ад нас ізаляваны, а таму імі апякуйцеся на свой погляд" [565, арк. 15, 15адв., 22–23].

Падводзячы рысу пад разглядам пытанняў працы КПЗБ па інтэрнацыянальным выхаванні, адзначым выключную важнасць гэтай тэмы для партыйнага кіраўніцтва ў савецкія часы. Яе распрацоўка і прапаганда

адпаведных уяўленняў выконвала найперш палітычныя задачы па распаўсюджванні і ўсталяванні інтэрнацыянальных ідэй, якія былі часткай марксісцка-ленінскай тэорыі, што панавала ў савецкім грамадстве. На гэтым фоне нацыянальныя праблемы павінны былі адыходзіць на задні план з тым, каб стварыць неабходныя ўмовы для выхавання савецкага чалавека.

Не абдзялілі ўвагай савецкія гісторыкі і пытанні дзейнасці КПЗБ на Віленшчыне (у тэрытарыяльныя рамкі дзейнасці акруговай арганізацыі партыі ўваходзілі Віленскае ваяводства і паўночная частка Навагрудскага – Лідскі і Валожынскі паветы). Да даследавання праблем рэвалюцыйнага руху ў гэтым рэгіёне, а значыць і асобных аспектаў дзейнасці КПЗБ, першым з савецкіх гісторыкаў звярнуўся Б.С. Клейн, які падрыхтаваў і абараніў кандыдацкую дысертацыю [338]. Гэтымі пытаннямі, як ужо адзначалася вышэй, займаліся і літоўскія гісторыкі Ю.І. Марцінкявічус і К.К. Манкявічус, якія па матэрыялах сваіх кандыдацкіх дысертацый апублікавалі некалькі навуковых артыкулаў [505; 546; 547]. Асобныя аспекты дзейнасці КПЗБ сярод насельніцтва Віленшчыны асветлены ў працах актыўнага ўдзельніка камуністычнага руху І.П. Каросаса [331–333]. Дарэчы, партыйны кантроль у дачыненні да І.П. Каросаса быў відавочна і празмерна літасцівы, што нехарактэрна для 1920–1930-х гадоў, ёсць звесткі, што ў час свайго зняволення ў Лукішскай турме “Каросас, кур’ер з Коўна… ненармальны ў выніку пабояў пісьмова данёс пракурору, хто такі Сямён” (Іван Бучук, адзін з арганізатараў падпольнага камуністычнага руху на Віленшчыне ў 1922 годзе. – *А.С.*) [579, арк. 1]. Вядома, што дзеля належнай пастаноўкі і рэалізацыі літоўскай складовай у КПЗБ і КПП кожны літовец-камуніст уяўляў каштоўнасць (адно веданне літоўскай мовы шмат значыла). Таму Каросасу даравалі “правакацыю”, у адрозненне ад беларускіх, польскіх, яўрэйскіх камуністаў, якіх было шмат і якія панеслі цяжар палітычных рэпрэсій у перыяд роспуску КПП і пасля яго.

У гэтых публікацыях разгледжана ўнутрыпартыйнае жыццё акруговых партарганізацый, раскрыта іх роля ў кіраўніцтве эканамічнай барацьбой, формы і метады працы па згуртаванні працоўных за свае класавыя інтарэсы. Неабходна звярнуць увагу на тое, што ў працах літоўскіх савецкіх даследчыкаў гісторыя Вільні і Віленшчыны 1921–1939 гадоў атрымлівала афарбоўку як частка літоўскай, а не беларускай гісторыі, што грунтавалася на валюнтарысцкім вырашэнні пытання прыналежнасці Вільні і Віленшчыны – у кастрычніку 1939 года бальшавікі перадалі гэтыя тэрыторыі Літве.

Згодна з замацаванымі традыцыямі аўтары асвяцілі і такія сюжэты, як дзейнасць КПЗБ у прафсаюзах, сярод сялянства, рамеснікаў і беспрацоўных. Даследчыкі шмат увагі надалі барацьбе камуністаў Віленшчыны за стварэнне адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага

фронту. Яны прыйшлі да высновы, што на падставе дэмакратычных патрабаванняў камуністам удалося згуртаваць “шырокія народныя масы ў барацьбе супраць фашызму, супраць рэакцыйнай унутранай і знешняй палітыкі польскага ўраду”. Аднак рабочы і антыфашысцкі народны фронт на Віленшчыне, як і ва ўсёй Польшчы, не быў створаны, на спрошчаную думку даследчыкаў, з-за адмовы кіраўніцтва мясцовых арганізацый ППС і Бунда супрацоўнічаць з КПЗБ.

У даследаваннях І.П. Каросаса і К.К. Манкявічуса асветлена дзейнасць Літоўскага бюро, якое было створана ў канцы 1930 года пры Віленскім акружным камітэце КПЗБ для працы з літоўскім насельніцтвам. У 1931 годзе яно было пераўтворана ў Літоўскае бюро ЦК КПЗБ. Пры гэтым літоўскія гісторыкі безапеляцыйна сцвярджалі літоўскую нацыянальна-дзяржаўную прыналежнасць “Вільнюса і ўсяго Вільнюскага краю”, называючы іх “карэннай літоўскай тэрыторыяй” [333, с. 112]. І гэта пры тым, што ў параўнанні з беларускім рухам літоўскія справы выглядалі больш як сціплыя. Так, напрыклад, Ю.І. Марцінкявічус на падставе гістарычных фактаў, у асноўным звязаных з беларускім нацыянальным рухам, у сваім жаданні замацаваць правы на Віленшчыну сцвярджаў, што “рэвалюцыйны і вызваленчы рух працоўных Віленскага краю… важны этап на шляху да вызвалення ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту… і аб’яднання ўсіх літоўскіх зямель у адзінай сям’і савецкіх народаў” [506, с. 28].

Беларуская савецкая гістарыяграфія, разважаючы пра літоўскія справы ў КПП і КПЗБ, пра ўсталяванне ўплыву на літоўскае насельніцтва ў Заходняй Беларусі, устрымлівалася ад асэнсавання тэрытарыяльных праблем, якія існавалі паміж беларускімі, польскімі і літоўскімі камуністамі, што прыводзіла да няўзгодненасці сярод беларускіх гісторыкаў у дачыненні да вызначэння плошчы тэрыторыі Заходняй Беларусі [733; 741]. І сапраўды, спрэчкі ў ідэалогіі камуністычнага руху Заходняй Беларусі, у першую чаргу, мелі тэрытарыяльны характар і тычыліся пытання замацавання адпаведных уплываў і праблемы дзяржаўнай прыналежнасці Вільні і Віленшчыны [740]. Пры гэтым відавочна, што стварэнне Літоўскага бюро не дыктавалася жаданнем польскіх ці беларускіх камуністаў, хутчэй за ўсё яго ўладкаванне было прадыктавана з Масквы. Савецкія палітыкі ўсяляк хацелі задобрыць літоўцаў, заахвочвалі іх да сумеснай працы, каб потым выкарыстаць у выглядзе плацдарма, напрыклад, у супрацьстаянні з Польшчай, а магчыма і для паходу ў Еўропу. Трэба мець на ўвазе і тое, што паводле савецка-літоўскай дамовы ад 12 ліпеня 1920 года Вільня і Віленшчына абяцаліся бальшавікамі Літве [542].

Розныя аспекты дзейнасці КПЗБ на Віленшчыне канкрэтызаваны ва ўспамінах ветэранаў рэвалюцыйнага руху [99] і зборніках дакументаў і

матэрыялаў [718]. Пры гэтым трэба адзначыць відавочнае імкненне іх складальнікаў як мага больш трывала сцвердзіць "літоўскасць" Вільні і Віленшчыны: на першы план выстаўляліся дакументы, у якіх фігуруюць літоўскія дзеячы, населеныя пункты і адпаведныя падзеі, якія адлюстроўвалі літоўскую гісторыю.

У даследаваннях вялікая ўвага надавалася ўсталяванню думкі аб складанасцях і цяжкасцях нацыянальна-вызваленчага руху, якія былі вынікам праследаў, тэрору, правакацый польскіх уладаў. Найбольшую ўвагу на гэтыя аспекты звярнулі Б.С. Клейн і У.Ф. Ладысеў. Аднак беларускім савецкім гісторыкам трэба аддаць належнае за тое, што, нягледзячы на тагачасны гістарыяграфічны клімат, паступовую рэсталінізацыю, якая пачалася ў часы Л.І. Брэжнева, на старонках навуковых даследаванняў звярталася ўвага на страшэнны ўдар, які быў нанесены ў спіну беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў 1930-я гады ў выніку рэпрэсій і роспуску КПЗБ. Безумоўна, гэта былі толькі згадкі назыўнога характару, аднак для ўважлівых чытачоў яны з'яўляліся падставай для адпаведных высноў пра відавочны валюнтарызм і гвалтоўнасць бальшавіцкага кіраўніцтва ў дачыненні да заходнебеларускіх дзеячаў.

Адным з гісторыка-партыйных накірункаў савецкай гістарыяграфіі праблемы з'яўлялася навуковае асвятленне гісторыі камсамолу Заходняй Беларусі як "вернага баявога памочніка кампартыі ў барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне". Публікацыі па гісторыі КСМЗБ, падрыхтаваныя былым камсамольскім лідарам, актыўным удзельнікам рэвалюцыйнага руху С.Р. Анісавым [12–14], як і іншыя працы ўдзельнікаў падзей нацыянальна-вызваленчага руху, мелі мемуарны характар са значным элементам навуковага даследавання. У іх камсамол ахарактарызаваны як "баявая камуністычная арганізацыя", якая ўзначальвала пад кіраўніцтвам КПЗБ барацьбу моладзі Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

У публікацыях па гісторыі КСМЗБ М.А. Бобера і А.А. Віхрава [44; 45; 46; 100–105] прааналізаваны сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча моладзі Заходняй Беларусі, працэс арганізацыйнага афармлення, станаўлення і ўмацавання камсамолу. Дадзена характарыстыка асноўных маладзёжных арганізацый розных палітычных накірункаў, раскрываюцца формы арганізацыйнай і ідэйна-палітычнай работы КСМЗБ сярод моладзі. Значная ўвага нададзена асвятленню дзейнасці камсамолу па стварэнні і ўмацаванні адзінства маладога пакалення ў барацьбе супраць фашызму, за мір і дэмакратыю, па фарміраванні ў яго інтэрнацыянальнай салідарнасці з усімі эксплуатуемымі працоўнымі, братэрскіх пачуццяў да савецкага народу. Праз усе даследаванні, у якіх закранаюцца сюжэты з камсамольскай

гісторыі, праведзена ідэя аб кіруючай ролі кампартыі дзейнасцю камсамолу Заходняй Беларусі. У 1978 годзе выйшаў у свет сборнік дакументаў і матэрыялаў, якія непасрэдна тычыліся пытанняў гісторыі КСМЗБ [719].

Асобныя моманты дзейнасці КСМЗБ знайшлі адлюстраванне практычна ва ўсіх гісторыка-партыйных працах і перш за ўсё ў калектыўнай манаграфіі "Революционный путь Компартии Западной Белорусии", у якой дадзена абагульненая ацэнка палітычнай і арганізатарскай дзейнасці камсамолу сярод рабочай і сялянскай моладзі. Пры гэтым трэба адзначыць дастатковы ўзровень аб'ектыўнасці, з якой адлюстроўвалі камсамольскія падзеі на старонках выдання. Гэта тычыцца інфармацыі аб схільнасці камсамольскіх арганізацый успрымаць нацыянальныя каштоўнасці ў рэвалюцыйным руху, нечаканай падтрымцы камсамольскімі арганізацыямі ідэй і дзеянняў "сэцэсіі" ў КПЗБ [100, с. 58–61]. Аднак, у асноўным, паказ дзейнасці камсамолу Заходняй Беларусі быў відавочна шаблонным. Так, напрыклад, у працах І.Ф. Дзяшко і У.Ф. Ладысева акцэнтуецца ўвага на ролі КСМЗБ як баявога памочніка КПЗБ у барацьбе за дэмакратычныя правы і свабоды, за стварэнне адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту. У даследаваннях Г.Б. Ватковіча і С.У. Кабяка прыводзяцца факты ўдзелу камсамолу ў інтэрнацыянальным выхаванні працоўных.

Падводзячы рысу пад вывучэннем праблем гісторыі КСМЗБ, неабходна адзначыць тое, што гэтая тэма не атрымала скразнога асвятлення. Сёння, на нашу думку, існуюць тэарэтычныя і фактаграфічныя перадумовы для падрыхтоўкі абагульняльнай працы па гісторыі камсамолу Заходняй Беларусі, якая будзе накіравана на яе аб'ектыўнае, а не схематычнае адлюстраванне. Гэта тычыцца і перспектыўнай справы, накіраванай на навуковую распрацоўку гісторыі моладзі Заходняй Беларусі, а таксама асобных яе арганізацыйных асяродкаў. Тым больш, што такая праца ўжо распачата айчыннымі даследчыкамі [66–68; 370–373; 489; 507].

Гісторыкі выконвалі задачу стварэння іканічных вобразаў дзеячаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі – "палымяных рэвалюцыянераў", "барацьбітоў за шчасце народнае". Паступова фарміравалася іерархія такіх герояў, на вяршыні якой па колькасці публікацый узвышалася В. Харужая. Яна атрымала найбольш увагі вучоных-гісторыкаў і публіцыстаў, асабліва пасля надання ёй у 1960 годзе звання Героя Савецкага Саюза. Акрамя згаданых, ёй прысвячалася велізарная колькасць іншых публікацый [56; 264; 265; 610; 776–778; 850–852; 898 і інш.], а ў 1975 годзе С.В. Талапіна абараніла адмысловую дысертацыю, прысвечаную асэнсаванню рэвалюцыйнай і публіцыстычнай дзейнасці В. Харужай [821]. Колькасць прац у выглядзе новых публікацый ці перавыданняў, артыкулаў

асабліва павялічвалася ў юбілейныя гады. Цяжка знайсці перыядычнае выданне БССР, у якім не змяшчалася б інфармацыя пра В. Харужую.

Блізка да яе знаходзяцца С. Прытыцкі [38; 266; 530; 676; 903], Б. Тарашкевіч [40; 339; 345; 346; 453; 460; 499; 615; 900], М. Дворнікаў [257–260] і некаторыя іншыя, розным аспектам рэвалюцыйнай дзейнасці якіх у Заходняй Беларусі таксама надавалася шмат увагі дзеля прапаганды і папулярызацыі іх гераізму, вернасці, адданасці і самаахвярнасці справе камуністычнай партыі.

У традыцыях партыйнай літаратуры пытанні нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі набылі адлюстраванне і ў працах літаратуразнаўчага і культуралагічнага характару, напрыклад, У.А. Калесніка [321–325], А.С. Ліса [453–455; 457; 458; 460]. Для іх быў характэрным паказ складаных і неадназначных падзей з сацыяльна-палітычнага і культурнага жыцця Заходняй Беларусі па дуалістычнай схеме: “прагрэсіўная грамадскасць” – свае, “буржуазныя нацыяналісты” – чужыя, з варожым нутром.

Адзначым тую акалічнасць, што ўсе найбольш значныя публікацыі суправаджаліся выхадам рэцэнзій і водзываў на гэтыя працы. Напрыклад, на выхад зборніка дакументаў і матэрыялаў “Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР” [502; 533; 885; 886], на працу С.Р. Анісава “Крутымі шляхамі” [11; 82], на кнігу У.А. Палуяна і І.В. Палуяна “Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг.” [844], на даследаванні А.А. Сарокіна [9; 57; 532], А.М. Мацко [49; 151], М.С. Арэхвы [407; 454], У.Ф. Ладысева [434; 441], П.І. Зялінскага [348] і многія іншыя. Аднак гэтыя рэцэнзіі насілі прывітальны характар і не змяшчалі сур’ёзных заўваг і папрокаў з боку рэцэнзентаў.

Такім чынам, савецкімі гісторыкамі ў другой палове 1950-х – 1980-я гады была праведзена значная навуковая праца па вывучэнні праблем гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху. Улічваючы грамадска-палітычныя, арганізацыйна-метадалагічныя, крыніцазнаўчыя ўмовы развіцця гістарыяграфіі праблемы гэтую працу можна лічыць пазітыўнай, нягледзячы на тое, што даследаванні ажыццяўляліся па загадзя вызначанай лініі і з адпаведнай акцэнтацыяй. Яны ставілі левардыкальную КПЗБ з яе выразным сацыяльна-класавым абліччам і роляй у падзеях беларускага руху на безумоўна першае і вырашальнае месца, даючы магчымасць асвятляць тыя бакі пытанняў, якія не супярэчылі ўсталяваным падыходам, станоўча ацэньваючы толькі тых, хто лаяльна ставіўся да кампартыі ці падтрымліваў з ёй арганізацыйныя сувязі. Даследаванні актыўна разгарнуліся пасля XX з’езда КПСС, які ажыццявіў палітычную і гістарычную рэабілітацыю ў адносінах да кампартый Польшчы, Заходняй

Беларусі і Заходняй Украіны і даў своеасаблівы дазвол на навуковае даследаванне раней забароненых тэм. Быў падрыхтаваны шэраг кандыдацкіх, а потым і доктарскіх дысертацый, апублікаваны артыкулы, брашуры, манаграфіі. У 1966 годзе выйшла абагульняльная праца па гісторыі КПЗБ, якая адначасова стымулявала далейшае, больш паглыбленае вывучэнне яе асобных аспектаў. Гісторыка-партыйная праблематыка ў навуковых даследаваннях аказалася прэваліруючай.

Гісторыя КПЗБ атрымала шырокае асвятленне не толькі ў дысертацыях, але і ў апублікаваных манаграфіях, абагульняльных працах па гісторыі КПСС і КПБ, а таксама ў мемуарах ветэранаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, зборніках дакументаў і матэрыялаў. Нельга адназначна гаварыць пра такое становішча як пра адмоўную гістарыяграфічную з’яву, бо відавочна, што шырокае вывучэнне КПЗБ стымулявала асэнсаванне іншых аспектаў заходнебеларускай праблематыкі. Такім чынам, у другой палове 1950-х – 1980-я гады гісторыя КПЗБ – своеасаблівы “лакаматыў”, які “цягнуў” за сабой “вагоны” ў выглядзе самастойных даследчыцкіх накірункаў, афарбаваных адпаведным пракамуністычным, сацыяльна-класавым чынам.

Але трэба адзначыць, што прымяненне марксізму як метаду навуковага даследавання не магло забяспечыць аб’ектыўнага вывучэння гісторыі КПЗБ, КСМЗБ і ўвогуле пытанняў гісторыі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху. Пры тым, што Кампартыі Заходняй Беларусі надавалася авангардная роля ў “барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне”, шмат якія бакі гісторыі дзейнасці КПЗБ аказаліся па ідэалагічных і палітычных прычынах па-за ўвагай гісторыкаў, не атрымалі дастатковага аб’ектыўнага асвятлення.

Гэта тычылася, у першую чаргу, пытанняў стварэння і роспуску КПЗБ, у тым ліку рэпрэсій у адносінах да былых членаў КПЗБ, стасункаў Кампартыі Заходняй Беларусі з КП(б)Б, КПЗУ, КПП, Кампартыяй Літвы, Камінтэрнам, удзелу ў партызанскай, дыверсійна-разведвальнай дзейнасці, фінансавання падпольнай працы. Як арганічнай часткі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху патрабуе аб’ектыўнага, праўдзівага, паглыбленага разгляду гісторыя г. зв. сэцэсіі, якая ўвесь час падвяргалася навуковаму шальмаванню. Да разраду недастаткова вывучаных неабходна аднесці пытанні ўзаемаадносін КПЗБ з беларускімі нацыянальнымі партыямі і арганізацыямі.

Не атрымала належнага даследавання і неабходнай дэталізацыі праблема фракцыйнай барацьбы ў КПЗБ, якую толькі павярхоўна закраналі гісторыкі, пры гэтым адзначаючы вастрыню гэтай унутрыпартыйнай з’явы [720, с. 159–162, 185]. Наяўныя архіўныя матэрыялы змяшчаюць шмат інфармацыі аб дадзенай важнай старонцы гісторыі партыі [571, арк. 15–22].

Што тычыцца пытання стварэння КПЗБ, то, відавочна, яно было выклікана жаданнем савецкага кіраўніцтва ўмацаваць сваю прысутнасць у Польшчы. Натуральна, становішча ў Заходняй Беларусі было зручнай падставай для бальшавіцкага кіраўніцтва выступаць у якасці абаронцы правоў прыгнечанага народа, а беларускі рух для Масквы быў адным са сродкаў пралангацыі сваіх уплываў, пры дапамозе якога рэалізоўвалася камінтэрнаўская палітыка ў Польшчы. Менавіта ў такім кантэксце трэба разглядваць канчатковую рэалізацыю ідэі стварэння беларускай камуністычнай партыі ў Польшчы – КПЗБ, якая павінна была прыстасоўвацца да ўмоў грамадска-палітычнага жыцця ў Заходняй Беларусі, выкарыстоўваць існуючую сярод беларускага народа незадаволенасць, перацягваць на свой бок актыўныя элементы, навязваючы свае сацыяльна-класавыя каштоўнасці замест ідэй беларускага нацыянальна-вызваленчага характару [734; 735; 748–750]. Стварэнне КПЗБ было тактычным крокам Камінтэрна для разгортвання больш шырокага і трывалага рэвалюцыйнага руху ў Польшчы ва ўмовах павелічэння ролі і месца беларускага фактара ва ўнутранапалітычным жыцці дзяржавы, відавочным сведчаннем чаго з’яўляліся вынікі выбараў у польскі сейм у 1922 годзе. У асобе сваіх выбраннікаў, дэпутатаў сейма, беларускія сяляне бачылі абаронцаў нацыянальных і сацыяльных інтарэсаў беларускага народа ў складзе Польшчы [720, с. 54].

КПЗБ стваралася спешна ў кастрычніку 1923 года ў час узброенага паўстання ў Кракаве, калі Камінтэрн патрабаваў “ад Кампартыі Польшчы ўзначаліць кіраўніцтва паўстаннем і пачаць стварэнне чырвонай гвардыі, каб трансфарміраваць паўстанне ў рэвалюцыю” [449, с. 271]. Для перацягвання на свой бок беларускіх палітыкаў сацыялістычнай арыентацыі бальшавіцкае кіраўніцтва пайшло на тактычны крок: “замацавала” за КПЗБ тэрыторыю Віленшчыны, нягледзячы на тое, што 12 ліпеня 1920 года ў Маскве, як вядома, быў падпісаны савецка-літоўскі дагавор, згодна з якім бальшавікі перадавалі Віленшчыну Літве – пакуль яшчэ не савецкай [542]. Пазней літоўскія камуністы неаднаразова аспрэчвалі рашэнне аб замацаванні Вільні і Віленшчыны за КПЗБ [718, с. 109–111]. Прызнанне Віленшчыны беларускай этнічнай тэрыторыяй безумоўна ўздымала патрыятычны настрой беларускіх нацыянальных дзеячаў, якія спадзяваліся на канчатковае замацаванне з цягам часу Вільні і Віленшчыны за Беларуссю.

Стварэнне КПЗБ, разгортванне ёй пад нацыянальнымі беларускімі сцягамі “барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне” павінна разглядвацца ў цеснай сувязі з дзейнасцю Камінтэрна па распаўсюджванні сусветнай рэвалюцыі, КП(б)Б, КПП і КПЛ, з арганізацыяй партызанскага руху, “сэцэсіяй”. У гэтым кантэксце трэба грунтоўна вывучаць гісторыю

БПС-Р і БРА, іх дзейнасць па арганізацыі партызанскага руху, асэнсаванне пазіцыі іншых беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, якія не падтрымлівалі камуністычную ідэалогію, але былі перакананымі прыхільнікамі незалежнасці Беларусі, яе тэрытарыяльнай цэласнасці, па прынцыпова важкіх для беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пытаннях ішлі на супрацоўніцтва з КПЗБ.

Нягледзячы на відавочную ўвагу да гісторыі КПЗБ, не атрымала вырашэння праблема колькаснага складу партыі. Так, напрыклад, аўтары калектыўнай манаграфіі па гісторыі КПЗБ прывялі наступныя звесткі: да канца 1924 года ў КПЗБ было 2296 членаў партыі, напярэдадні І з’зда КПЗБ – 2500 чалавек, да сакавіка 1932 – 3600, у 1933 – 3800–4000, акрамя гэтага 3000–3500 знаходзілася ў турмах, значыць агульны лік больш за 7000 партыйцаў. Напярэдадні ІІ з’езда КПЗБ (май 1935) партыя мела 3300 членаў, у разрэзе акругаў – 2991 [720, с. 78, 182, 242, 322]. Амаль аналагічныя паказчыкі мае манаграфія Б.С. Клейна, які са спасылкай на цытаваную вышэй калектыўную манаграфію прывёў наступныя звесткі: напярэдадні І з’езда КПЗБ – 2500 чл., да сакавіка 1932 – 3600 чл., 1933 – 3800–4000 чл. Акрамя гэтага 3000–3500 знаходзілася ў турмах, значыць агульны лік больш за 7000 членаў партыі, а са спасылкай на “Решения II съезда Коммунистической партии Западной Белорусии” (Вільно, 1935) паказана колькасць партыі напярэдадні І з’езда КПЗБ – 2500 чл., а напярэдадні ІІ з’езда КПЗБ (май 1935 года) – 3300 чл. [341, с. 94, 135]. У.Ф. Ладысеў прывёў колькасць заходнебеларускіх камуністаў на 1930-я гады: у пачатку – сярэдзіне 1934 года – 3327 чалавек; пасля паліцэйскіх рэпрэсій (май 1935) – 2.5 тыс.членаў (са спасылкай на даклад М.С. Арэхвы), плюс 4 тыс. палітзняволеных членаў партыі – 7 тыс. чалавек. [414, с. 73–74]. Бачыцца неабгрунтаваным выдзяленне асобнай катэгорыі палітзняволеных, як быццам бы яны не знаходзіліся на партыйным уліку. Вядома, што ў турмах камуністы не спынялі партыйнае жыццё, мелі сувязі з камуністычным падполлем. Звесткі Сакратарыята ЦК КПЗБ ад 20 лістапада 1933 года не згадваюць палітзняволеных членаў партыі, называюць лічбу 3 500 чалавек [54, с. 271].

Неабходна адзначыць, што дакладную лічбу колькасці членаў КПЗБ устанавіць немагчыма. Справаздачы партыйных функцыянераў не могуць разглядвацца як крыніцы абсалютна даставернай інфармацыі, да іх трэба ставіцца крытычна. Прадстаўнікі партыйнай наменклатуры маглі падаваць звесткі, якія змяшчалі заведама недакладную інфармацыю ў бок павелічэння, што на паперы даказвала эфектыўнасць іх працы ў падполлі і, што немалаважна, апраўдвала выдаткаваныя фінансавыя сродкі. Напрыклад, у справаздачы ЦК КПЗБ за чэрвень 1925 года гаварылася пра наяўнасць у шэрагах партыі на 1 красавіка бягучага года 1970 партыйцаў,

пры гэтым выказвалася думка, што пасля атрымання дадзеных з усіх райкамаў колькасць павялічыцца да 2500–2800 членаў партыі. Было адзначана, што 70 % партыі складае сялянства – “матэрыял сыры, які патрабуе агромністай працы. Рост партыі пакуль не прыпыніўся. Частка элемента партыі безумоўна зусім выпадкова знаходзіцца ў яе шэрагах. Гэтыя пачалі ужо адпадаць і будуць адпадаць у будучым” [584, арк. 14]. Да таго ж КПЗБ – падпольная, нелегальная партыя, многія яе актыўныя ўдзельнікі маглі і не фігураваць у адпаведных спісах і тым больш не мець партыйных білетаў. У дакументах польскіх органаў, судовых, паліцэйскіх, вайсковых, маецца вялікая колькасць анкет і пратаколаў судовых спраў на грамадзян, жыхароў Заходняй Беларусі, якія толькі падазраваліся ў камуністычнай дзейнасці, за што былі арыштаваныя польскай уладай. Аднак іх арышт з-за падазрэння не ёсць пацвярджэнне членства ў партыі. Наадварот, многія аспрэчвалі сваю прыналежнасць да кампартыі, адмаўляліся ад КПЗБ, былі відавочна ўцягнутыя ў антыдзяржаўную дзейнасць па эканамічных прычынах, напрыклад, за грошы. Акрамя гэтага, як камуністычных дзеячаў з адпаведнай акцэнтацыяй крыніцы кваліфікуюць і многіх тых, каго падазравалі ў правядзенні падрыўной, разведвальна-дыверсійнай дзейнасці на тэрыторыі Польшчы [213–225; 234–237; 243; 245; 248; 251]. Да таго ж дакументы польскіх паліцэйскіх органаў утрымліваюць аператыўную інфармацыю пра колькасць КПЗБ па асобных акругах і раёнах, у прыватнасці Віленскі аддзел бяспекі ад 27 студзеня 1933 года – пра Віленскую акруговую арганізацыю КПЗБ. Разам з партыйцамі ў ім улічаны і камсамольцы, прычым побач з іншымі названы “28 mężow zaufania”, а таксама “нячынныя” і нават тыя, якія доўгі час не праяўлялі дзейнасці [244, арк. 34адв.]. Гэтыя акалічнасці ўскладняюць праблему высвятлення колькасных паказчыкаў КПЗБ і КСМЗБ.

Разважаючы адносна пытанняў заходнебеларускага партыйнага жыцця, нельга пакінуць па-за ўвагай меркаванне польскай даследчыцы А. Бергман, якая ўзняла яшчэ адну, вельмі важную і перспектыўную праблему. Яе сутнасць заключаецца ў неабходнасці актывізацыі навукова-даследчыцкіх намаганняў на пытанне асэнсавання чужых, у тым ліку пазабеларускіх сіл, якія мэтанакіравана ўспрымалі саму ідэю беларускага нацыянальна-вызваленчага руху як, відавочна, грунтоўную падставу для стварэння трывалых уласных падмуркаў сацыяльна-палітычнага ўплыву. “Трагедыя КПЗБ заключаецца ў тым, што ёй кіравала ДПУ-НКУС у асобе прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б. НКУС не толькі ведаў, што робіцца ў КПЗБ, ён вызначаў яе стратэгію і тактыку. Пад яго кіраўніцтвам КПЗБ у канцы 20-х гадоў пачала праводзіць палітыку нацыянальнага нігілізму і рабіць гэта ў такой ступені, што быў знішчаны ўвесь цвет актыву “Грамады” і “Змагання” і шэраг дзеячоў КПЗБ яшчэ ў

1933 годзе. …На самой справе члены КПЗБ самаадданa змагаліся, не лічачыся са смерцю, а мэты сваёй барацьбы яны не ведалі” [41].

Аднак нельга абмяжоўваць знешнюю абумоўленасць беларускага камуністычнага руху ўплывам толькі расійска-савецкіх дзяржаўных і партыйных органаў. У якасці самастойнага чынніка грамадска-палітычнага жыцця ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне трэба разглядваць кампартыю Польшчы, якая канчаткова не адмаўлялася ад польскіх нацыянальных інтарэсаў, афіцыйна аддаючы прыярытэт інтэрнацыянальным ідэям [740]. Стварэнне КПЗБ у тым выглядзе, у якім яно адбылося, яе дзейнасць была на карысць польскім камуністам, якія атрымалі пэўны кантроль над беларускім рухам, маглі аказваць на яго вырашальны ўплыў. Негатыўнае стаўленне КПП да дзейнасці беларускіх і ўкраінскіх нацыянальна-дэмакратычных партый, нават польскі шавінізм, выразна праяўляліся ва ўнутрыпартыйным жыцці і трансляваліся на КПЗБ і КПЗУ, патрабуючы ад іх адпаведных адносін і дзеянняў у дачыненні да такіх партый. Так, напрыклад, у студзені 1934 года на пленуме ЦК КПП ва ўмовах узмацнення таталітарных тэндэнцый у жыцці Польшчы, аслаблення супраціўлення гэтаму з боку дэмакратычнага лагеру, у тым ліку ў выніку рэалізацыяй камуністамі тэорыі сацыял-фашызму і нацыянал-фашызму, было прынята красамоўнае рашэнне аб адносінах да беларускіх і ўкраінскіх партый. Мясцовым ячэйкам для барацьбы з легальнымі беларускімі і ўкраінскімі арганізацыямі было настойліва прапанавана дыскрэдытаваць іх у вачах народа шляхам прадстаўлення такіх арганізацый, як агентур польскага імперыялізму, узмацняць давер да нацыянальнай палітыкі СССР. Гэтая інфармацыя стала хутка вядомай дзяржаўнай паліцыі, супрацоўнікам якой, напэўна, былі дадзены адпаведныя рэкамендацыі па распаўсюджванні атрыманых звестак для паглыблення супярэчнасцей сярод партый антысанацыйнага стану [237, арк. 54].

Не вытрымліваюць крытыкі і сцвярджэнні аўтараў аб перманентнай варожасці і непрымірымай барацьбе КПЗБ з сацыялістычнымі, буржуазнымі і сялянскімі непралетарскімі партыямі, у тым ліку беларускімі. Навейшыя публікацыі сцвярджаюць думкі аб нефармальным узаемадзеянні і супрацоўніцтве камуністаў з прадстаўнікамі іншых партый і плыняў, без чаго, выкарыстоўваючы выраз А. Бергман, КПЗБ “вісела б у пустаце”. Гэта тычыцца і першай паловы 1920-х гадоў, калі камуністы наладжвалі супрацоўніцтва з Беларускім пасольскім клубам, не спыняліся такія адносіны ў часы Грамады [647], не разарваліся яны канчаткова ў час асаблівага пагаршэння адносін з-за рэалізацыі ідэй VI кангрэса Камінтэрна (КПЗБ заклікала шукаць кантакты з шэраговымі дзеячамі ППС, Бунда і інш.) [720, с. 192, 287]. З сярэдзіны 1930-х гадоў да самага свайго роспуску камуністы працавалі на наладжванне супрацоўніцтва з любымі

антаганістамі польскай улады, не цураючыся свайго прынцыповага суперніка ў асобе БХД-БНА [87; 96].

Што тычыцца супрацоўніцтва з небеларускімі палітычнымі партыямі, то ілюстрацыяй выгаднага для КПЗБ супрацоўніцтва могуць стаць яе адносіны з Бундам. У выніку ўзаемадзеяння легальных гурткоў Бунда з нелегальнымі арганізацыямі КПЗБ стварылася вельмі зручная для камуністаў сітуацыя, калі мясцовыя ячэйкі легальнай арганізацыі Бунд, магчыма атрымліваючы некаторае фінансаванне, удзельнічалі ў правядзенні камуністычных акцый [727]. Так, напрыклад, секцыя дэфензівы другога аддзела 2-й арміі ў рапарце за чэрвень 1921 года паведамляла, што бальшавікі, акрамя вялікай масы агітатараў і эмісараў, актыўнага распаўсюджвання нелегальнай літаратуры, знайшлі сабе важных прыхільнікаў з асяродку "яўрэйскай моладзі, што групуецца вакол лаяльнай арганізацыі "Сіяністаў", якая з'яўляецца арганізацыяй Бунда і кіруецца яго праграмай" [211, арк. 236–237]. У 1924 годзе Іцка Трахтэр быў асуджаны за прыналежнасць да камуністычнай партыі. Сарненская экспазітура дзяржаўнай паліцыі правяла па гэтай справе разбіральніцтва, з якога вынікае, што І. Трахтэр, які пражываў у Дубровіцы і знаходзіўся пад наглядам паліцыі, меў кантакт з камуністычнай арганізацыяй у Пінску і з членамі Бунда ў Дубровіцы і Століне [221, арк. 1, 30–31, 37].

Па падазрэнні ў камуністычнай дзейнасці праходзілі іншыя члены бундаўскай арганізацыі, напрыклад, якія фігуравалі ў справе распаўсюджвання камуністычных адозваў у Дубровіцы 28 кастрычніка 1924 года [222, арк. 14, 18]. Пра раскідванне камуністычных улётак у час першамайскай дэманстрацыі ў 1925 годзе ў Брэсце паведмляецца, што "у час шэсця жыхар горада Брэста-над-Бугам Тэненбаум Сруль, вядомы мясцовай экспазітуры як камуністычны дзеяч, кінуў перад ваяводствам пачак камуністычных адозваў..." Названы С. Тэненбаум быў членам Брэсцкага акруговага камітэта Бунда, адказным за фінансавыя пытанні. Пад уплывам кампартыі знаходзілася бундаўская маладзёжная арганізацы Югенд-Бунд Цукуфт [55, с. 104–105, 178, 265].

Такога кшталту шчыльныя адносіны паміж камуністамі і бундаўцамі можна патлумачыць тым, што ў пачатку 1920-х гадоў бальшавіцка-камінтэрнаўскае кіраўніцтва рабіла шмат намаганняў, накіраваных на стварэнне ў Польшчы пракамуністычный апазіцыйный арганізацыі. У якасці такой разглядваўся Бунд, цэнтральны камітэт якога шматразова звяртаўся ў Сакрэтны аддзел Цэнтральнага бюро КП(б)Б з просьбай дапамагчы ў арганізацыі нелегальнага перахода праз савецка-польскую мяжу, у тым ліку фінансава і дакументамі, бундаўцам, якія павінны былі ўзмацняць камуністычныя ўплывы ў Польшчы, у прыватнасці "камуністычныя тэндэнцыі ў Польскім Бундзе" [578, арк. 1–23]. Праўда,

пазней у КП(б)Б з камуністычнага падполля Заходняй Беларусі і Польшчы пачала прыходзіць інфармацыя аб дэструктыўнай працы перасланых таварышчах-бундаўцах і просьбе больш членаў Бунда не перасылаць, бо яны псуюць справу [575, арк. 3адв.].

Для самога Бунда супрацоўніцтва з КПЗБ было небяспечным, бо наводзіла падазрэнне ў антыдзяржаўнай дзейнасці і магло стаць падставай для спынення дзейнасці партыі. Арганізатары ж камуністычнага падполля ў Заходняй Беларусі былі зацікаўлены ва ўцягненні ў яго бундаўцаў, у выкарыстанні магчымасцей легальнай партыі, не баяліся падставіць Бунд пад рэпрэсіі, якія маглі б прывесці да ажыўлення антыдзяржаўнай дзейнасці ў Польшчы, што было на руку камінтэрнаўскаму кіраўніцтву. Так у заходнебеларускім грамадстве камуністамі штучна стваралася сітуацыя расколу, калі ў выніку рэпрэсій з боку дзяржаўных органаў незадаволенае насельніцтва ішло за камуністамі. Такога кшталту схемы былі рэалізаваны камуністамі ў выніку стварэння БСРГ, НПХ, Сельроба, якія актыўна дзейнічаў на тэрыторыі Палескага ваяводства з удзелам КПЗБ.

Відавочна, што створаная ў 1960–1980-я гады карціна гісторыі КПЗБ была гісторыяй афіцыйнай КПЗБ, а не канкрэтна-гістарычнай кампартыі Заходняй Беларусі. Гэтыя паняцці ў гістарычным і гістарыяграфічным сэнсе не тоесныя. Гістарычныя працы ўяўлялі сабой асэнсаванне падзей на падставе марксісцкіх патрабаванняў партыйнасці і класавага падыходу. Агучванне партыйных лозунгаў, адозваў, пастаноў, якія адпавядалі лініі УКП(б) і Камінтэрна і не пярэчылі партыйна-дзяржаўным устаноўкам 1950–1980 гадоў, не маглі забяспечыць паўнавартаснага навуковага асэнсавання пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху і ўвогуле гісторыі Заходняй Беларусі. Гэта, аднак, было характэрнай рысай усёй беларускай савецкай гістарыяграфіі.

КПЗБ з’яўлялася праваднікам інтарэсаў камінтэрнаўскага кіраўніцтва, якое арыентавалася на выкананне галоўнай задачы (сусветнай рэвалюцыі) і атрымлівала фінансаванне як ад кіраўніцтва БССР, так і па камінтэрнаўскай лініі [569; 590; 692, с. 69–71], пра што ў той час было вядома польскай паліцыі. Акрамя непасрэднага фінансавання падпольнай дзейнасці, камінтэрнаўскія грошы выкарыстоўваліся для стварэння пэўнага эканамічнага падмурку для рэвалюцыйнай дзейнасці, напрыклад, у вёсках і мястэчках ствараліся склепы (крамы), корчмы і рэстараны з мэтай атрымаць над насельніцтвам пэўны кантроль, “праводзіць сярод насельніцтва агітацыю ў духу выўратовым (падрыўным. – *А.С.*) і распаўсюджваць улёткі”. У тых грамадска-палітычных абставінах КПЗБ сапраўды была авангардам рэвалюцыйнага руху. Пры гэтым трэба адзначыць, што камуністычнае падполле на тэрыторыі Заходняй Беларусі, па перакананні дакументаў польскіх органаў, выконвала заданні савецкіх

разведвальных органаў [225, арк. 21, 140]. Што тычыцца кіруючай яе ролі ўвогуле ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе, то гэтае меркаванне не адпавядае рэчаіснасці. На заходнебеларускім грамадска-палітычным полі ў 1920–1930 гады актыўна і ў розных формах і ўмовах – як легальных, так і нелегальных – дзейнічалі партыі і арганізацыі не менш значныя па колькасных паказчыках і актыўнасці.

Відавочна, што як у 1920–1950-я, так і ў 1950–1980-я гады беларуская савецкая гістарычная навука абслугоўвала інтарэсы савецкай улады, якая пераняла традыцыі дзяржаўна-палітычных адносін да Беларусі ад царскай Расіі, ішла ў лоне савецкай гістарыяграфіі і прарасійску настроенай марксісцка-ленінскай ідэалогіі, была часткай савецкай расійскай гістарыяграфіі. Аднак гэта не перашкаджала беларускім гісторыкам нават на падставе марксісцка-ленінскай навукова-метадалагічнай дактрыны дэклараваць, адстойваць і ўсталёўваць навукова-гістарычныя вобразы відавочна прабеларускага характару. Выказваючы крытычныя заўвагі адносна акцэнтаў і фармулёвак, якія змяшчаюцца ў даследаваннях беларускіх аўтараў 1950–1980-х гадоў, трэба канстатаваць падпарадкаванасць айчыннай гістарыяграфіі праблемы савецкай дзяржаўна-партыйнай ідэалогіі, якая выконвала патрабаванне: “Рэвалюцыйныя і баявыя традыцыі савецкага народа, КПСС, УЛКСМ, КПЗБ, КСМЗБ – наша духоўнае багацце, ідэйная зброя. …Зрабіць гэтыя традыцыі спадчынай падрастаючага пакалення, усіх савецкіх людзей – адна з важнейшых задач партыі, камсамолу, усіх грамадскіх арганізацый” [47]. Вялікай увагі заслугоўваюць даследаванні У.А. Палуяна, І.В. Палуяна, А.М. Мацко, П.І. Зялінскага, У.Ф. Ладысева, Б.С. Клейна і іншых вучоных: яны выхоўвалі ў беларускага чытача пачуццё гонару і павагі да гераічнага мінулага народа, які, як сцвярджалася ў друку, і што вельмі важна, у адзіным парыве ўзняўся на барацьбу за сваю незалежнасць, нягледзячы на тэрор, ціск з захаду і ўсходу, цяжкасці ідэалагічнага, палітычнага характару, змагаўся за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за ўз’яднанне ў складзе адзінай дзяржавы.

## 3.2. Адлюстраванне гісторыі беларускіх палітычных партый

У заходнебеларускай гістарыяграфіі ёсць шмат пытанняў, якія савецкая гістарычная навука змяніла да непазнавальнасці, спрасціла да прымітыўнасці. Сярод такіх праблем сваёй значнасцю ў нацыянальна-вызваленчым руху выдзяляюцца беларускія партыі і арганізацыі. З эмпірычнага пункту гледжання на гістарыяграфічны працэс можна адзначыць, што ў гісторыі нават больш даследаваных ў савецкія часы КПЗБ і Грамады, ёсць яшчэ шмат што адкрываць і пераадкрываць, каб

надаць ім больш аб’ектыўны выгляд, не кажучы ўжо пра БХД, БСС, “Цэнтрасаюз” і іншыя апазіцыйныя камуністам арганізацыі. Сказанае яшчэ больш тычыцца правадыроў заходнебеларускай палітыкі, якія вельмі часта самі былі незвычайнымі ў сваёй адказнай грамадзянскай пазіцыі, адданасці ідэалам. Сваім імпэтам, актыўнасцю рабілі больш, чым некаторыя партыі, і з’яўляючыся арганізатарамі-стваральнікамі палітычных партый і арганізацый, былі іх кіраўнікамі, фарміравалі грамадска-палітычнае аблічча гэтых структур.

Своеасаблівасць падыходаў беларускай савецкай гістарыяграфіі 1950–1980-х гадоў у дачыненні да дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху характарызавалася тым, што ў якасці народных герояў прызнаваліся тыя, якія былі фізічна знішчаны ў сталінскіх засценках і лагерах! Тыя ж, якім удалося пазбегнуць “капцюроў ГПУ”, выратавацца і пакінуць урэшце-рэшт радзіму, на старонках выданняў падаваліся заклятымі ворагамі беларускага народа і савецкай улады. Можа за тое, што яны рознымі сродкамі выступалі за незалежную Беларусь, супраць рэалізаванай мадэлі сацыяльна-эканамічнай палітыкі СССР у дачыненні да Беларусі. Толькі апошнім часам, дзякуючы намаганням айчынных гісторыкаў, беларускі чытач мае магчымасць знайсці змястоўную інфармацыю, якая раскрывае ролю і месца А. Луцкевіча, А. Станкевіча, В. Гадлеўскага і многіх іншых беларускіх дзеячаў у тагачасных падзеях.

Увогуле, трэба адысці ад адназначнага падзелу партый на рэвалюцыйныя і дэмакратычныя, рэфармісцкія, праўрадавыя, згодніцкія і г.д. Такія фармулёўкі партыі атрымлівалі ў выніку вострага ідэйна-палітычнага супрацьстаяння, вельмі часта неапраўдана, калі апаненты для памяншэння ўплыву канкурэнтаў прыбягалі да навешвання абразлівых ярлыкоў і штампаў, намагаліся сцвердзіць сваё прагрэсіўнае аблічча. Паступова адпаведныя фармулёўкі замацаваліся і ў гістарыяграфіі. Ва ўсялякім выпадку на палітычным полі Заходняй Беларусі ажыццявіць такога кшталту ўдалае ранжыраванне, класіфікацыю будзе няпроста. Вельмі часта назва партыі, яе праграмныя пункты не супадалі з рэальным зместам паўсядзённай палітычнай дзейнасці, якая магла стымуляваць удакладненне статутных пазіцый партыі. І наадварот, часам палітычная барацьба, канкрэтныя поспехі па ахопе сваім уплывам шырокіх мас натыкаліся на забароны, якія вынікалі з палажэнняў, фармальна ўзаконеных праграмай – статутам. У папярэднім раздзеле змешчана шмат гістарыяграфічнай інфармацыі аб КПЗБ, якая ў сваіх праграмных памкненнях была, як і сталінская канстытуцыя, бадай што самая дэмакратычная і народная. Аднак дзейнасць гэтай партыі не можа адназначна запэўніць у тым, што гэтая арганізацыя ўвогуле была палітычнай партыяй, а не асяродкам савецкай падпольнай агентуры. І тут жа можна гаварыць пра Беларускую партыю

сацыялістаў-рэвалюцыянераў, якая не хавала сваіх радыкальных метадаў барацьбы, але яе ўнутрыпартыйны дэмакратычны дух і ліберальныя традыцыі былі больш відавочнымі.

Навукова-метадалагічная дактрына і грамадска-палітычная сітуацыя, якая яе абумоўлівала, патрабавалі ўсталявання ўніфікацыі ў навуцы па аднапартыйнай схеме, не дапускаючы наяўнасці інварыянтных, альтэрнатыўных праектаў. Прынцып “Хто не з намі, той супраць нас!”, падобны да марксіскага прынцыпу партыйнасці, не даваў магчымасці даследчыкам размяшчаць побач з партыяй дыктатуры пралетарыяту іншыя партыі, нават калі яны менш значныя і ўплывовыя. Партыя можа быць толькі адной і адзінай унутрана. Усе астатнія – варожыя. Таму ў беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый не было шанцаў атрымаць нават адносна аб’ектыўнага даследчыка.

Нельга сказаць, што навуковыя творы зусім не згадвалі беларускіх эсэраў, хадэкаў, цэнтрасаюзаўцаў і іншых, але гэтыя згадкі задняга плану мелі характар дапаможны. Яны павінны былі забяспечыць стварэнне гістарыяграфічных умоў для сцвярджэння патрэбнага вобраза КПЗБ, якія б падкрэслівалі дыскрэдытацыю, маргіналізацыю, заняпад палітычных апанентаў, правал іх стратэгіі і тактыкі на фоне росквіту і пераможных поспехаў камуністаў. Здзеклівыя фармулёўкі ў дачыненні да “адыёзных фігур”, “цемрашалаў”, “беларускіх буржуазных нацыяналістаў” былі бадай адзіным, што магло быць заўважаным у такога кшталту гістарычных апавяданнях.

Што тычыцца аб’ёмаў вывучэння гісторыі дзейнасці ў Заходняй Беларусі партый і арганізацый нацыянальна-дэмакратычнага характару, то яно залежыла ад канкрэтна-гістарычных маштабаў функцыянавання арганізацый. І калі нязначныя па сваёй дзейнасці Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў, Беларуская партыя незалежных сацыялістаў былі амаль праігнараваны даследчыкамі, то больш уплывовыя, дзейнасць якіх цяжка было замоўчваць, адпаведным чынам выкарыстоўваліся – выстаўляліся як злейшыя ворагі СССР, БССР, КПЗБ. На старонках навуковага друку фігуравалі больш актыўна Беларуская хрысціянская дэмакратыя – Беларускае народнае аб’яднанне (БХД – БНА), Беларускі сялянскі саюз (БСС), “Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый” (“Цэнтральны саюз беларускіх культурна-асветных арганізацый і інстытуцый” [507, с. 5; 794, с. 1024]) – Цэнтрасаюз. Некаторае асвятленне атрымала Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя. Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р) у асноўным згадвалася ў сувязі з партызанскім рухам першай паловы 1920-х гадоў і т. зв. эсэраўскай спадчынай у КПЗБ. Аднак, як і ў папярэднія часы, іх уплыў на заходнебеларускае насельніцтва ў гістарычнай літаратуры атрымаў адмоўную ацэнку.

Фрагментарныя згадкі назыўнога характару атрымаў надпартыйны Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні. Большая ўвага нададзена Беларускаму пасольскаму клубу відавочна з-за таго, што без яго немагчыма было адлюстраваць найбольшы поспех КПЗБ – стварэнне Грамады. Што тычыцца іншых, дробных арганізацый, а тым больш паланафільскіх груповак, то айчынная савецкая гістарыяграфія іх проста замоўчвала, не жадаючы парушаць звесткамі пра “згоднікаў і запраданцаў” гістарыяграфічна створанае ўражанне адзінства беларускага народа ў яго барацьбе “за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне”.

Негатыўныя ацэнкі арганізацый нацыянальна-дэмакратынага накірунку можна тлумачыць яшчэ і тым, што ў айчыннай гістарыяграфіі ў пачатку 1960-х гадоў панавала канцэпцыя аб двух лагерах у нацыянальна-вызваленчым руху Заходняй Беларусі, якая была сфармулявана І.В. Палуянам і У.А. Палуянам, – лагер рэакцыі і лагер рэвалюцыі. У якасці свайго гісторыкі паставілі лагер рэвалюцыі, у якім “аб’ядналіся рабочыя, бядняцка-серадняцкія масы сялян, гарадская бедната і лепшыя прадстаўнікі прагрэсіўнай часткі інтэлігенцыі Заходняй Беларусі ў саюзе з польскім рабочым класам і працоўным сялянствам пад кіраўніцтвам КПП, а з канца 1923 года і КПЗБ” [683, с. 6–8]. Астатнія сілы, у тым ліку і партыі, былі аднесены да лагеру рэакцыі і атрымалі адпаведныя негатыўныя характарыстыкі.

У канцы 1970-х гадоў канцэпцыя аб двух лагерах у нацыянальна-вызваленчым руху на старонках манаграфіі У.А. Палуяна была зменена на трохчленную: “…у працэсе класавай барацьбы вызначыліся тры асноўныя сацыяльна-палітычныя лагеры. Першы – рэвалюцыйны лагер рабочага класа і рэвалюцыйна-дэмакратычных сіл непралетарскіх слаёў працоўных, другі – рэакцыйны буржуазна-памешчыцкі і трэці – дробнабуржуазна-згодніцкі” [682, с. 41]. Аднак ад змены колькасці “лагераў” сітуацыя з падыходамі да асвятлення нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый карэнным чынам не змянілася.

Даследчыкі ў стылі 1930-х гадоў імкнуліся ўсялякімі сродкамі падкрэсліць антынародную сутнасць некамуністычных беларускіх сіл. Так, напрыклад, традыцыйна ўвага акцэнтавалася на “паланафільскай, згодніцкай палітыцы”, “далейшым ўмацаванні супрацоўніцтва беларускага нацыяналістычнага лагера з акупацыйным рэжымам”, “шалёнай, бруднай, антыкамуністычнай, антысавецкай прапагандзе”, “лакейскім выслужванні перад урадам Пілсудскага” [720, с. 132, 223]. У такім рэчышчы А.М. Мацко гаварыў аб далейшым умацаванні “супрацоўніцтва беларускіх буржуазных нацыяналістаў з акупацыйным рэжымам “санацыі”, аб “ажыўленні контррэвалюцыйнай дзейнасці БХД на чале з ксяндзом А. Станкевічам”, звяртаў увагу на ўзмацненне беларускай хадэцыяй

“раскілзанай прапаганды паклёпу на рэвалюцыйны рух, Савецкі Саюз”, пра ўхваленне БХД буржуазнага нацыяналізму і намаганні заразіць ім працоўныя масы. Аналагічныя ацэнкі атрымала група А. Луцкевіча і Р. Астроўскага за імкненне “аб’яднаць вакол сябе ўсіх беларускіх нацыяналістаў”. Сваю “здрадніцкую антынародную дзейнасць” група, а затым створаная на базе яе “буржуазна-кулацкая партыя” “Цэнтрасаюз” прыкрывалі “дэмагагічным лозунгам абароны інтарэсаў усяго народа”, “сеяннем ілюзій” пра тое, што нацыянальнае і іншыя пытанні ў Заходняй Беларусі можна вырашыць у межах буржуазнага ладу шляхам мірнага супрацоўніцтва з урадам. Яшчэ адным відавочным грахом, на думку А.М. Мацко, была спроба беларускіх дзеячаў “супрацьпаставіць сялян рабочаму класу, пасеяць варожасць паміж польскімі і беларускімі працоўнымі і тым аслабіць іх барацьбу”. З’едлівыя выразы пра “лакейскае выслужніцтва” “белбурнацаў” перад акупацыйнымі ўладамі, “верную апору” ў барацьбе супраць рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі павінны былі канчаткова замацаваць за нацыяналістамі вобраз чужых беларускаму народу дзеячаў. Пры гэтым, па напрацаванай схеме, адзначалася “паслядоўная барацьба з буржуазнымі нацыяналістамі” КПЗБ, якая супрацьпастаўляла “рэакцыйнай, антынароднай ідэалогіі буржуазных нацыяналістаў і іх партый выпрабаваную зброю – пралетарскі інтэрнацыяналізм, ідэі дружбы, супрацоўніцтва, сумеснай барацьбы ўсіх працоўных без адрознення нацыянальнай прыналежнасці” [516, с. 170–171].

Імкненне гісторыкаў абсалютызаваць інтэрнацыянальныя пачуцці народаў Заходняй Беларусі, ігнараванне ці нівеліраванне пры гэтым нацыянальных пачуццяў былі скіраваны сваім вастрыём менавіта на беларускія нацыянальна-дэмакратычныя арганізацыі, а не на іншаэтнічныя партыі, садзейнічалі ўсталяванню ў чытача нацыянал-нігілізму.

Падобным чынам адлюстравана дзейнасць беларускіх арганізацый, якія не падтрымлівалі радыкальныя лозунгі камуністаў, на старонках іншых выданняў, прысвечаных дзейнасці КПЗБ па інтэрнацыянальным выхаванні [107–109; 315–318; 349–352]. Увогуле складваецца ўражанне, што галоўная задача ў асвятленні гэтага пытаня была накіравана на прыніжэнне ролі беларускіх нацыянальных арганізацый і іх дзеячаў. Напрыклад, небеспадстаўна вызначаючы вядучую ролю БХД сярод беларускіх арганізацый, Г.Б. Ватковіч намагаўся даказаць яе антыкамуністычную і антысавецкую накіраванасць, імкненне распаліць варожасць беларускага народа да палякаў. Пры гэтым, каб падкрэсліць яшчэ большую шкоднасць БХД, прымяняліся відавочна нетактоўныя захады, калі беларусы-каталікі супрацьпастаўляліся беларускаму народу як непаўнавартасныя і, пэўным чынам, чужыя: акцэнтавалася ўвага на тым,

што “кіруючае становішча ў партыі займалі ксяндзы… партыя аказвала ўплыў на акаталічаных беларускіх сялян, рэакцыйную частку інтэлігенцыі, нацыяналістычнае студэнцтва” [109, с. 14]. У дадзеным выпадку мы маем відавочную непаслядоўнасць аўтара, які, агітуючы за інтэрнацыяналізм, асуджае партыю і яе электарат за канфесійную еднасць беларусаў і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

Даследчыкі ігнаравалі шырокавядомыя супярэчнасці, факты канкурэнцыі і нават варожасці паміж беларускімі дзеячамі і партыямі, звязваючы іх у адно цэлае на падставе як быццам бы аднолькавага імкнення нашкодзіць рэвалюцыйнаму руху і дапамагчы польскаму ўраду. Дапасоўваючы партыі адну да другой, часам без усялякай логікі, гісторыкі вырашалі пастаўленую задачу. Пасля “выкрыцця варожага аблічча” БХД Г.Б. Ватковіч прывязаў да яе “беларускую нацыяналістычную інтэлігенцыю і кулацтва, якія ўваходзілі ў склад “Сялянскага Саюза” на чале з Ф. Ярэмічам” і т. зв. “Беларускую санацыю” – групу А. Луцкевіча і Р. Астроўскага. “Гэтая буржуазна-нацыяналістычная група, якая выдзялялася беспрынцыповасцю і гатоўнасцю служыць любому гаспадару, уключаючы нямецкую разведку, поўнасцю падтрымлівала правячую партыю польскага фашызму – Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам”. Цікава, што ўзгаданыя ў наступным абзацы аналагічныя па сваім палітычным абліччы літоўскія буржуазна-нацыяналістычныя партыі не атрымалі такіх ганебных, дыскрэдытуючых фармулёвак [109, с. 14]. Тут трэба адзначыць часта сустракаемае нежаданне беларускіх савецкіх гісторыкаў незнарок пакрыўдзіць літоўцаў і Літоўскую ССР. Нягледзячы на відавочна ваяўнічую пазіцыю літоўскіх палітыкаў у дачыненні да польскай дзяржавы на падставе Віленскага канфлікту, якая пры пэўных абставінах прывяла б да аднаўлення яго ваеннай фазы, выданне не прыпісвае літоўскім “буржуазным нацыяналістам” жадання “шляхам нахабнай ілжы і падману аб Савецкім Саюзе і БССР, аб палітыцы КП(б) і Савецкай улады ў БССР, аб “пераследванні беларусаў маскалямі” і “чырвоным імперыялізме”, спробе “запрэгці ў ваенную калясніцу польскага фашызму працоўныя масы і зрабіць іх сляпой зброяй фашызму ў ліхаманкавай падрыхтоўцы нападу на СССР”, у чым абвінавачвае беларускіх дзеячаў [109, с. 78–79].

Ухваляючы дэкларатыўна міралюбівую палітыку Савецкага Саюза, савецкія гісторыкі абвінавачвалі беларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі, як адзначалася толькі што, у спробах падтрымаць Польшчу ў развязванні вайны з СССР, а таксама ў асуджэнні нармалізацыі адносін паміж Польшчай і Савецкім Саюзам [109, с. 102].

Яшчэ больш знішчальнай па сваёй сутнасці і накіраванасці ўвагі ў дачыненні да нацыянальных партый і арганізацый, у першую чаргу

беларускіх, дэманструе даследаванне С.У. Кабяка, якое ўтрымлівае асобны раздзел пад красамоўнай назвай “Барацьба КПЗБ супраць буржуазнага нацыяналізму”. Як і папярэднія працы, асноўная ўвага ў выданні нададзена БХД, у першую чаргу і ў найбольшым аб’ёме, і БСС. Толькі назыўным парадкам згадана “рэакцыйная” група “Часовая беларуская рада” А. Паўлюкевіча.

Падкрэсліваючы першачарговасць барацьбы КПЗБ супраць беларускага буржуазнага нацыяналізму, С.У. Кабяк, як тады было агульнапрынята, ідучы ўслед за кампартыяй у адлюстраванні пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху, сцвярджаў, што “асаблівую небяспеку для інтэрнацыянальнага адзінства працоўных” уяўляла БХД. Зыходзячы з гэтага, аўтар абвінаваціў хадэкаў у шматлікіх злачынствах: актыўная падтрымка ўрада Керанскага, супрацоўніцтва з хрысціянскай дэмакратыяй Літвы, польскімі нацыянал-дэмакратамі і пілсудчыкамі, антыкамуністычная і антысавецкая скіраванасць, распальванне варожасці паміж беларускімі і польскімі працоўнымі, жаданне адцягнуць увагу народных мас ад рэвалюцыйнай барацьбы на падставе тэорыі самабытнасці Беларусі, адмаўленне класавай барацьбы, абарона асноў буржуазнага ладу, прыватнай уласнасці і памешчыцкага землеўладання, адмоўны ўплыў на БСРГ на падставе культурніцтва [352, с. 63–64]. Але ў такога кшталту разважаннях мы знаходзім супярэчнасць: аўтар бачыць пагрозу парушэння інтэрнацыянальнага адзінства ад партыі, якая супрацоўнічае з польскімі і літоўскімі арганізацыямі.

Беларуская хадэцыя, апрача названых, атрымала дадатковыя негатыўныя ацэнкі з-за сваіх сімпатый да хрысціянскіх каштоўнасцей, што давала падставы даследчыкам неабгрунтавана пазіцыянаваць партыю як клерыкальную [504].

У даследаваннях, якія храналагічна ахоплівалі 1930-я гады, знайшла месца інфармацыя пра спробы стварыць у Заходняй Беларусі палітычную партыю накшталт нацысцкай. Маецца інфармацыя пра Беларускую нацыянал-сацыялістычную партыю і Беларускую нацыяналістычную сябрыну [414, с. 132–134]. Зразумела, што характарыстыка гэтых арганізацый, яе правадыроў не магла быць станоўчай: аналогія з нямецкім нацызмам, фашызмам толькі ўзмацняла негатыўныя фармулёўкі ў дачыненні да іх, не давала магчымасці падступіцца да цвярозага аналізу прычын, якія выклікалі ўзнікненне такіх суполак.

Такім чынам, заходнебеларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі, якія не супрацоўнічалі з кампартыяй, не атрымалі аб’ектыўнага вывучэння. Жаданне прынізіць іх ролю ў грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі, якое суправаджалася шырокім выкарыстаннем нацыяналістычных і класавых штампаў у дачыненні да іх

дзейнасці, прыводзіла да тэндэнцыйнасці і аднабаковасці ў асвятленні гэтых праблем, як і ўвогуле грамадска-палітычнай гісторыі Заходняй Беларусі. Як і ў 1920–1950-я гады, гэтыя партыі заставаліся на старонках навуковых выданняў чужымі, здраніцка-згодніцкімі, ворагамі КПЗБ, БСРГ, ТБШ, БССР, СССР. Адзначым напрыклад тое, што У.А. Палуян пазбягаў называць дзяржаўна-палітычны лад Польшчы фашысцкім, нават 1930-х гадоў, калі істотна былі звужаны магчымасці дэмакратынага жыцця Польшчы. Аднак у дачыненні да беларускіх нацыянальных дзеячаў ён у знішчальна-з’едлівым тоне, не абцяжарваючы сябе доказнай базай, беспадстаўна прымяняў фармулёўку “нацыянал-фашысты” [682, с. 131].

Апафеозам такіх падыходаў з’яўляецца праца У.Ф. Ладысева, выхад якой у найбольш яскравым выглядзе ўяўляе сабой выкананне адназначнага ідэалагічнага і палітычнага заказу і дэманструе чыста бальшавіцкія тэзісы ў дачыненні да былых палітычных апанентаў камуністаў [415]. Па меркаванні Э.А. Мазько, у гэтым выданні многія факты, праграмныя палажэнні перакручваліся, давалася няправільнае іх датаванне, перадумовы з’яўлення. Так, напрыклад, Ф. Ярэміч быў аднесены да кіраўніцтва БХД, хоць быў адным з заснавальнікаў і кіраўніком БСС, У.Ф. Ладысеў “даволі свабодна абышоўся” з другой назвай БХД: замест “Беларускае народнае аб’яднанне” падаў “Беларускае нацыянальнае аб’яднанне” [497, с. 123]. Заўважым, што У.Ф. Ладысеў не першым перайменаваў Беларускае народнае аб’яднанне ў нацыянальнае. І.В. Палуян і У.А. Палуян у сваёй працы 1962 года і калектыўная манаграфія па гісторыі КПЗБ у 1966 годзе такім чынам падкрэслівалі самы недапушчальны грэх БХД-БНА – прыхільнасць да беларускіх нацыянальных ідэй [720, с. 349], аднак такога кшталту трансфармацыі назвы партыі былі народжаны прапагандыстамі КПЗБ, пра што сведчыць звароты ЦК КПЗБ да суполак і членаў нацыянальных арганізацый [54, с. 374, 380, 382–383].

У чарговай манаграфіі У.Ф. Ладысеў, звяртаючы ўвагу на “буржуазна-нацыяналістычныя арганізацыі і групы”, даказвае выкарыстанне “рэакцыйных правадыроў нацыяналістычнага лагера” імперыялістычнымі разведкамі ў антысавецкіх мэтах, сцвярджае аб сувязях беларускіх дзеячаў Ф. Акінчыца, Р. Астроўскага, Я. Станкевіча, А. Луцкевіча з японскімі і германскімі разведкамі [401, с. 5, 162]. Нягледзячы на відавочную тэндэнцыйнасць айчынных гісторыкаў савецкага часу ў дачыненні да дзеячаў беларускага нацыянальна-дэмакратычнага крыла [800; 801; 853], нельга адназначна і канчаткова адмовіць фігураванне беларускіх дзеячаў у розных камбінацыях, якія распрацоўваліся прадстаўнікамі разнастайных замежных місій, у тым ліку па лініі спецслужбаў [29; 80; 97; 629; 642; 653; 659; 867; 871; 873].

Значнае ўдакладненне “варожага” аблічча беларускіх дзеячаў, апазіцыйна настроеных да савецкай улады, якія дзейнічалі ў Заходняй Беларусі, зрабіў М.С. Сташкевіч. Незалежна арыентаваныя беларускія сілы ён аб’яднаў у адзіную антысавецкую масонскую змову. Асабліва вылучыліся, на думку даследчыка, схільнасцю да скарыстання масонскіх метадаў арганізацыі беларускія эсэры [800, с. 267–268]. Разважаючы пра значнасць масонскіх элементаў у беларускім руху, трэба мець на ўвазе тое, што адпаведная інфармацыя фігуруе ва “ўласнаручных” паказаннях беларускіх дзеячаў, якія яны давалі ў час допытаў у НКУС [29; 80]. Магчыма, каб яшчэ больш падкрэсліць варожасць беларускіх нацдэмаў савецкай уладзе, следчыя настойліва падказвалі інфармацыю пра іх сувязь з арганізаванымі антысавецкімі замежнымі сіламі, у тым ліку масонамі. Таму адпаведная праблематыка патрабуе асобнага даследавання, у выніку якога сувязі беларускіх дзеячаў з міжнародным масонствам будуць пацверджаны ці абвергнуты.

Важна адзначыць як гістарыяграфічны факт тое, што ў савецкай гістарычнай навуцы пытанні арганізаванага ўзброенага супраціўлення бальшавіцкай уладзе ў БССР выносіліся па-за заходнебеларускую праблематыку. Атрымлівалася, напрыклад, што “Зялёны Дуб”, дзейнасць С. Булак-Балаховіча, В. Разумовіча і іншых, не мелі адносін да гісторыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы, што не адпавядае гістарычнай рэчаіснасці [800; 853].

На працягу другой паловы 1950-х – 1980-х гадоў пашырэнне тэматычнага дыяпазону, змяненне накіраванасці фармулёвак адбываліся ў дачыненні да палітычных саюзнікаў КПЗБ на розных этапах яе палітычнай біяграфіі – Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі, Беларускай сялянска-работніцкай грамады і Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба “Змаганне”.

Нагадаем, што ў другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гадоў у беларускай савецкай гістарыяграфіі адчуваліся наступствы панавання метадалагічных установак 1930-х гадоў, назіралася барацьба існаваўшых да XX з’езда КПСС уяўленняў па праблемах рэвалюцыйнай барацьбы, сацыяльна-палітычнынага характару беларускіх палітычных партый і арганізацый і новых падыходаў, якія з’яўляліся наступствам “ідэалагічнай адлігі”.

Асвятленне з’явы палітычнай гісторыі Заходняй Беларусі пад назвай “Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя” яшчэ ў даваенны перыяд атрымала эвалюцыю ад прывітальна-памяркоўных да ваяўніча-варожых фармулёвак. Нягледзячы на тое, што КПЗБ свайму нараджэнню ў канкрэтна-гістарычным выглядзе была абавязана БРА, беларускія савецкія гісторыкі згадвалі гэтую партыю з асцярожнасцю, азіраючыся на

папярэднія трывожныя гады. Усе выдатна памяталі тое, што менавіта БРА была “коранем зла” і “засмеціла” КПЗБ “нацыяналістычным зеллем” у выглядзе “сэцэсіі”, пасля пераадолення якой былыя беларускія эсэры левага крыла былі крыніцай трывогі для сапраўдных камуністаў-інтэрнацыяналістаў. Так М.С. Арэхва, добра знаёмы з правіламі “гульні” ў камуністычным асяродку, у сваіх меркаваннях наконт БРА палічыў неабходным звярнуць увагу на тое, што яна, уліўшыся ў КПЗБ, не пераадолела да канца сваіх нацыяналістычных настрояў і дробнабуржуазных хістанняў [337, с. 29]. Вядома, што абвінавачванне ў нацыяналізме і дробнабуржуазнасці магло замацаваць за арганізацыяй стэрэатып варожай партыі, перашкаджала ўсталяванню вобраза вернай і надзейнай у адносінах да кампартыі арганізацыі.

Шмат для рэабілітацыі і своеасаблівага ўшанавання здзейсненага заходнебеларускімі палітыкамі, а найперш партыямі, зрабілі І.В. Палуян і У.А. Палуян. Яны кваліфікавалі БРА як рэвалюцыйна-дэмакратычную арганізацыю. Аўтары прыйшлі да высновы, што партыя, змагаючыся за здзяйсненне дэмакратычных пераўтварэнняў, выказвала інтарэсы працоўнага сялянства, большасць членаў БРА, уступаючы ў КПЗБ, стаяла на рэвалюцыйных пазіцыях рабочага класа. Аднак і на сааўтараў працягваў уплываць гістарыяграфічны і палітычны вопыт папярэдніх часоў барацьбы з нацдэмаўшчынай. Яны таксама звярнулі ўвагу на тое, што частка былых членаў БРА не парвала поўнасцю з эсэраўскімі поглядамі і яшчэ на працягу шэрагу гадоў уносіла ў партыю дух хістанняў, неарганізаванасці і бунтарска-левацкія метады працы [683, с. 49–50].

Памяркоўныя ацэнкі ў дачынення да БРА Т.Ю. Глінская выказала наступным чынам. У склад БРА, якая выдзелілася з партыі беларускіх эсэраў, увайшлі прадстаўнікі левага крыла эсэраў і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. Шэраговыя члены БРА актыўна змагаліся за ўз’яднанне з БССР, падтрымлівалі мерапрыемствы КПЗБ. Кіраўніцтва БРА, бачачы растучы аўтарытэт КПЗБ і баючыся згубіць давер мас, пад ціскам шэраговых членаў прыняло рашэнне аб уступленні ў КПЗБ. Канферэнцыя БРА, якая адбылася 30 снежня 1923 года, адзінагалосна прыняла рашэнне ўступіць у КПЗБ.

Паводле Т.Ю. Глінскай, КПЗБ, прымаючы ў свой склад членаў БРА, ведала, што частка з іх не пераадолела да канца дробнабуржуазных хістанняў і нацыяналістычнай ідэалогіі. Аднак, улічваючы тое, што БРА мела ўплыў сярод сялян Заходняй Беларусі і ставіла сваёй мэтай барацьбу за ўз’яднанне з БССР, КПЗБ прыняла ў свой склад членаў гэтай арганізацыі. Гэтым КПЗБ умацоўвала свой уплыў сярод сялян і наносіла ўдар па буржуазных і нацыяналістычных партыях, якія імкнуліся павесці за сабой сялянства. Уваходжанне БРА ў склад КПЗБ сведчыла пра тое, што шырокія сялянскія

масы Заходняй Беларусі прызнавалі кіруючую ролю Кампартыі Заходняй Беларусі ў абароне інтарэсаў працаўнікоў вёскі, у барацьбе за ўз’яднанне з БССР, лічыла даследчыца [138, с. 8]. Гэтае выказванне ўскосна гаворыць аб схільнасці аўтара перабольшваць ролю БРА, аб неабгрунтаваным ігнараванні ўплыву сярод беларускага сялянства іншых партый.

Паступова гісторыкі адыходзілі ад кваліфікацыі БРА як нацыяналістычнай і дробнабуржуазнай арганізацыі. Аўтары кнігі ”Революционный путь Компартии Западной Белоруссии” прытрымліваліся думкі, што БРА, выдзеліўшыся з левага крыла партыі беларускіх эсэраў, адасобілася ў самастойную рэвалюцыйную арганізацыю нацыянальна-вызваленчага характару. БРА стаяла на пазіцыях узброенай барацьбы з польскімі акупантамі з мэтай вызвалення Заходняй Беларусі ад панавання Польшчы і далучэння яе да БССР. Яна карысталася ўплывам сярод беларускай інтэлігенцыі і часткі сялян. У практыцы паўсядзённай барацьбы БРА паступова збліжалася з ў падпольнымі камуністычнымі арганізацыямі [720, с. 71].

Да яшчэ больш глыбокіх высноваў адносна БРА прыйшоў У.А. Палуян у сваёй працы “Беларуская сялянска-рабочая грамада”. Утварэнне БРА ў 1922 годзе ён назваў першым значным поспехам рэвалюцыйна-дэмакратычных сіл у Заходняй Беларусі. Па сваім сацыяльным і палітычным характары БРА з’яўлялася рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыяй з элементамі сацыялістычнага кшталту. Змагаючыся за ажыццяўленне глыбокіх дэмакратычных пераўтварэнняў, за зямлю без выкупу, яна выказвала інтарэсы працоўнага сялянства і гарадской беднаты і абапіралася на сялян і прагрэсіўныя элементы беларускай інтэлігенцыі. Палітычныя імкненні БРА ўсё больш схіляліся да ідэі сацыялістычнай рэвалюцыі, асноўнай зброяй ажыццяўлення якой яна лічыла рэвалюцыйную барацьбу працоўных на аснове саюзу рабочых і сялян.

У нацыянальным пытанні, працягваў даследчык, БРА стаяла на пазіцыях паслядоўнай барацьбы супраць польскай акупацыі, за самавызначэнне Заходняй Беларусі і аб’яднанне беларускіх зямель у адзінай рабоча-сялянскай рэспубліцы, звязваючы і падпарадкоўваючы нацыянальнае пытанне пытанню сацыяльнаму. У БССР члены БРА бачылі адзінага законнага прадстаўніка беларускага народа і ўвасабленне яго дзяржаўнасці. Даследчыку, каб пазбавіць аблічча арганізацыі ад непрыемных нацыяналістычных плям, трэба было даказваць яе інтэрнацыяналісцкую накіраванасць – дзеячы БРА паказалі сябе інтэрнацыяналістамі, выступаючы ў абарону іншых прыгнечаных нацыянальнасцей. У гэтым, лічыў аўтар, пераконваюць іх неаднаразовыя выказванні ў друку аб тым, што вызваленчая барацьба працоўных Заходняй Беларусі можа быць паспяховай толькі пры ўмове сумесных дзеянняў з рабочым класам Польшчы.

Сярод кіраўнікоў і членаў БРА выспявала ідэя стварэння масавай народнай арганізацыі. На старонках газет партыі з другой паловы 1923 года ставілася пытанне аб выхадзе з Беларускага пасольскага клуба прадстаўнікоў левага крыла і сфарміраванні асобнай сацыялістычнай фракцыі ў сейме, аб разрыве са згодніцтвам і стварэнні масавай сялянскай партыі, працягваў У.А. Палуян. На думку аўтара, БРА станавілася на пазіцыі паслядоўнай рэвалюцыйнай барацьбы і прыйшла да высновы, што ў інтарэсах народных мас неабходна аб’яднаць усе рэвалюцыйныя сілы ў шэрагах КПЗБ як самай рэвалюцыйнай партыі, якая найбольш паслядоўна абараняе інтарэсы працоўных. Гэтым БРА ўпершыню выявіла тэндэнцыю пераходу найбольш передавой часткі рэвалюцыйнай дэмакратыі на платформу марксісцка-ленінскай партыі, тэндэнцыю ўсяго рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху да адзінства і злучэння з палітычнай барацьбой пралетарыяту за сацыялізм. У гэтым сэнсе, лічыў У.А. Палуян, БРА з’явілася папярэдніцай БСРГ.

У сваёй больш позняй працы “Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии” У.А. Палуян у асноўным паўтарыў свае раней абгрунтаваныя высновы, але дадаў, што хоць БРА да канца 1923 года ў асноўным пераўтварылася ў рэвалюцыйную сацыялістычную арганізацыю, у ёй яшчэ захаваліся элементы папярэдніх рэфармісцкіх і рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў, праяўлялася некаторая непаслядоўнасць у пытаннях класавай барацьбы [682, с. 47–48].

Наяўнасць такога кшталту неадназначных фармулёвак актуалізуе грунтоўнае манаграфічнае даследаванне па гісторыі Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі. Значэнне БРА ў станаўленні камуністычнай часткі заходнебеларускай палітыкі ў айчыннай гістарыяграфіі не ацэнена адэкватна. Тэматычны дыяпазон гісторыі БРА пашырыў А. Сідарэвіч думкай аб тым, што “заснаваньне Беларускае рэвалюцыйнае арганізацыі, якая супрацоўнічала зь Беларускім цэнтральным выбарчым камітэтам у 1922 г., наладзіла ў 1923 – пачатку 1924 гг. левы беларускі друк і спрычынілася да беларусізацыі КПЗБ” [760]. Аднак нельга адназначна прыняць дадзенае меркаванне, улічваючы спецыфічную прагматычнасць камуністаў у дачыненні да беларускага пытання ў Польшчы.

Больш распрацаванай на сучасны дзень з’яўляецца гісторыя Беларускай сялянска-работніцкай грамады, у першую чаргу дзякуючы творчым намаганням У.А. Палуяна, які ў 1958–1962 гадах апублікаваў шэраг артыкулаў аб дзейнасці БСРГ і рэвалюцыйным руху ў Заходняй Беларусі, прапанаваў і абгрунтаваў палажэнне аб рэвалюцыйна-дэмакратычным характары Грамады.

Набходна адзначыць, што падыходы і высновы па пытаннях БСРГ, якія мелі месца ў канцы 1930-х – першай палове 1950-х гадоў і акцэнтавалі ўвагу

на нібыта існаваўшых сувязях кіраўніцтва Грамады з польскімі спецслужбамі, фігуравалі на старонках навуковых публікацый і ў другой палове 50-х гадоў XX ст. Напрыклад, у сваім артыкуле А.У. Царук, канстатуючы стварэнне БСРГ у 1925 годзе, не ўзгадаў удзел у гэтым працэсе камуністаў. Больш таго, даследчык лічыў, што Грамада была створана са згоды польскага ўраду. “Польскі прафашысцкі ўрад, – даводзіў аўтар, – санкцыянаваў легальнае існаванне Грамады, паставіў задачу падпарадкаваць яе свайму ўплыву і кіраўніцтву і такім шляхам палегчыць справу разгрому рэвалюцыйна-вызваленчага руху працоўных заходніх абласцей Беларусі. Беларускім буржуазным нацыяналістам (Луцкевіч, Астроўскі, Акінчыц, Бурсевіч і інш.) удалося прабрацца ў кіраўніцтва грамады”. Аўтар адзначыў, што мясцовыя арганізацыі Грамады, на якія вялікі ўплыў аказвалі камуністы, насуперак дырэктывам правага крыла свайго цэнтральнага кіраўніцтва вялі сапраўды рэвалюцыйна-вызваленчую барацьбу. Да 1926 года Грамада, адзначае даследчык, стала масавай арганізацыяй, а яе нізавыя ячэйкі, кіруемыя камуністамі, разгарнулі актыўную рэвалюцыйную барацьбу на месцах. Урад Ю. Пілсудскага, націраючы правал палітыкі, накіраванай на разлажэнне і падпарадкаванне Грамады свайму ўплыву, узяў цвёрды курс на поўны яе разгром [855, с. 133–134].

У 1963 годзе У.А. Палуян абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную БСРГ, а ў 1967 годзе выйшла яго кніга “Беларуская сялянска-рабочая грамада”, у якой асвятляецца гісторыя гэтай арганізацыі, узнікненне і пераўтварэнне яе ў масавую рэвалюцыйную арганізацыю. Аўтар прыйшоў да высновы, што па сацыяльна-палітычным характары БСРГ з’яўлялася рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыяй бяднейшых і сярэдніх сялян, якая змагалася на аснове саюзу рабочых і сялян за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных Заходняй Беларусі і ўз’яднанне з БССР. БСРГ была створана ў выніку рэвалюцыйнай творчасці народных мас, арганізацыйнай дзейнасці Камуністычнай партыі і дзеячаў левага рэвалюцыйна-дэмакратычнага крыла нацыянальна-вызваленчага руху [624, с. 207].

Па сваім сацыяльным складзе Грамада была масавай народнай арганізацыяй, якая аб’ядноўвала ў сваіх шэрагах бяднейшых і сярэдніх сялян, парабкаў, рабочых, гарадскую беднату і прагрэсіўную частку інтэлігенцыі. Сяляне складалі пераважную большасць членаў Грамады. Найважнейшым вынікам палітычнай арганізацыйнай дзейнасці ў 1925–1927 гады БСРГ і КПЗБ, пад кіраўніцтвам якой яна працякала, на думку аўтара, з’явіліся хуткі рост арганізаванасці і палітычнай актыўнасці працоўных, асабліва сялян, ізаляцыя г. зв. згодніцкіх і нацыяналістычных партый, стварэнне саюзу рабочага класа, бяднейшага і сярэдняга сялянства, уздым рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў другой палове 1926 года [624, с. 87–89, 213]. Як бачым, некаторыя з заяўленых тэзісаў маюць

відавочна дэкларатыўны характар, у тым ліку выснова аб ізаляцыі “згодніцкіх і нацыяналістычных партый” і “стварэнне саюзу рабочага класа”. Наадварот, у выніку актыўнай дзейнасці БСРГ, яе шчыльнага ўзаемадзеяння з камуністамі, якія намагаліся радыкалізаваць дзейнасць Грамады, што прыносіла шкоду беларускаму руху, у Заходняй Беларусі актывізавалася дзейнасць апанентаў камуністычнай арыентацыі, нават была створана партыя – канкурэнт БСРГ – Беларускі сялянскі саюз. Іншая справа – пытанне аб суадносінах актыўнасці, а тым больш уплыву гэтых партый.

Відавочна, працуючы ва ўмовах савецкай арганізацыі навукі, У.А. Палуян не мог дазволіць сабе вывесці канцэптуальны характар свайго даследавання за межы ўсталяваных падыходаў. Таму на старонках яго даследаванняў чытач не знойдзе ўдзячных слоў на адрас, напрыклад, А. Луцкевіча і Р. Астроўскага, без якіх цяжка ўявіць гісторыю Грамады, няма там асэнсавання ролі і месца БСРГ у камінтэрнаўскіх ваенна-стрэтагічных планах, як і больш глыбокага пранікнення ў прычыны забароны польскімі ўладамі шматколькаснай, але, як паказала гісторыя, бязвольнай арганізацыі, якая не здолела (ці па нейкай невядомай волі не захацела) арганізаваць сваёй больш рашучай абароны.

У сувязі з адлюстраваннем гісторыі БСРГ пажадана адзначыць унікальную інфармацыю кнігі ”Революционный путь Компартии Западной Белоруссии”, на якую сёння амаль не звяртаюць увагі. Выданне змяшчае звесткі пра тое, што бурны рост Грамады, яе поспехі ў развіцці нацыянальна-вызваленчага руху нарадзілі ў некаторых мясцовых арганізацыях КПЗБ ліквідатарскія тэндэнцыі і настроі. Сельскія камуністы актыўна дэманстравалі нежаданне праводзіць партыйную працу, былі перакананыя ў тым, што БСРГ і ёсць сапраўдная партыя. Многія ячэйкі пасутнасці самараспусціліся [720, с. 142–143]. Гэтая інфармацыя з’яўляецца красамоўным сведчаннем рэальнага становішча ў Заходняй Беларусі, папулярнасці і аўтарытэту Грамады і пэўнай штучнасці камуністычнага ўплыву, які грунтаваўся на поспехах беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Трэба пагадзіцца з А.В. Пашкевічам у тым, што ўтварэнне пасольскага клуба БСРГ стала лагічным завяршэннем працэсаў агульнай радыкалізацыі і падпадання часткі беларускіх паслоў пад камуністычны ўплыў, у выніку чаго адбыўся падзел беларускага парламенцкага прадстаўніцтва. Беларускія прадстаўнікі ў выніку шавіністычнай і нягнуткай нацыянальнай палітыкі польскіх улад практычна страцілі спадзяванні абараніць свае правы, карыстаючыся чыста парламенцкімі формамі змагання. Гэта скарысталі камуністычныя ўлады суседняга СССР, якія праз мясцовыя падкантрольныя Камінтэрну арганізацыі здолелі пераканаць частку беларускіх парламентарыяў у неабходнасці пераходу з

нацыянальных на класавыя пазіцыі [647, с. 57]. Апошні тэзіс патрабуе ўдакладнення, бо наўрад ці адбыўся канчатковы пераход часткі беларускіх пaслоў на класавыя пазіцыі, яны сумяшчаліся з нацыянальнымі.

Аналізуючы гістарыяграфію БСРГ, немагчыма не адзначыць відавочнае: грамадскі клімат не спрыяў, а агульнаметадалагічны стан айчыннай навукі не дазваляў аб'ектыўна даследаваць яе гісторыю. Праўдзівая інфармацыя пра стварэнне Грамады, яе адносіны з куратарамі ад кампартыі, маніпуляванне арганізацыяй і яе членамі ў інтарэсах распальвання сацыялістычнай рэвалюцыі, навязванне ёй чужых, шкодных беларускаму нацыянальна-вызваленчаму руху лозунгаў былі схаваны ад даследчыкаў у спецсховішчах.

У адзначаны перыяд атрымала пэўнае даследаванне дзейнасць арганізацыі “Змаганне”. Яе гісторыя, правадыры і ўдзельнікі ўяўляюць найбольш трагічны абразок у заходнебеларускай гістарыяграфіі, які красамоўна ілюструе сутнасць адносін савецкага кіраўніцтва да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і яго ўдзельнікаў. Яны, найбольш свядомыя і перакананыя прыхільнікі супрацоўніцтва з камуністамі, выконвалі вельмі важныя для савецкай агентуры функцыі арганізацыі легальнага прыкрыцця падпольнай дзейнасці. Самаахвярна адстойваючы інтарэсы, навязаныя ім кіраўнікамі камуністычнага руху, ахвяруючы інтарэсамі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, удзельнікі групоўкі заслужылі ў вачах савецкага афіцыёзу гонар і пашану. Імі правадыры “Змагання” карысталіся некалькі месяцаў пасля абмену палітвязнямі паміж Польшчай і СССР у 1932 годзе, каб у хуткім часе паплаціцца жыццём, стаўшы “разменнымі шрубкамі” ў складаным еўрапейскім “гандлі” за беларускі кошт.

Гэтая пэўная адназначнасць і адданасць у 1950–1980-я гады была падставай для відавочна неканфліктнага ўключэння “Змагання” ў тагачасны савецкі гістарыяграфічны дыскурс. Гісторыя Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба “Змаганне” прыцягвала дастаткова значную ўвагу і асвятленне, якія маглі быць ажыццёўлены ў той супярэчлівы час. Пры гэтым гісторыя арганізацыі ў савецкія часы так і не стала самастойным аб'ектам навуковага даследавання. Даследчыкі, аналізуючы праграмныя ўстаноўкі, практычную дзейнасць, называлі “Змаганне” арганізацыяй бяднейшага і сярэдняга сялянства і гарадской беднаты. Пасольскі клуб “Змаганне” фактычна выконваў у сейме функцыі парламенцкай фракцыі КПЗБ. Ён стаў кіруючым цэнтрам легальнай палітычнай работы Кампартыі ў масах. Клуб “Змаганне” працягваў традыцыі Грамады, выступаў яшчэ больш паслядоўна і мэтанакіравана за ажыццяўленне тых самых задач. Гэтаму спрыяла сацыяльная аднароднасць клуба, які аб'яднаў найбольш рэвалюцыйныя элементы Грамады [683, с. 126; 720, с. 196].

Працягваючы распрацоўку гісторыі клуба “Змаганне”, У.А. Палуян прыйшоў да высновы, што дзейнасць БСРПК “Змаганне” была накіравана на арганізацыю і палітычнае выхаванне працоўных, галоўным чынам сялян, і ў гэтым ён дасягнуў немалых поспехаў. Характар “Змагання”, лічыў аўтар, больш правільна разглядаць з улікам рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцый мясцовага актыву, што працаваў пад кіраўніцтвам клуба. Таму аб’яднанне “Змаганне” ў цэлым трэба характарызаваць як рэвалюцыйна-дэмакратычную арганізацыю непралетарскіх пластоў працоўных, якія ішлі па шляху пераўтварэння ў рэвалюцыйную сацыялістычную арганізацыю, лічыў даследчык. Яно ў сваім ідэйна-палітычным развіцці пайшло далей, чым Грамада, і пастулова пераўтваралася ў рэвалюцыйную сацыялістычную арганізацыю [682, с. 103, 329]. Аднак трэба адзначыць, што прыведзеныя фармулёўкі спрошчваюць гісторыю “Змагання” і ўвогуле беларускага руху канца 1920-х гадоў. Рэвалюцыйныя і сацыялістычныя ідэі маскоўскага гатунку нават кіраўніцтвам арганізацыі ўспрымаліся неадназначна. Пра гэта сведчыць паведамленне саветніка паўпрадства СССР у Варшаве Ю.М. Кацюбінскага, які выказаў свае думкі пасля размовы з Я.Е. Гаўрылікам: “...зрабіла цяжкае ўражанне... ён увесь час падкрэсліваў, што ён не камуніст” [299, с. 34]. У дзейнасці “Змагання” праглядваюцца рысы, якія дазволілі В.В. Даніловічу абгрунтавана гаварыць аб праграме народна-дэмакратычнай рэвалюцыі [193, с. 131]. Сябры арганізацыі стаялі больш блізка да нацыянальнага і аграрнага дэмакратызму, чым да прадыктаваных звонку левармадыкальных сацыяльна-класавых арыенціраў.

Зразумела, ні крыніцавых магчымасцей, ні арганізацыйна-метадалагічнай прасторы гісторыкі не мелі для таго, каб разважаць аб тых драматычных і трагічных для людзей і беларускай справы акалічнасцях, у якіх працавалі дзеячы “Змагання”. Шчыльная заслона была апушчана на тыя прыклады распачлівага роздуму, якім аддаваліся палымяныя, на першы погляд, патрыёты, іх сумненні і шкадаванні да нядаўняга часу не прабіваліся праз гэтую заслону. Нічога дзіўнага ў тым, што ў савецкія часы праўду аб рэпрэсіях у дачыненні да кіраўнікоў “Змагання” грамадства так і не пачула. Сёння, дзякуючы навейшым даследаванням, больш зразумелы складаны характар узаемаадносін розных беларускіх палітычных груповак і дзеячаў, якія ў часы дзейнасці арганізацыі вызначалі змест беларускага руху. Гэта тычыцца і самога “Змагання”. Унутры арганізацыі ўвесь час ішла барацьба за выдзяленне на першы план агульнабеларускіх мэт нацыянальна-вызваленчага характару, а не сацыяльна-класавых, якія пастаянна навязваліся камінтэрнаўскім кіраўніцтвам [193, с. 50, 114; 194, с. 7, 5, 86].

Па часе дзейнасці на ніве нацынальна-культурнага адраджэння, на грамадска-палітычнай прасторы Заходняй Беларусі Таварыства беларускай

школы (ТБШ) дзейнічала даўжэй, чым усе астатнія арганізацыі. Аднак яно своеасаблівым чынам нейк "выслізнула" ў якасці манаграфічнага аб'екта даследавання з рук беларускіх савецкіх гісторыкаў. Патлумачыць гэта можна тым, што арганізацыя па духу і па сутнасці была беларускай, аб'ядноўвала пад сцягам барацьбы за беларускую мову, школу, увогуле беларускую культуру насельніцтва, рознае па сваіх палітычных памкненнях. ТБШ разам з ганарова-гераічным званнем "другой лініі акопаў КПЗБ" не заўсёды дапасоўвалася да камуністычнай ідэалогіі, не ўсе ўдзельнікі беларускага культурна-асветніцкага руху пад шыльдай ТБШ адназначна падтрымлівалі камуністычныя лозунгі і справы. Ліберальная сутнасць ТБШ і яе прыхільнікаў з нацыянальна-дэмакратычнага боку не давалі магчымасці канстатаваць яе дзейнасць як аддана савецкую. Больш таго, як сведчасць мемуарныя публікацыі апошняга часу, нават некаторыя мясцовыя кіраўнікі ТБШ не мелі адназначна антыпольскіх поглядаў, дэманстравалі погляд на Польшчу як на сваю дзяржаву [663].

Гісторыя ТБШ у 1950–1980-я гады атрымала фрагментарныя станоўчыя водгукі ў выніку таго, што яго дзейнасць звязвалася з КПЗБ, якая, паводле сцвярджэння гісторыкаў, у сваіх справах абапіралася на ТБШ. Аднак лёгка заўважыць спрошчаныя погляды вучоных на гэтыя ўзаемаадносіны: не заўсёды ТБШ знаходзілася ў адназначным падпарадкаванні КПЗБ. Таварыства, нягледзячы на жаданні яе больш левых ці правых правадыроў, імкнулася захоўваць нацыянальна-асветніцкае аблічча, стаяць вышэй міжпартыйных спрэчак, і яму гэта часта ўдавалася. Нават на старонках калектыўнай манаграфіі "Революционный путь Компартии Западной Белоруссии" сустракаем звесткі пра пасярэдніцтва ТБШ у адносінах КПЗБ з БІГіКам. Што тычыцца барацьбы за ТБШ у 1928–1929 гадах паміж камуністамі, у тым ліку ўдзельнікамі арганізацыі "Змаганне", і прадстаўнікамі нацыянальна-дэмакратычнага крыла беларускага руху, то гэтая старонка трактавалася як спроба польскага ўраду падпарадкаваць ТБШ свайму ўплыву з дапамогай беларускіх нацыяналістаў [720, с. 140, 194–195, 224–225, 351].

Але наяўныя дакументы ўдакладняюць дадзенае спрошчанае ўяўленне. Кіраўніцтва "Змагання" ў 1928 годзе рашуча выступала супраць палітызацыі ТБШ, жадаючы захоўваць яго легальны культурна-асветніцкі характар. Наданне палітычнага характару ТБШ яны лічылі памылкай, аб сваёй пазіцыі цвёрда паведамлялі сваім куратарам па лініі савецкай дыпламатыі [299, с. 34].

Вострае суперніцтва ў Таварыстве па агульных пытаннях тактыкі і стратэгіі, асноўнага зместу дзейнасці адлюстравана ў працах У.Ф. Ладысева і У.А. Палуяна. Так, У.Ф. Ладысеў разам з абавязковай для таго часу канстатацыяй "спробаў пілсудчыкаў фашызаваць ТБШ з

дапамогай беларускіх буржуазных нацыяналістаў" спыніўся на чарговым акце барацьбы за ТБШ у 1934 годзе, якую аўтар тлумачыў жаданнем выціснуць КПЗБ з легальных арганізацый [414, с. 136–139].

Сярод даследаванняў, у якіх адлюстравана дзейнасць ТБШ, неабходна адзначыць грунтоўную манаграфію У.А. Палуяна. Даследаванне змяшчае інфармацыю пра ўтварэнне, склад, арганізацыйнае развіццё ТБШ, арганізацыю культурна-асветніцкай працы, правядзенне кампаніі за адкрыццё беларускіх школ, дыялектычна пададзены ідэйна-палітычныя асаблівасці характару арганізацыі, узаемаадносіны з КПЗБ, прызнаючы яе кіраўніцтва Таварыствам, стасункі з іншымі беларускімі арганізацыямі.

У.А. Палуян характарызаваў ТБШ як арганізацыю рэвалюцыйна-дэмакратычнага характару. Аднак з гэтым меркаваннем адназначна нельга пагадзіцца, маючы на ўвазе яе першапачатковую накіраванасць на беларускую культурна-асветніцкую справу і тое, што сябры арганізацыі дэманстравалі пэўную лаяльнасць у адносінах да польскай дзяржавы [663, с. 50–51]. Гэта разумеў і У.А. Палуян, прызнаючы адносны характар рэвалюцыйнага дэмакратызму ТБШ: "У ідэйна-палітычных пазіцыях часткі членаў ТБШ мелі месца нявызначанасць і непаслядоўнасць". Ён шукаў пацвярджэнні "палітычнай непаслядоўнасці часткі членаў і актывістаў ТБШ, дробнабуржуазнай і нацыянальнай абмежаванасці, якая нараджала згодніцкія нацыяналістычныя настроі, нязбытныя надзеі на магчымасць дабіцца нацыянальнага вызвалення нападставе развіцця асветы". Пры гэтым відавочнымі бачацца сімпатыі даследчыка ў дачыненні да ТБШ, як і ўвогуле да рэвалюцыйна-дэмакратычных беларускіх арганізацый, што прыводзіць да супярэчнасцей у выкладанні сваіх поглядаў. Так, напрыклад, вітаючы актыўнасць КПЗБ, даследчык канстатуе як станоўчы бок у гісторыі ТБШ факт выкарыстання камуністамі культурна-асветніцкай дзейнасці ТБШ для арганізацыі палітычнай работы. Вядома, што такая тактыка КПЗБ на практыцы стварала перашкоды для ажыццяўлення культурна-асветніцкай справы, прыводзіла да актыўных рэпрэсій у дачыненні да ТБШ з боку польскай улады, якая бачыла ў дзейнасці таварыства "руку Масквы". Аб гэтых рэпрэсіях гаварыў і аўтар. Але ў агульнаканцэптуальным плане ён не мог дазволіць сабе выйсці за межы ўсталяваных схем, паводле якіх рэвалюцыянізацыя ТБШ у канцы 1920-х гадоў была станоўчай з'явай у развіцці рэвалюцыйнага руху, бо яна, апрача іншага, была накіравана на барацьбу з беларускімі буржуазнымі нацыяналістамі, аслабленне іх пазіцый. Адносіны вучонага да палітызацыі дзейнасці ТБШ мяняюцца, калі гутарка ідзе аб падзеях 1934 года, калі нацыянальна-вызваленчы рух быў моцна аслаблены, у першую чаргу з-за раскольніцкай лініі КПЗБ, рэпрэсій у БССР у дачыненні да кіраўніцтва БСРГ і "Змагання". Камуністам трэба было "зачапіцца" за легальную

беларускую арганізацыю, прыкрыцца ёй, скарыстаць магчымасці легальнай працы. Аднак камуністы, якія апанавалі Беластоцкую акруговую ўправу, былі больш звыклыя дзейнічаць у традыцыях рашэнняў VI кангрэса Камінтэрна. ЦК КПЗБ, канстатаваў У.А. Палуян, вырашыў перанесці кіраўніцтва Таварыствам у Беластоцкую акруговую ўправу. З яе дапамогай планавалася пераўтварыць ТБШ у радыкальную, па сутнасці палітычную нацыянальна-вызваленчую арганізацыю. Беластоцкая акруговая ўправа вырашыла не прызнаваць Галоўнай управы, зневажальна назвала яе нацыянал-фашысцкай і перастала дасылаць членскія ўзносы. Аўтар адназначна назваў такія дзеянні няправільнымі, памылковымі. Але пры гэтым ён зыходзіў з інтарэсаў КПЗБ, якая магла б больш паспяхова выкарыстоўваць ТБШ для легальнай працы як культурна-асветніцкую арганізацыю. Не ўдалося пазбегнуць аўтару відавочных супярэчнасцей. Напрыклад, неаднойчы заяўляючы пра шчыльныя сувязі ТБШ і КПЗБ, У.А. Палуян згадаў акруговы з’езд ТБШ у Міры, які асудзіў правакацыйныя заявы газеты “Наперад” аб тым, што як быццам бы цэнтральныя органы ТБШ падпарадкоўваюцца нейкім канспіратыўным арганізацыям [682, с. 134, 121–126, 223, 309].

Як спецыфіку беларускага руху трэба адзначыць часта сустракаемы ў 1921–1939 гадах актыўны ўдзел беларусаў у дзейнасці агульнапольскіх палітычных арганізацый. Асаблівай увагі ў гэтым сэнсе заслугоўвае Незалежная партыя хлопская (НПХ). Яна была створана ў выніку рэалізацыі раскольніцкай камінтэрнаўскай палітыкі на глебе агульнапольскай сялянскай партыі “Вызваленне”. У склад кіраўніцтва НПХ уваходзілі выхадцы з Беларусі С. Балін, Ф. Галавач, У. Шакун і А. Шапель, якія падкрэслівалі сваё беларускае паходжанне. Разам з “крэсовым палякам” С. Ваявудскім яны займаліся ўсталяваннем НПХ як агульнапольскай радыкальнай сялянскай партыі, амаль аналагічнай па сваім палітычным характары БСРГ. Архіўныя матэрыялы даюць магчымасць зрабіць выснову аб спробе на базе НПХ стварыць агульнапольскую арганізацыю бальшавіцкага характару са строгай дысцыплінай, глыбокай канспірацыяй і справаздачнасцю [225, арк. 79–80]. НПХ, маючы цесныя сувязі з камуністычнымі арганізацыямі, павінна была праводзіць пракамуністычную дзейнасць у агульнапольскіх маштабах. Што тычыцца адлюстравання дзейнасці НПХ беларускімі савецкімі гісторыкамі, то яно абмяжоўвалася канстатацыяй дабразычлівых адносін НПХ з КПЗБ і БСРГ як прыкладу братэрскіх узаемаадносін польскага і беларускага народаў, іх узаемнай салідарнасці ў барацьбе з сацыяльным і нацыянальным прыгнётам [516, с. 87–90; 720, с. 93; 682, с. 44, 45, 55, 56, 59, 342].

Такім чынам, у айчыннай савецкай гістарыяграфіі грунтоўнага даследавання дзейнасці непралетарскіх партый, у тым ліку беларускіх,

не было. У лепшым выпадку адлюстраванне дзейнасці беларускіх нацыянальных партый і арганізацый у другой палове 1950-х – 1980-я гады працягвала традыцыі, якія склаліся ў гістарычнай літаратуры яшчэ ў 1920–1930-я гады, калі вывучэнне і асвятленне ў друку гэтых пытанняў павінна было давесці да насельніцтва інфармацыю пра варожыя і здрадніцкія ў дачыненні да беларускага народа, згодніцкія ў адносінах да польскіх уладаў характар і сутнасць узгаданых палітычных арганізацый. Аднак на фоне 1920–1930-х гадоў, калі на старонках абагульняльных прац гісторыя партый і арганізацый рознага накірунку была прадстаўлена ў значнай ступені [488; 678], у пасляваеннай гістарыяграфіі не назіралася бачнага пашырэння названай праблематыкі. Як і раней, згадкі як пра асобных некамуністычных дзеячаў, так і пра адпаведныя партыі і арганізацыі, калі яны не супрацоўнічалі з КПЗБ, дэманстравалі рашучую варожасць і адназначнае непрыманне іх дзейнасці.

Неабходна мець на ўвазе той факт, што адлюстраванне гісторыі беларускіх партый і арганізацый было абумоўлена залежнасцю айчыннай гістарыяграфіі ад грамадска-палітычнага рэжыму. Гэты дэтэрмінізм прыводзіў да таго, што беларускія нацыянальныя партыі падвяргаліся першачарговаму ўдару і шэльмаванню з боку айчынных даследчыкаў. Гісторыкі, сцвярджаючы абсалютную непагрэшнасць КПЗБ у барацьбе са сваімі апанентамі, з бальшавіцкім імпэтам адмаўлялі саму магчымасць існавання альтэрнатыўных падыходаў да вырашэння беларускага пытання.

Патрэбы навукі і сённяшнія магчымасці, на нашу думку, не дазваляюць так аднабакова, нецярпліва ставіцца да палітычных апанентаў: кожная з названых партый была выказнікам інтарэсаў адпаведных слаёў насельніцтва і па-свойму бачыла шляхі рэалізацыі сваіх праграмных установак па паляпшэнні жыцця насельніцтва Заходняй Беларусі ўвогуле ці асобных этнічных адзінак.

Цяпер паўстае неабходнасць як мага больш аб’ектыўнага вывучэння гісторыі стварэння і дзейнасці беларускіх дэмакратычных партый і арганізацый. Бо, як слушна заўважыла польская даследчыца А. Бергман, без гэтых палітычных арганізацый сама КПЗБ “вісіць у пустаце” [41]. Тое самае адносіцца і да гісторыі іншых небеларускіх непралетарскіх арганізацый, якія таксама праводзілі сваю працу ў гэтым рэгіёне. У апошні час беларускія вучоныя зрабілі ў гэтым накірунку значныя крокі.

### 3.3. Даследаванне пытанняў рабочага руху

Разгорнутая з другой паловы 1950-х гадоў актыўная праца па навуковым вывучэнні і асвятленні ў друку гісторыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі стымулявала вывучэнне пытанняў рэвалюцыйнага

рабочага руху, яго месца і ролі ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе ў Заходняй Беларусі. Адбывалася гэта з-за таго, што КПЗБ была нададзена авангардная роля ў барацьбе супраць акупацыйнага рэжыму і кіраванні гэтай барацьбой, у прыватнасці, рабочым рухам. Вядома, што будучы партыяй рабочага класу і ставячы сваей канчатковай мэтай дыктатуру пралетарыяту, КПЗБ усе свае намаганні прыкладвала да таго, каб узначаліць рабочых Заходняй Беларусі ў іх барацьбе за паляпшэнне свайго становішча. Камуністы імкнуліся накіраваць рабочы рух, які насіў эканамічны характар, у рэчышча палітычнай барацьбы, скарыстаўшы гэткім чынам цяжкае эканамічнае становішча рабочых і іх незадаволенасць эканамічнай палітыкай польскага ўраду.

Асноўныя метадалагічныя падыходы да асэнсавання характару, ролі і месца рабочага руху ў рэвалюцыйнай нацыянальна-вызваленчай барацьбе ў Заходняй Беларусі былі акрэслены ва ўзгаданых вышэй публікацыях у партыйным друку. Найбольшай увагі ў гэтым сэнсе заслугоўвае падрыхтаваны М.С. Арэхва артыкул “Да пытання аб гісторыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі”, ва ўступе да якога звяртаецца ўвага на тое, што арганізатарам і кіраўніком барацьбы рабочых і сялян Заходняй Беларусі супраць эксплуататараў і прыгнятальнікаў выступала КПЗБ.

Разважаючы аб агульных пытаннях рабочага руху, М.С. Арэхва даводзіў, што “вызваляючыся ад нацыяналістычнага ўплыву, рабочыя пад кіраўніцтвам камуністаў стваралі і ўмацоўвалі класавыя інтэрнацыянальныя прафсаюзы, арганізоўвалі забастоўкі, наладжвалі рэвалюцыйныя дэманстрацыі ў абарону сваіх правоў” [337]. Адзначым, што вывучэнне пытанняў рэвалюцыйнага рабочага руху ў Заходняй Беларусі ў другой палове 1950-х – 1980-я гады якраз і развівалася ў асноўным вакол гэтых момантаў: аналіз стану прафсаюзнага руху ў рабочым асяродку і праца кампартыі ў прафсаюзах з мэтай заваявання пралетарскіх мас на свой бок; арганізацыя партыяй эканамічнай барацьбы ў выглядзе забастовак, якія часам насілі палітычны характар; палітычная барацьба рабочых у выглядзе масовак, мітынгаў, дэманстрацый.

Неабходна адзначыць, што ў параўнанні з папярэднім перыядам, калі пры разглядзе пытанняў рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі аўтары перабольшвалі яго стыхійнасць, у другой палове 1950-х гадоў у гістарычнай літаратуры была прапанавана і абгрунтавана думка аб вядучай, авангарднай ролі КПЗБ у кіраванні рабочым рухам. “Стыхійных выступленняў было мала. У большасці сваёй стачкі рыхтаваліся і праводзіліся пад кіраўніцтвам камуністаў і заканчваліся перамогай рабочых”, – сцвярджала І.В. Царук, закранаючы некаторыя пытанні рабочага руху [858, с. 52].

Прапанаваная схема (цяжкае становішча рабочых выклікае рэвалюцыйны рабочы рух, якім кіруе КПЗБ, яна ў сваю чаргу вядзе барацьбу за заваяванне большасці пралетарыяту шляхам працы ў прафсаюзах; кампартыя аргнанізоўвае эканамічныя і палітычныя забастоўкі і шматлікія дэманстрацыі) была з цягам часу пацверджана на старонках усесаюзнага партыйнага друку. Так у артыкуле “За правильное освещение истории Компартии Западной Белоруссии” падтрымана палажэнне аб кіраўніцтве рабочым рухам кампартыяй, якая “здолела распаўсюдзіць свой уплыў на прафсаюзы, захопленыя ППС і буржуазнымі нацыяналістычнымі партыямі, стварыць унутры іх левае крыло ці самастойныя рэвалюцыйныя прафсаюзы і праз іх кіравала масавымі забастоўкамі рабочага класу Заходняй Беларусі за павелічэнне заработнай платы, скарачэнне рабочага дня і іншыя надзённыя патрабаванні” [287, с. 73].

Разам з тым, што пытанні рабочага руху знаходзіліся ў залежнасці ад актуальнасці вывучэння гісторыі КПЗБ, яго роля і месца ў рэвалюцыйнай барацьбе ўздымаліся на значны ўзровень з-за таго, што, згодна палажэнняў марксісцка-ленінскай метадалогіі, рабочы клас Заходняй Беларусі, нягледзячы на яго нешматлікасць, узводзіўся ў ранг гегемона рэвалюцыйнага руху народных мас. У гістарыяграфіі замацавалася своеасаблівая схема, згодна з якой барацьбу працоўных Заходняй Беларусі супраць прыгнёту ўзначальваў рабочы клас, якім кіравала кампартыя, а выступленні рабочых былі штуршком для разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы бяднейшага сялянства, сельскагаспадарчага пралетарыяту і батракоў [855, с. 132].

У адзначаны перыяд тэма рабочага руху не атрымала свайго спецыяльнага даследавання, аднак яго падзеі з’яўляліся фонам, на якім даследчыкі адлюстроўвалі з неабходнай акцэнтацыяй і ацэнкамі ўзровень рэвалюцыйнасці насельніцтва Заходняй Беларусі і поспехі камуністаў па авалодванні кіраўніцтвам рабочым рухам. Першымі апублікаванымі працамі па ўказанай праблематыцы сталі артыкулы І.В. Палуяна [620; 621]. Ён быў адным з тых, каму было даверана абгрунтаваць ідэю аб антынароднай палітыцы польскіх улад і масавым адказам на яе з боку рэвалюцыйных рабочых, згуртаваных вакол сваёй партыі – КПЗБ. Вышэйакрэсленыя падыходы знаходзім і ў сумеснай працы І.В. Палуяна і У.А. Палуяна, у якой значнае месца адведзена адлюстраванню пытанняў рабочага руху [683]. Асаблівую вартасць гэтай працы надае тое, што ў кнізе пытанні рэвалюцыйнай нацыянальна-вызваленчай барацьбы, у тым ліку і пытанні рабочага руху, атрымалі скразное асвятленне, гэта значыць з 1921 па 1939 гады. Бачны ўклад у распрацоўку пытанняў рэвалюцыйнага рабочага руху як выніку імкнення польскага і беларускага народаў да кансалідаванага змагання зрабіў у сваіх працах А.М. Мацко [512; 516].

Скразное асвятленне пытанні рабочага руху ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гады атрымалі на старонках калектыўнай працы па гісторыі КПЗБ, тэарэтычнай асновай якой з’яўлялася марксісцка-ленінскае вучэнне аб партыі рабочага класу [720].

Гісторыкі шмат увагі адводзілі пытанням эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі, стану прамысловасці, умовам жыцця і працы рабочых. Традыцыйна падкрэслівалі наяўнасць “эканамічнай эксплуатацыі, жорсткага акупацыйнага рэжыму, нацыянальнага і палітычнага гнёту”, якія, на думку аўтараў, стваралі аб’ектыўныя перадумовы, базу, на якой рос і развіваўся масавы рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Задача кампартыі як авангарду гэтага руху заключалася ў тым, каб аб’яднаць усе рэвалюцыйныя сілы народа, у першую чаргу нешматлікі, распылены і слаба арганізаваны рабочы клас [720, с. 21–22]. Даследаванні сцвярджалі думку пра адавочную залежнасць актыўнасці рабочага руху ад уплыву камуністаў у рабочым асяродку, пры гэтым назіралася ігнараванне трывалых пазіцый і вырашальнага ўплыву ў рабочым руху ППС, Бунда, іншых партый, хоць на гэта ўказвалі згадкі пра адсутнасць адзінства рабочых. Так Т.Ю. Глінская, якая ў значным аб’ёме закранала пытанні развіцця рабочага руху ў Заходняй Беларусі, адзначыла, што прафсаюзны рух у Заходняй Беларусі, як і ва ўсёй Польшчы, быў раздроблены на шэраг паралельных саюзаў. Перад КПЗБ, якая з першых дзён свайго існавання разгарнула шырокую працу ў прафсаюзах, у якасці адной з важных стаяла задача пераадолення расколу ў прафсаюзах і ўцягненне ў іх большасці рабочых Заходняй Беларусі. Для здзяйснення гэтага неабходна было перш за ўсё ўмацаваць уплыў КПЗБ у прафсаюзах, таму партыя прыступіла да стварэння ў прафсаюзах камуністычных і чырвоных фракцый. Камуністычныя фракцыі – з камуністаў, а чырвоныя са спачуваючых [140, с. 68]. Відавочна добра ўсведамлялі рэальныя магчымасці КПЗБ І.В. Палуян і У.А. Палуян, закранаючы пытанні стану прафсаюзнага руху, яны адзначылі, што на пачатку 1920-х гадоў унутры класавых прафсаюзаў пастаянна ішла барацьба за ўплыў паміж ППС і Бундам, якія называліся аўтарамі згодніцкімі, і камуністычнай партыяй. Гісторыкі разумелі цяжкасці камуністаў у барацьбе за прафсаюзы: “Змагаючыся за масы, за ўмацаванне свайго ўплыву сярод рабочых, камуністы… праводзілі тлумачальную працу на прадпрыемствах, стваралі фабрычна-завадскія камітэты і левыя (чырвоныя) фракцыі пры прафсаюзах”. Аднак адразу пасля гэтага вучоныя ўпэўнена аптымістычна сцвярджалі дамінантнае становішча КПЗБ: “Да 1923 года акрэплі прафсаюзныя арганізацыі, пашырыліся сувязі і ўзаемная падтрымка паміж імі, узрасла арганізаванасць і адзінства рабочага класа. Рос уплыў кампартыі ў прафсаюзах, што станоўча сказвалася і на стане

забастовачнага руху. Там, дзе кіраўніцтва прафсаюзаў аказалася ў руках камуністаў, барацьба рабочых за свае правы станавілася больш упартай і арганізаванай” [683, с. 46, 48].

Нягледзячы на першапачатковую зададзенасць і схематызм, даследаванні дэманстравалі розныя выніковыя фармулёўкі і ацэнкі прафсаюзнага руху. Так, Т.Ю. Глінская назвала “ультралевыя” памылкі ў КПЗБ у адносінах да прафсаюзаў, якія праявіліся ў адмове працаваць у энпээраўскіх, хадэцкіх і іншых “рэакцыйных” прафсаюзах, ухіленні ад правядзення тактыкі адзінага фронта і арганізацыі эканамічнай барацьбы рабочага класа. Яна лічыла, што кіраўніцтва КПЗБ не вяло барацьбу супраць выхаду рабочых з г. зв. рэакцыйных прафсаюзаў, падпарадкаваных іншым партыям, а, імкнучыся ўмацаваць уплыў у прафсаюзах, яно змагалася толькі за захоп прафсаюзнага апарату, а не за ўмацаванне свайго ідэйнага ўплыву на масы [140, с. 71]. Такія высновы аўтара выклікалі рашучую крытыку з боку ветэранаў КПЗБ: “Канкрэтны паказ дзейнасці КПЗБ у прафсаюзах, яе кіруючай ролі ў забастоўках падменены ў кнізе агульнымі разважаннямі пра стан прафсаюзнага руху” [613]. На выпраўленне такога кшталту недахопаў, недапушчэнне іх у будучым на старонках друку была арыентавана калектыўная праца па гісторыі КПЗБ. Даследчыкі, а аўтарам адпаведнай главы быў М.С. Арэхва, адзін з крытыкаў Т.Ю. Глінскай, звярнулі ўвагу на цяжкасці, якія, на іх думку, перажываў рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі пасля яе захопу Польшчай. Каталіцкаму духавенству, нацыянальна-дэмакратычным партыям, якія названы ў кнізе нацыяналістычнымі буржуазнымі партыямі, часова, як лічылі аўтары, удалося ўмацаваць свой уплыў у рабочым класе. У тых складаных умовах камуністы пачалі актывізаваць сваю дзейнасць сярод рабочых, “усю сваю энергію гарадскія партыйныя арганізацыі канцэнтравалі на працы ў прафсаюзах”. Аднак, у адрозненні ад Т.Ю. Глінскай, калектыўная манаграфія акцэнтавала ўвагу на “паслядоўнай інтэрнацыянальнай палітыцы” камуністаў, якія імкнуліся аб’яднаць польскія і яўрэйскія класавыя прафсаюзы ў адзіныя арганізацыі. Па меркаванні выдання, класавыя прафсаюзы пад кіраўніцтвам камуністаў арганізоўвалі забастоўкі, у ходзе якіх выстаўляліся эканамічныя патрабаванні, пад уплывам камуністаў расла палітычная свядомасць рабочых, ішоў працэс палявення рабочага класа. Нівеліруючы крытыкаванае ветэранамі выказванне, гісторыкі сцвярджалі, што кампартыя ў мэтах пашырэння ўплыву сярод рабочых прымяняла тактыку адзінства дзеянняў з арганізацыямі ППС і Бунда [720, 42, 48–49].

Дадзеная спрэчка не можа быць вырашана канчаткова, бо пазіцыя КПЗБ па акрэсленых пытаннях была неадназначнай і супярэчлівай. Напрыклад, рэзалюцыя сакратарыяту ЦК КПЗБ па дакладзе Брэсцкага

акруговага камітэта не пазней 1926 года мае заблытаную інфармацыю пра “станоўчыя бакі” ў дзейнасці арганізацыі, правядзенне партыяй “шырокай працы па папулярызацыі ідэі адзінага рэвалюцыйнага фронта працоўных” і “вялікай кампаніі выкрыцця ППС і Бунда”. Сярод задач была выстаўлена патрэба “звярнуцца з новымі прапановамі да ППС, Бунда, ПЦ (Паалей Цыёна. – *А.С.*) аб далучэнні да існуючага камітэта рабочага адзінства, які з’яўляецца выяўленнем адзінага рабочага блоку, для аб’яднання ўсіх сіл рабочага класу, супраць аб’яднанай буржуазіі” [563, арк. 64, 65].

Што тычыцца вынікаў дзеянняў кампартыі ў прафсаюзным асяродку, то тут даследчыкі дэманстравалі адзінства, якое сцвярджала пра вырашальны ўплыў і выніковасць дзеянняў камуністычных агітатараў. Т.Ю. Глінская гаварыла, што арганізацыя эканамічнай барацьбы рабочага класа, стварэнне чырвоных фракцый у саюзах узмацнілі ўплыў партыі ў прафсаюзах: у сярэдзіне 1926 года з 11 тысяч арганізаваных у прафсаюзах рабочых Заходняй Беларусі пад уплывам партыі знаходзілася больш паловы [140, с. 71]. Паступова камуністы сталі вырашальнай сілай ва ўправах большасці класавых прафсаюзаў і ў аб’яднаных саветах прафсаюзаў Заходняй Беларусі, як гаварыў М.С. Арэхва, у тых месцах, дзе кіраўніцтва прафсаюзаў знаходзілася ў руках камуністаў, усе канфлікты насілі рашучы характар і большай часткай выліваліся ў працяглыя забастоўкі [720, с. 56–57]. Разважаючы аб рабочым руху ў перыяд 1921–1924 гадоў, І.В. Палуян і У.А. Палуян напрамую звязвалі стан забастовачнага руху з узмацненнем пазіцый кампартыі ў прафсаюзах, што прыводзіла да пашырэння забастовачнага руху, прычым баставалі не толькі рабочыя буйных, але і дробных прадпрыемстваў. Забастовачны рух у перыяд пасляваеннага рэвалюцыйнага ўздыму найвышэйшага ўзроўню дасягнуў у 1923 годзе, калі ў Віленскім, Навагрудскім, Палескім і Валынскім ваяводствах адбылося 62 забастоўкі. Імі было ахоплена 177 прадпрыемстваў з 1128 рабочых [683, с. 48]. М.С. Арэхва ў калектыўнай манаграфіі прывёў іншыя лічбы, якія значна адрозніваюцца ад прыведзеных: у 1923 годзе ў 590 калектыўных канфліктах з прадпрыймальнікамі прынялі ўдзел 126 000 рабочых [720, с. 56]. Не дазваляе высветліць адпаведныя колькасныя паказчыкі А.М. Мацко, які паказаў лічбы за кастрычнік 1923 годзе ў агульнапольскім маштабе: 400 тысяч забастоўшчыкаў [516, с. 73]. Сцвярджэнні аб пашырэнні забастовачнага руху ў сувязі з актывізацыяй кампартыі выклікаюць крытычныя разважанні, бо гаварыць пра трываласць пазіцый камуністаў у 1921–1923 гады не даводзіцца, у заходнебеларускіх гарадах, напрыклад у Брэсце, існавалі разрозненыя ідэйна і нацыянальна камуністычныя арганізацыі і дзеячы [577, арк. 22–23, 25, 26, 27]. Увогуле на працягу ўсяго перыяду 1921–1939 гадоў камуністы так і не змаглі ўзначаліць рабочы рух,

пацягнуць за сабой большасць рабочых, якія традыцыйна ішлі за ППС, Бундам, а таксама за праўрадавымі прафсаюзамі. КПЗБ была створана толькі ў канцы 1923 года. Важна ўлічваць тое, што 1923 год – год вельмі паказальны, калі сітуацыя ў Еўропе, асабліва ў Германіі, дасягнула вядомай вастрыні, полымя рэвалюцыі ўсё больш пагражала перакінуцца на Польшчу.

У даследаваннях выяўляецца эквілібрыстыка з лічбовымі паказчыкамі на карысць павелічэння актыўнасці і ролі КПЗБ у рабочым руху, што прыводзіла да несастыковак. Вядома, што, паводле агульнапрынятай перыядызацыі, у 1924 годзе пачынаўся перыяд адноснай стабілізацыі капіталізму, а значыць колькасць эканамічных канфліктаў у вытворчасці павінна зніжацца. Гісторыкі так і гаварылі, адзначаючы аднак, што ў 1924 годзе ва ўмовах “узрастаючых цяжкасцей капіталістычнай стабілізацыі” рабочы рух таксама дасягнуў значнай вастрыні, бо ўсё больш увагі рабоце ў прафсаюзах удзяляла кампартыя, але, тым не менш, забастовачны рух у 1924 годзе ў цэлым быў слабей, чым у 1923 годзе. Колькасць забастовак паменшылася да 30, ахопленых імі прадпрыемстваў – да 263, у забастоўках удзельнічала 4 151 рабочы (у 1923 годзе – 1128 рабочых). Забастовачная барацьба насіла пераважна эканамічны характар. Дасягнуўшы ўздыму ў 1923 годзе, яна ў хуткім часе пайшла на спад, даводзілі даследчыкі [683, с. 48, 52]. Бачым, што агульная колькасць забастовак у 1924 годзе сапраўды зменшылася, аднак рашуча павялічылася колькасць бастуючых прадпрыемстваў і амаль у чатыры разы колькасць забастоўшчыкаў! Аднак ісці супраць прынятай перыядызацыі было нельга. Узгодненых паказчыкаў забастовачнага руху і за 1924 год няма, М.С. Арэхва і А.М. Мацко аднолькава падалі 388 забастовак і 79 тыс. рабочых, як і па 1925 годзе – 25 тыс. рабочых [516, с. 107; 720, с. 84]. Пры гэтым усе даследчыкі намагаліся забастоўкі арганізацыйна звязаць з КПЗБ. Яны рашуча ішлі на штучнае павелічэнне ролі КПЗБ, звяртаючы ўвагу на актывізацыю палітычных выступленняў рабочых, гаворачы аб “параўнальна шырокіх памерах… палітычнай барацьбы рабочага класа, якая праяўлялася ў першамайскіх выступленнях і дэманстрацыях рабочых”. Акцэнтацыя ажыццяўлялася на ідавочнай, па меркаванні аўтараў, розніцы: калі ў 1921–1922 гадах у вызваленчым руху Заходняй Беларусі заўважна праяўляліся элементы стыхійнасці, то ў 1923–1924 гады ён насіў больш арганізаваны характар таму, што на чале яго стала Кампартыя Заходняй Беларусі [683, с. 46–48].

Адзначым, што прыведзеныя аптымістычныя сцверджанні сфарміраваны насуперак праігнараваных непрыемных для камуністаў выпадкаў, якія мелі месца ў рабочым прафсаюзным руху. Партыйнае кіраўніцтва, у тым ліку М.С. Арэхва, пра іх ведала з рэгулярна атрыманых справаздач з “крэсаў”. Так, справаздача ЦК КПЗБ за чэрвень 1925 год,

падаючы інфармацыю аб становішчы ў Заходняй Беларусі і рабочым руху, канстатавала несуцешальную для партыйнага кіраўніцтва сітуацыю: “Што тычыцца рабочых мас, то сярод іх вялікая апатыя. Асабліва характэрна гэта ў Беластоку”. Нягледзячы на некаторыя поспехі, “зрушыць масу на якую-небудзь кампанію вельмі цяжка. Рабочыя пабойваюцца. У прафсаюзы ідуць неахвотна, і гэта звязана з рэпрэсіямі”. Даклад за ліпень таго ж года аб стане КПЗБ таксама не мог дабавіць партыйным функцыянерам аптымізму, бо “настрой рабочых мас у сваёй большасці пасіўны… агульную апатыю разбіць нельга. Асобныя выпадкі выйграных забастовак не ў стане ўскалыхнуць усёй рабочай масы. Боязь страціць месца прымушае рабочых чэпка трымацца сваіх месцаў” [584, арк. 13, 14, 17].

На фоне поспехаў арганізацыі антыпольскага руху ў сельскай мясцовасці, калі вяскоўцы масава ўступалі ў Грамаду і так ці інакш удзельнічалі ў барацьбе, з гарадскімі рабочымі былі вядомыя цяжкасці, ілюстрацыяй чаго была згаданая інфармацыя аб уплыве на прафсаюзы рабочых. У цэлым, лічылі І.В. Палуян і У.А. Палуян, забастовачны рух рабочых у 1926 годзе адставаў ад узроўню палітычнай барацьбы ў краі. Аўтары тлумачылі гэта ажыўленнем прамысловай вытворчасці ва ўмовах стабілізацыі, а таксама адсутнасцю адзінства рабочага руху і раскольніцкай работай згодніцкіх партый [683, с. 103]. А.М. Мацко да гэтага дабавіў “суровыя паліцэйскія рэпрэсіі”, пагадзіўся з тым, што ў 1926 годзе забастовачная барацьба значна аслабла [516, с. 106, 113]. Аўтары калектыўнай манаграфіі ізноў гаварылі пра слаба арганізаваны і распылены рабочы рух [720, с. 165]. Аднак, нягледзячы на гэта, каб выправіць хоць на старонках навуковых выданняў відавочны дысбаланс не на карысць гегемона рэвалюцыі, гісторыкі вымушаны былі гаварыць пра ўяўныя поспехі, якія, як выцякае з тэксту, сталі вынікам актыўнай агітацыйнай працы, калі адным з найважнейшых момантаў барацьбы КПЗБ і Грамады за стварэнне адзінага фронту рабочага класа стала змаганне за легальныя арганізацыі рабочых: прафесійныя саюзы, бальнічныя касы, страхавыя суполкі. Тут ізноў гутарка пра пасяховыя вынікі гэтай справы: “…КПЗБ дабівалася пэўных поспехаў у справе ажыўлення працы ў прафсаюзах. …У 1926–1927 гг. назіраўся паўсюдны рост класавых прафсаюзаў, што сведчыла аб зрухах улева, аб рэвалюцыянізаванні рабочых мас, аб усё ўзрастаючым уплыве КПЗБ сярод пралетарыяту” [720, с. 165–166]. Да такіх сцверджанняў дабаўлялася інфармацыя аб характэрнай асаблівасці рабочага руху другой паловы 1926 года – яго ярка выражаны палітычны характар. Адной з асноўных форм выступлення рабочых лічыліся “арганізаваныя камуністамі і актывам Грамады” ў розных гарадах краю масавыя мітынгі, палітычныя сходы і дэманстрацыі, у рэзалюцыях, прынятых у ходзе гэтых “масавых выступленняў”,

утрымліваліся патрабаванні карэнных рэвалюцыйных пераўтварэнняў” [683, с. 103–104]. Але гаварыць пра вялікую карысць прапагандысцкіх кампаній бальшавікоў у гарадах не даводзіцца, тым больш улічваючы неаднолькавую сацыяльна-эканамічную, этнаканфесійна сітуацыю ў розных гарадах Заходняй Беларусі. Напрыклад, прыезд і выступленне на мітынгу 21 лютага 1926 года ў Брэсце Б. Тарашкевіча і П. Валошына, нягледзячы на тысячную колькасць удзельнікаў, наўрад ці можа быць падставай для сцвярджэнняў аб падтрымцы рабочымі камуністаў і грамадоўцаў [55, с. 105–106]. Здаралася, што рабочыя дамаўляліся не распаўсюджваць апазіцыйныя ўлёткі ў час масавых сходаў, бо “тым самым пралетарыят не столькі выкажа сваю дзейнасць, колькі скампраметуе сябе і прывядзе да арышту членаў легальных арганізацый” [225, арк. 22].

Пры разглядзе пытанняў рабочага руху ў перыяд існавання Грамады аўтары сцвярджалі, што ў арганізацыях БСРГ налічвалася каля 8 % гарадскіх рабочых [720, с. 136]. Улічваючы той факт, што колькасць членаў Грамады ў розных крыніцах вагаецца ад 100 да 160 тысяч чалавек, можна гаварыць пра даволі шырокі ўдзел рабочых у дзейнасці БСРГ. Аднак, зыходзячы з асаблівасцей нацыянальна-канфесійнага складу рабочых, наўрад ці можна давяраць прыведзеным працэнтным паказчыкам. Да таго ж, паводле партыйных дакументаў, няма падстаў гаварыць пра безумоўны аўтарытэт кампартыі сярод рабочых у сярэдзіне 1920-х гадоў. У тым ліку пра стан прафсаюзнага руху, напрыклад у Беластоку, дзе першапачатковыя поспехі камуністаў у прафсаюзах былі спынены масавымі арыштамі актывістаў КПЗБ, некаторыя з іх актыўна супрацоўнічалі са следствам, выдавалі яўкі, паролі, кіраўніцтва партыі [225, арк. 35–41; 588, арк. 24]. Напрыклад, сакратар Беластоцкага акруговага камітэта, член ЦК КПЗБ Ян Богдан, адзін з камуністычных прафсаюзных правадыроў, карыстаўся “вялікім аўтарытэтам сярод беластоцкіх рабочых”, выдаў члена цэнтральнага камітэта Л.Н. Аранштама, кіраўніка нелегальнай ваеннай арганізацыі КПЗБ. Пасля арышту і супрацоўніцтва са следствам Я. Богдан адышоў ад супрацоўніцтва з камуністамі і паспяхова працаваў у прафсаюзах, непадкантрольных КПЗБ [566, арк. 2–4; 588, арк. 24].

Несуцешальныя прыклады не выключаліся і ў іншых партыйных і прафсаюзных арганізацыях. Гэта пацвярджае, у прыватнасці, рэзалюцыя ЦК КПЗБ па дакладзе аб дзейнасці Віленскага акруговага камітэта партыі, якая адзначыла слабую палітычную актыўнасць гарадскіх арганізацый Вільні і Ліды, недастатковы ўдзел камуністаў у эканамічнай барацьбе рабочых, партыя “не прымае ніякага ўдзелу ў канфліктах, якія мелі месца на шклозаводзе і фанернай фабрыцы [563, арк. 68]. Хутчэй за ўсё гэта можна патлумачыць паглынаннем камуністаў аграрна-сялянскай

праблематыкай, якая дыктавалася грамадоўскімі актывістамі і паступова выводзіла партыйцаў з гарадоў у бурлівыя вёскі і мястэчкі.

Жаданне гісторыкаў падвесці наяўныя колькасныя паказчыкі рабочага руху пад агульную канцэпцыю бачання нацыянальна-вызваленчага руху прыводзіла да відавочных несастыковак. І.В. Палуян і У.А. Палуян сцвярджалі, што ў перыяд г. зв. апошніх гадоў адноснай стабілізацыі капіталізму (красавік 1927 года – май 1929 года) рэвалюцыйны і нацыянальна-вазваленчы рух у Заходняй Беларусі хоць і быў больш слабым, чым у 1926–1927 гадах, але дасягнуў значнай вастрыні і сілы. Забастовачны рух рабочых нават некалькі ўзрос у параўнанні з 1926 годам. [683, с. 130]. Баявы і наступальны характар многіх стачак сведчыў аб уздыме забастовачнага руху, які бачна ажывіўся, адзначыў А.М. Мацко [516, с. 129; 720, с. 167]. Адметнасць гэтага перыяду даследчыкі бачылі ў тым, што барацьба вялася галоўным чынам за захаванне і ўмацаванне саюза рабочых і сялян, за захаванне наяўных і стварэнне новых масавых легальных арганізацый працоўных, за падтрыманне хаця б на ранейшым узроўні рэвалюцыйнага нацыянальна-вызывленчага руху, за актывізацыю рабочага руху. Агульным, на думку даследчыкаў, што аб’ядноўвала рэвалюцыйны рух тых гадоў з рэвалюцыйным рухам 1925–1926 гадоў, з’яўлялася існаванне і легальная дзейнасць дэмакратычных арганізацый “Змаганне” і ТБШ, значнае распаўсюджванне легальных форм дзейнасці кампартыі ў масах, у тым ліку ў асяродку рабочых. Відавочна, што тут аўтарам не хапіла дакладнасці ў тым, каб разабрацца што ёсць рух рэвалюцыйны, а што нацыянальна-вызваленчы, як яны суадносяцца паміж сабой. Тым больш улічваючы ўжо адзначаныя асаблівасці гарадскога насельніцтва, у якім колькасная перавага была на баку прадстаўнікоў яўрэскай нацыянальнасці, якія хоць і кантактавалі з КПЗБ, але забяспечыць рэвалюцыйнасць не маглі. Да таго ж забастовачны рух рабочых мог развівацца без узаемасувязі з беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам і слаба быць залежным ад “Змагання” і ТБШ, як раней і ад БСРГ.

І на працягу астатніх перыядаў рабочы рух гісторыкі дэтэрмінавалі станам кампартыі. Улічваючы вядомы антаганізм КПЗБ з ППС і Бундам, які актыўна падаграваўся камінтэрнаўскім кіраўніцтвам, супярэчлівым можна назваць разважанне пра тое, што ў 1928 годзе КПЗБ яшчэ больш умацавала свае пазіцыі ў прафсаюзах, бальнічных касах і іншых рабочых арганізацыях, што гэты час характарызаваўся рэзкім зрухам рабочай масы ў накірунку камуны. Безумоўна, нельга адназначна адмаўляць некаторую камуністычную абумоўленасць рабочага руху ў акрэсленыя часы. Аднак вядома, што ў гэты час КПЗБ па патрабаванні камінтэрнаўскага кіраўніцтва паступова пераходзіць да арганізацыі канфрантацыі ў

адносінах з сацыялістычнымі партыямі паводле так званай тэорыі “сацыял-фашызму”. Гэта непазбежна прывяло да сварак з асноўнымі гракамі на “фабрычна-завадскім полі” – ППС і Бундам, кіраўніцтва якіх было моцна пакрыўджана сваімі партнёрамі-камуністамі, што павінна было звузіць камфортную прысутнасць камуністаў у рабочым асяродку.

Тым не менш, даследаванні распавядалі пра актыўную працу КПЗБ у прафсаюзах, у тым ліку і ў праўрадавых – “рэакцыйных”, што дазваляла камуністам актывізаваць эканамічную і палітычную барацьбу рабочага класа. Аўтары паведамлялі, што ў 1927–1928 гадах у Заходняй Беларусі праходзілі шматлікія забастоўкі рабочых. Эканамічныя забастоўкі нярэдка выліваліся ў палітычныя, перапляталіся з імі, усё больш узнікала забастовак салідарнасці [683, с. 130]. Пры гэтым падача матэрыялу адбывалася так, што штучна ствaралася ўражанне аб дачыненні кампартыі да ўсіх праяваў рабочага руху. Так, напрыклад, А.М. Мацко сцвярджаў, што “падаўляльная большасць стачак заканчвалася поўнай ці частковай перамогай рабочых. У авангардзе барацьбы пралетарыяту за паляпшэнне жыццёвых умоў, супраць гнёту эксплуататараў ішлі камуністы” [516, с. 130]. Аналізуючы забастовачную барацьбу, аўтары калектыўнай манаграфія па гісторыі КПЗБ сцвярджалі, што забастоўкі гэтага перыяду насілі масавы, часта наступальны з боку рабочых характар, многія “стачкі былі вельмі ўпартымі, працягваліся некалькі месяцаў”, “рабочыя вялі барацьбу не толькі за павышэнне заработнай платы, але і выстаўлялі палітычныя патрабаванні”, у ходзе забастовачнай барацьбы ўмацоўваўся рабоча-сялянскі саюз, аб чым сведчыла матэрыяльная дапамога сялян бастуючым рабочым [516, с. 132–133; 720, с. 166–168, 188–190].

Шмат увагі даследчыкі надавалі пытанням арганізацыі кампартыяй шматлікіх мітынгаў і дэманстрацый працоўных, якія, па іх меркаванні, насілі палітычны характар. Традыцыйна аўтары прама звязвалі актыўнасць эканамічных і палітычных выступленняў рабочых з актыўнасцю работы КПЗБ у рабочым асяродку. Ужо ў пачатковы перыяд сусветнага эканамічнага крызісу, даводзілі аўтары, пад кіраўніцтвам кампартыі барацьба рабочага класа Заходняй Беларусі супраць наступлення буржуазіі набыла контрнаступальны характар, забастоўкі ўспыхвалі не толькі ў прамысловых цэнтрах, але і ў самых глухіх мястэчках; часта яны перарасталі ва ўсеагульныя стачкі салідарнасці; адметнай рысай забастовачнай барацьбы станавілася яе ўпартасць, а нярэдка і ярка выражаны палітычны характар [720, с. 189–190].

Колькасныя паказчыкі забастовачнага руху 1927–1928 гадоў таксама неаднолькавыя ў падачы розных аўтараў. Напрыклад, І.В. Палуян і У.А. Палуян 1928 год, разам з 1923 годам, выдзелілі як самы высокі ў 1920-я гады па ўзроўні развіцця забастовачнага руху ў Заходняй Беларусі.

Калі ў 1927 годзе ў Віленскім, Навагрудскім, Палескім і Валынскім ваяводствах адбылося 37 забастовак, то ў 1928 годзе – 55, а ў 1929 – 49. Амаль удвое – з 10 у 1927 годзе да 18 у 1928 годзе – вырасла колькасць больш буйных забастовак, у якіх удзельнічала адразу некалькі прадпрыемстваў. Колькасць прадпрыемстваў, ахопленых забастоўкамі, павялічылася з 210 у 1927 годзе да 435 у 1928 годзе [683, с. 130]. А.М. Мацко, сааўтар калектыўнай манаграфіі, у сваіх выданнях падаў іншыя лічбы, якія значна адрозніваюцца: у 1927–1928 гадах у чатырох беларускіх ваяводствах адбылося 370 забастовак з удзелам каля 49 тыс. рабочых [516, с. 129; 720, с. 167].

На думку І.В. Палуяна, перыяд першых гадоў сусветнага эканамічнага крызісу характарызаваўся ажыўленнем рабочага руху ў Заходняй Беларусі, што падрыхтавала рэвалюцыйны ўздым у наступныя два гады. Нізкі ўзровень прамысловага развіцця ў Заходняй Беларусі абумовіў нешматлікасць пралетарыяту: па падліках аўтара, да пачатку крызісу тут было 14 тысяч рабочых [620, с. 44]. Аднак гісторык не патлумачыў, хто ўваходзіў у гэтую колькасць: усе пралетарыі Заходняй Беларусі ці толькі беларускай нацыянальнасці. Гэтая інфармацыя атрымала ўдакладненне ў сумеснай працы І.В. Палуяна і У.В. Палуяна: колькасць рабочых на прамысловых прадпрыемствах з 5 і болей чалавек павялічылася ў 1928 годзе да 14–15 тыс. чалавек. Агульная ж колькасць рабочых, занятых на ўсіх прамысловых і дробных рамесна-кустарных прадпрыемствах, у 1931 годзе не перавышала 45 тыс. Усяго ў прамысловасці, рамястве, транспарце, гандлі і ўстановах грамадскага абслугоўвання было занята 90 тыс. рабочых [683, с. 15]. Аднак прыведзеныя лічбы не суадносяцца з дадзенымі М.Б. Сямёнчыка, які прывёў наступныя дадзеныя: паводле перапісу 1931 года на тэрыторыі Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага і Палескага ваяводстваў было 229 061 наёмны рабочы, з якіх у прамысловасці і на транспарце працавалі 127 722 чалавекі [814, с. 74–75; 815, с. 38–39]. Аднак, зразумела, абсалютызаваць і гэтыя лічбы не трэба, бо ва ўмовах нестабільнасці эканамічнай сітуацыі адпаведная статыстыка часта мянялася. Што тычыцца прычын істотнага разыходжання паказчыкаў колькасці рабочых, то справа ў розных метадалагічных падыходах: І.В. Палуян і У.А. Палуян падлікі рабілі без уліку Беластоцкага ваяводства, а М.Б. Сямёнчык улічваў усе чатыры заходнебеларускія ваяводствы.

Даследчыкі адзначылі найбольш буйныя выступленні рабочых у 1929 годзе, такія, як забастоўкі 700 рабочых шклозавода ”Неман” Лідскага павета, 700 рабочых Гродзенскага шклозавода, 150 рабочых-краўцоў Брэста, пекараў Пінска, рабочых лесапільнага завода “Панемунь” у Гродна і іншыя. Прычыны гэтых забастовак былі эканамічныя і, як правіла,

даводзілі вучоныя, заканчваліся задавальненнем патрабаванняў бастуючых, некаторымі кіравалі акружкамы і гаркамы КПЗБ [620, с. 52; 720, с. 211–214]. Аднак, тагачасныя каноны даследавання пытанняў рабочага руху патрабавалі ад аўтараў кваліфікаваць забастовачную эканамічную барацьбу рабочых як рэвалюцыйную: "Барацьба супраць наступлення капіталу, за змяненне да лепшага ўмоў найму і працы паступовa ахоплівала ўсё больш значную колькасць рабочых і прадпрыемстваў. …рабочы клас працягваў упарта змагацца супраць капіталістычнага прыгнёту. Нягледзячы на няспынныя праследаванні, ён праводзіў усё новыя і новыя забастоўкі і іншыя рэвалюцыйныя выступленні", – даводзіў І.В. Палуян [620, с. 48]. Даследчык барацьбу рабочых за эканамічныя патрабаванні адназначна называе рэвалюцыйнай. Аўтар адзначыў, што ў 1931 годзе рабочы рух, развіваючыся па ўзыходзячай лініі, дасягнуў яшчэ больш шырокіх маштабаў, павялічылася агульная колькасць забастовак і іх удзельнікаў, у разглядаемы перыяд нарадзіліся г. зв. акупацыйныя забастоўкі, "значнае месца ў рэвалюцыйным руху заходнебеларускага пралетарыяту па-ранейшаму займала барацьба супраць зніжэнняя заработнай платы і за яе павышэнне" [620, с. 50]. Забастоўкі 1930 года, па сцвярджэнні аўтараў калектыўнай манаграфіі, насілі, як і ў 1929 годзе, у большасці эканамічны характар. Пад кіраўніцтвам партыйных ячэек прафарганізацыі рупліва рыхтавалі амаль кожную стачку, таму і большым быў адсотак забастовак, якія заканчваліся перамогай рабочых, – так прысутнасць камуністаў у забастоўках аўтаматычна наводзіла на думку аб рэвалюцыйнасці рабочага руху [720, с. 212].

Відавочным было жаданне гісторыкаў выявіць палітычныя матывы ў выступленнях рабочых. І.П. Хаўратовіч і А.М. Мацко гаварылі аб палітычных забастоўках, забастоўках салідарнасці, дэманстрацыях, мітынгах, маёўках, у падаўляльнай большасці яны былі падрыхтаваны камуністамі [516, с. 174–176; 720, с. 213, 214]. Хоць забастовачная барацьба, як правіла, вялася за задавальненне матэрыяльных патрэб рабочых, даследчыкі адзначылі, што нярэдка ў эканамічных забастоўках выразна праглядваліся і палітычныя моманты. Такімі, напрыклад, І.В. Палуян назваў патрабаванні бастуючых вызваліць арыштаваных арганізатараў забастоўкі ў Слоніме, непадпарадкаванне рабочых лесапільнага завода "Гута-Міхалін" паліцыі і прадстаўнікам мясцовых улад. Відавочна палітычнымі аўтар лічыў перш за ўсё мітынгі, масоўкі, дэманстрацыі, накіраваныя супраць унутранай і знешняй палітыкі буржуазна-памешчыцкай Польшчы, у абарону Савецкага Саюза. Значнае месца ў палітычнай барацьбе рабочага класа, канстатаваў вучоны, займалі выступленні ў сувязі з рэвалюцыйнымі святамі і важнейшымі датамі з гісторыі міжнароднага рэвалюцыйнага руху. І.В. Палуян канстатаваў, што

перыяд з 1929 года па 1931 год характарызаваўся паступовым нарастаннем рэвалюцыйнага руху рабочага класа Заходняй Беларусі, эканамічная барацьба з’яўлялася асновай для палітычных выступленняў, а апошнія садзейнічалі нарастанню рэвалюцыйнага руху ў цэлым [620, с. 52, 55].

Безумоўна прынятая і шматразова паўтораная гісторыкамі думка аб кіраўніцтве рабочым рухам КПЗБ у гады сусветнага эканамічнага крызісу абвяргаецца наяўнымі архіўнымі матэрыяламі. На сумесным пасяджэнні ЦК КПЗБ і Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры КП(б)Б 19 верасня 1931 года было канстатавана “…адставанне актыўнасці партыі ад росту актыўнасці мас… важнейшыя забастоўкі прайшлі без кіраўніцтва нашай партыі, міма кіраўніцтва нашай партыі, а ў некаторых месцах нават без ведама партыі. У гэтым накірунку трэба біць трывогу”. Сітуацыя для камуністаў трывожная, бо партарганізацыя ў Беластоку “разгубілася”, у Гродна “забастовачны стан яшчэ горш. …Цэлы шэраг забастовак… таксама прайшлі міма партыі”. Асабліва непрыемным для партыйнага кіраўніцтва было тое, што на фоне пасіўнасці КПЗБ іншыя партыі мелі папулярнасць і аўтарытэт у рабочых, пашырылі свой уплыў у прафсаюзах, арганізавалі шэраг буйных забастовак так, што “важнейшыя забастоўкі праходзілі пад кіраўніцтвам сацыял-фашызму” [566, арк. 2, 3, 4, 5].

Аднак, нягледзячы на гэта, у публікацыях сустракаем адваротнае. Так, напрыклад, І.П. Хаўратовіч звязваў дзеянні камуністаў з пашырэннем забастовачнага руху ў Заходняй Беларусі, у тым ліку ў Беластоку і Гродна, сцвярджаў, што стачкі насілі ўсё больш наступальны характар і большасць з іх праходзіла пад кіраўніцтвам арганізацый КПЗБ [720, с. 213, 246]. Пры гэтым ствaралася ўражанне паступальнасці ў авалодванні камуністамі рабочага руху, той жа аўтар даводзіў, што ў перыяд 1932–1933 гадоў адбылося пашырэнне рабочага руху, КПЗБ у гэты час значна часцей удавалася ператварыць эканамічныя забастоўкі ў палітычныя выступленні, арганізаваць вулічныя дэманстрацыі пратэсту [849, с. 13, 17].

Найбольшай увагі даследчыкаў рабочага руху прыцягнулі апошнія гады сусветанага эканамічнага крызісу. Асноўныя сюжэты гэтых падзей былі выкладзены І.В. Палуянам у артыкуле 1959 года, у якім асветлены праявы забастовачнага руху рабочых лясных промыслаў Белавежскай пушчы. Асноўныя падзеі выкладзены аўтарам па схеме, якая прадугледжвала прычынай забастоўкі нечуваную эксплуатацыю з боку “фашысцкага надлясніцтва” (вельмі нізкая заработная плата) як часткі “ўсёй сістэмы жорсткага эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і нацыянальнага прыгнёту, якому падвяргаліся працоўныя Заходняй Беларусі”; усенародны характар барацьбы – уключэнне ў барацьбу супраць прыгнёту разам з рабочымі лясных промыслаў і возчыкаў, сезонна занятых на вывазцы лесу; рэвалюцыйны парыў рабочых лясных промыслаў, якімі, як і ўсёй барацьбой

працоўных Заходняй Беларусі, кіравала кампартыя. Імкненне падаваць барацьбу рабочых за эканамічныя інтарэсы як рэвалюцыйны рух стала характэрнай рысай гістарыяграфіі рабочага руху і не толькі, калі, напрыклад, відавочныя праявы чыста эканамічных выступленняў, звязаных з патрабаваннем павышэння зарплаты, паляпшэння ўмоў найму і працы, без належнага абгрунтавання факталагічнага характару кваліфікаваліся як рэвалюцыйныя выступленні. Своеасабліва былі патлумачаны і прычыны спаду рэвалюцыйнага руху рабочых лясных промыслаў: адсутнасць неабходнага адзінства ў выступленнях саміх рабочых і належнай падтрымкі іх з боку сялянства, жорсткі паліцэйскі тэрор, здрада інтарэсам рабочых кіраўніцтвам ППС, Бунда, якія дапамаглі польскім уладам у шэрагу выпадкаў ашукаць і раскалоць рабочых, сарваць іх выступленні, часовае агульнае паслабленнем рэвалюцыйнага руху ва ўмовах уступлення Польшчы ў паласу дэпрэсіі. Пры гэтым даследчык аптымістычна гаварыў пра забастовачны рух рабочых лясных промыслаў як сведчанне таго, што "і гэты распылены атрад рабочага класа, які складаўся ў асноўным з беззямельных і малазямельных сялян, узняўся да арганізаваных форм класавай пралетарскай барацьбы" [621]. Звернем увагу на недастаткова абгрунтаванае аднясенне гісторыкам сялян-сезоннікаў да рабочых, якія толькі часова наймаліся на адпаведныя работы, ад чаго не пераставалі быць сялянамі.

Іншыя публікацыі канцэптуальна ішлі ў адзначаным рэчышчы, сцвярджаючы пра правядзенне ў 1932–1933 гадах рабочымі пад кіраўніцтвам КПЗБ шматлікіх рэвалюцыйных выступленняў, якія ахапілі дзесяткі тысяч чалавек, гэты час характарызаваўся таксама шматтысячнымі палітычнымі выступленнямі рабочага класа. Аўтары падкрэслілі, што ў непарыўнай сувязі з рабочым рухам і пад яго непасрэдным уплывам разгортвалася рэвалюцыйная барацьба сялянскіх мас Заходняй Беларусі, прычым агульнае кіраванне ажыццяўлялася КПЗБ. Гэта назывался асноўнай прычынай перамог рабочых у забастовачнай барацьбе, да таго ж рабочыя пад кіраўніцтвам камуністаў "вялі непрымірымую барацьбу" супраць правых кіраўнікоў рэфармісцкіх прафсаюзаў, "згоднікаў" з вярхушкі ППС [516, с. 49, 93; 683, с. 168–169; 720, с. 245–247]. Развіваючы і абгрунтоўваючы палажэнне аб адзінстве беларусаў і палякаў у забастовачнай барацьбе, А.М. Мацко прывёў прыклады падтрымкі польскіх забастовак з боку беларускіх рабочых. "Салідарнасць і дзеючая дапамога працоўных мас горада і вёскі, беларусаў і палякаў праяўлялася амаль у кожнай забастоўцы, у кожным рэвалюцыйным выступленні таго часу", – даводзіў гісторык [516, с. 49, 93]. Пра "братэрскую салідарнасць" працоўных у сумесных выступленнях рабочых – палякаў, беларусаў, украінцаў, яўрэяў гаварылі іншыя аўтары, у прыватнасці І.П. Хаўратовіч і Г.Б. Ватковіч [109, с. 51; 720, с. 245].

Гісторыкі з захапленнем разважалі пра поспехі КПЗБ у Беластоку ў 1932 годзе па наладжванні кантактаў у рабочым асяродку, арганізацыі забастовак, у тым ліку сярод тэкстыльшчыкаў, згадвалі актыўную дзейнасць акругований і гарадскога камітэтаў КПЗБ [720, с. 248–251]. Але гэтая інфармацыя не састыкуецца са справаздачамі камуністычных функцыянераў Беласточчыны, якія паведамлялі ў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пра згаданага вышэй Я. Богдана як кіраўніка легальнага Беластоцкага саюза тэкстыльшчыкаў, які кіраваў у 1931 годзе забастоўкай тэкстыльшчыкаў і ўзняў аўтарытэт "сацыял-фашызму" і свой уласны [566, арк. 4]. Што тычыцца 1932 года, то слабасць кампартыі пацвярджаецца красамоўнай інфармацыяй пра рабочы сход у Беластоку, пасля якога камуністы меркавалі "вывесці масы" на вуліцу і арганізаваць мітынг з вынясеннем "кароткай рэзалюцыі аб вайне". Гэта ўяўляла "найбольшыя цяжкасці, бо хлопцы, якія выступаюць на сходах, асабліва баяцца закранаць гэта пытанне, і тым больш уносіць рэзалюцыі…" І зусім непрыемная для кіраўніцтва КПЗБ інфармацыя з Беластока аб тым, што на 5 чэрвеня 1932 года Беластоцкага акруговага і гарадскога камітэтаў "фактычна не існуе, ячэйкі не збіраюцца. Няма ўцягнення ўсёй арганізацыі ў працу" [573, арк. 4]. Атрымліваецца, што актывізацыя рабочага руху, якая адбывалася дзякуючы дзейнасці легальных прафесійных саюзаў і палітычных партый, беспадстаўна прыпісвалася кампартыі. Дзейнасць жа сапраўдных арганізатараў рабочага руху, у першую чаргу ППС і Бунда, на старонках цытаваных публікацый падавалася негатыўна. Напрыклад, спад рэвалюцыйнага рабочага руху восенню 1933 года вучоныя тэзісна тлумачылі "здрадай інтарэсам рабочых кіраўніцтва ППС і Бунда" разам з адноснай слабасцю рабочага класа, адсутнасцю адзінства ў выступленнях саміх рабочых і належнай падтрымкі іх з боку сялянства, жорсткім паліцэйскім тэрорам [683, с. 168–169].

Як бачна з прыведзенай інфармацыі, пашырэнне рабочага руху ў гады эканамічнага крызісу, абумоўленае ў першую чаргу пагаршэннем сацыяльна-эканамічнай сітуацыі і жыцця рабочых, даследчыкі тлумачылі актыўнасцю кампартыі, прыпісваючы ёй вядучую кіруючую ролю. Прычыны ж спаду выступленняў рабочых і адказ за гэта перакладваліся на апанентаў КПЗБ, якая часта дэманстравала ў дачыненні да ППС, Бунда і іншых партый дэструктыўныя, непартнёрскія адносіны.

Асаблівасцю забастовак перыяду 1931–1933 гадоў, на думку аўтараў, было тое, што рабочыя ў той час самі пераходзілі ў наступленне. Для гэтага перыяду характэрны працяглыя, упартыя і добра арганізаваныя стачкі, якія суправаджаліся вулічнымі дэманстрацыямі і мітынгамі. Большасць з іх, як сцвярджалі даследчыкі, праходзіла пад кіраўніцтвам КПЗБ і заканчвалася перамогай рабочых; нярэдка забастоўкі рабочых

перарасаталі ў палітычныя выступленні, у вострыя сутычкі з паліцыяй; ад разрозненых стачак рабочыя перайшлі да стачак у цэлых галінах прамысловасці, да стачак, якія суправаджаліся вулічнымі дэманстрацыямі, захопамі асобных прадпрыемстваў. Мяняўся, па дадзеных У.Ф. Ладысева, і сам характар забастовачнай барацьбы. Калі ў пачатковы перыяд эканамічнага крызісу большасць забастовак узнікала стыхійна, яны праходзілі разрознена, а патрабаванні зводзіліся, галоўным чынам, да захавання раней існаваўшых расцэнак, то пачынаючы з 1932 года адметнай рысай забастовачнай барацьбы становіцца яе ўпартасць, працягласць, перапляценне эканамічных патрабаванняў з палітычнымі, перарастанне эканамічных стачак у палітычныя. Узрасла таксама колькасць забастовак салідарнасці [401, с. 57; 720, с. 271].

Гэтыя выказванні суправаджаліся статыстычнымі дадзенымі пра колькасць забастовак. Як і ў дачыненні да ранейшых перыядаў, і па крызісных гадах лічбы значна адрозніваюцца, некаторыя даследчыкі падалі інфармацыю пра забастоўкі і стачкі, якія савецкая гістарыяграфія адрознівала, маецца інфармацыя пра палітычныя стачкі і акупацыйныя забастоўкі. Напрыклад, І.П. Хаўратовіч на фоне колькасных паказчыкаў забастовак па Польшчы (1930 год – 322 забастоўкі, 1931 год – 459, 1932 год – 504, 1933 год – 631) сцвярджаў, што ўсяго “за першыя два гады эканамічнага крызісу ў гарадах Заходняй Беларусі адбылося 90 забастовак, у якіх удзельнічалі 45 тыс. рабочых, з чым пагадзіліся Г.Б. Ватковіч і Б.С. Клейн [109, с. 51; 341, с. 89; 720, с. 213, 279]; П.І. Зялінскі за лістапад 1932 года – май 1933 года падаў 22 тыс. рабочых, якія прынялі ўдзел у 46 забастоўках, 30 з якіх кіравалі камуністы [293, с. 44]. Агульнапольскія лічбы А.М. Мацко паказваюць за 1929 год 497 забастовак з 217 тыс. удзельнікаў, 1930 год – 48 тыс. чалавек, 1931 год – 357 забастовак і 107 тыс. рабочых, 1932 год – 504 і 314 тыс. адпаведна, разам з гэтым у 1931 год адбылося 30 акупацыйных (польскіх) стачак, 1932 год – 95, 1933 год – 137 [516, с. 173, 181, 188, 190]. У.Ф. Ладысеў даводзіў, што пад кіраўніцтвам КПЗБ барацьба рабочага класа супраць наступлення капітала на сацыяльна-эканамічныя заваёвы, нягледзячы на пагрозу лакаўту, узмацнялася, набываючы масавы і ўпарты характар. Калі ў 1929 годзе забастовачнай барацьбой было ахоплена каля 30 % прамысловага пралетарыяту Заходняй Беларусі, то ў 1931 годзе – прыкладна 60 %. Аднак, дадаваў даследчык, колькасць стачачнікаў у выніку масавых звальненняў рабочых некалькі паменшылася, а ў 1933 годзе аўтар выявіў рэзкае павелічэнне колькасці палітычных забастовак – стачак, звязанае з “новым наступленнем манапалістычнага капіталу на сацыяльныя заваёвы працоўных”. Так, у 1933 годзе адбылося звыш 14 забастовак, у якіх прынялі ўдзел 12 500 чалавек, што значна перавышала колькасць палітычных стачак за ўсе

папярэднія гады крызісу. Толькі ў студзені – сакавіку 1934 года прайшло 9 палітычных забастовак, у якіх удзельнічалі 13 300 чалавек [401, с. 56–57].

Аналіз прыведзеных колькасных паказчыкаў дае адноснае ўяўленне пра колькасць і дынаміку забастовачнага руху. Відавочна, што для гісторыкаў устанаўленне больш дакладных лічбаў не было прыярытэтам, яны былі своеасаблівым інструментам для стварэння карціны ўсеагульнага ўздыму рабочага класу пад кіраўніцтвам кампартыі супраць “эксплуататараў”.

Пытанні разгортвання рабочага руху ў перыяд 1934–1939 гадоў на старонках навуковых публікацый звязваліся з агульнай барацьбой працоўных Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам КПЗБ “супраць фашысцкай дыктатуры і падрыхтоўкі новай вайны, за стварэнне адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронта”. Даследчыкі выказалі думку, што рэвалюцыйны рабочы рух, як і ўвогуле рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі, у цэлым быў слабейшым, чым у перыяд рэвалюцыйнага ўздыму 1932–1933 гадоў. Ён не быў падтрыманы шырокімі выступленнямі сялянства. Прычыну гэтага гісторыкі бачылі ў цяжкіх палітычных умовах у краіне ў сувязі з узмацненнем рэакцыі, падрыхтоўкі да вайны; “масавыя рэпрэсіі і паліцэйскі тэрор у адносінах да камуністаў і рэвалюцыйна настроеных рабочых і сялян” абмяжоўвалі магчымасць работы кампартыі сярод мас, “заадно з урадам дзейнічалі і беларускія буржуазныя нацыяналісты, якія поўнасцю падтрымлівалі палітыку польскага буржуазнага ўраду, у іх асяродку ўсё больш узмацняліся фашысцкія тэндэнцыі” [516, с. 272; 683, с. 217; 720, с. 319]. Так, у традыцыйным стылі беларускія палітычныя сілы падаваліся большымі ворагамі, чым іншыя “буржуазныя нацыяналісты” – ППС, Бунд, Паалей-Цыён і інш. Прычынай гэтага было рашучае адмаўленне, у прыватнасці, БХД-БНА ад супрацоўніцтва з КПЗБ у адзінафронтавых рамках. Тады камуністы рэзка ўзмацнілі сваю крытыку “белбурнацаў”, а савецкія гісторыкі да пачатку 1990-х гадоў працягвалі лаяць беларускіх дзеячаў, якія, адмаўляючыся ад адзінафронтавага супрацоўніцтва, мелі на ўвазе трагічныя падзеі калектывізацыі, барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам, палітычных рэпрэсій у БССР.

Разважанні пра аслабленне рэвалюцыйнага рабочага руху стваралі ўражанне зніжэння актыўнасці рабочых у барацьбе за свае эканамічныя і палітычныя правы, якую яны праводзілі пад сцягамі ППС, Бунда іншых палітычных сілаў. Але, як паказвае даследаванне М.Б. Сямёнчыка, “2-я палова 1935 – 1939 гг. былі часам найбольш высокага ўздыму рабочага руху. Сярэднегадовая колькасць забастовак у параўнанні з 1925–1935 гг. узрасла ў 2–3 разы, быў дасягнуты і перавышаны паказчык 1923 г.” [818, с. 100]. І гэта ва ўмовах, як адзначалі савецкія гісторыкі, панавання “жорсткага санацыйнага рэжыму” і “фашысцкай” канстытуцыі 1935 года!

Адзначаная актыўнасць, нават ва ўмовах аслаблення кампартыі ў выніку жорсткага ціску на яе з боку польскай улады і палітычных кампаній у СССР, роспуску КПП, давала падставы гаварыць пра значную прысутнасць КПЗБ у рабочым руху сярэдзіны – другой паловы 1930-х гадоў. Такая падставовасць вынікала з праяваў узаемадзеяння кампартыі з былымі зацятымі апанентамі – пэпэсякамі, бундаўцамі, якія ў гэты час дабіліся значных поспехаў у авалодванні рабочым рухам і дапускалі супрацоўніцтва з камуністамі. Што, аднак, не пазбавіла абвінавачвання гэтых партый і іх кіраўнікоў на старонках выданняў у раскольніцтве, здрадзе рабочым, згодніцтве і паслугацтве буржуазіі, сектанцтве і прасіянізме [414, с. 43; 516, с. 244; 720, с. 313–314]. Згадка кампартыі ў кантэксце актывізацыі прафсаюзнага ці забастовачнага руху, у якім камуністы былі аўтсайдэрамі, дазваляла гаварыць пра іх папулярнасць. Напрыклад, “па закліку Камуністычнай партыі і прафсаюзнай левіцы рабочы клас” разгарнуў упартую барацьбу за свае правы, баставалі рабочыя Беластока, Гродна, Слоніма, Васількова, Супрасля, Ліды, Вільні, Гарадка; толькі за студзень – сакавік 1934 года адбылося каля 20 стачак, у якіх прынялі ўдзел 28,4 тысячы рабочых, а на працягу ўсяго года – 86 стачак (40,9 тысяч удзельнікаў). Забастовачны рух гэтага перыяду вызначаўся вялікай колькасцю палітычных стачак, сцвярджалі даследчыкі. Так, у студзені – сакавіку адбылося 9 палітычных стачак з 13,3 тыс. удзельнікаў (у 1933 годзе адпаведна 14 і 12,5 тысяч). Рабочыя выказвалі пратэст не толькі супраць наступлення аб’яднанага фронту ўрада і манаполій на сацыяльныя правы працоўных, але і супраць узмацнення паліцэйскага тэрору [341, с. 229; 414, с. 35–36; 720, с. 302–305].

Як і раней, у дачыненні да сярэдзіны 1930-х гадоў даследчыкамі стваралася ўражанне паступальнага павелічэння маштабаў рабочага руху як паказчык усталявання аўтарытэту кампартыі. Напрыклад, характэрнымі рысамі забастовачнага руху ў 1937 годзе, на думку У.Ф. Ладысева, былі адначасовая канцэнтрацыя забастовак у некалькіх галінах прамысловасці, уцягненне ў стачачную барацьбу малаактыўных раёнаў, такіх, як Палессе, Віленшчына, вялікая актыўнасць паўпралетарскіх элементаў, узросшая актыўнасць бастуючых і большы лік стачак салідарнасці. Барацьба насіла выключна баявы характар і суправаджалася не толькі заняццем стачачнікамі рабочых месц, але і аб’яўленнем галадовак, далучэннем у асобных выпадках да бастуючых іх сем’яў [414, с. 97–99]. Паводле аўтараў, рэалізацыя ў 1936–1937 гадах тактыкі кампартыі на развіццё адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту садзейнічала больш цеснаму супрацоўніцтву “левых элементаў сацыялістычных і сялянскіх партый і арганізацый”, росту рабочага і сялянскага руху ў краіне. Забастоўкі насілі, як правіла, адзінафронтавы характар, у іх удзельнічалі рабочыя рознай палітычнай прыналежнасці і нацыянальнасці [414, с. 97, 98; 720, с. 366–368].

Разглядваючы пытанні дзейнасці КПЗБ у барацьбе за адзіны фронт пралетарыяту і антыфашысцкі народны фронт (1934–1938 гады), даследчыкі спыніліся на пытаннях становішча прафсаюзнага руху ў Заходняй Беларусі. Цікава, што, спасылаючыся на адну і тую ж крыніцу, Т.В. Прытыцкая з А.У. Царуком і У.Ф. Ладысеў падавалі неаднолькавыя лічбы адпаведна на красавік 1935 года і да сярэдзіны 1934 года: у прафсаюзах, якія знаходзіліся пад уплывам ППС і Бунда, аб'ядноўваліся 5 800 і 5 400 членаў, у праўрадавых, т. зв. фашысцкіх, прафсаюзах – 6 600 і 4 200, хрысціянскія і "нацыяналістычныя" прафсаюзы аб'ядноўвалі 2 330 чалавек (У.Ф. Ладысеў падаў клерыкальныя прафсаюзы – 1 800 членаў), а левыя прафсаюзы – 3 250 і 3 000 членаў [414, с. 40–41; 720, с. 299]. Да таго ж самі даследчыкі пярэчылі прыведзеным паказчыкам, гаварылі, напрыклад, аб знаходжанні пад уплывам ППС прафсаюзаў "асноўных атрадаў рабочага класа" чыгуначнікаў, тэкстыльшчыкаў, сельскагаспадарчых рабочых [7200, с. 299], якіх разам напэўна было больш, чым 4 200 чалавек. Як справядліва лічылі аўтары, каб прывесці ў дзеянне тактыку адзінага фронту ў Заходняй Беларусі, а значыць утрымацца ў якасці заўважнай сілы, кампартыі неабходна было ўмацавацца ў рэфармісцкіх прафсаюзах, а таксама ў праўрадавых, да якіх камуністы раней ставіліся пагарджальна і нават варожа. Таму даследаванні адлюстравалі разуменне кампартыяй неабходнасці сістэматычнага супрацоўніцтва КПЗБ, ППС і Бунда, якое станоўча ўплывала на колькасць і якасць эканамічных і палітычных выступленняў рабочага класа [414, с. 41–42; 516, с. 243; 720, с. 300–301]. Але арганізацыя адзінафронтавых дзеянняў натыкалася на складанасці па пераадоленні недаверу з боку даўніх вострых канкурэнтаў. Гісторыкі пры гэтым звярталі ўвагу на інертнасць КПЗБ па перабудове сваіх партыйных шэрагаў у патрэбным накірунку, пра палавінчатасць рашэнняў дырэктыў кіраўніцтва КПЗБ, лявацкія настроі і моцныя сектанцкія тэндэнцыі – многія камуністы па-ранейшаму атаясамлівалі сацыял-дэмакратычныя арганізацыі з рэакцыйнымі, урадавымі. Аднак традыцыйна асноўная акцэнтацыя рабілася на тое, што правыя правадыры ППС, Бунда, "Стронніцтва людовага", іншых сацыял-дэмакратычных арганізацый не жадалі наладжвання шчырага партнёрства, "усяляк перашкаджалі развіццю новых прагрэсіўных тэндэнцый у рабочым руху", "не згаджаліся дзейнічаць сумесна з камуністамі"; беларускія "буржуазныя нацыяналісты", у першую чаргу кіраўніцтва БХД, здраджваючы інтарэсам народа, вялі "гандаль з "санацыяй" па пытанні прадстаўніцтва ў сейме" [414, с. 64; 516, с. 244; 720, с. 298–301, 313–314].

Вучоныя адзначылі, што кампартыя Польшчы і яе складовыя часткі КПЗБ і КПЗУ былі распушчаны Выканкамам Камінтэрна ў абстаноўцы

несумненных поспехаў па стварэнні адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту, ва ўмовах агульнага ўздыму рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху. Гэтая падзея адмоўна паўплывала і на разгортванне рэвалюцыйнага рабочага руху. Паменшылася колькасць, палітычная вастрыня забастовак, звузілася і затармазілася развіццё адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронта, заключылі аўтары [401, с. 64; 516, с. 244; 720, с. 375].

Рабочая праблематыка шырока выкарыстоўвалася для падмацавання патрэбных пастулатаў, якія характарызавалі разнастайныя сферы дзейнасці КПЗБ і КСМЗБ. Напрыклад, барацьбу КПЗБ за інтэрнацыянальнае выхаванне і адзінства працоўных [109; 347], дзейнасць камсамолу як кіраўніка рабочай моладзі [100], дзейнасць КПЗБ па арганізацыі самаабароны [341], палітычную працу КПЗБ у масах [293] і інш.

Неабходна пагадзіцца з М.Б. Сямёнчыкам, які адзначыў, што пад канец 1990-х гадоў не было абагульняльнай працы, у якой пытанні рабочага руху разглядаліся б у комплексе ўзаемазвязаных праблем: стан прамысловасці і ўплыў на яе развіццё эканамічнай палітыкі Польшчы; колькасны склад, становішча прамысловых рабочых, перыядызацыя, характарыстыка і дынаміка выступленняў рабочых; уплыў палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў на рабочы рух. Даследчык адзначыў, што дзейнасць арганізацый камуністычнага накірунку ў рабочым руху даследавана даволі шырока, але аднабакова. Роля ж іншых партый і арганізацый вывучана толькі фрагментарна [817, с. 4–5].

Такім чынам, у другой палове 1950-х – 1980-я гады гісторыкамі была праведзена значная праца па вывучэнні гісторыі рабочага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў. У рознай форме і аб’ёме атрымалі вывучэнне і асвятленне асноўныя пытанні названай праблемы. Гэты працэс вызначаўся спецыфікай метадалагічных падыходаў: згодна марксісцка-ленінскай метадалогіі рабочаму класу – пралетарыяту – адводзілася асобнае месца і роля ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе – роля гегемона рэвалюцыйнага руху народных мас. Рабочыя выступленні, акрамя гэтага, з’яўляліся падставай для актывізацыі сялянскага руху. Найважнейшым якасным паказчыкам рэвалюцыйнага рабочага руху лічылася ўтварэнне Кампартыі Заходняй Беларусі – партыі дыктатуры пралетарыяту, якая ўзначаліла барацьбу рабочага класу за свае інтарэсы.

Да сцвярджэння аб кіруючай ролі КПЗБ у рабочым руху трэба ставіцца крытычна: наяўныя архіўныя дакументы ў выглядзе справаздач кіраўнікоў КПЗБ аб сітуацыі ў Заходняй Беларусі і становішчы партыі красамоўна гавораць аб слабасці партыйных арганізацый і іх пазіцый у рабочым асяродку, канстатуюць, што выступленні рабочых часта адбываліся без удзелу КПЗБ, і наадварот, падкрэсліваюць кіруючую ролю “фашысцкіх”

партый, за якімі даследчыкі хавалі ППС, Бунд, Паалей-Цыён і іншыя. Самі гісторыкі адзначалі, што пераважная большасць рабочага класа знаходзілася пад уплывам “згодніцкіх” партый, у складзе нацыяналістычных, хрысціянскіх і фашысцкіх прафсаюзаў. Дзейнасць, напрыклад, ППС, Бунда, іншых некамуністычных партый па арганізацыі руху рабочых за свае інтарэсы хоць і не адмаўлялася гісторыкамі, але падавалася ў негатыўным плане. Думку аб вядучым уплыве камуністаў на рабочы рух абвяргае інфармацыя, змешчаная яшчэ ў савецкія часы ў надрукаваных зборніках дакументаў і матэрыялаў. Забастоўкі арганізоўваліся законна, адбываліся на падставе эканамічных патрабаванняў і часта, як паведамлялі польскія афіцыйныя органы, працякалі спакойна [53, с. 162–164; 172–175, 410, 424, 472, 473, 477–478, 486–487, 507–508, 511–512, 525, 539–540, 551–553, 553–554, 560; 54, с. 22–23, 25, 32, 225–227, 230, 280–282, 392, 425–426, 455–456, 464–465; 718, с. 70–73, 171–172, 186–187, 219–221, 295–296, 306, 335]. Камуністы, як правіла патаемна ажыццяўляючы сваю партыйную справу, не маглі канкурыраваць з легальнымі арганізацыямі, нават калі кампартыя і дабівалася адзінкавых поспехаў у гэтым плане, то яе актыўнасць хутка спынялася паліцэйскімі ўладамі, якія абвінавачвалі камуністаў у антыдзяржаўнай падрыўной дзейнасці.

Даследчыкі схематычна акцэтавалі ўвагу на асаблівасці і адметнасці ролі рабочага класа, які, нягледзячы на сваю малую колькасць, ішоў у авангардзе рэвалюцыйнага руху: на чале рабочага класа, як і ўсіх працоўных, стаяла Камуністычная партыя, ажыццяўляючы штодзённае кіраўніцтва барацьбой рабочых, яна дапамагала ім усвядоміць сваю гістарычную місію ў справе вызвалення ўсіх працоўных ад капіталістычнага панавання. Традыцыя ўзаемаадносін са “старэйшымі братамі-рабочымі” патрабавала ў развагах пра вытокі рабочага руху даводзіць, што рабочы клас Заходняй Беларусі выхоўваўся на баявых традыцыях расійскага пралетарыяту, які здзейсніў пераможную сацыялістычную рэвалюцыю. Даследчыкі, не маючы магчымасці ігнараваць палітыка-прапагандысцкія схемы, сцвярджалі, што заходнебеларускія рабочыя знаходзіліся пад велізарным уздзеяннем рэвалюцыйных пераўтварэнняў, якія адбываліся ў Савецкай Беларусі. Потым гісторыкі аддавалі даніну павагі яшчэ аднаму брату – польскаму, адзначалі рэвалюцыйную барацьбу польскага пралетарыяту, якая аказвала сур’ёзны ўплыў на рабочы клас Заходняй Беларусі.

Што тычыцца абумоўленасці сялянскага руху актыўнасцю рабочых выступленняў, то і гэтае сцвярджэнне было відавочнай нацяжкай. Наадварот, беларускі рух у Польшчы ў 1921–1939 гады праяўляў сябе найбольш актыўна менавіта на глебе сялянска-аграрных пытанняў, быў вынікам свядомага ўдзелу ў нацыянальным руху актыўнага вясковага жыхарства.

У адрозненне ад папярэдняга перыяду вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі, калі рэвалюцыйны рух паказваўся як узрастаючы з года ў год, даследчыкі ў другой палове 1950-х – 1980-я гады напрамую звязвалі актыўнасць рэвалюцыйнага руху рабочых з дзейнасцю КПЗБ. У гады, калі КПЗБ удавалася ўмацаваць свае шэрагі, пазбаўляючыся ад сектанцтва правага і левага характару, калі кампартыя дабівалася поспехаў у працы ў рознага кшталту прафсаюзах, рэвалюцыйны рух рабочых пашыраўся і ўзмацняўся, даводзілі вучоныя.

У працах даследчыкаў прасочвалася схільнасць да перабольшвання рэвалюцыйнасці рабочага руху, калі да разраду рэвалюцыйнай барацьбы адносіліся выступленні эканамічнага характару, напрыклад, забастоўкі рабочых за паляпшэнне ўмоў працы, за павышэнне заработнай платы. Пры гэтым трэба крытычна ставіцца да заяўленых гісторыкамі колькасных паказчыкаў рабочага руху. Справа ў тым, што гісторыкі не прытрымліваліся аднолькавых, выпрацаваных і агульнапрызнаных паказчыкаў тырыторыі Заходняй Беларусі, здаралася, што пэўныя працэсы сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага характару падаваліся на прыкладзе аднаго ваяводства, павета, горада. Гэтыя акалічнасці не запэўніваюць у адназначнай аб’ектыўнасці атрыманых вынікаў і патрабуюць далейшых уважлівых пошукаў, падлікаў, суаднясенняў.

Для гісторыкаў, якія займаліся заходнебеларускай праблематыкай у другой палове 1950-х – 1980-я гады, пытанні рабочага руху не былі прыярытэтнымі. Пацвярджэннем гэтага з’яўляецца той факт, што вывучэнне ўзгаданых пытанняў не склалася ў самастойны накірунак гістарычных даследаванняў. У беларускай гістарыяграфіі 50–80-х гадоў XX ст., акрамя некалькіх артыкулаў, не было працы, прысвечанай пытанням рабочага руху за ўвесь перыяд 1921–1939 гадоў Вывучэнне рабочага руху было як бы другасным, дапаможным для таго, каб больш выпукла і ярка паказаць авангардную ролю кампартыі ў рэвалюцыйнай барацьбе ці адлюстраваць стан і ўзровень гэтай барацьбы. Але, тым не менш, у названы адрэзак часу былі пазначаны асноўныя накірункі вывучэння праблем гісторыі рабочага руху, якія атрымалі сваё паглыбленае і больш аб’ектыўнае вывучэнне ў 1990-я гады [743].

### 3.4. Асвятленне гісторыі сялянскага руху

Аграрнае пытанне ў Заходняй Беларусі стаяла вельмі востра і з’яўлялася адным з найважнейшых, калі не самым галоўным, з-за таго, што абсалютная большасць насельніцтва пражывала ў сельскай мясцовасці (у 1931 годзе 85 % насельніцтва). 79 % яго займалася сельскай гаспадаркай [625, с. 214], паводле навейшых падлікаў – 76, 3 % [814, с. 74]. Аграрныя

адносіны ў Заходняй Беларусі характарызаваліся панаваннем буйнога памешчыцкага землеўладання, беззямеллем і малазямеллем сялян, наяўнасцю значных перажыткаў феадальна-прыгонніцкіх адносін. Цяжкае сацыяльна-эканамічнае становішча сялянства спалучалася з палітыкай паланізацыі і асіміляцыі, садзейнічала развіццю сялянскага руху ў розных формах яго праяўлення.

Прыведзеная дэмаграфічная асаблівасць Заходняй Беларусі вымагала ад даследчыкаў звароту да праблем сельскагападарчай сферы, акцэнтуючы асаблівую ўвагу на складанасцях, якія мелі аб’ектыўна-гістарычны характар, а таксама былі наступствам ажыццяўлення аграрнай палітыкі ўрадам Польшчы, падаючы іх як ланцуг прычын-перадумоў сялянскага руху. Аднак разам з гэтым колькасць навукоўцаў, якія паглыблена і мэтанакіравана ажыццяўлялі даследаванне пытанняў змагання сялян, фактычна абмяжоўваецца І.В. Палуянам, У.А. Палуянам і А.А. Сарокіным. Гэта тлумачыцца відавочнай дыспрапорцыяй у заходнебеларускай савецкай гістарыяграфіі, якая характарызавалася пануючым становішчам гісторыка-партыйнай тэматыкі – гісторыі КПЗБ як партыі рабочага класу. Аграрна-сялянская праблематыка выкарыстоўвалася ў адлюстраванні гісторыі КПЗБ на розных этапах яе існавання і ў сувязі з ажыццяўленнем партыяй сваёй гістарыяграфічна аформленай “шматграннай дзейнасці”, таму асобныя аспекты праяваў сялянскага руху, паказаныя на старонках выданняў гэтага перыяду, садзейнічалі падмацаванню сцвярджэнняў аб авангарднай і кіруючай ролі КПЗБ, рэвалюцыйнасці заходнебеларускага сялянства.

Так, відавочным схематызмам у адлюстраванні барацьбы сялян Заходняй Беларусі выдзяляецца даследаванне Б.Я. Кухарава, прысвечанае, аднак, даследаванню праблем сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі. Акрамя характарыстыкі сельскагаспадарчай вытворчасці, паказу аграрнага крызісу як адной з форм праявы капіталістычных супярэчнасцей, сацыяльна-эканамічных умоў жыцця беларускага сялянства, у якасці мэты даследавання аўтар вызначыў адлюстраванне рэвалюцыйнай барацьбы сялянства “супраць буржуазна-памешчыцкага прыгнёту, за вырашэнне аграрнага пытання, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за ўз’яднанне Заходняй Беларусі ў адзінай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве; паказаць ролю Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў рэвалюцыйнай барацьбе працоўных супраць каланіяльнага падпарадкавання буржуазна-памешчыцкай Польшчай” [390, с. 5]. Таму як вынік – аграрная гісторыя і гісторыя сялянскага руху Заходняй Беларусі ў кнізе атрымалі надзвычай заідэалагізаванае асвятленне.

Савецкая гістарычная навука, разважаючы аб нацыянальна-вызваленчым руху, імкнулася прытрымлівацца марксісцка-ленінскай схемы, паводле якой сяляне і сялянскі рух па сваёй сутнасці мелі дробнабуржуазны

характар, а значыць не маглі быць рухаючай сілай сацыялістычнай рэвалюцыі. Гэтая роля надавалася рабочаму класу – пралетарыяту, які быў аб'яўлены гегемонам рэвалюцыйнага руху, да пралетарыяў павінны былі прыслухоўвацца сяляне, ідучы ў стройных калонах, сфарміраваных, аднак, паводле ўяўленняў пралетарскіх правадыроў.

Але заходнебеларускія рэаліі складана было ўціснуць у прапанаваныя схемы: гістарычная рэчаіснасць Заходняй Беларусі 1920–1930-х гадоў часта не хацела падпарадкоўвацца жаданням бальшавіцкага кіраўніцтва, у тым ліку з шэрагаў КПЗБ. Бывала так, што партыя і спачуваючыя ёй гарадскія рабочыя ішлі ўслед за сялянамі, якія абумоўлівалі беларускі рух, вызначалі яго асноўны, стрыжнёвы змест.

Разважаючы аб змаганні сялян за свае інтарэсы, іх ролі ў нацыянальна-вызваленчым руху, неабходна зрабіць агаворку наступнага характару. Сялянскі рух відавочна падзяляўся на дзве плыні: стыхійную і арганізаваную. Стыхійная барацьба пераважна мела эканамічны характар і зыходзіла з натуральнага жадання сялян на сваю карысць вырашыць сацыяльна-эканамічныя праблемы, у тым ліку паўсядзённыя, бягучыя. Стыхійны рух з'яўляўся падставай і прыступкай для руху арганізаванага, розныя палітычныя сілы часта без відавочных для гэтага падстаў імкнуліся гаварыць аб сваіх дачыненнях да яго. Удзел сялян у арганізаванай барацьбе быў вынікам росту нацыянальнай свядомасці беларускага сялянства, здольнасці аб'яднацца пад беларускім сцягам за вырашэнне задач нацыянальна-вызваленчага, дзяржаўна-палітычнага характару.

Аднак марксісцка-ленінскія падыходы, арыентаваныя на ўсталяванне думкі пра кіраўніцтва сялянскім рухам з боку КПЗБ, аб абавязковым уплыве гарадскога пралетарыяту на сялян, былі прадэманстраваны і пры даследаванні няўзброеных праяўленняў сялянскага руху. Напрыклад, А.У. Царук лічыў, што выступленні рабочага класа заходніх абласцей Беларусі з'яўляліся штуршком для разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы бяднейшага сялянства, сельскагаспадарчага пралетарыяту і парабкаў, першапачаткова стачкі сельскагаспадарчых рабочых і вясковай беднаты насілі эканамічны характар. Гісторык неабгрунтавана падводзіў да думкі аб усенародным супраціўленні польскай уладзе, непрыняцці сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, сцвярджаў, што "паўсюдна насельніцтва адмаўлялася плаціць усемагчымыя падаткі і подаці, выганяючы секвестратараў, якія забіралі ў сялян іх апошні хлеб". Абсалютызуючы класавыя падыходы, даследчык выступленні сельскагаспадарчых рабочых і вясковай беднаты, якія ўзніклі на глебе эканамічных канфліктаў, апрыёрна характарызаваў у большасці як "палітычныя выступленні абяздоленага народа супраць буржуазна-памешчыцкіх эксплуататараў, за ўз'яднанне з СССР" [855, с. 132].

Дэманструючы КПЗБцэнтрызм, гісторыкі як негатыўную асаблівасць сацыяльна-палітычнага становішча ў вёсцы называлі актыўную прысутнасць іншых палітычных партый, якія прываблівалі сялян сваімі праграмнымі пастулатамі. Напрыклад, І.В. Палуян і У.А. Палуян адзначылі, што з прычыны адсутнасці КПЗБ значная частка насельніцтва ў 1921–1923 гадах аказалася пад уплывам дробнабуржуазных арганізацый і груповак (беларускія эсэры, ППС, “Вызволенне” і інш.). Аднак пры гэтым даследчыкі нават самыя звычайныя формы сялянскага свавольства (патравы памешчыцкіх пасеваў, самавольныя высечкі лесу, выпас жывёлы на памешчыцкіх лугах, падпальванне памешчыцкіх маёнткаў) абумоўлівалі дзейнасцю камуністычных сілаў. Занадта перабольшваючы ўплыў кампартыі, гісторыкі выказалі супярэчлівую думку, што гэтыя дзеянні адбываліся пад уплывам камуністычнай агітацыі, якая знаходзіла падтрымку сярод бяднейшых і сярэдніх сялян, яны ўсё шырэй уключаліся ў аграрны і антыпадаткавы рух, аказвалі масавае супраціўленне пад час прызыву моладзі ў войска. Нярэдка, як адзначылі даследчыкі, на глебе збору падаткавых недаімак і штрафаў адбываліся сутычкі сялян з паліцыяй і чыноўнікамі. Яшчэ больш грозныя маштабы набыла барацьба сялян супраць памешчыкаў і асаднікаў у форме падпальвання іх маёнткаў і хутароў. Характэрным аўтары назвалі тое, што колькасць наўмысных падпальванняў павялічвалася ў перыяды ўздыму партызанскага руху, і, наадварот, была меншай у перыяды яго спаду. Гэта дало падставу гісторыкам справядліва гаварыць не толькі пра цесную сувязь сялянскага руху з узброенай барацьбой партызан, але і пра тое, што партызанскі рух 1921–1925 гадоў па сваім паходжанні і ўдзеле ў ім народных мас з’яўляўся пераважна сялянскім [683, с. 69–71]. Пры гэтым гаварыць пра выключны аўтарытэт камуністаў сярод сялянства не прыходзіцца. Паводле архіўных дакументаў у выглядзе справаздач кіраўнікоў КПЗБ, у сярэдзіне 1920-х гадоў цэлыя раёны і акругі “партыі рабочага класу” спынялі сваю дзейнасць. Напрыклад, Жабінкоўскі раён, “дзякуючы сабатажу адказнага сакратара раёна амаль зусім распаўся. Распаду садзейнічаў ліст аднаго таварыша, былога функцыянера акруговага камітэту, які напісаў з турмы да іх (членаў КПЗБ. – *А.С.*), каб не працавалі, былі больш асцярожнымі, таму што гарадскі пралетарыят нічога не робіць, а таму і ім не трэба рабіць” [564, арк. 13]. Так што частыя згадкі ў публікацыях пра наяўнасць і трываласць саюзу рабочага класа і сялянства з’яўляюцца кан’юнктурнай нацяжкай.

Аднак выснова аб вызначальным уплыве рабочых выступленняў на развіццё сялянскага руху і адначасова яго стыхійнасці знаходзіла сваё адлюстраванне. Аўтары калектыўнай манаграфіі, напрыклад, пафасна гаварылі аб “баявых выступленнях” рабочага класа ў гарадах, якія аказвалі рэвалюцыянізуючае ўздзеянне на сялян, уздымалі іх на барацьбу супраць

эксплуататараў і прыгнятальнікаў. Справядліва адзначылі, што барацьба сялян у заходнебеларускай вёсцы прымала самыя розныя формы і падавалі асцярожныя фармулёўкі пра “ў асноўным стыхійны характар” сялянскіх выступленняў. Тут, відавочна, меліся на ўвазе і неаднойчы згадваліся моцныя пазіцыі сярод беларускага вясковага насельніцтва “сялянскай згодніцкай партыі” “Вызволенне”. Звяртае на сябе ўвагу інфармацыя пра з’езд гэтай партыі Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў у Вільні ў студзені 1923 года, дзе прысутнічала 1 327 дэлегатаў, якія “з’яўляліся ў асноўным беларускімі сялянамі”, у час з’езду выказваліся дастаткова радыкальныя патрабаванні. Таму не з’яўляецца адназначным сцвярджэнне гісторыкаў пра тое, што самавольныя дзеянні беларускіх сялян, якія “захоплівалі памешчыцкія лугі і пашу, аказвалі супраціўленне памешчыкам пры ліквідацыі сервітутаў, секлі лес на будаўніцтва жылля і гаспадарчых пабудоў, патрабавалі адкрыцця беларускіх школ, адмаўляліся ісці ў польскую армію і ўцякалі з яе”, ёсць праявы стыхійнасці. Такога кшталту выступленні маглі быць наступствам агітацыі, якую праводзілі прадстаўнікі “Вызволення”, ППС, БПС-Р і іншых арганізацый. Але сааўтары манаграфіі традыцыйна эвалюцыю сялянскіх выступленняў звязвалі з КПЗБ і адзначылі, што пасля стварэння партыі сялянскі рух пачаў набываць новыя формы барацьбы. Так, з мэтай надаць нарастаючай барацьбе працоўных Заходняй Беларусі больш вострыя формы і шырокі размах, КПЗБ у сярэдзіне 1924 года выставіла лозунг байкоту польскіх школ і падаткаў. Аднак, як заўважылі аўтары, ажыццяўленне тактыкі байкоту натыкалася на цяжкасці. Не заўсёды антыпадатковая камуністычная прапаганда давала жаданыя вынікі. Падаткаў не плацілі толькі бедната і члены партыі. Байкот польскай школы таксама натыкаўся на вялікія цяжкасці з-за таго, што ўлады штрафавалі бацькоў тых дзяцей, якія не хадзілі ў польскія школы [720, с. 60, 88–89]. Пры гэтым у даследаваннях фактычна замоўчваўся вызначальны ўнёсак беларускіх палітычных партый і арганізацый, палітыкаў, дзеячаў асветы і культуры, якія неслі асноўны цяжар правядзення легальнай працы па агітацыі беларускага насельніцтва ў барацьбе за беларускія школы, абароны ад сваволства мясцовай польскай адміністрацыі [60]. Да таго ж паводле архіўных матэрыялаў, у 1924 годзе КПЗБ не мела арганізацыйных магчымасцей аказваць уплыў на школьную справу, камуністы толькі намацвалі слабыя месцы ў сацыяльна-культурнай і асветніцкай палітыцы ўладаў. Таму нават у 1925 годзе, па інфармацыі партыйнага функцыянера, “вясной сяляне вельмі ахвотна падавалі дэкларацыі аб беларускіх школах; вакол гэтых дэкларацый вялікае ажыўленне, паўсюдна і побач неахопленае партыяй (партыі не зусім спачувалі). Восенню мы думаем выкарыстаць”. Тое самае тычылася і праблемы сервітутаў, вакол якіх разгортвалася барацьба, што выкарыстоўвалі камуністы [584, арк. 13].

Тэзіс аб інтэрнацыянальным адзінстве насельніцтва Заходняй Беларусі савецкая гістарыяграфія адстойвала і ўкараняла ў якасці асноўнага і пры разглядзе сялянскага руху. Асаблівую увагу ў гэтым плане прыцягвалі беларускі і польскі народы. Адлюстраванне гэтых сюжэтаў у найбольш завершаным выглядзе атрымала ў даследаваннях А.М. Мацко і С.У Кабяка, якія звярнулі ўвагу на ўзаемадзеянне КПЗБ і Незалежнай партыі хлопскай, што выдзелілася з левага крыла "Вызволення". Арганізацыі НПХ пачалі ўзнікаць у Заходняй Беларусі, паміж імі і КПЗБ паступова наладжвалася цеснае супрацоўніцтва. Яны сумесна праводзілі палітычныя кампаніі, арганізоўвалі сялян на рэвалюцыйную барацьбу, вялі сярод іх шырокую агітацыйную працу [352, с. 46–47; 516, с. 89]. Вядома, што да пачатку 1990-х гадоў гаварыць пра выключную ролю камінтэрнаўскага кіраўніцтва ў стварэнні НПХ, як і Грамады, як левацрадыкальных партый, у арганізацыі пракамуністычнага сялянска-антыўрадавага руху ў Польшчы, было немагчыма. Дакументы сцвярджаюць, што кіраўніцтва КПП і КПЗБ, садзейнічаючы стварэнню БСРГ і НПХ, намагалася паставіць пад свой кантроль сялянскі рух, каардынавала дзейнасць гэтых двух сялянскіх партый, намагаючыся пазбегнуць "напластавання" іх на тэрыторыі Заходняй Беларусі [585, арк. 71].

Аўтары, якія закраналі пытанні сялянскага руху 1925–1927 гадоў, адзінадушна і небеспадстаўна адзначалі, што ў часы дзейнасці Грамады сялянскі рух узмацніўся і актывізаваўся. Пры гэтым даследчыкамі перабольшваліся сацыяльна-класавыя памкненні грамадоўцаў, нівеліраваліся праявы нацыянальна-дэмакратычнага і культурнага характару. Уступленне шырокіх мас працоўнага сялянства ў Грамаду суправаджалася ўзмацненнем класавай барацьбы ў вёсцы, як адзначылі, напрыклад, І.В. Палуян і У.А. Палуян [683, с. 98]. Аднак, нягледзячы на відавочнае дамінаванне ў нацыянальна-вызваленчым руху БСРГ, а ў ёй – беларускіх сялян, даследчыкі не адмаўляліся ад укаранёнага тэзісу аб авангардзе і гегемоне рэвалюцыйнага руху – КПЗБ і рабочым класе.

Гэтыя думкі знайшлі сваё адлюстраванне і ў манаграфіі "Беларуская сялянска-рабочая грамада" [624, с. 123–125]. Маючы на ўвазе вырашальны ўплыў на сялян КПЗБ, У.А. Палуян даводзіў, што, вядучы барацьбу супраць камасацыі, сяляне адмаўляліся даваць рабочых для вымярэння і размежавання зямельных участкаў, падводы і кватэры землеўпарадчыкам, пагражалі ім расправай, патрабавалі, каб яны пакінулі вёску, байкатавалі агульныя сходы па гэтым пытанні, знішчалі межавыя слупы і знакі. У выніку восенню 1926 года ў многіх паветах Заходняй Беларусі камасацыйныя работы амаль спыніліся, спынілася і прыватная парцэляцыя. Пры гэтым аўтар неабгрунтавана пашыраў праявы камунітычнага ўплыву ў вёсцы, сцвярджаў, што сяляне пад уплывам агітацыі кампартыі і Грамады

перасталі купляць зямлю, калі нават яна прадавалася па больш выгаднай цане, што, безумоўна, не адпавядала тагачаснай рэчаіснасці. Архіўныя дакументы ў выглядзе справаздач кіраўніцтва КПЗБ даюць падставы меркаваць адваротнае: нават актывісты кампартыі не адмаўляліся ад фінансавых выгод, якія прадстаўляліся польскай уладай, і адыходзілі ад удзелу ў апазіцыйнай дзейнасці. Так, напрыклад, як вынікае са справаздачы ЦК КПЗБ за чэрвень 1925 года, "у Брэсцкай акрузе адзін з членаў партыі атрымаў "пажычкі" (пазыку, крэдыт. – *А.С.*) 800 злотых, выступіў з партыі, але абяцаў вярнуцца, калі партыя пойдзе ў бой" [584, арк. 14].

У рэчышчы ўсталяваных ідэалагічных пастулатаў У.А. Палуян гаварыў пра "грабежніцкую ліквідацыю" сервітутаў і пра актывізацыю сялянскага змагання супраць яе, а таксама за захаванне правоў на сервітуты і пераход сервітутных зямель у поўную ўласнаць сялян. І сапраўды, барацьба за сервітуты была адным з вострых пытанняў сацыяльна-эканамічнай паўсядзённасці Заходняй Беларусі. Аднак няма падстаў абсалютызаваць гэтую з'яву і ролю ў ім КПЗБ у стылі, прадэманстраваным аўтарам. Ліпеньская справаздача 1925 года ЦК КПЗБ не пацвярджае наяўнасць шматлікіх выступленняў сялян за сервітуты: "… біліся ў адной вёсцы Брэсцкай акругі з асаднікамі за сервітуты" [584, арк. 17]. Пашыраючы адзінкавыя эпізоды на ўсю Заходнюю Беларусь, гісторык гаварыў, што "насельніцтва ўсё часцей аказвала супраціўленне ўладам і памешчыкам… усё больш арганізавана выступаючы супраць эксплуатацыі, сяляне ў вёсках пачыналі забастоўкі, адмаўляліся ісці за грашы на работу да памешчыка". Аднак, паводле вышэй цытаванага дакумента, сяляне – "элементы не вытрыманыя, няўстойлівыя шукаюць шляхі як бы ўладкавацца ў рамках існуючай дзяржавы. На гэтай глебе ў адной з вёсак Баранавіцкай акругі, не атрымаўшы ніякай дапамогі ад ураду за іх "бальшавізм", вырашылі крыху "супакоіцца" [584, арк. 12]. Нягледзячы на бачныя поспехі БСРГ, наўрад ці на працягу кароткага перыяду існавання арганізацыі можна было карэнным чынам змяніць сялянскую псіхалогію, значна зменшыць прыватнаўласніцкія памкненні беларускіх сялян.

Трэба адзначыць справядлівасць выказванняў У.А. Палуяна адносна павелічэння колькасці выступленняў сялян пад уплывам агітацыі БСРГ: "...з арганізацыйным разрастанем Грамады і з непамерна хуткім тэмпам павелічэння колькасці яе членаў заўважаецца каласальны рост колькасці супраціўлення ўладзе на глебе антыдзяржаўнай агітацыі". Адначасова з павелічэннем супраціўлення і праяўлення ўсё больш варожага стаўлення сялянскіх мас у адносінах да польскай дзяржавы і яе ўлад пачалі праяўляцца баявыя настроі. У канцы 1926 – пачатку 1927 гадоў адбываліся гурткі і мітынгі, што захліснулі ўвесь край, якія ў спалучэнні з дэманстрацыямі, палітычнай і арганізацыйнай работай КПЗБ і Грамады, з

аграрнымі і антыпадаткавымі выступленнямі сялян стваралі абстаноўку рэвалюцыйнага ўздыму. У.А. Палуян бачыў у гэтым наспяванне рэвалюцыйнай сітуацыі [624, с. 179], што з'яўляецца перабольшваннем, гаварыць пра ўсенародны характар апазіцыйных праяваў беларускага насельніцтва не даводзіцца. У дакументах польскіх урадавых органаў неаднойчы, як напрыклад у справаздачах Лідскай павятовай каменды дзяржпаліцыі за 1926 год, прыводзяцца звесткі пра пасіўнасць мясцовага жыхарства, сцвярджаецца, што беларусы "не праявілі сябе ў грамадска-палітычным жыцці і ў адкрыцці беларускіх школ. Настрой да дзіва берны і не выяўляе відавочных ці законспіраваных выступленняў" [242, арк. 32, 57, 87]. Аднак і А.А. Сарокін, у прыватнасці, гаварыў пра ўзмацненне байкатысцкіх настрояў сярод сялян у адносінах распараджэнняў улад, выканання шарваркаў, польскіх школ. У Заходняй Беларусі, працягваў даследчык, яшчэ існавалі партызанскія атрады, якія разышліся па хатах, але захавалі зброю. Гэтыя атрады ў асобных месцах налічвалі сотні людзей. Пачасціліся выпадкі забойстваў агентаў дэфензівы і правакатараў [785, с. 123]. Наяўныя архіўныя матэрыялы сцвярджаюць, што рашучы палітычны настрой, які дэманстравалі сяляне, быў шмат у чым штучна створаны ў выніку адпаведнай агітацыі, якую праводзілі актывісты БРСГ і КПЗБ. Пры гэтым бальшавіцкае кіраўніцтва разумела гэта, аднак курс на ўзброенае паўстанне ў Заходняй Беларусі лічыла бесперспектыўным, стрымлівала паўстанцкія настроі ў КПЗБ і Грамадзе [591].

Разважаючы адносна арганізаванага сялянскага руху трэба мець на ўвазе настойлівае імкненне савецкіх гісторыкаў на фоне сцвярджаемай імі кіруючай ролі КПЗБ і Грамады замоўчваць дзейнасць іншых партый. Гэта тычыцца, разам з ППС і "Вызволення", і беларускіх арганізацый, пра актывізацыю якіх у сялянскім асяродку паведамляюць крыніцы. У прыватнасці, матэрыялы Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ утрымліваюць інфармацыю пра стварэнне пад кіраўніцтвам паслоў Бона, Шакуна, Шапеля, якія выйшлі з НПХ, "згодніцкай партыі" пад назвай "Радыкальная Сялянская партыя Беларускіх зямель". Сцвярджаецца, што "гэтыя нікчэмныя здраднікі", да якіх аднесены таксама Ф. Ярэміч і В. Рагуля і БСС, Я. Станкевіч і "Беларуская сялянская партыя", БХД, "Саюз дробных зямляўласнікаў", заснаваны вызваленцам Гольманам, "пачынаюць развіваць узмоцненую дзейнасць сярод беларускага сялянства, намагаючыся адарваць ад саюза з пралетарыятам" [570, арк. 82]. Разам з гэтымі маюцца звесткі пра пераход былых членаў БСРГ у гурткі Беларускага сялянскага саюза, напрыклад, былы сакратар гуртка БСРГ у в. Малы Угрын Дзярэчынскай гміны арганізаваў гурток БСС, у склад якога ўвайшлі дзесяць былых грамадоўцаў [250, арк. 1].

Перыяд пасля забароны БСРГ і да сусветнага эканамічнага крызісу характарызаваўся спадам сялянскага руху. Аднак даследчыкі, сцвярджаючы антынародны характар улады і настойлівае жаданне насельніцтва рашуча рэагаваць на адсутнасць паляпшэнняў, на старонках выданняў падтрымлівалі дастаткова высокі ўзровень сацыяльнай напружанасці і сялянскай актыўнасці. Аграрныя і антыпадаткавыя выступленні сялян працягваліся і ў 1928–1929 гадах, лічылі І.В. Палуян і У.А. Палуян. Разам з шырокімі палітычнымі кампаніямі супраць "фашысцкай дыктатуры", як агульна ацэньвалі даследчыкі дзяржаўна-палітычны лад тагачаснай Польшчы, сялянамі выкарыстоўваліся супраціўленне ўзыманню штрафаў за патравы, за пасеў тытуню, супраціўленне ліквідацыі сервітутаў, правядзенню камасацыі, прымусоваму збору падаткаў; супраціўленні гэтыя часта прымалі больш вострыя формы і выліваліся ў адкрытыя выступленні сялян; побач з аграрнымі і антыпадаткавымі працягваліся і палітычныя выступленні сялян у выглядзе першамайскіх мітынгаў і дэманстрацый. Частай з'явай у заходнебеларускай вёсцы ў 1927–1929 гадоў сталі забастоўкі сялян, занятых на розных работах у якасці сезонных рабочых, якія праходзілі пад уплывам забастовачнага руху прамысловых рабочых. Аднак, на думку даследчыкаў, у цэлым сялянскі рух, асабліва палітычная барацьба сялян, у гэты перыяд быў значна слабейшым, чым у 1926 – пачатку 1927 гадах, калі існавала БСРГ. Прычыну гэтага спаду аўтары бачылі ў рэпрэсіўных дзеяннях польскіх улад. Агульным, што аб'яднала рэвалюцыйны рух гэтых гадоў з рэвалюцыйным рухам 1925–1926 гадоў, з'явілася існаванне і легальная дзейнасць дэмакратычных арганізацый "Змаганне" і ТБШ, разгляду дзейнасці якіх аўтары прысвяцілі пэўную ўвагу [683, с. 147–149]. Што да сцвярджаемага гісторыкамі вызначальнага ўдзелу КПЗБ у арганізацыі сялянскага руху, то гэтае меркаванне з'яўляецца надуманым. Дакументы архіва сведчаць, што ў маі 1929 года Сялянскае бюро ЦК КПЗБ фактычна прызнавала ігнараванне партыяй адпаведных пытанняў, падкрэслівала "зусім недастатковую ўвагу з боку большасці акруговых партарганізацый да пытанняў сялянскай працы, вялікую слабасць і нязначную актыўнасць большасці сялянскіх партарганізацый" [566, арк. 466].

Сусветны эканамічны крызіс нанёс адчувальны ўдар па эканоміцы Польшчы і Заходняй Беларусі, у прыватнасці, па сельскай гаспадарцы. Гэта садзейнічала актывізацыі сялянскага руху. Даследчыкі, якія вывучалі пытанні гісторыі Заходняй Беларусі перыяду 1929–1933 гадоў, абавязкова, хоць і ў схематычнай форме, закраналі пытанні сялянскага руху. У прыватнасці, І.В. Царук лічыла, што па меры абвастрэння крызісу і павелічэння цяжкасцей і голаду ў вёсцы, а таксама пад уплывам буйных баёў пралетарыяту ўзмацняўся і рос рэвалюцыйны сялянскі рух у

Польшчы і Заходняй Беларусі. Сяляне арганізоўвалі дэманстрацыі і галодныя паходы, масавыя высечкі памешчыцкіх лясоў і нападалі на цягнікі з вуглем, падпальвалі памешчыцкія маёнткі, асадніцкія хутары і фальваркі. Аднак, заўважыла даследчыца, да 1932 года сялянскі рух, за невялікім выключэннем, насіў характар не звязаных паміж сабой распыленых выступленняў, што палягчала польскаму ўраду іх падаўленне. З 1932 года сялянскі рух, які развіваўся пад лозунгамі КПЗБ, пачынае пераадольваць гэтае раз’яднанне, пераходзіць ад распыленых выступленняў, што ахплівалі звычайна адну вёску, да масавых выступленняў, якія ахплівалі шэраг вёсак і нават цэлыя паветы, і перарастае ў асобных выпадках ва ўзброеную барацьбу [858, с. 52–53].

Пагаджаючыся ў цэлым з вышэйадзначаным меркаваннем, І.В. Палуян адзначыў розныя формы барацьбы сялянскіх мас, падводзячы гістарычныя падзеі пад пануючую гістарыяграфічную схему. Працоўнае сялянства не хацела мірыцца з існаваўшым парадкам землеўладання, лічыў гісторык. Яно пераходзіла да адкрытых самачынных захопаў памешчыцкіх і дзяржаўных зямель. Па сцвярджэнні даследчыка, стыхійныя выступленні ў выглядзе адмаўлення плаціць падаткі, ад шарваркаў і павіннасцей, супраць камасацыі, парцэляцыі, ліквідацыі сервітутаў, падпальвання сядзібаў памешчыкаў і кулакоў, супраціўлення ўладам часта атрымлівалі асабліва напружаны характар, калі сялянскія выступаленні аб’ядноўваліся з выступленнямі рабочых. Канцэптуальна гэта мела на ўвазе падпарадкаванне аграрных выступленняў актыўнасці КПЗБ і яе кампаніям, у прыватнасці, антыпадаткавай барацьбе пад лозунгам “Ні граша падаткаў фашысцкаму ўраду голада, беспрацоўя, тэрору і вайны”. У кіраўніцтве барацьбой працаўнікоў вёскі КПЗБ абапіралася на сялянскія камітэты, стварэнню і дзейнасці якіх яна надавала штодзённую ўвагу [622, с. 44, 47]. Аднак гаварыць пра эфектыўнасць і глабальнасць такіх акцый не прыходзіцца, бо паліцэйскія органы валодалі адпаведнай інфармацыяй і мелі магчымасць стрымліваць іх рэалізацыю [237, арк. 15].

З восені 1933 года вастрыня сялянскіх выступленняў Заходняй Беларусі паступова слабее. І.В. Палуян назваў гэтую з’яву часовым спадам рэвалюцыйнай барацьбы працоўнага сялянства, прычым, на яго думку, спад гэты наступіў крыху раней, чым у рабочым руху. Даследчык тлумачыў гэта шэрагам прычын. На працягу восені 1933 года назіралася пэўнае аслабленне рэвалюцыйнай барацьбы рабочага класу, што не магло не аказаць адмоўнага ўплыву на сялянскі рух. Назіраўся і спад міжнароднага рэвалюцыйнага руху ва ўмовах уступлення капіталістычных краін у паласу дэпрэсіі. Адмоўна, на думку аўтара, адбівалася на рэвалюцыйным руху малакольказнасць КПЗБ. У значнай ступені з-за гэтага партыя не магла поўнасцю ахапіць сваім уплывам і кіраўніцтвам сялянскія масы.

Прыведзеныя заявы даследчыка бачацца відавочна супярэчлівымі, улічваючы наступныя выкладкі І.В. Палуяна, які звярнуў увагу на слабую арганізаванасць сялянства, у адрозненне ад рабочага класа. Сялянства, працягваў даследчык, вельмі распыленае і разнароднае па сваім складзе, і інтарэсы розных яго праслоек нярэдка не супадаюць. Сяляне вызначаліся даверлівасцю да ППС, "Стронніцтва людовага" і іншых партый і арганізацый, якія аўтар назваў дробнабуржуазнымі, кулацкімі, нацыяналістычнымі. Так сам аўтар прыводзіць да думкіпра тое, што актыўнасць сялянства не магла вызначацца выключна пазіцыяй асобнай партыі, у дадзеным выпадку КПЗБ. Але, ідучы ўслед за настойлівым жаданнем шукаць "рэвалюцыйнасць" у сялян, І.В. Палуян сцвярджаў: сялянства робіць рэвалюцыйным тое, што селянін, як і рабочы, таксама падвяргаецца жорсткай эксплуатацыі, якая яго ўсё больш зводзіць да становішча сапраўднага пралетарыя [622, с. 50–53].

Думкі аб абвастрэнні ў перыяд эканамічнага крызісу класавай барацьбы ў вёсцы і вышэйузгаданыя падыходы і высновы па пытаннях сялянскага руху ў 1929–1933 гадах сцвярджалі І.В. Палуян і У.В. Палуян, аўтары калектыўнай манаграфіі па гісторыі КПЗБ і іншыя гісторыкі. Вучоныя даводзілі, што, здзяйсняючы кіраўніцтва рэвалюцыйнай барацьбой сялянскіх мас Заходняй Беларусі, КПЗБ у аснову сваёй практычнай дзейнасці на вёсцы ставіла рашэнні І з'езда па сялянскім пытанні. Паводле гэтых рашэнняў, галоўнай лініяй працы партыі на вёсцы з'яўлялася апора на беззямельных, паўпралетарыяў і беднату пры адначасовым умацаванні саюзу з сераднякамі. Як бачна з вышэйпрыведзенага, у аснову аналізу сялянскага руху даследчыкі ставілі нават не самыя выступленні сялян, а дэкларатыўныя заявы КПЗБ, якая толькі планавала і настройвала сваіх прыхільнікаў на адпаведную дзейнасць. Зразумела, што дэкларацыі і планы КПЗБ не заўсёды апраўдваліся на практыцы. Больш таго, як адзначаў 19 верасня 1931 года на пасяджэнні Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ т. Яшка (партыйны псеўданім, сапраўднае прозвішча не выяўлена. – *А.С.*), "у сувязі з паглыбленнем эканамічнага крызісу мы маем паўсюдна нарастанне сялянскай барацьбы. Але і тут трэба падкрэсліць, што ў большай частцы гэтая барацьба сялянскіх мас праходзіць стыхійна. Толькі на асобных участках мы мелі арганізаваную партыяй каардынаваную працу". Рашуча не змянілася сітуацыя і на пачатак вясны 1933 года: партыйны функцыянер паведамляў, што "ў асноўным партарганізацыі слаба рэагуюць на падзеі, не надаюць дастатковай увагі арганізацыі барацьбы мас на падставе паўсядзённых патрэб", што "не скранулася з месца арганізацыя барацьбы сельскагаспадарчых рабочых" [566, арк. 6, 385].

Аднак гісторыкі сцвярджалі, што “рэвалюцыйная барацьба” заходнебеларускага сялянства ў перыяд крызісу, асабліва ў 1932–1933 гадах, дасягнула выключнага напружання. Разам з эканамічнымі адбываліся і палітычныя выступленні працаўнікоў вёскі. Барацьба сялян накіроўвалася не толькі супраць свавольства мясцовых улад, але і супраць усёй, як даводзілі даследчыкі, “рэакцыйнай палітыкі фашысцкага ўраду”, не абмяжоўваючыся мірнымі сродкамі барацьбы, сяляне ўсё часцей уступалі ва ўзброеныя сутычкі з памешчыкамі, асаднікамі і паліцыяй. Даследчыкі акцэнтавалі ўвагу на тым, што выступленні рыхтаваліся пры актыўным і вызначальным удзеле камуністаў, гэта лагічна прыводзіць да ўсведамлення штучнасці “рэвалюцыйнага” руху, абумоўленасці яго імпартам адпаведных уплываў, якія ішлі па камінтэрнаўскіх каналах.

Як быццам бы прагаворваючыся і намякаючы на палітычную рознаскіраванасць і эканамічную абумоўленасць аграрных выступленняў, гісторыкі гаварылі аб разрозненасці і слабой арганізацыі сялянскага руху. Большасць выступленняў узнікала стыхійна і не адначасова ў розных месцах, яны, як правіла, адбываліся ізалявана адно ад другога, што прадвырашала адносную слабасць сялянскага руху, лічылі даследчыкі [683, с. 169, 186]. Тут, як і ў некаторых ранейшых даследаваннях, заўважаецца цяжкасць, з якой пазбаўляліся савецкія гісторыкі ўсталяванага ў 1930-х гадах тэзісу аб стыхійнасці сялянскага руху, які ўзнік у выніку ігнаравання КПЗБ як арганізатара рэвалюцыйнай барацьбы. З другога боку, мясцовыя арганізацыі КПЗБ не маглі забяспечыць адчувальнага ўплыву на сялянства, бо самі знаходзіліся ў занядбаным стане ў сувязі з відавочнымі поспехамі паліцэйскіх органаў у барацьбе з “падрыўнымі элементамі” [244, 244]. На фоне гэтага ў 1933 годзе справаздачы дзяржпаліцыі адзначаюць на тэрыторыі заходнебеларускіх паветаў актыўнасць беларускіх культурна-асветніцкіх арганізацый БІГіК, “Рунь”, Беларускага дабрачыннага таварыства, якія ладзілі мерапрыемствы з удзелам дзесяткаў і соцень асобаў [243, арк. 16, 16адв, 46адв–47адв; 243]. Да таго ж разрозненыя і слабаарганізаваныя выступленні маглі быць вынікам агітацыі з боку партый – палітычных канкурэнтаў КПЗБ.

На падставе партыйных рашэнняў гісторыкі агучвалі інфармацыю пра арганізацыйны ахоп працоўных вёскі КПЗБ праз сялянскія камітэты, якія ўцягвалі ў барацьбу шырокія масы, у тым ліку і тых сялян, якія знаходзіліся пад уплывам т. зв. згодніцкіх партый. Вучоныя агучвалі партыйныя рашэнні з іх дэкларатыўнасцю і ўрачыстасцю, пазбягаючы фактаграфічнага пацвярджэння выказанай інфармацыі, напрыклад, пра “антыпадаткавыя выступленні працоўных сялян”, якія КПЗБ імкнулася звязаць з непасрэднай барацьбой за зямлю без выкупу і накіраваць у

агульнае рэчышча барацьбы пралетарыяту за ўладу. Даследчыкі ігнаравалі інфармацыю аб спробах камуністаў ствараць разам з іншымі партыямі, якія мелі ўплыў у вёсцы, сялянскія камітэты. Так сярод сродкаў, накіраваных на стварэнне "баявога фронту беспрацоўных вёскі", камуністы планавалі мерапрыемствы па арганізацыі выбараў камітэтаў беспрацоўных, стварэнне "сеткі адзінафронтавых камітэтаў у вёсках, злучэнне іх у гмінныя і павятовыя камітэты". Але такія захады камуністаў не атрымалі падтрымкі з боку легальных партый з-за сваёй радыкальнасці, названыя камітэты павінны былі арганізоўваць відавочна антыдзяржаўныя крымінальныя справы, у тым ліку рабаўніцтва дзяржаўнай і прыватнай маёмасці ў выглядзе харчовых складоў, цягнікоў і інш. [237, арк. 14].

Акцэнтуючы ўвагу на кіруючай ролі партыі, аўтары сцвярджалі, што ў 1929–1930 гадах КПЗБ паспяхова кіравала барацьбой сялян супраць гвалтоўнай хутарызацыі і ліквідацыі сервітутаў, пад кіраўніцтвам антыкамасацыйных камітэтаў, якія ствараліся партыйнымі арганізацыямі, сяляне праганялі з палёў землямераў разам з паліцыяй, якая іх ахоўвала, знішчалі межавыя знакі, пасылалі ваяводскім уладам рэзалюцыі пратэсту. Сяляне-беднякі не дапускалі на сходы кулакоў [720, с. 218–219]. Тут, як і раней, кідаецца ў вочы слабая доказнасць выказанага сцвярджэння, цяжка ўявіць канкрэтыку ў дзейнасці партыі і адпаведных камітэтаў – колькі іх было, дзе яны былі найбольш актыўныя і паспяховыя. Да таго ж польскія ўлады не фарсіравалі правядзенне названых пераўтварэнняў, іх дзеянні былі гнуткімі і асцярожнымі, што прызнавалі ў сваіх справаздачах адказныя дзеячы КПЗБ. "Ужо ў многіх месцах прайшлі ўсе тэрміны камасацыі, але фашысцкі ўрад адклаў правядзенне камасацыі, не жадаючы занадта абвастраць становішча. У іншых месцах фашысты ідуць на такі манеўр, каб разбіць адзіны фронт працоўных. Яны бяруць самых рэвалюцыйна настроеных сялян, якія з'яўляюцца правадырамі ў барацьбе супраць камасацыі, і выдзяляюць ім больш урадлівыя ўчасткі зямлі", – паведамляў адзін з функцыянераў КПЗБ [566, арк. 15].

У духу партыйных пастаноў даследчыкі дэкларавалі пашырэнне і паляпшэнне працы КПЗБ сярод сельскагаспадарчых рабочых у 1929–1933 гадах. Сцвярджалася думка пра значнае ўзмацненне дзейнасці партарганізацый па стварэнні прафсаюзнай апазіцыі ва ўжо існаваўшых прафсаюзах, якія знаходзіліся пад уплывам ППС і "Вызволення", па арганізацыі самастойных прафсаюзаў сельскагаспадарчых рабочых там, дзе іх не было, пра пачатак "шырокага ўцягнення" ў сельскія партарганізацыі пралетарыяў і паўпралетарыяў вёскі. Усе гэтыя мерапрыемствы, на думку І.П. Хаўратовіча, садзейнічалі ўздыму рэвалюцыйных настрояў сярод сельскагаспадарчых рабочых [720, с. 216–219]. Аднак трэба адзначыць, што прыведзеныя выказванні не

адлюстроўвалі рэаліі тагачаснага грамадска-палітычнага стану ў вёсцы. Нават у 1933 годзе сяляне ў асноўным не дэманстравалі рэвалюцыйнай актыўнасці, польскія дакументы часта гавораць пра “бернасць неарганізаванай палітычна і грамадска беларускай меншасці” [244, арк. 9адв.]. Выяўленыя і прыведзеныя даследчыкамі яркія ўспышкі лакальных сялянскіх выступлення накшталт Асташынскага і Навасёлкаўскага, актыўнага ўдзелу ў забастоўцы сялян – лясных рабочых Белавежскай пушчы, разрэкламаваныя камуністычнай прапагандай як бліскучыя праявы рэвалюцыйнага сялянскага бунту, былі вынікам мэтанакіраванай дзейнасці камуністаў на мясцовым узроўні па інспірацыі рашучых настрояў сярод вясковага насельніцтва. КПЗБ выкарыстоўвала незадаволенасць сялянства пагаршэннем іх эканамічнага стану, ажыццяўляла арганізацыйныя мерапрыемствы, накіраваныя на актывізацыю і радыкалізацыю сялянскіх выступленняў [212, арк. 22–24; 235, арк. 26, 29; 237, арк. 4, 14, 15. 16, 35]. Менавіта такую тактыку выкарыстоўвалі камуністы ў падзеях забастоўкі лясных рабочых і сялян-возчыкаў Белавежскай пушчы, пра што выказваўся І.К. Лагіновіч, думкі якога былі выкладзены А.А. Сарокіным [786, с. 115]. Характэрнай рысай гэтых падзей была наяўнасць легальнага прафсаюза “Саюз малазямельных сялян”, які быў створаны па ініцыятыве ППС і аб’ядноўваў значную колькасць лясных рабочых і сялян-возчыкаў. Менавіта пэпээсаўскаму прафсаюзу належыла кіруючая роля ў пачатку забастоўкі. Але актыўны ўдзел у ёй камуністычных агітатараў, якія былі накіраваны на абвастрэнне сітуацыі, у рэшце-рэшт прывёў да роспуску прафсаюзу малазямельных сялян, “лясная адміністрацыя пачала адступаць ад запісаных у калектыўнай дамове ўмоў”, якія адлюстроўвалі саступкі на карысць сялян, атрыманых у час змагання [786, с. 123].

Прыкладам такіх дзеянняў камуністаў з’яляецца паўстанне ў Навасёлках Кобрынскага павета. Тыповым апісаннем названых падзей з’яўляецца версія І.В. Палуяна, які гаварыў пра абурэнне сялян бясконцымі рэпрэсіямі і жорсткім памешчыцкім прыгнётам, іх гатоўнасць уступіць ва “ўзброеную сутычку з прыгнятальнікамі”. Характэрна выдзяляючы КПЗБ як асноўнага прадстаўніка сялянства, аўтар падкрэсліў беражлівыя адносіны да насельніцтва з боку партыі, якая лічыла неадкладнае паўстанне заўчасным, паколькі яно яшчэ не было падрыхтаваным і не выспелі яшчэ неабходныя ўмовы для яго паспяховага зыходу. Пры гэтым аўтар дае зразумець неадназначнасць пазіцыі і тактыкі КПЗБ: у сваіх зваротах да сялян кампартыя не заклікала да неадкладнага паўстання, хоць і ўказвала на неабходнасць падрыхтоўкі да яго; каб пазбегнуць заўчасных стыхійных выступленняў і непатрэбнага кровапраліцця, партыя рашыла накіраваць абурэнне працоўнага сялянства па лініі правядзення масавых

паходаў-дэманстрацый у памешчыцкія маёнткі з мэтай прад’яўлення зямельным магнатам сумесных патрабаванняў. Але наіўнасць і правакацыйная сутнасць такіх паводзін відавочная: ва ўмовах актыўнага пранікнення ў партыйныя шэрагі правакатараў і даносчыкаў такія планы хутка сталі вядомыя паліцыі, якая павінна была адпаведным чынам адрэагаваць, што і адбылося. Як адзначыў гісторык, улады, даведаўшыся, што рыхтуюцца паходы сялян, правялі серыю пацыфікацый, якія сталі падставай для далейшай канфрантацыі. Пры гэтым І.В. Палуян даводзіў, што бясконцы гвалт штурхаў працоўных да рашучых дзеянняў, нягледзячы на выказанае, гаварыў аб Навасёлкаўскім паўстанні як аб заўчасным узброеным выступленні [622, с. 50–51]. Па такой схеме падаваў падзеі на Кобрыншчыне і У.А. Палуян [682, с. 201–203], пра камуністычны след у гэтых падзеях гаварылі і іншыя даследчыкі. Калектыўная манаграфія назвала ўзброенае выступленне ў Кобрынскім павеце ў жніўні 1933 года кульмінацыйным момантам сялянскага руху ў гады крызісу, калі камуністам-падпольшчыкам удалося скіраваць стыхійнае абурэнне вясковага насельніцтва ў рэчышча арганізаванай барацьбы [720, с. 283]. Звяртаючыся да гісторыі гэтай яркай падзеі, А.М. Мацко і А.А. Сарокін гаварылі, што Кобрынскае выступленне было падрыхтавана і арганізавана камуністамі [512, с. 34; 786, с. 124–125]. Неабходна звярнуць увагу на гэтую своеасаблівую “шчырасць” гісторыкаў, якія, у адрозненне ад публікацый 1930–1950-х гадоў, “рэвалюцыйнасць” сялянскіх выступленняў справядліва прыпісвалі камуністычным актывістам. Зразумела, што гаварыць аб стыхійнасці, заўчаснасці і раптоўнасці гэтых падзей у поўным сэнсе не прыходзіцца. Відавочна, што актывізацыя радыкальных выступленняў сялян у пачатку 1930-х гадоў адбывалася ў выніку пашырэння працы КПЗБ з сельскім насельніцтвам на глебе незадаволенасці пагаршэннем сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, пра што сведчаць архіўныя матэрыялы. Гаварыць пра чыста сялянскую самарганізацыю ў справе наладжвання паходу-дэманстрацыі, што прывёў да т. зв. паўстання ў Навасёлках, не прыходзіцца. Вядома, што ў гэты час на тэрыторыі Берасцейшчыны сваю актыўную дзейнасць праводзілі функцыянеры КПЗБ, сярод якіх выдзяляўся М. Дворнікаў. Яны на сходах падпольных райкамаў сцвярджалі пра хуткае набліжэнне ў Польшчы рэвалюцыі. Хутчэй за ўсё, тактыка паходаў-дэманстрацый была прапанавана цэнтрам да рэалізацыі камуністычнымі падпольшчыкамі, якія не надта схільныя былі браць на ўвагу наступствы такіх сацыяльных абвастрэнняў для мясцовага насельніцтва. Сапраўды, актывізацыя падпольшчыкаў была вядомая польскай паліцыі. Напрыклад, яшчэ ў студзені 1933 года паліцыі было вядома, што камуністы ў якасці асновы акцыі на вёсцы плануюць арганізоўваць масавыя мерапрыемствы ў

выглядзе сходаў, масовак, паходаў да гмінных рад, павятовых сеймікаў, галадовак і антыкамасацыйных кампаній пад лозунгам "Ідзіце да абшарніцкіх свірнаў, забірайце хлеб і дзяліце паміж сялян" [235, арк. 29]. Паліцэйскія органы праз сваіх агентаў і канфідэнтаў мелі дастаткова падрабязную інфармацыю пра пасяджэнні падпольных ячэек, у тым ліку з удзелам будучых актыўных арганізатараў-удзельнікаў узброенага выступлення ў Кобрынскім павеце, напрыклад, В.П. Ласковіча, тады яшчэ маладога камсамольца, сярод членаў ячэйкі якога быў правакатар, што неўзабаве падаў досыць падрабязную інфармацыю пра пасяджэнне ячэйкі [212, арк. 22–24]. І няма дзіва ў тым, што польскія карныя органы не спынялі "на корані" дзеянні "выўратовых" элементаў, бо не выключана, што яны мелі жаданне даць магчымасць антыдзяржаўным дзеянням адбыцца, каб у далейшым мець падставы для разгрому любых праяваў апазіцыйнасці.

Тут дарэчы будзе адзначыць, што афіцыйныя польскія органы, паліцыя, судовыя інстанцыі трактавалі прыведзеныя выступленні не інакш, як прыклады бандытызму, арганізаванага камуністычным падполлем. Да таго ж сітуацыя ў вёсцы вызначалася, акрамя паказчыкаў нарматыўна-прававога і сацыяльна-эканамічнага характару, наяўнасцю маральных і псіхаэмацыянальных трансфармацый. Сфарміраваныя паміж сялянамі непрыязныя адносіны маёмаснага, сацыяльнага і палітычнага характару прыводзілі да ўсталявання напружанай сітуацыі, якую абвастралі валюнтарысцкія дзеянні камуністаў. Яны, часам гвалтоўна, пашыралі антыдзяржаўныя настроі, схільныя былі відавочна тэрарыстычныя метады запалохвання і фізічнага знішчэння палітычных апанентаў – аднавяскоўцаў – прымяняць у паўсядзённым жыцці дзеля вырашэння ўласных інтарэсаў. У час Навасёлкаўскага паўстання камуністычныя правадыры, на думку М.С. Міцковіча, падбухторвалі да экстрэмізму, "павязваючы" моладзь пралітай крывёю і пагромамі, пасля чаго пад страхам рэпрэсій улад (і не толькі) моладзь баялася б павярнуць назад [544, с. 34, 37, 44–46].

Разнастайныя архіўныя дакумента як кампартыі, так і польскіх сілавых ведамстваў адзначаюць павелічэнне колькасці інфарматараў і правакатараў у першай палове 1930-х гадоў, якія паралізавалі падпольную дзейнасць КПЗБ. Паводле партыйнай справаздачы за ліпень 1934 года, часта сустракаліся выпадкі, калі нізавыя кіраўнікі партыі і камсамолу ў выніку абвастрэння сітуацыі ў вёсцы, пасля арышту і допытаў у паліцыі адмаўляліся ад сваіх партыйных перакананняў, "падпісалі дэкларацыі на канфідэнтаў ці адкрыта сталі правакатарамі", "ёсць ячэйкі, якія пагалоўна перайшлі на службу паліцыі" [567, арк. 12; 572, арк. 39, 40]. Гэта сведчыла пра страту былымі актыўнымі апанентамі польскага рэжыму, прыхільнікамі камуністычных ідэалаў, ілюзій, звязаных з магчымасцю і жаданнем савецкага кіраўніцтва ажыццявіць "сацыяльнае і нацыянальнае

вызваленне" Заходняй Беларусі. Валюнтарызм камуністычных правадыроў, грэбаванне імі агульначалавечымі каштоўнасцямі ў Заходняй Беларусі, гвалтоўная калектывізацыя, арышт і фізічнае знішчэнне правадыроў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў БССР канчаткова пераконвалі сялян у памылковасці сваіх папярэдніх сацыяльна-палітычных уяўленняў пра "сацыялістычны рай".

Савецкія даследчыкі, акцэнтуючы ўвагу на інтэрнацыянальных сувязях, дэтэрмінаваных тагачаснай гістарыяграфічнай схемай, значную ўвагу надавалі сумесным выступленням польскіх і беларускіх сялян супраць санацыйных уладаў. Напрыклад, А.М. Мацко звярнуўся да забастоўкі рабочых лясных промыслаў Белавежскай пушчы ў апошні год сусветнага эканамічнага крызісу, у якой, акрамя 4 тыс. рабочых лесазаводаў, усіх лесарубаў, прымалі ўдзел сяляне 56 вёсак. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што ў гэтай забастоўцы, "як і ў іншых выступленнях супраць гнёту эксплуататараў", беларускія і польскія рабочыя і сяляне выступалі адзіным фронтам, што садзейнічала росту іх "згуртаванасці і брацкай салідарнасці" [512, с. 113]. Такога характару заявы мае калектыўная манаграфія, якая працытавала партыйную газету "Чырвоны сцяг" і змешчаныя ў ёй сцвярджэнні аб дзейсным саюзе рабочых і сялян, салідарнасці беларускіх і польскіх сялян і рабочых [720, с. 275]. Аднак такія сцвярджэнні, народжаныя камуністычнай прапагандай, не пацвярджаюцца матэрыяламі апытання саміх камуністаў – удзельнікаў забастоўкі, якое праводзілася ў пачатку 1934 года [573, арк. 94–99, 105–123, 124–128]. Такія заявы не могуць прымацца без агаворак і таму, што сацыяльныя ўяўленні беларусаў пазіцыянавалі палякаў як "паноў", да якіх прыгнечаны беларус адносіўся з малой прыхільнасцю [375; 376; 377, с. 47; 378].

У даследаваннях прагледжвалася чарговая супярэчнасць, якая вынікала з настойлівага жадання вучоных сцвердзіць патрэбныя, ідэалагічна выверанныя схемы. З аднаго боку, згадкай пра партызанскія выступленні ў пачатку 1930-х гадоў даследчыкі хацелі паказаць заканамерную наяўнасць стыхійнай рэвалюцыйнасці сялян. З другога – непрыемная шчырасць у адназначным прыпісванні камуністам чарговых прыкладаў заходнебеларускай партызанкі ў сувязі з яе відавочным авантурызмам магла пашкодзіць іміджу партыі: КПЗБ у гэты час спрабавала пераадолець у сваіх шэрагах палітычны шавінізм і валюнтарызм, праявай якога былі дэструктыўныя дзеянні ў дачыненні да сваіх палітычных калег-апанентаў па сацыялістычным лагеры. Свае магчымыя дзеянні па арганізацыі ўзброеных атрадаў партыя ажыццяўляла ў глыбока сакрэтным рэжыме, разважаючы пра "стыхійнасць" у адказ на "жорсткі акупацыйны рэжым". Таму, напрыклад, І.В. Палуян адзначыў як сур'ёзны паказчык высокага напружання класавай барацьбы ў Заходняй Беларусі стыхійнае, на яго думку, аднаўленне восенню 1932 года

партызанскага руху, які ахапіў шэраг паветаў Навагрудскага і Палескага ваяводстваў [622, с. 47]. У перыяд крызісу ў выніку росту галечы і адчаю сярод сялян узмацніліся партызанскія і тэрарыстычныя настроі, фактычна гэта быў “адказ працоўных вёскі на масавыя рэпрэсіі акупацыйнага рыжыму”, як даводзіў І.П. Хаўратовіч, партызанская барацьба заходнебеларускіх сялян насіла нярэдка стыхійны характар; КПЗБ надавала вялікае значэнне партызанскаму руху, імкнучыся накіраваць яго ў рэчышча арганізаванай і мэтанакіраванай барацьбы [720, с. 283]. У.А. Палуян дзеянні партызан назваў “у асноўным” стыхійнымі, прыводзячы пазіцыю V пленума ЦК КПЗБ, які перасцярог ад заўчасных партызанскіх выступленняў [682, с. 200].

На думку І.В. Палуяна і У.А. Палуяна, часовы спад рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў канцы 1933 – 1935 гадах выявіўся ў памяншэнні колькасці і працягласці выступленняў сялян, у скарачэнні колькасці іх удзельнікаў, у паслабленні рэвалюцыйнай вастрыні гэтых выступленняў, у зніжэнні палітычнай актыўнасці сялянскіх мас. Уздым рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, у прыватнасці сялянскага, даследчыкі звязвалі са зваротам КПЗБ да ўсіх палітычных партый і арганізацый з заклікам стварыць адзіны рабочы і антыфашысцкі народны фронт і з практычнымі захадамі камуністаў па рэалізацыі гэтых планаў. Тут прыходзіцца выказаць нязгоду з выказаным меркаваннем, бо ідэя яднання на глебе адзінага фронту з удзелам камуністаў не выклікала асаблівага аптымізму ў шэрагах былых палітычных апанентаў [87; 96]. Што тычыцца канстатаванага ўздыму апазіцыйнага руху, то, хутчэй за ўсё, яго трэба тлумачыць абвастрэннем сацыяльна-эканамічных супярэчнасцей у заходнебеларускай вёсцы, звязаных з далейшымі працэсамі сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, якія суправаджаліся, як гэта бывае часта на пераходных этапах, свавольствам мясцовых чыноўнікаў і прадпрыймальнікаў. Як, напрыклад, падзеі Нарачанскага паўстання рыбакоў. Іншая справа, што камуністы, выкарыстоўваючы сваю звычайную тактыку дапасавання да вострых падзей, на іх фоне дэманстравалі свой арганізаваны ўплыў. Выступленне нарачанскіх рыбакоў дало падставы даследчыкам пацвердзіць патрэбную схему, яны акцэнтавалі ўвагу на ажыўленні сялянскага руху на фоне ўзмацнення забастовачнай барацьбы рабочага класа, падкрэслівалі кіруючую ролю КПЗБ. У адказ на нацыяналізацыю рэк і азёр, забарону свабоднага рыбнага лову сяляне аднадушна і катэгарычна адмаўляліся выконваць патрабаванні ўладаў і працягвалі лавіць рыбу ў Нарачы, лічылі гісторыкі, хоць і згадвалі аб штрэйкбрэхерах сярод сялян-рыбакоў [786, с. 147–154]. Ігнаруючы арганізацыйны ўдзел у дадзеных падзеях іншых партый, Т.В. Прытыцкая і А.У. Царук сцвярджалі, што барацьбу сялян узначалілі партыйныя арганізацыі КПЗБ [720, с. 343–345].

Вучоныя рабілі штучныя абагульненні, прыцягваючы адзінкавыя, лакальныя падзеі на агульнакраявы ўзровень. Яны даводзілі, што сялянскія аграрныя і антыпадаткавыя выступленні ў 1934–1938 гадах працякалі ў асноўным па лініі барацьбы супраць камасацыі, ліквідацыі сервітутаў, супраць гвалтоўнага ўзымання недаімак і канфіскацыі маёмасці сялян за падаткавую запазычанасць, супраць шарваркаў. Па меркаванні гісторыкаў, КПЗБ накіроўвала выступленні сялян у рэчышча арганізаванай барацьбы, якая нярэдка прыводзіла да масавых выступленняў сялян цэлых вёсак. З гэтым нельга пагадзіцца, бо своеасаблівая стагнацыя, якая мела месца ў жыцці партыі пасля першых рэпрэсій у дачыненні да кіраўніцтва ў 1936 годзе, хутчэй за ўсё такія поспехі рабіла немагчымымі. Але даследчыкі расказвалі пра новыя поспехі сялян, якія ў шэрагу выпадкаў сілаю зноў займалі сервітутныя землі, выкідвалі межавыя знакі, байкатавалі шарваркі, праганялі паліцыю і чыноўнікаў, пасланых дапамагаць памешчыкам і прымушаць сялян плаціць падаткі і выконваць шарваркі. Нельга адмаўляць поўную адсутнасць такіх праяваў сялянскага незадавальнення, аднак разрозненыя, адзінкавыя праявы сялянскага свавольства наўрад ці можна ўстаўляць у рамкі “арганізаванай барацьбы” пад кіраўніцтвам КПЗБ. Тое самае тычыцца і палітычных выступленняў у форме палітычных сходаў, масовак і дэманстрацый, на якіх сяляне прымалі палітычныя рэзалюцыі, у якіх пратэставалі супраць “фашысцкага праізволу” і няшчаднай эксплуатацыі працоўных, збіралі харчы і грошы ў дапамогу бастуючым рабочым [683, с. 193–194, 206–210, 217]. Што тычыцца рэвалюцыйнага ўздыму 1936–1938 гадоў, пра які ахвотна гаварылі вучоныя, то асноўным зместам яго стала эканамічная барацьба, у цэнтры якой была арганізаваная “Стронніцтвам людовым” сялянская забастоўка 1937 года.

Савецкія гісторыкі акцэнтавалі ўвагу на дэструктыўных, на іх думку, паводзінах палітычных канкурэнтаў КПЗБ адносна ўплыву на сялян, у першую чаргу “Стронніцтва людовага”. У верасні 1936 года на Валыні і Палессі пад непасрэдным уплывам падзей, звязаных з дэманстрацыяй сялян у Навасельцах Жэшэўскага ваяводства, разгарнулася забастовачная барацьба сялян, канстатавалі даследчыкі. Яны сцвярджалі, што забастоўкай кіравалі КПЗБ і КПЗУ, але гэта перабольшванне, бо падпольная партыя не мела арганізацыйных магчымасцей для падтрымкі высокага напружання легальнай эканамічнай барацьбы. Абвінавачваючы арганізатараў усеагульнай забастоўкі 1937 года, вучоныя неаргументавана падкрэслілі, што, аб’яўляючы яе, кіраўніцтва “Стронніцтва людовага” свядома выключыла з яе Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, ведаючы, што там моцны нацыянальна-вызваленчы рух і забастоўка ў гэтых умовах пад уплывам КПЗБ і КПЗУ можа перарасці ва ўзброеную барацьбу. Гісторыкі негатыўна ацэньвалі ўдзел

іншых партый у названых падзеях, безапеляцыйна гаварылі аб здрадзе правых сілаў інтарэсам сялянства, даводзілі, што кіраўнікі “Стронніцтва людовага”, украінскія і беларускія “нацыяналісты” чынілі перашкоды ў арганізацыі забастоўкі, садзейнічалі суровым рэпрэсіям улад, спецыяльна прызначылі пачатак забастоўкі на 15 жніўня – гадавіну бітвы паміж белапольскімі войскамі і Чырвонай Арміяй, што, па справядлівым меркаванні У.Ф. Ладысева, гаварыла аб імкненні правых кіраўнікоў “Стронніцтва” прыдаць масавым сялянскім выступленням антысавецкі характар [401, с. 119]. Але, улічваючы папулярнасць гэтай партыі сярод сялян Польшы, у тым ліку і Заходняй Беларусі, нацяжкай бачацца сцвярджэнні вучоных адносна таго, што сялянская забастоўка 1937 года была магутнай дэманстрацыяй сялян супраць тагачаснага польскага палітычнага рэжыму, адлюстроўвала вялікую незадаволенасць працоўных сялян санацыйным рэжымам і выявіла тыя рэвалюцыйныя сілы, якія былі ў вёсцы. Таму, як падсумавалі Т.В. Прытыцкая і А.У. Царук, “вялікі рэвалюцыйны парыў, які ахапіў шматмільённыя масы”, не дасягнуў сваёй мэты, санацыйнаму рэжыму з дапамогай правых кіраўнікоў “Стронніцтва людовага” і ППС удалося падавіць забастовачны рух сялян. Такія высновы даследчыкаў былі зроблены на фоне іх жа інфармацыі аб агітацыйнай кампаніі камуністаў, якая дапасоўвалася да пазіцый “Стронніцтва людовага” ў дачыненні да сялянскіх забастовак, у арганізацыі і падрыхтоўцы якіх ЦК КПП лічыў неабходным за зыходны пункт браць эканамічныя патрабаванні [720, с. 369–373].

Тэндэнцыйнасць прыведзеных публікацый, зададзеная канцэптуальнай аднастайнасцю, прыводзіла да значных скажэнняў выкладаемых падзей, калі ўсе выпадкі незадаволенасці сялян падводзіліся вучонымі пад фармулёўку рэвалюцыйных. Аднак былі створаны працы, якія пашырылі даследуемую праблематыку, унеслі значную ступень навізны і аб’ектыўнасці. Да такіх у першую чаргу неабходна аднесці аўтарытэтнае даследванне У.А. Палуяна, накіраванае на асэнсаванне характару ўдзелу заходнебеларускіх сялян у нацыянальна-вызваленчым руху, якое адрозніваецца глыбінёй навуковай прапрацоўкі і трываласцю фактаграфічнага падмацавання [682]. Аўтар паставіў рэвалюцыйна-дэмакратычныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі як вырашальныя, асноўным носьбітам рэвалюцыйнага дэмакратызму з’яўляліся непралетарскія пласты, у першую чаргу сялянства. Даследчык адзначыў, што барацьба сялян мела свае асаблівасці, выкліканыя галоўным чынам спецыфікай іх становішча як дробных уласнікаў і эксплуатуемых працаўнікоў, умовамі жыцця, працы і быту. Гэта не магло, на думку У.А. Палуяна, не адбіцца на палітычных пазіцыях, ідэалогіі, формах арганізацыі і метадах барацьбы сялянскіх мас. Вучоны дапускаў адыход ад сцверджання аб усенародным характары сялянскага руху, гаварыў,

напрыклад, аб адсутнасці адзінства сярод сялян, удзельнікаў нарачанскіх падзей, крытыкаваў ігнараванне камуністамі паўсядзённых эканамічных памкненняў сялян. Але даследаванне відавочна грунтавалася на традыцыйных для таго часу ўяўленнях аб абумоўленасці сялянскага руху актыўнасцю выступленняў рабочых, залежнасцю яго ад КПЗБ, стану яе згуртаванасці, асаблівасцей тактычных поглядаў на нацыяльна-вызваленчую барацьбу, знішчальна-з’едлівых адносінах да нацыянальных беларускіх дзеячаў, якія аўтар называў нацыянал-фашыстамі. Як падаецца, занадта ўскладняючы пытанне вызначэння асаблівых форм сялянскіх выступленняў, У.А. Палуян падзяліў іх на некальткі груп: аграрныя, г.зн. скіраваныя супраць памешчыкаў і зямельнай палітыкі ўраду, антыпадаткавыя і антышарварачныя і эканамічныя забастоўкі; асобную групу складалі розныя палітычныя выступленні. Беспадстаўнасць гэтага меркавання пацвярджаецца самім аўтарам, які, звяртаючы ўвагу на ступень вастрыні сілы сялянскіх выступленняў, меў на ўвазе іх разнастайнасць ад “арганізаваных патраў і пасіўнага супраціўлення буржуазнай уладзе да масавых выступленняў, якія часта заканчваліся вострымі сутычкамі з паліцыяй” [682, с. 151, 156, 299]. Перапляценне асобных рысаў прыведзеных форм супраціўлення робіць выказаныя аўтарам думкі спрашчэннем складаных па сваёй накіраванасці і праявах працэсаў.

Такім чынам, у другой палове 1950-х – 1980-я гады гісторыя сялянскага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў атрымала вялікую ўвагу даследчыкаў і асвятленне на старонках апублікаваных выданняў. Пра дастаткова значную фактаграфічную базу і адносна высокі навукова-даследчыцкі ўзровень вывучэння названых праблем даследчыкамі гэтага перыяду сведчыць тое, што ў 1990–2000-я гады, акрамя некаторых публікацый па гісторыі партызанскага руху, не было апублікавана спецыяльных прац, у якіх пытанні сялянскага руху ў Заходняй Беларусі набылі б прадметнае асвятленне.

Зыходны пункт сялянскага руху традыцыйна быў звязаны з паказам цяжкага становішча беларускага сялянства ў Польшчы і накіраваны на вырашэнне ідэалагічнай задачы: паказаць перавагі жыцця ў складзе савецкай Беларусі ў параўнанні з “галечай і нястачай у буржуазна-памешчыцкай Польшчы”, а зыходзячы з гэтага падкрэсліць правільнасць і неабходнасць далучэння ў верасні 1939 года Заходняй Беларусі да БССР. Прычыны сялянскага руху даследчыкі бачылі ў тым, што мерапрыемствы польскага ўраду ў аграрнай сферы такія, як парцэляцыя, камасацыя, ліквідацыя сервітутаў, высокія падаткі, наяўнасць шарваркаў, прыводзілі да рэзкага пагаршэння становішча сялян, што ў спалучэнні з сацыяльным і палітычным бяспраўем выклікалі незадавальненне сялян і былі падставай для разгортвання масавага сялянскага руху. Відавочна, што гэтыя аспекты

не вычэрпвалі ўсіх прычын, якія падводзілі сялян да ўдзелу ў арганізаваных выступленнях, у першую чаргу трэба мець на ўвазе палітычныя акцыі, якія дэманстравалі ўсвядомленае жаданне сялян дабіцца паляпшэння становішча на падставе адпаведных канцэпцый палітычных партый, у рэшце-рэшт праз вырашэнне галоўнай мэты – нацыянальнага аб’яднання і сапраўднай дзяржаўнай незалежнасці.

Даследчыкі адзначылі, што барацьба сялян у розныя часы набывала розную актыўнасць і праяўленне. Адзінадушша аўтараў назіралася ў тым, што КПЗБ надавалася кіруючая роля ў арганізацыі сялянскага руху, які залежыў ад палітыкі кампартыі і яе актыўнасці ў розныя перыяды. На фоне відавочнага жадання гісторыкаў знайсці пацвярджэнне рэвалюцыйнасці сялянскага руху абавязковай была канстатацыя таго, што рэвалюцыйная барацьба сялянскіх мас развівалася ў сувязі і пад непасрэдным уплывам рабочага класа. Найважнейшай умовай паспяховага разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы, на думку даследчыкаў, было існаванне саюзу рабочых і сялян, за стварэнне і ўмацаванне якога КПЗБ пастаянна вяла барацьбу. Яскравым вынікам гэтай працы было стварэнне пад кіраўніцтвам КПЗБ масавых рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый БСРГ і “Змагання”, якія і былі асноўнай арганізацыйнай формай саюзу рабочага класа і сялянства. На гады існавання гэтых арганізацый, асабліва Грамады, якраз і прыпадаюць перыяды найбольшай, найвышэйшай актыўнасці сялянскага руху. Пры гэтым, абсалютызуючы ў ім ролю КПЗБ, вучоныя ігнаравалі асаблівасці гістарычнага развіцця самой партыі, якая па розных прычынах не магла забяспечыць устойлівую кардынацыю сваіх падпольных ячэек дзеля забеспячэння трывалага ўплыву на сялянскае насельніцтва. Гістарыяграфічнае ўсталяванне КПЗБ як галоўнай сілы, за якой ішло сялянства, адбывалася за кошт беспадстаўнага ігнаравання значэння іншых партый у арганізацыі сялянскага руху.

Пры адлюстраванні сацыяльна-палітычных пазіцый сялянства даследчыкі вымушаны былі згладжваць відавочную супярэчлівасць: з аднаго боку сяляне – падаўляльная маса насельніцтва, без яе актыўнасці немагчыма дасягнуць планаванага і чаканага – пралетарскай рэвалюцыі, а з другога боку сяляне – дробныя ўласнікі, а значыць класава яны не паўнавартасныя. Для гэтага гісторыкам увесь час прыходзілася даказваць рэвалюцыйнасць, палітычную актыўнасць сялян, што зрабіць па аб’ектыўных прычынах было вельмі цяжка: беларускі селянін не надта паддаваўся палітычнай агітацыі, бо яму трэба было працаваць.

Відавочна, што вышэйакрэсленыя высновы наконт характару сялянскага руху выглядаюць надзвычай палітызаванымі і заідэалагізаванымі. Таму адной з надзённых задач з’яўляецца пазбаўленне навуковых даследаванняў ад названых недахопаў. Сёння чакаюць больш дэталёвай

распрацоўкі пытанні гісторыі БРА, Саюза сялянскай самаабароны, Брацтва беларусаў, а таксама вызначэнне памеру пранікнення ў сялянскія гушчы Заходняй Беларусі ўплываў БПС-Р, БХД, БСС, іншых беларускіх і небеларускіх сялянскіх партый і арганізацый, якія намагаліся дабіцца папулярнасці і падтрымкі ў сялян.

На актыўнасць і вастрыню сялянскага змагання за свае сацыяльна-эканамічныя інтарэсы выключна важную ролю аказвала пазіцыя СССР, яго імкненне выкарыстаць цяжкасці гаспадарчага жыцця і палітычнага стану заходнебеларускага насельніцтва. Праз свае рэзідэнтуры, праз КПЗБ, якая павінна была ўліцца ў гушчу сялянскай грамады, бальшавіцка-камінтэрнаўскае кіраўніцтва намагалася рэвалюцыянізаваць сялянства – асноўную масу насельніцтва, каб, падрыхтаваўшы сацыяльны выбух, выкарыстаць гарачую сітуацыю ў сваіх міжнародных мэтах. І таму адказ на спады, прыпыненне, затуханне актыўнасці выступленняў сялянскага руху, разам з прыведзенымі вышэй меркаваннямі даследчыкаў, трэба шукаць у змяненні міжнароднай сітуацыі ў Еўропе, грамадска-палітычнага клімату, геапалітычных інтарэсаў Польшчы і СССР. Як, напрыклад, у пачатку 1930-х гадоў, калі савецкая дыпламатыя ў неабходнасці прымірыцца з Польшчай абапіралася на палітычную кампанію, распачатую ў БССР, скіраваную на рэпрэсіі ў дачыненні актыўных дзеячаў заходнебеларускага руху, арганізатараў масавых, па-сутнасці, сялянскіх партый БСРГ, “Змаганне”. У выніку арганізаванай справы БНЦ сялянскія правадыры левардыкальнай скіраванасці былі падвергнуты дыфамацыі і фізічна знішчаны.

### 3.5. Партызанскі рух на старонках навуковых публікацый

У першай палове 1920-х гадоў партызанскі рух быў вызначальнай формай барацьбы беларускага народа супраць польскіх уладаў, сацыяльны характар якога ў айчыннай гістарыяграфіі пераважна вызначаўся як сялянскі [742, с. 169]. Партызанская барацьба, як і ўвогуле сялянскі рух, у першыя гады польскай улады, да ўтварэння КПЗБ падавалася як рух стыхійны, неарганізаваны. А.У. Царук гаварыў пра партызанскі рух 1921–1925 гадоў як пра “ў аснове сваёй рэвалюцыйны, сялянскі рух” [856, с. 8–9]. Сяляне самавольна seклі памешчыцкія і дзяржаўныя лясы, захоплівалі памешчыцкую зямлю і сенажаці, падпальвалі маёнткі, забівалі ненавісных асаднікаў, войтаў і іншых прадстаўнікоў акупацыйных улад. У асобных месцах пачалі фарміравацца ўзброеныя групы, якія павялі барацьбу з паліцыяй і карнымі экспедыцыямі”, – даводзіў М.С. Арэхва [22, с. 10].

На думку І.В. Палуяна і У.А. Палуяна, партызанскі рух узнік як праяўленне пераважна стыхійнай барацьбы найбольш актыўнай часткі

сялян супраць улады памешчыкаў і капіталістаў, супраць польскай акупацыі. Аднак трэба мець на ўвазе, што партызанскі рух у Заходняй Беларусі меў свае карані ў барацьбе беларускіх партызан у час польска-савецкай вайны, а не пачаўся з чыстага аркуша, як гаварылі даследчыкі: у 1921 годзе ў заходнебеларускіх ваяводствах сталі ўзнікаць мясцовыя падпольныя паўстанцкія арганізацыі і камітэты, на чале якіх станавіліся камуністы, рабоча-сялянскі актыў, найбольш рэвалюцыйныя элементы дэмакратычных арганізацый, у прыватнасці БРА, Саюза сялянскай самаабароны і іншых.

Аўтары прытрымліваліся той думкі, што стыхійны партызанскі рух, асабліва ў першыя гады, не быў аднародным і па сваёй палітычнай накіраванасці. Атрады, якія дзейнічалі ў Палескім, Навагрудскім і большай частцы Віленскага ваяводстваў і аб’ядноўвалі большасць партызан, ставілі задачу адабраць у памешчыкаў зямлю, дабіцца ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР. А атрады, якія дзейнічалі ў раёне Белавежскай пушчы, у Ваўкавыскім і Гродзенскім паветах і якія знаходзіліся пераважна пад уплывам БРА і беларускіх эсэраў, стаялі за здзяйсненне дэмакратычных пераўтварэнняў і вялі барацьбу антыакупацыйнага характару.

Панаваўшая ў другой палове 1950-х – 1980-я гады гістарыяграфічная традыцыя патрабавала ад даследчыкаў узвышэння ролі КПЗБ і стварэння адмоўнай характарыстыкі “авантурыстычным элементам эсэраўскага накірунку”, якія, апынуўшыся ля кіраўніцтва асобнымі атрадамі, штурхалі партызан і насельніцтва на заўчасныя непадрыхтаваныя стыхійныя выступленні. Такія дзеянні эсэраў, на думку аўтараў, безумоўна, прыносілі вялікую шкоду ўсяму партызанскаму руху, перашкаджалі арганізаванай барацьбе. І наадварот, большую арганізаванасць і палітычную мэтанакіраванасць партызанскаму руху надало стварэнне ў 1923 годзе КПЗБ і ўзначальванне ёй вызваленчай барацьбы працоўных. Пры гэтым даследчыкі не маглі цалкам выканаць патрабаванні марксісцка-ленінскіх канонаў аб вядучай ролі рабочага класа, узнікненне партызанскага руху, як вынікае з тэксту, было народжана, разам з агульным уздымам нацыянальна-вызваленчага руху беларускага народа, у першую чаргу барацьбой сялянства “за рэвалюцыйнае вырашэнне аграрнага пытання”. Па сваіх вытоках і сацыяльным складзе партызанскіх атрадаў ён быў пераважна сялянскім, а па палітычным характары – рэвалюцыйным і нацыянальна-вызваленчым, лічылі І.В. Палуян і У.А. Палуян [683, с. 60–64, 75].

Падобнай пазіцыі прытрымліваліся аўтары кнігі “Революционный путь Компартии Западной Белоруссии”. На іх думку, незадаволенасць беларускіх сялян сацыяльным і палітычным гнётам прывяла да таго, што найбольш передавыя рэвалюцыйна настроеныя сяляне, былыя бежанцы-

чырвонаармейцы, некаторыя камуністы ішлі ў лясы, там стваралі ўзброеныя групы. Узброеная барацьба сялян, паступова ўзрастаючы, ахапіла ўсю тэрыторыю Заходняй Беларусі. Партызанскі рух, на думку даследчыкаў, насіў нацыянальна-вызваленчы характар і быў накіраваны супраць буржуазна-памешчыцкай Польшчы. У ім прымалі ўдзел працоўныя сяляне, рамеснікі, вясковая інтэлігенцыя – прадстаўнікі розных палітычных поглядаў і накірункаў, ад камуністаў да асобных груповак беларускіх нацыяналістаў.

Разам з надуманымі сцвярджэннямі і спрашчэннямі пра тое, што на Палессі, Навагрудчыне, Віленшчыне партызанскай барацьбой кіравалі камуністы, а таму яна мела ярка выражаны класавы, антыпамешчыцкі характар, манаграфія змяшчала на сярэдзіну 1960-х гадоў цікавыя звесткі: у Гродзенскім, Ваўкавыскім, Сакулкаўскім, Бельскім і Беластоцкім паветах партызанскі рух у першыя часы насіў антыпольскі характар і інспіраваўся "беларускімі буржуазнымі нацыяналістамі", якія знаходзіліся ў Каўнасе і карысталіся падтрымкай літоўскага буржуазнага ўраду. Урад Літвы імкнуўся выкарыстаць партызанскі рух беларускіх і літоўскіх сялян у сваіх тэрытарыяльных і палітычных спрэчках з буржуазна-памешчыцкай Польшчай.

"Беларускія буржуазныя нацыяналісты", як сцвярджалі стваральнікі кнігі, не называючы, аднак, канкрэтныя партыі і арганізацыі ці іх кіраўнікоў, баючыся росту нацыянальна-вызваленчага руху народных мас, стрымлівалі развіццё партызанскай барацьбы і імкнуліся накіраваць яе ў неабходнае рэчышча. Аднак, будучы не ў сілах утрымаць пад сваім уплывам партызан, у масе сваёй сялян, "беларускія нацыяналісты" спынілі барацьбу і эмігрыравалі ў Літву. Выяўленае гісторыкамі "спыненне" партызанскай барацьбы "белбурнацамі" неабгрунтавана падавалася ў 1923 годзе, таму далейшая інфармацыя пра тое, што мясцовыя партызанскія групы, якія засталіся пасля іх у заходніх паветах, не склалі зброі, а, дзейнічаючы разрознена, працягвалі змагацца супраць сваіх прыгнятальнікаў, павінна была ўзмацніць ураженне пра вырашальны ўнёсак у кіраўніцтва партызанскім рухам створанай у канцы 1923 года КПЗБ [720, с. 61–63].

Такім чынам, відавочнае імкненне гісторыкаў прынізіць ролю беларускіх нацыянальных дзеячаў і ўзвялічыць ролю КПЗБ прыводзіла да таго, што на старонках выданняў усё гераічна-станоўчае аддавалася камуністам, а нацыянальныя беларускія сілы прыносілі толькі шкоду.

У асноўным не выйшаў за межы акрэсленых падыходаў А.А. Сарокін, які ўнёс значны ўклад у распрацоўку пытанняў партызанскага руху ў Заходняй Беларусі. У працы "Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.)" ён прытрымліваўся традыцыйнай канцэпцыі адносна сацыяльнага характару партызанскага руху, даводзячы,

што беларускае сялянства паднялося на партызанскую барацьбу ў адказ на ўведзеныя польскімі ўладамі ў Заходняй Беларусі капіталістычныя парадкі, рэстаўрацыю ўлады зямельных магнатаў, узмоцнены сацыяльны гнёт і нацыянальнае бяспраўе [785, с. 53].

У наступнай працы, поўнасцю прысвечанай пытанням сялянскага руху ў Заходняй Беларусі [786], А.А. Сарокін асаблівую ўвагу надаў вывучэнню пытанняў разгортвання партызанскага руху і прыйшоў да некаторых арыгінальных высноў, якія не зусім супадалі з вышэйадзначанымі. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі пачаўся яшчэ ў перыяд польскай інтэрвенцыі, нагадаў аўтар. Пасля Рыжскага дагавору ўжо летам 1921 года пачалася ўзброеная барацьба ва ўсходняй частцы Палескага ваяводства. Партызанскія атрады часта ўзнікалі стыхійна і дзейнічалі эпізадычна, байцы такіх груп жылі дома, пакідалі хатні прытулак толькі на час выканання якой-небудзь баявой аперацыі.

А.А. Сарокін выдзеліў больш буйныя і ўстойлівыя фарміраванні, якія доўгі час апервыравалі ў адпаведных зонах, кантралявалі вялікія тэрыторыі, мелі сваіх камандзіраў, свае штабы і базы, часам нагадваючы падраздзяленні рэгулярнай арміі. Ва ўсходняй частцы Палескага ваяводства дзейнічалі групы К.П. Арлоўскага і В.З. Каржа, ва ўсходняй частцы Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў – аддзелы С.А. Ваўпшасава. Партызанскія сілы пад камандаваннем К.П. Арлоўскага і С.А. Ваўпшасава былі найбольш актыўнымі і існавалі даўжэй за іншыя фарміраванні. Асобныя атрады гэтых злучэнняў дзейнічалі да канца 1925 года У заходніх частках Палескага ваяводства – Белавежскай пушчы – базіраваліся атрады Германа Шыманюка, у заходніх частках Віленскага ваяводства аперыравалі літоўскія партызаны.

Кіраўнікамі партызанскага руху былі людзі рознай палітычнай арыентацыі, даводзіў А.А. Сарокін. Акрамя камуністаў у ім удзельнічалі і прадстаўнікі іншых ідэйных плыняў. Пры гэтым кідаецца ў вочы жаданне нівіляваць наяўнасць і размах прадстаўніцтва ў партызанскім руху беларускіх эсэраў. А.А. Сарокін гаворыць аб існаванні фарміраванняў, якія аб’ядноўвалі людзей розных поглядаў і перакананняў, сярод якіх найбольш заўважная роля належыла злучэнню пад кіраўніцтвам Г. Шыманюка. Пры гэтым у гісторыка “ўзніклі” цяжкасці ў выяўленні партыйнай прыналежнасці “Скамароха” (падпольная мянушка Г. Шыманюка). Гэтую відавочную супярэчнасць вырашыў сам аўтар, распавядаючы далей пра тое, што партызанскі атрад Г. Шыманюка ствараўся з удзелам эсэраў. Г. Шыманюк і яго штаб мелі сувязь з эсэрамі, а праз іх – з урадам В. Ластоўскага. Сам “Скамарох” са сваімі паплечнікамі хадзіў у Коўна, каб данесці да ведама Лігі нацый ультыматум Ю. Пілсудскаму, нават атрымаў адтуль грошы. Аднак усё гэта, на думку А.А. Сарокіна, не мяняла

характару вызваленчай барацьбы беларускага сялянства, эсэраўская ідэалогія не была дамінуючай у асяродку шэраговых байцоў нават у злучэнні Г. Шыманюка, не кажучы ўжо пра іншыя партызанскія фарміраванні. Насуперак сваім жа выказванням аўтар лічыў, што да таго, як кампартыя не ўвайшла яшчэ ў гушчу сялян, беларускім вызваленчым рухам верхаводзіла беларуская адраджэнская інтэлігенцыя. У яе асяродку, па словах аўтара, хоць і назіралася ідэйная неразбярыха, але ўсё ж пераважала эсэраўская ідэалогія. Найбольш уплывовым яе ачагом з’яўляўся эмігранцкі ўрад В. Ластоўскага, які размясціўся ў Коўне. У далейшым, пацярпеўшы ідэйны крызіс, эсэраўскія арганізацыі самараспусціліся і перасталі існаваць, канстатаваў гісторык, ігнаруючы дзейнасць адпаведных палітычных сілаў, накіраваных на ўсталяванне беларускіх незалежніцкіх дзяржаўна-палітычных каштоўнасцей.

У ліку асноўных патрабаванняў партызан А.А. Сарокін назваў толькі нацыянальныя і агульнадэмакратычныя моманты. Працягваючы практыку нівеліравання нацыянальнага кампаненту ў вызваленчым руху, аўтар не раскрываў сутнасць і мэты беларускага пытання. Разам з гэтым даследчык беспадстаўна ўводзіў у ідэалогію партызан класавыя памкненні, разумеючы штучнасць сцвярджэння стрыжнёвай ідэі марксісцка-ленінскай метадалогі на заходнебеларускай глебе і канстатуючы тое, што “патрабаванні не насілі класавага характару, беларускі народ разглядваўся як адзіны, бяскласавы”. Дэманстрацыя ідэйна вытрыманых схем і імкненне да навуковай аб’ектыўнасці атрымалі своеасаблівае перапляценне ў канцэпцыі вучонага, які ўсё ж такі даў сваё разуменне класавага характару партызанскага руху: паколькі ён быў накіраваны супраць класавага панавання польскіх капіталістаў і памешчыкаў, пастолькі ён насіў класавы характар. Аднак у ім удзельнічала не толькі ўсё сялянства, але і іншыя сацыяльныя праслойкі. З гэтага боку яго цяжка назваць класавым. Партызанамі выстаўляўся лозунг “Зямля павінна належыць тым, хто яе апрацоўвае”.

На думку аўтара, партызанскі рух меў дзве асноўныя асаблівасці. Ён адначасова з’яўляўся агульнадэмакратычным і вызваленчым. Паколькі яго рухаючымі сіламі былі масы, якія належылі розным сацыяльным праслойкам, і адной з яго мэт з’яўлялася заваяванне грамадзянскіх свабод, ён быў агульнадэмакратычны; паколькі быў накіраваны супраць панавання замежнага капіталу і ставіў сваей задачай вызваленне краю, ён быў вызваленчым. Аграрнае пытанне, лічыў А.А. Сарокін, мела ў вызваленчым руху некаторую ролю, галоўным чынам, як сродак агітацыі і мабілізацыі сіл, але аграрным рухам яго назваць нельга. Як і іншыя аўтары, даследчык звяртаў увагу на значную кіруючую ролю партызанскім рухам КПЗБ, якая з вясны 1925 года павяла лінію на згортванне партызанскага руху ў Заходняй Беларусі. Да канца 1925 года партызанскі рух у Заходняй Беларусі спыніўся, заключыў А.А. Сарокін [786, с. 19–21, 69–80].

Значнае пашырэнне праблематыка партызанскага руху атрымала на старонках даследавання М.С. Сташкевіча. У канцэптуальным плане інфармацыя аўтара адрознівалася тым, што звяртала ўвагу на значнасць дзеянняў БПС-Р па арганізацыі паўстанцкага руху. У параўнанні з А.А. Сарокіным, М.С. Сташкевіч быў больш аб’ектыўным у падачы адпаведнай інфармацыі, напрыклад, партызанскае злучэнне Г. Шыманюка аўтар адназначна назваў эсэраўскім.

У раздзеле пад красамоўнай назвай “Нацыяналістычная эміграцыя: агонія контррэвалюцыі” М.С. Сташкевіч спыніўся на пытаннях падрыхтоўкі беларускімі эсэрамі паўстання на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якое павінна было распаўсюдзіцца і на тэрыторыю БССР. Аўтар акцэнтаваў увагу на падтрымцы ўраду БНР В. Ластоўскага і ЦК БПС-Р Літвой, паведаміў пра стварэнне чатырох паўстанцкіх груп, штабы якіх знаходзіліся ў Коўна, Уцянах, Аранах і Мерачы. Для аператыўнага кіраўніцтва партызанскай дзейнасцю быў створаны “Цэнтральны беларускі паўстанцкі камітэт”. Вучоны працягнуў традыцыю негатыўнага стаўлення да “партызанскай барацьбы” БПС-Р (узята М.С. Сташкевічам у двухкоссе, якое аўтар часта прымяняў, каб, напэўна, падкрэсліць штучнасць і негатыўнасць адаведных праяваў. – *А.С.*). Ужываючы традыцыйныя фармулёўкі – “нацыяналістычны актывізм”, “авантурызм эсэраўскіх кіраўнікоў”, гісторык лічыў варожымі і беспадстаўнымі памкненні дабіцца стварэння беларускай буржуазнай дзяржаўнасці ў выглядзе БНР. М.С. Сташкевіч закрануў дзейнасць “Беларускага брацтва”. Асаблівы акцэнт быў зроблены на тым, што яно будавалася па прынцыпе масонскай ложы, што, верагодна, павінна было дадаць арганізацыі дадатковага негатыву [800, с. 267–280].

Гісторыя партызанскага руху ў Заходняй Беларусі атрымала сваё паглыбленае ўдакладненне і папулярызацыю на старонках выданняў, адрасаваных шырокаму колу чытачоў, у якіх падрабязна раскрываюцца разнастайныя аспекты дзейнасці камуністычных партызанскіх атрадаў пад кіраўніцтвам С. Ваўпшасава, К. Арлоўскага, арганізацыі падпольна-дыверсійнай працы ў Заходняй Беларусі [50; 83–85]. І хоць дакументальная аповесць І. Барысава выйшла ў 1991 годзе, калі пачынаўся новы перыяд гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі незалежнай Рэспублікі Беларусь, канцэптуальна яна відавочна з’яўляецца яскравым прыкладам савецкай гістарычнай навукі, накіраванай на ўсталяванне гераічных вобразаў партызанаў-чэкістаў.

Такім чынам, беларуская савецкая гістарыяграфія надавала пэўную ўвагу партызанскаму руху ў Заходняй Беларусі, але тэма не стала самастойным накірункам навуковага даследавання, нягледзячы на тое, што ў першай палове 1920-х гадоў ўзброеныя выступленні сталі асноўнай

формай беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Партызанскі рух большасцю даследчыкаў кваліфікаваўся як сялянскі, што з’яўляецца бачным перабольшваннем і спрашчэннем [742, с. 174]. Імкнучыся прынізіць ролю БПС-Р і іншых беларускіх арганізацый у партызанскім супраціўленні, савецкія гісторыкі падкрэслівалі першапачатковую стыхійнасць заходнебеларускай партызанкі. Вучоныя сцвярджалі, што, узнікнуўшы стыхійна, партызанскі рух імкліва ўзрастаў, асабліва пасля таго, як была створана КПЗБ, якая ўзначаліла партызанскі рух. Удзел у арганізацыі партызанскага і ўвогуле сялянскага руху беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый даследчыкі хоць і не адмаўлялі, але мінімалізавалі, адзначаючы шкоднасць заўчасных стыхійных выступленняў, да якіх штурхалі, у прыватнасці, “авантурыстычныя элементы эсэраўскага накірунка”. Дзейнасць жа партызанскіх атрадаў пад агульным камандаваннем камуністаў, якія, як вядома атрымлівалі дапамогу і падтрымку ў БССР і СССР, ідэалізавалася і атрымала высокую ацэнку.

Аднак канкрэтна-гістарычныя абставіны разгортвання ўзброенай антыпольскай барацьбы ў пачатку 1920-х гадоў былі больш значнымі, шматаспектнымі, чым гэта было адлюстравана на старонках навуковых выданняў. Відавочным было спрашчэнне гістарычных падзей, падвядзенне пад замацаваную схему: у адказ на жорсткі сацыяльны і нацыянальны ўціск беларускі народ стыхійна ўзняўся на партызанскую барацьбу супраць польскіх акупантаў, КПЗБ узначаліла яе, што прывяло да бачных поспехаў; ва ўмовах стабілізацыі капіталізму і ўзмацнення тэрору польскіх улад партызанскі рух па рашэнні партыі прышлося арганізавана спыніць. У гэтай схеме не знаходзілася дастатковага месца для праўдзівага адлюстравання лёсу ўдзельнікаў Слуцкага паўстання і злучэнняў С. Булак-Балаховіча, планаў беларускіх эсэраў адносна аб’яднання Заходняй Беларусі і БССР у выніку ўзброенага паўстання, стратэгіі і тактыкі бальшавіцка-камінтэрнаўскага кіраўніцтва ў дачыненні да партызанскага руху, жаданне праз сялянскае паўстанне рэвалюцыянізаваць Польшчу, ігнараваліся драматычныя аспекты згортвання заходнебеларускай партызанкі па загадзе маскоўскіх палітыкаў. Тым больш не магла атрымаць аб’ектыўную ацэнку дзейнасць партызанскіх атрадаў, якія фарміраваліся па лініі ДПУ, Камінтэрна на тэрыторыі БССР з наступнай перакідкай у Заходнюю Беларусь, дзеянні якіх мелі відавочна дыверсійна-разведвальны і часам відавочна тэрарыстычны характар. Аднак менавіта камандзіры гэтых адзінак падаваліся як правадыры і кіраўнікі ўзброенай “усенароднай” барацьбы. Імёны іншых яго ўдзельнікаў, не камуністаў, беларускаму чытачу амаль былі невядомыя, за выключэннем Г. Шыманюка і легендарнага Ю. Мухі-Міхальскага.

Не атрымала дастатковага асвятлення надзвычай цікавая і да сённяшняга часу цьмяная праблема як быццам бы раптоўнага ажыўлення партызанскай барацьбы ў пачатку 1930-х гадоў. У навуковай літаратуры 1960–1980-х гадоў маем згадкі пра тое, што ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу ў Заходняй Беларусі ў Навагрудскім і Віленскім ваяводствах, на Палессі і Валыні атрымаў распаўсюджванне стыхійны партызанскі рух, які меў паўстанцка-тэрарыстычныя рысы: “У гады крызісу ў выніку росту галечы і роспачы сярод сялян узмацніліся партызанскія і тэрарыстычныя настроі. …Партызанская барацьба заходнебеларускіх сялян насіла нярэдка стыхійны характар”. З тэкстаў публікацый немагчыма зразумець сувязь і ролю ў гэтых падзеях КПЗБ, якая “надавала вялікае значэнне партызанскаму руху, імкнучыся накіраваць яго ў рэчышча арганізаванай і мэтанакіраванай барацьбы з прыгнятальнікамі” [720, с. 257, 258, 270], але разам з гэтым “перасцерагала працоўных ад небяспекі заўчаснага пераходу да партызанскіх формаў барацьбы” [682, с. 198, 200]. Што гэта была за з’ява? Ці гэта сапраўды беларускія сяляне выступілі супраць сваіх “прыгнятальнікаў”, ці гэта праявілі сябе заканспіраваныя і закансерваваныя партызаны, якія ў сярэдзіне 1920-х гадоў спынілі па загадзе з Масквы “актыўную (палявую) разведку” і па новым загадзе (ці без яго?) нагадалі польскім уладам “хто гаспадар у краі” і раздувалі іскры “ўсенароднага паўстання”, якое павінна было вызваліць Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну з удзелам Чырвонай Арміі. Ці ёсць сувязь успышак партызанскіх настрояў з чарадой т. зв. сялянскіх паўстанняў 1932–1933 гадоў. Як суадносяцца гэтыя падзеі з відавочнымі праявамі савецкай дыпламатыі наладзіць адносіны з Польшчай (дамова 1932 года), прычым за кошт беларускага руху; ці звязаны падзеі гэтага шэрагу з рэпрэсіямі супраць заходнебеларускіх дзеячаў у БССР у 1933 годзе. Нельга адназначна выключыць і магчымы ўдзел у названых выступленнях прадстаўнікоў украінскага нацыянальна-вызваленчага руху, якія актывізавалі свае дзеянні, у тым ліку на Палессі, і якія маглі восенню 1939 года нагадаць пра сябе як “Палеская сеч”. У гэтым плане неабходна ўлічваць інфармацыю аб дзейнасці ў першай палове 1930-х гадоў на Ашмяншчыне “беларускай тэрарыстычнай арганізацыі” пад назвай “Наша крыўда”, якая мела кантакты з МУС Германіі і ўкраінскімі нацыяналістамі на чале з Я. Канавальцам. Арганізацыя кіравалася з Прагі і рыхтавала ўзброенае паўстанне “каб адрадзіць незалежную Беларусь” [168, с. 115–116].

Пытанняў шмат, адказы на іх можна будзе атрымаць у архівах спецслужбаў, у тым ліку савецкіх, дакументы якіх, магчыма, захоўваюцца ў Расіі і не толькі. Вядома, што КПП і КПЗБ у гэты час зыходзілі з таго, што Польшча набліжаецца да рэвалюцыі. Безумоўна, камуністы жадалі наблізіць яе, узначаліць і, захапіўшы ўладу, ажыццявіць адпаведныя

сацыялістычныя пераўтварэнні. Таму яны маглі патаемна падтрымліваць партызанскі рух і адкрыта яму спачуваць. Аднак ва ўмовах пацяплення польска-савецкіх адносін бальшавіцкае кіраўніцтва не магло адкрыта садзейнічаць распальванню рэвалюцыі. З другога боку, абвастрэнне сітуацыі на крэсах павінна было зрабіць палякаў больш падатлівымі ў іх “сяброўстве” з Масквой.

Такім чынам, гісторыя партызанскага руху ў першай палове 1920-х гадоў патрабуе манаграфічнага вывучэння, якое дасць узгодненую інтэрпрэтацыю яго ўзнікнення, развіцця і згортвання, удзелу ў “партызанцы” прадстаўнікоў нацыянальна-дэмакратычнай плыні, у тым ліку фарміраванняў, якія лічылі сябе войскамі БНР. Чакаюць сваіх даследчыкаў праблемы аднаўлення партызанскага руху ў першай палове 1930-х гадоў. Раскіданыя па розных выданнях звесткі пра палітыку савецкага і камінтэрнаўскага кіраўніцтва па арганізацыі ўзброеных антыпольскіх фарміраванняў, іх узаемадзеянні з камуністычным падполлем, фінансаванне і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, узбраенне, аналагічнага кшталту пытанні арганізацыі эсэраўска-бэнээраўскай партызанкі, яе сувязей з замежнымі прадстаўніцтвамі, літоўскімі ўладамі, кантакты з прадстаўнікамі нямецкай разведкі павінны быць зведзены ў адно даследаванне. Фрагментарна ўзгаданыя ў навуковай літаратуры лакальныя ўзброеныя сялянскія выступленні пачатку 1930-х гадоў на Палессі і Навагрудчыне патрабуюць больш пільнага даследавання.

# Глава 4
# Асноўныя накірункі гістарыяграфіі Заходняй Беларусі ў 1990–2000-я гады

## 4.1. Арганізацыйна-метадалагічнае ўдасканаленне вывучэння заходнебеларускай праблематыкі

Якасна новы перыяд развіцця беларускай гістарычнай навукі, у тым ліку заходнебеларускай гістарыяграфіі, пачаўся ў пачатку 1990-х гадоў пасля распаду СССР і ўстанаўлення незалежнасці Рэспублікі Беларусь, калі ў грамадстве адкрыта праявілася цяга да сапраўднай гісторыі Айчыны. Спачатку ў гістарычнай навуцы, у прыватнасці пры разглядзе пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі, адчуваліся цяжкасці метадалагічнага характару, звязаныя з крызісам марксісцка-ленінскай метадалогіі гісторыі, якая раней мела дамінантнае становішча як мадэль і сродак навукова-гістарычных інтэрпрэтацый [607]. Узнікла вострая неабходнасць пераадолення крызісных з'яў і выпрацоўкі новых гісторыка-метадалагічных падыходаў да асэнсавання мінулага. Да таго ж вялікая колькасць разнастайнай навуковай і навукова-папулярнай прадукцыі савецкіх часоў пра "сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне", "інтэрнацыянальнае выхаванне", "рэвалюцыйны авангард" з аднаго боку стварала ілюзорнае ўражанне пра добра вывучаную гісторыю Заходняй Беларусі, з другога – перанасыціла чытача, наводзіла сум і апатыю сваёй відавочнай тэндэнцыйнасцю, заідэалагізаванасцю, завуаляванасцю многіх пытанняў. Паступова пачала фарміравацца ўласнабеларуская мадэль мінулага, усталёўвацца нацыянальна-дзяржаўная канцэпцыя гісторыі Беларусі, якой быў характэрны свой погляд на гісторыю Бацькаўшчыны.

На дзяржаўным узроўні відавочна стала разуменне неабходнасці замацоўваць нацыянальна-дзяржаўную свядомасць беларускага народа, асабліва маладога пакалення. Таму з часу атрымання незалежнасці гісторыкі і адказныя супрацоўнікі Міністэрства адукацыі Беларусі аддавалі вялікую ўвагу выхаванню гістарычнай свядомасці ў сярэдняй і вышэйшай школе: адзначалася, што "ад школьных і ўніверсітэцкіх заняткаў па гісторыі... істотна залежыць, ці трывала замацуецца ў падрастаючых пакаленняў новая дзяржаўная свядомасць" [452, с. 51]. У.Н. Сідарцоў адзначыў, што ў гістарыяграфіі Беларусі амаль усяго XX ст. "панавалі дзве іншанацыянальныя канцэпцыі, што адмаўлялі ўрэшце самастойнасць беларускага этнасу, яго мовы і культуры", звярнуў увагу на выключную грамадска-палітычную значнасць функцыянавання незалежнай гістарычнай навукі: "...нацыянальная гістарыяграфія з'яўляецца апірышчам нацыянальнага ўсведамлення кожнага народа… айчынная

гістарычная навука аказалася здольнай да дэмантажу традыцыйных (савецкіх) пастулатаў і парадыгмаў” [759, с. 37, 39].

Адкрыццю і асваенню новых тэм даследаванняў, перагляду і пераадоленню ўсталяваных догм і стэрэатыпаў у трактоўцы айчыннай гісторыі садзейнічала развіццё гістарычнай перыёдыкі. Яна стала “палігонам і лабараторыяй” для новых гістарыяграфічных версій. У адзначаным накірунку відавочныя заслугі маюць гістарычныя часопісы “Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук”, “Спадчына” (з 1989 года), “Беларускі гістарычны часопіс” (з 1993 года), “Беларуская мінуўшчына” (з 1993 года), “Беларускі гістарычны агляд” (з 1994 года), “Гісторыя: праблемы выкладання” (з 1997 года). Заслуга гэтых часопісаў у тым, што галоўную ўвагу яны надавалі маладаследаваным і дыскусійным праблемам гісторыі Беларусі, актыўна ўводзілі ў навуковы ўжытак забытую і “рэспрэсіраваную” крыніцавую спадчыну [330, с. 156]. Гэта тычыцца і выданняў “Архівы і справаводства”, “Гістарычны альманах”, “Беларускі археаграфічны штогоднік”, “Гістарычна-археалагічны зборнік”, “ARCHE пачатак”, “Куфэрак Віленшчыны”. На старонках гістарычных часопісаў і матэрыялах канферэнцый у першай палове 1990-х гадоў былі апублікаваны метадалагічна значныя для аднаўлення зместу заходнебеларускай гістарыяграфіі артыкулы У.І. Адамушкі, У.Ф. Ладысева, Р.Р. Лазько і інш. [4–7; 411; 413; 416; 417; 426; 429; 430; 431].

Відавочным зрухам у накірунку да аб’ектыўнага асвятлення гісторыі Заходняй Беларусі характарызаваліся абагульняльныя выданні па гісторыі Беларусі: раздзел У.А. Палуяна ў “Нарысах гісторыі Беларусі”, а таксама глава Я.К. Новіка і М.А. Бобера ў вучэбным дапаможніку “Гісторыя Беларусі” [290; 625]. Метадалагічную вартасць і наватарства мелі артыкулы “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі”, у шасці тамах якой у сціслай форме набылі асвятленне важнейшыя падзеі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў [890–896].

Актывізацыя працэсу вывучэння заходнебеларускай праблематыкі адбывалася на фоне і ў выніку шпаркага росту колькасці навуковых мерапрыемстваў, у першую чаргу навуковых канферэнцый, у тым ліку міжнародных і замежных з удзелам беларускіх гісторыкаў [66, с. 9–10]. Як плённую перадумову актуалізацыі заходнебеларускай праблематыкі можна разглядваць рознага кшталту навуковыя ўзаемакантакты беларускіх і польскіх гісторыкаў па праблемах беларуска-польскіх узаемаадносін [392–395].

Значнай падставай актывізацыі навуковых даследаванняў стала пашырэнне арганізацыйна-выдавецкай дзейнасці, звязанай з выхадам рэгіянальных часопісаў, выданняў, зборнікаў гістарычнай тэматыкі, у тым ліку ў Гродна “Гарадзенскія запісы: Старонкі гісторыі і культуры”, “Краязнаўчыя запіскі”, “Наш радавод”, у Брэсце “Берасцейскі хранограф”, “Моладзь

Берасцейшчыны”. У сэнсе падрыхтоўкі кадраў гістарычнай навукі вялікае значэнне і зараз маюць зборнікі навуковых прац студэнтаў, аспірантаў, якія актыўна даследавалі беларускія архівы, удзельнічалі ў канферэнцыях маладых вучоных, рыхтавалі і абаранялі кандыдацкія дысертацыі.

Разам з гэтым, па слушным меркаванні В.І. Мянькоўскага, у 1990-я гады ўзніклі і нечаканыя праблемы, нехарактэрныя для папярэдніх перыядаў. Нягледзячы на тое, што даследаванні атрымалі большую аналітычную глыбіню, а колькасць публікацый значна павялічылася, яны былі цяжкадаступнымі для большасці спецыялістаў, а тым больш для шэраговага чытача [521, с. 92]. Гэта звужала магчымасць айчыннай гістарыяграфіі паўнавартасна ўкараняць вынікі навуковых даследаванняў і больш дасканала фарміраваць адпаведныя ідэйна-палітычныя вобразы айчыннай і заходнебеларускай гісторыі.

Актывізацыі навуковых даследаванняў гісторыі Заходняй Беларусі садзейнічала знаёмства з працамі ўдзельнікаў тагачасных падзей. Гістарыяграфія Заходняй Беларусі папоўнілася за кошт публікацый даследаванняў, мемуараў, запісаў дзённікавага характару прадстаўнікоў беларускага руху ў міжваеннай Польшчы, у прыватнасці Б. Тарашкевіча, А. Луцкевіча, А. Станкевіча, В. Пануцэвіча, В. Рагулі, Я. Найдзюка і І. Касяка, В. Жук-Грышкевіча, К. Дуж-Душэўскага, Я. Шутовіча і іншых [17; 29; 30; 62; 114; 173; 262; 288; 295; 296; 300; 301; 311; 397; 479; 480; 557; 618; 626; 688; 690; 699; 712; 717; 775; 795; 799; 822; 847; 872; 887; 897]. Названыя публікацыі паставілі новыя пытанні для навуковага вырашэння, дазволілі пазнаёміцца з альтэрнатыўным поглядам на падзеі ў Заходняй Беларусі 1920–1930-х гадоў, удакладніць наяўную інфармацыю. Публікатарская справа атрымала свой працяг у выглядзе адмысловых зборнікаў Б. Тарашкевіча, А. Луцкевіча, А. Станкевіча, Я. Станкевіча, П. Сяўрука, А. Стагановіча [15; 80; 475–478; 663; 779; 787; 793; 794; 797; 823]. Шмат для ўсталявання станоўчага вобразу дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху зрабілі З. Верас, Л. Луцкевіч і Г. Войцік, намаганнямі якіх была падрыхтавана серыя кніг пра беларускіх дзеячаў Віленшчыны “Партрэты віленчукоў” [485–487; 753].

Выклікае цікавасць зборнік дакументаў і матэрыялаў, прысвечаны У.М. Ігнатоўскаму, які меў вызначальную ролю ў арганізацыі і каардынацыі беларускага руху за мяжой, у тым ліку ў Заходняй Беларусі [8]. Значнай падставай для больш паспяховай рэканструкцыі самых разнастайных нюансаў гісторыі беларускага нацыянальнага руху, у першую чаргу міжнародных аспектаў, сталі тры тамы дакументаў і матэрыялаў знешняй палітыкі Беларусі [297–299], а таксама “Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі” [19; 20]. Інфармацыю, якая тычыцца пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху, змяшчае дакументальны зборнік пра міжваенны Брэст [55].

Важна адзначыць цікавую акалічнасць, звязаную з відавочным адставаннем у 1990-я гады айчыннай гістарыяграфіі агульнаеўрапейскай гісторыі ад расійскай гістарычнай навукі, якая яшчэ ў час перабудовы мела грунтоўныя публікацыі, прысвечаныя розным аспектам унутрыпартыйнага жыцця УКП(б), КПП, Камінтэрна, іншых пытанняў міжнароднага камуністычнага руху. Напрыклад, яшчэ ў другой палове 1980-х гадоў выйшаў артыкул Ф.І. Фірсава і І.С. Яжбароўскай, у якім на падставе новых архіўных матэрыялаў даследаваны ўзаемаадносіны КПП і Камінтэрна [841]. У 1990–2000-я гады расійская гістарыяграфія стварыла важкія падставы для даследавання заходнебеларускай праблематыкі [208; 353; 449; 677; 842]. Аналагічнага кшталту выказванні тычацца і польскай гістарычнай навукі, якая мела больш зручныя ўмовы для аб'ектыўнай інтэрпрэтацыі падзей мінулага, у тым ліку Заходняй Беларусі і беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы ў 1921–1939 гадах. Працы польскіх вучоных былі і ёсць важкай падставай для ўдасканалення беларускімі гісторыкамі падыходаў да вывучэння азначаных пытанняў [906–917; 919–934; 937–939]. Апошнім часам добрай перадумовай для пашырэння айчыннай чытальніцкай аўдыторыі польскіх даследаванняў стаў іх пераклад на беларускую мову [115; 443; 444; 529; 889].

Адставанне беларускай гістарычнай навукі можна патлумачыць цяжкасцямі як навукова-метадалагічнага, так і матэрыяльна-арганізацыйнага характару, з якімі сутыкнуліся беларускія даследчыкі ў 1990-я гады. Адсутнасць належнага фінансавання, немагчымасць ажыццяўлення навуковых камандзіровак у замежныя архівы, у тым ліку маскоўскія, стрымлівалі беларускую гістарычную навуку і разам з некаторымі іншымі фактарамі рабілі яе аўтсайдарамі па агульнаеўрапейскіх праблемах, у тым ліку звязаных з гісторыяй Камінтэрна.

Паступова з'явіліся магчымасці доступу да архіўных матэрыялаў, якія раней знаходзіліся на сакрэтным захоўванні. Гісторыкі ажыццяўлялі значную архіўна-пошукавую дзейнасць, знаёмілі з новымі архіўнымі дакументамі, прыцягвалі да іх увагу даследчыкаў [21; 111; 757]. Былі адкрыты фонды беларускіх архіваў з дакументамі ўстаноў, што існавалі ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гадах. Яны захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных архівах Брэсцкай, Гродзенскай абласцей, філіяле Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў г. Маладзечна і да 1988 года былі на закрытым захоўванні. Грыф сакрэтнасці зняты з 41 416 спраў, якія характарызуюць розныя аспекты дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і грамадскага жыцця Заходняй Беларусі [716, с. 106–107]. Значны ўклад у выяўленне, апрацоўку і публікацыю крыніц з раней закрытых фондаў архіваў, у тым ліку і архіва КДБ РБ, унеслі супрацоўнікі Беларускага навукова-даследчага інстытута

дакументазнаўства і архіўнай справы [36], у тым ліку з актыўным арганізацыйным удзелам У.М. Міхнюка [15; 80; 779].

Вялікае значэнне для актывізацыі і пашырэння праблематыкі даследаванняў мелі магчымасці атрымання навуковых грантаў, камандзіровак і стажыровак, у першую чаргу ў Польшчу, а таксама Літву і Расію для знаёмства з дакументамі архіваў і матэрыяламі, якія пачалі адкрывацца ў постсавецкі і постсацыялістычны час. Вынікам гэтага стала ўзбагачэнне крыніцазнаўчай базы дакументамі Архіва новых актаў у Варшаве, Цэнтральнага вайсковага архіва ў Рэмбертаве, Цэнтральнага архіва ўнутраных спраў і адміністрацыі ў Варшаве, Дзяржаўнага архіва ў Беластоку, архіва дыяцэзіі ў Драгічыне-над-Бугам, аддзела рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі імя Асалінскіх у Вроцлаве, архіва Яўрэйскага гістарычнага ўніверсітэта, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літвы, аддзела рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы, Расійскага цэнтра захавання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі. Так, напрыклад, аб’ектыўнасць даследавання А.М. Вабішчэвіча пацвярджаецца трывалай крыніцазнаўчай базай, выкарыстаннем самых разнастайных дакументаў беларускіх, польскіх і літоўскіх архіваў, матэрыялаў выданняў “Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej”, “Polska Macierz Szkolna”, “Przegląd Współczesny”, “Rocznik statystyczny”, “Sprawy narodowościowe” і многіх іншых. Дадзеная акалічнасць забяспечыла шматбаковы аналіз разнастайных пытанняў нацыянальна-культурнага жыцця Заходняй Беларусі [67].

Актыўнаму даследаванню беларускімі гісторыкамі падвергліся архівы Польшчы. У гэтым сэнсе неабходна адзначыць тэндэнцыю публікацыі і ўвядзення ў навуковы ўжытак дакументаў і матэрыялаў. Напрыклад, дзякуючы намаганням А.М. Чарнякевіча, А.В. Пашкевіча, А.Ф. Вашкевіча, С.М. Токця айчынная гістарыяграфія папоўнілася шэрагам выданняў дакументальнага характару [334; 464; 663; 794], а таксама некалькімі дзесяткамі грунтоўных артыкулаў [87–97; 628–645; 648–659; 867–871; 873].

На дакументах, якія захоўваюцца ў архівах Польшчы, грунтуюцца значныя становчыя зрухі крыніцазнаўчага забеспячэння. Вялікая іх частка уяўляе сабой матэрыялы польскіх спецслужб, якія карысталіся самымі разнастайнымі крыніцамі інфармацыі. Яны, натуральна, маглі прыводзіць да скажэння падзей, што адлюстроўваліся ў запісах. Кожны паліцэйскі ўчастак меў сваю агентурную сетку і спіс асоб, якіх можна было выкарыстаць. Такая праца добра аплочвалася – ад 20 да 100 злотых за адну “справаздачу”. Канфідэнты перагружалі паліцыю непатрэбнай інфармацыяй, паліцэйскае начальства крытыкавала якасць такіх справаздач, з якіх даволі цяжка было выцягнуць карысную для органаў бяспекі інфармацыю [276, с. 36]. Яскравым прыкладам гэтага з’яўляюцца апублiваныя на беларускай мове рапарты Р. Зямкевіча і “Кароткі нарыс

беларускага руху” [334; 715; 873]. Адзначым, што самі ўкладальнікі выданняў разумеюць неадназначнасць такіх крыніц [642, с. 101–102]. Трэба ўлічваць, што ў рукі даследчыкаў могуць трапіць і ўжо трапляюць дакументы – вынікі мэтанакіраваных фальсіфікацый, правакацый, падробак. Гэта тычыцца і следчых справаў, якія былі заведзены на ўдзельнікаў тагачасных падзей у Польшчы і СССР. Разам з Н.І. Стужынскай падкрэсліваючы своеасаблівасць такога кшталту архіўных крыніц, будзем памятаць, што “дакумент з’яўляецца на свет ва ўмовах няшчырасці і жадання пазбегнуць праўды. Ісціна непажадана для абодвух бакоў. У следчага – адны мэты. У падследнага – іншыя” [805, с. 236]. Акцэнтуючы ўвагу на матэрыялах судовых спраў В. Грыцкевіч слушна адзначыў, што “судовы працэс з’яўляецца спаборным. Бакі, што прымаюць у ім удзел, абазязкова нешта недагаворваюць, нешта хаваюць. Таму ацэнка верагоднасці паказанняў у працэсе патрабуе крытычных адносін да іх з боку даследчыкаў” [171, с. 72].

Выйсце з такой складанай герменеўтычнай сітуацыі бачыцца ў неабходнасці пошукавай працы ў іншых архівах, дзе могуць знаходзіцца матэрыялы, атрыбуцыя і крытыка якіх не будзе выклікаць такія цяжкасці, як, напрыклад, дакументы польскай тайнай паліцыі, якія пасля супастаўлення і параўнання з надзейнымі крыніцамі змогуць пацвердзіць ці абвергнуць інфармацыю адпаведных крыніц, узмацніць крыніцазнаўчую базу даследаванняў. Не выключана, што такога кшталту дакументы захоўваюцца ў архівах Беларусі. Гутарка ідзе не толькі аб дакументах судовых спраў у дачыненні да рэпрэсіраваных беларускіх дзеячаў, але і пра загады, пастановы, справаздачы, аналітычныя матэрыялы – тыя дакументы, на падставе якіх ажыццяўляліся дзяржаўна-палітычныя і партыйныя рашэнні адносна заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Гэта тычыцца дакументаў дзяржаўных і партыйных органаў БССР, якія, выконваючы дырэктывы і распараджэнні Масквы, прымалі пэўныя рашэнні для рэалізацыі адпаведных планаў. Таму слушна гучаць словы А.В. Пашкевіча пра тое, што “многія фонды архіваў былых камуністычных арганізацый у Мінску, Варшаве, Вільні і Маскве яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў” [659, с. 87].

Да таго, як паказала знаёмства з архівамі Рэспублікі Беларусь, у іх яшчэ ёсць шмат матэрыялаў, якія да гэтага часу не былі ўведзены ў навуковы зварот. У ДзАБВ, ДзАГВ, НАРБ на захоўванні знаходзяцца справы, якія так і не сталі аб’ектам увагі даследчыкаў! Пры гэтым гутарка ідзе пра адзінкі захавання, якія змяшчаюць дакументы па прынцыпова важных для гісторыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пытаннях, у тым ліку эканамічнай і грамадска-палітычнай сітуацыі ў краі, пазіцыях беларускіх дзеячаў, арганізацыі і фінансавання камуністычнага

руху ў Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гадоў, аргнізацыйна-фінансавых спрэчак паміж прадстаўніцтвам ЦК КПП пры Выканкаме камінтэрна і Прадстаўніцтвам ЦК КПЗБ, узаемаадносін паміж КП(б)Б і Бундам па пытаннях арганізацыі камуністычнага руху ў Польшчы, інфармацыі аб правакатарах у КПЗБ і іншыя [214; 236; 237; 247; 249; 253; 572; 576; 578; 587; 590; 592]. Так, напрыклад, у справе “Переписка секретного отдела Центрального Бюро КП(б) Белоруссии с Белостокским окружным комитетом КП(б) Белоруссии о положении в Белостоке, по персональным и другим вопросам” захоўваецца ўласнаручная запіска У.М. Ігнатоўскага памерам 2.5 см на 15 см з характэрным тэкстам: “Таварышч Канчэўскі! Прыміце падаўцу гэтага (Давідюка), як мяне самога, с поўным даверам і паттрыманьнем. Дапамагіце яму ў яго працы. С тав. прывіт. Ў. Ігнатоўскі. 1922, 10, IX” [576, арк. 54]. Такія запіскі былі характэрнай з’явай часу, перадаваліся праз нелегальныя “дарогі” ад камуністычных кіраўнікоў БССР прадстаўнікам заходнебеларускага руху разам з інструкцыямі, яўкамі, літаратурай і грашыма [79, с. 30].

Пры ўвядзенні новых крыніц у навуковы ўжытак трэба мець на ўвазе меркаванне У.І. Адамушкі, які звярнуў увагу на эмацыянальны фактар у дзейнасці даследчыкаў, іх захапленне тым, каб “як мага хутчэй выдаць наверх матэрыял, а бывае, што разабрацца ў ім, прааналізаваць як след не хапае ў спешцы часу, а можа, і жадання” [3, с. 326]. А. Бергман, маючы на ўвазе амбіцыі ўвішнага даследчыка – szperacza, гаварыла пра паспешлівасць, імкненне найхутчэй апублікаваць цікавыя звесткі, што не раз прыводзіла да распаўсюджвання “цалкам мыльнай інфармацыі”. Таму “кожны дакумент, які “szperacz” трымае ў руках, належыць параўнаць з іншымі, трэба яго зверыфікаваць. І чым больш дакумент падаецца сенсацыйным, тым больш належыць яго “prześwietlić”” [905, s. 177].

Як і ў папярэдні перыяд, найноўшая гістарыяграфія Заходняй Беларусі развівалася ў асноўным у выніку падрыхтоўкі і абароны кандыдацкіх дысертацый, першыя з якіх былі абаронены ў сярэдзіне 1990-х (А.А. Румак, А.М. Вабішчэвіч) і ў канцы 1990-х (В.В. Даніловіч і М.Б. Сямёнчык) [70; 192; 724; 817]. Названыя даследаванні адлюстроўвалі змены суадносін асобных тэматычных накірункаў гісторыі Заходняй Беларусі, звязаныя з тым, што гісторыка-партыйная тэматыка з КПЗБ у цэнтры саступіла іншым – маладаследаваным праблемам, гісторыя КПЗБ у 1990–2000-я гады на манаграфічным узроўні не вывучалася.

Важнае значэнне мелі даследаванні В.М. Гліны, М.М. Мязгі, А.М. Кротава, І.І. Трацяка, Н.А. Глушаковай [137; 152; 375; 520; 828], якія непасрэдна тычацца заходнебеларускай праблематыкі, раскрываюць вызначальныя па сваім уплыве на падзеі жыцця Заходняй Беларусі дыпламатычныя аспекты агульнаеўрапейскай гісторыі, у тым ліку

дзейнасць БНР і беларускіх эсэраў, гістарыясофскія і псіхагістарычныя, звязаныя з асэнсаваннем ментальных асаблівасцей беларусаў і палякаў, успрыняцця палякаў і Польшчы беларусамі, культурна-асветніцкую дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў. Важкімі ў метадалагічным сэнсе з'яўляюцца даследаванні Р.Р. Лазько, у якіх аргументавана доказана абумоўленасць беларускага нацыянальнага руху палітыка-дыпламатычнымі прыярытэтамі Польшчы і СССР [422; 423; 428].

Адзначаныя арганізацыйна-метадалагічныя аспекты садзейнічалі нябачнай да гэтага актывізацыі працэсу даследавання гісторыі Заходняй Беларусі, што ярка праявілася ў 2000-я гады ў выглядзе абароны дысертацый, апублікавання манаграфій, артыкулаў, матэрыялаў канферэнцый. Асабліва гэта тычыцца кандыдацкіх дысертацый, падрыхтоўка якіх стала вынікам і плёнам рэалізацыі вышэйназваных арганізацыйна-метадалагічных захадаў. Прадметам манаграфічных даследаванняў С.С. Лісоўскага, А.М. Загідуліна, В.Э. Рабышка, В.Р. Швайко, А.Т. Цымбала сталі праблемы нацыянальнага, этна-канфесійнага і этнакультурнага жыцця ў Заходняй Беларусі [275; 470; 697; 862; 880], А.М. Свірыд і Т.В. Лісоўская працягнулі даследаванне канфесійнай праблематыкі [465; 754]. Гісторыю палітычных партый на тэрыторыі Заходняй Беларусі (БХД, БІГіК, Бунд, маладзёжныя арганізацыі, польскія і яўрэйскія партыі) даследавалі Э.А. Мазько, К.С. Разуванава, А.В. Машчук, В.І. Крывуць, А.К. Гецэвіч, П.Т. Сцяцкевіч [129; 371; 498; 549; 697; 803]. Здабыткам айчыннай гістарыяграфіі сталі даследаванні парламенцкага прадстаўніцтва беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (А.В. Пашкевіч), краязнаўчага руху (І.У. Цітовіч), дзейнасці дабрачынных арганізацый (А.І. Пашковіч), мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў Заходняй Беларусі (А.І. Борка) [51; 646; 660; 860]. У выглядзе кандыдацкай дысертацыі С.М. Грэся атрымалі працяг даследаванні гісторыі аграрных пераўтварэнняў [175]. Станоўча характарызуе гістарыяграфію праблемы абарона першай з канца 1980-х гадоў доктарскай дысертацыі А.М. Вабішчэвіча [66]. Шырокая тэматычная палітра дысертацыйных даследаванняў запэўнівае ў рэалізацыі пры вывучэнні беларускага нацыянальна-вызваленчага руху антрапалагічнага падыходу, які грунтуецца на імкненні адлюстраваць пэўную эпоху на падставе яе рознабаковага асэнсавання, з улікам індывідуальных ідэйна-рэлігійных, псіхаэмацыянальных асаблівасцей.

Такім чынам, толькі ў 2000-я гады было падрыхтавана і абаронена 18 кандыдацкіх дысертацый па гісторыі Заходняй Беларусі, а з улікам дысертацый 1990-х гадоў – 22! Да гэтага трэба дадаць кандыдацкія дысертацыі А.М. Чарнякевіча, В.М. Цынкевіча і В.М. Кузьміч, якія закранаюць разнастайныя аспекты беларуска-польскіх адносін, у тым ліку

ваенна-палітычныя і палітыка-дыпламатычныя, арганізацыйна-фінансавыя бакі арганізацыі і падтрымкі камуністычнага руху [381; 865; 874], а таксама кандыдацкія працы Т.Я. Паўлавай, В.Ф. Гігіна, А.А. Райчонка, С.М. Наумук, Д.А. Мігуна, І.У. Каляды, М.В. Гудава [132; 182; 326; 522; 600; 616; 709]. Выклікае цікавасць як даследаванне прадстаўніка іншанацыянальнай постсавецкай гістарыяграфіі кандыдацкая дысертацыя ўкраінскага вучонага Г.Г. Дзядурына [203].

Пaступова бягучы перыяд развіцця заходнебеларускай гістарыя-графіі пачаў атрымліваць больш паўнавартаснае афармленне выхадам манаграфій, якіх у 1990-я было мала (А. Бергман, І.В. Палуяна, Я.А. Місарэвіча і М.Д. Каралёва ) [42; 531; 684]. У 2000-я гады апублікаваны навуковыя манаграфіі Т.А. Лугачовай, У. Конана, А.М. Вабішчэвіча, В.В. Даніловіча, В.І. Крывуця, А.К. Гецэвіча, А.М. Загідуліна, П.Т. Сцяцкевіча, А.І. Борка, У.В. Ляхоўскага [52; 60; 68; 130; 193; 272; 355; 370; 372; 473; 489; 804]. Здабыткі навуковага асэнсавання гісторыі Заходняй Беларусі былі акумуляваны і на старонках абагульняльных прац па гісторыі Беларусі [37; 135; 136; 314; 380; 418; 888]. Аднак пры гэтым трэба адзначыць, што ў заходнебеларускай гістарыяграфіі відавочна адчуваўся своеасаблівы метадалагічны крызіс, калі ў некаторых публікацыях з-за адсутнасці пераканаўчай метадалагічнай канцэпцыі даследчыкі пры напісанні сваіх прац прытрымліваліся асобных норм марксізму-ленінізму, а то і ўвогуле дэманстравалі ўсталяванае ў папярэдні перыяд канцэптуальнае бачанне адпаведных праблем [473; 531; 684].

Сведчаннем пэўнай спеласці айчыннай гістарыяграфіі праблемы трэба кваліфікаваць разважанні, якія маюць навукова-метадалагічную накіраванасць. У першую чаргу гутарка ідзе аб дыскусіі, у тым ліку на старонках часопіса “АРХЭ-Пачатак”, вакол прац М. Кобрына, якога вядомыя беларускія гісторыкі А. Пашкевіч і А. Чарнякевіч абвінавачваюць у недакладнасці, неахайнасці і плагіяце. У гэтую дыскусію ўцягнуўся і польскі гісторык Я. Мірановіч, які імкнецца заняць памяркоўную пазіцыю, дэманструе жаданне бачыць гістарыяграфічныя плюсы такіх публікацый [527; 632; 643; 644; 928].

Пэўным чынам пагаджаючыся з дыпламатычнай асцярожнасцю Я. Мірановіча, неабходна ўсё ж вітаць імкненне А. Пашкевіча і А. Чарнякевіча падтрымліваць айчынную гістарыяграфію, у тым ліку заходнебеларускую, на пэўнай вышыні. Справа ў тым, што сучасныя даследаванні маюць адзін істотны недахоп: яны грунтуюцца на недастатковай, а часам і відавочна слабой метадалагічнай і гістарыяграфічнай базе. У першую чаргу кідаецца ў вочы своеасаблівы пазітывізм даследчыкаў, якія абсалютызуюць інфармацыю архіўных дакументаў без іх належнай кваліфікаванай крытыкі. У такім выпадку

складваецца сітуацыя, якая характарызуецца схільнасцю сучасных даследчыкаў ісці ўслед за стваральнікамі гістарычных крыніц, часам тыражуючы іх відавочныя памылкі. Гэтая з'ява была шырока распаўсюджана ў савецкія часы, калі беларускія гісторыкі актыўна выкарыстоўвалі партыйныя дакументы, запаўняючы імі зададзеныя схемы.

Падставай для ажыццяўлення значнага павароту да аб'ектыўнага даследавання заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху стала перасэнсаванне і ўдакладненне пытанняў сацыяльна-эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі, імкненне больш аб'ектыўна адлюстроўваць характар і сутнасць мерапрыемстваў польскай улады. Так, напрыклад, у параўнанні з савецкім перыядам, калі аграрныя пераўтварэнні падаваліся з негатыўнымі ацэнкамі, на працягу 1990–2000-х гадоў выйшлі працы з больш узважанымі і абгрунтаванымі высновамі, якія акрамя недахопаў не выключалі і станоўчыя наступствы адпаведных мерапрыемстваў [123; 124; 126; 174–176; 178–180; 302; 303; 367; 627]. Нават адыёзны ў падачы савецкай гістарыяграфіі інстытут вайсковага і цывільнага асадніцтва атрымаў станоўчыя рысы, звязаныя з тым, што асаднікі ўнеслі значны ўклад у паляпшэнне метадаў вядзення сялянамі гаспадаркі, у павышэнне іх агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню дзякуючы адкрыццю школ, бібліятэк, народных дамоў, заснаванню тэатральных, музычных і спартыўных таварыстваў, правядзенню сярод мясцовага насельніцтва розных спаборніцтваў, конкурсаў, арганізацыі выстаў [110; 123; 627]. Да таго ж сярод асаднікаў былі прывержанцы КПЗБ і КПП, найбольшая іх колькасць была на тэрыторыі Палескага ваяводства [110, с. 235].

На мясцовым узроўні адносіны польскіх уладаў да беларускага насельніцтва, асабліва на Палессі, жыхары якога характарызаваліся ўладамі як пасіўныя ("берная маса, адносіны да палітыкі апатычныя" [210, арк. 201адв.], былі адносна памяркоўныя і ліберальныя. У некаторых мясцовасцях сяляне мелі магчымасць самастойна выбіраць месцы для заснавання сваіх хутарскіх гаспадарак, не лічылі падаткавы цяжар адчувальным, а то і ўвогуле не ведалі што гэта такое. Некаторыя рэспандэнты з настальгіяй узгадвалі жыццё за "польскім часам" з яго кірмашамі, работамі па асушэнні балотаў, за ўдзел у якіх "паны" кармілі абедам і давалі адзін злоты, аглядамі гаспадарак, коней і вазоў з выдачай пераможцам прэмій – палякі выхоўвалі ў палешуках гаспадарлівасць [284–286]. Распаўсюджанай з'явай заходнебеларускай рэчаіснасці была наяўнасць шматлікіх праектаў мясцовага ўзроўню, звязаных з будаўніцтвам дарог, рэалізацыяй меліярацыйных праектаў. Напрыклад, важным мерапрыемствам было будаўніцтва грэблі Лахва – Давыд-Гарадок, якое фінансавалася ўладамі, давала заробак многім беспрацоўным палешукам і адчувальна паляпшала эканамічнае і культурнае

“самаадчуванне краю” [39]. Аднак у гістарыяграфіі працягваюць існаваць усталяваныя раней стэрэатыпы, паводле якіх прадстаўнікі маёмасных класаў заходнебеларускага грамадства, а менавіта памешчыкі, “адрозніваліся асаблівай рэакцыйнасцю” [176, с. 39–40].

Больш аб’ектыўна айчынныя гісторыкі пачалі падыходзіць да асэнсавання сутнасці палітыкі польскай улады, у выніку чаго ўсталяваныя ў савецкай гістарыяграфіі вобразы польскай дзяржавы і дзяржаўна-палітычнага ладу (панская, буржуазна-памешчыцкая, белапанская Польшча, санацыйны фашыстоўскі ўрад і інш.) былі скарэктаваныя на падставе больш глыбокага навуковага аналізу адпаведных пытанняў. Крыніцы пацвярджаюць, што беларусы ў Польшчы карысталіся асноўнымі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі правамі, яны ўдзельнічалі ў выбарах, выбіраліся ў органы дзяржаўнага і мясцовага кіравання. Знаёмства з архіўнымі матэрыяламі дазваляе зрабіць выснову аб дастаткова значным інтэграванні ў органах самакіравання беларускага насельніцтва на мясцовым узроўні, у прыватнасці вясковым і гмінным, не кажучы ўжо пра беларускіх паслоў сейма і сенатараў. Напрыклад, прадстаўнікі карэннага насельніцтва – праваслаўныя палешукі, займалі пасады старастаў, солтысаў, падсолтысаў, стражоў-гаёвых, служылі ў войску. Беларускія сяляне мелі магчымасць набываць зямлю, мелі прыватную рухомую і нерухомую маёмасць [226–233].

На трывалым метадалагічным і крыніцазнаўчым грунце атрымалі даследаванне пытанні сацыяльна-эканамічнай і этнакультурнай палітыкі Польшчы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Адзначаючы неаднолькавае стаўленне прадстаўнікоў польскай палітыкі да вырашэння пытанняў нацыянальных меншасцей, у тым ліку беларускага, наяўнасць сярод розных польскіх груповак шэрагу адпаведных праектаў, беларускія даследчыкі канстатавалі нездольнасць і (ці) нежаданне ажыццяўляць нацыянальную палітыку ў духу міжнародных абавязкаў польскай дзяржавы і ў інтарэсах этнічных груповак. Пры ўсіх разыходжаннях адносна пазначаных праблем было адзначана імкненне польскіх кіруючых колаў ажыццявіць такія мерапрыемствы, якія б забяспечылі асіміляцыю (нацыянальную ці дзяржаўную) і паланізацыю беларусаў [59; 60; 66–70; 272– 276; 370–373; 468–470; 604; 605; 697; 698].

Так у даследаванні А.М. Вабішчэвіча знайшла адлюстраванне думка аб неаднародным стаўленні розных грамадска-палітычных сілаў Польшчы да праблем дзяржаўнага будаўніцтва і вырашэння пытанняў нацыянальных меншасцей. Гэта было вынікам супярэчнасцей, якія ўзніклі ўжо ў пачатку 1920-х гадоў паміж узятымі Польшчай міжнародна-дагаварнымі абавязкамі, канстытуцыйнымі гарантыямі і рэальнымі працэсамі аднаўлення і станаўлення дзяржаўнасці Польшчы, якія выяўляліся ў двух асноўных

канцэпцыях дзяржаўнага ўладкавання – інкарпарацыйнай і федэралістычнай (федэрацыйнай). Праведзены даследчыкам аналіз праграмных палажэнняў і рэальнай практыкі вядучых польскіх палітычных сіл у 1921–1939 гадах дазволіў вылучыць асноўныя праекты вырашэння нацыянальна-культурных праблем Заходняй Беларусі: нацыянальна-дэмакратычны, кансерватыўны, ліберальна-дэмакратычны, камуністычны. Пры гэтым, як слушна адзначыў А.М. Вабішчэвіч, ва ўмовах фактычнага раздваення польскай грамадскай свядомасці, калі разам з дэмакратызмам, юрыдычным прызнаннем правоў няпольскага насельніцтва выразнымі сталі вялікадзяржаўны шавінізм і нацыяналістычнае разуменне рэчаіснасці, склаліся сацыяльна-псіхалагічныя перадумовы для практычнага прымянення менавіта нацыянальна-дэмакратычнага праекта. Паланізацыя як працэс пашырэння польскай культуры мела прымусовыя формы [67, с. 45–51].

Адсутнасць уніфікаваных і дзяржаўна прынятых падыходаў да выпрацоўкі і правядзення нацыянальнай палітыкі ўскладнялася цяжкасцямі кадравага забеспячэння. Польскія чыноўнікі, нават прадстаўнікі сілавых органаў, у тым ліку службоўцы дэфензівы і дзяржаўнай паліцыі, часта дэманстравалі разбэшчанасць і сквапнасць, выкарыстоўвалі службовыя паўнамоцтвы для забеспячэння сваіх матэрыяльных выгод, дапускалі фінансавыя злоўжыванні, бралі хабар за вызваленне бальшавіцкіх агентаў, дэманстравалі неахайнасць у вядзенні службовай дакументацыі [209, арк. 60, 93, 98–100; 210, арк. 72; 211, арк. 94; 219, арк. 11, 48, 55]. Чыноўнікі рознага ўзроўню на падставе ўяўленняў, дэтэрмінаваных прыналежнасцю да той ці іншай палітычнай групоўкі, а часам і асабістых памкненняў, на месцах скажалі прадэклараваныя дзяржаўнымі органамі падыходы. Прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі бачылі непаслядоўнасць дзеянняў цэнтральнай улады ў нацыянальным пытанні, назіралі частую змену ўрадаў, міністраў і асоб, што выпрацоўвалі нацыянальную палітыку, таму адчувалі сваю беспакаранасць і ўсёдазволенасць. Яны былі фактычна і аўтарамі, і выканаўцамі этнаканфесіянальнай палітыкі Польшчы ў Заходняй Беларусі [276, с. 37–38]. Такога характару стаўленне ў дачыненні да беларускага пытання дэманстравалі і польскія ваенна-палітычныя службы, якія дзейнічалі на тэрыторыі беларускіх ваяводстваў, – ваенная контрвыведка (двуйка) і дзяржаўная паліцыя, першая з якіх імкнулася выкарыстаць беларускі фактар, другая ж бачыла ў ім небяспеку польскай дзяржаве [871, с. 47–48].

Аднак, улічваючы пашырэнне і ўдасканаленне аб'ектыўнага поля даследавання заходнебеларускай праблематыкі, трэба канстатаваць нявырашанасць аднаго з асноўных пытанняў гістарыяграфіі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў – вызначэння плошчы тэрыторыі і колькасці насельніцтва Заходняй Беларусі. Складанасць гістарыяграфічнай сітуацыі

заключаецца ў тым, што ў некаторых публікацыях, як і ў савецкія часы, канстатацыя адпаведных пытанняў адбываецца на прыкладзе асобных ваяводстваў ці паветаў Заходняй Беларусі з наступных пераносам атрыманых высноў на астатнюю тэрыторыю. Гэта, безумоўна, не садзейнічае ўсталяванню аб'ектыўна абгрунтаваных высноў. Айчынныя савецкія і сучасныя даследчыкі не ставіліся з неабходнай увагай і дакладнасцю да гэтай праблемы [363, 523, 524, 541, 733, 741; 889]. Яскравым прыкладам няўзгодненасці адносна акрэсленых пытанняў з'яўляецца інфармацыя Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, у адным томе якой у артыкуле, прысвечаным грамадзянскай вайне і ваеннай інтэрвенцыі, плошча беларускай тэрыторыі, якая адышла да Польшчы, са спасылкай на артыкул па Заходняй Беларусі, пададзена 108 тыс. км², у самім жа артыкуле пра Заходнюю Беларусь названа плошча ў 113 тыс. км² [892, с. 110, 421]. Праблема ўскладняецца тым, што крыніцамі для правядзення падлікаў былі тэндэнцыйныя агульнапольскія перапісы 1921 года і 1931 года, а таксама матэрыялы ўсерасійскага перапісу 1897 года, перапісу 1919 года па Сярэдняй Літве. У 1990–2000-я гады пад уплывам польскіх даследчыкаў, якія выказваліся адносна штучнага перабольшвання названых паказчыкаў, беларускія гісторыкі пачалі ўдакладняць адпаведныя паказчыкі ў бок памяншэння, што яшчэ больш ускладніла пытанне. У прыватнасці, У.Ф. Ладысеў, а ўслед за ім некаторыя іншыя як аўтарытэтныя паўтаралі дадзеныя "беларускага даследчыка" Р. Паўстынскага, які ў першай палове 1920-х гадоў у працы "Статыстыка Заходняй Беларусі" падаў плошчу Заходняй Беларусі ў 98 815 км² і насельніцтва ў 3 171 тыс. чал. (колькасць беларусаў, праваслаўных і каталікоў, – 2 371 766 чал.) [562, арк. 61–75; 585, арк. 6–7]. Але Р. Паўстынскі не ўлічваў насельніцтва Аўгустоўскага, Сувалкаўскага і Высока-Мазавецкага паветаў, таму тэрыторыю Заходняй Беларусі трэба "павялічваць", як і колькасць беларускага насельніцтва. Таму меркаванні аб плошчы Заходняй Беларусі каля 113 тыс. км² і насельніцтве ў 4,6 млн. чал. на 1931 год, выказаныя ў абагульняльнай працы па гісторыі КПЗБ, работах І.В. Палуяна, У.А. Палуяна і І.П. Хаўратовіча, бачацца справядлівымі і могуць быць навукова пацверджаны [624, с. 214; 682, с. 16; 684, с. 3; 720, с. 17; 892, с. 421]. Аднак У.Ф. Ладысеў схільны дадзеныя Р. Паўстынскага па колькасці беларусаў змяншаць да прыкладна 2 млн. чал., прычым без уліку прыблізна 500 тыс. бежанцаў, якія вярнуліся на радзіму да 1 ліпеня 1924 года [412, с. 166; 418, с. 164]. Меркаванні В.Э. Рабышкі, якія падаюцца як "вынікі навейшых даследаванняў айчынных вучоных па гэтай праблематыцы" [67, с. 43], не садзейнічаюць, аднак, устанаўленню ўзгодненых лічбаў. У дачыненні да колькасці беларускага насельніцтва даследчыца палічыла магчымым вывесці сярэднія арыфметычныя паказчыкі па 1920-х гадах – "ад 50 да 80 % у розных паветах, а ў сярэднім 61,5 %

(2 326,4 тыс. чал.), а ў 30-я гады – 2 116, 1 тыс. чал. (52,8 % ад усёй колькасці насельніцтва). Адносна тэрыторыі Заходняй Беларусі, прыняўшы “да аналізу” паказчыкі Р. Паўстынскага – 98 815 км², В.Э. Рабышка выказалася аб тым, што адпаведная плошча амаль супадае з тэрыторыяй у 113 тыс. км², але падала лічбу ў 101 тыс. км², у чарговы раз заблытваючы важнае пытанне [698, с. 4, 66, 81, 97]. Таму праблема тэрыторыі і насельніцтва Заходняй Беларусі мае выключнае метадалагічнае значэнне і патрабуе скрупулёзнага манаграфічнага даследавання беларускімі гісторыкамі. Пры гэтым за аснову вызначэння тэрыторыі Заходняй Беларусі трэба браць адпаведную беларускую этнічную тэрыторыю, якая гістарычна сфарміравалася да пачатку І сусветнай вайны. Разам з перапісамі 1897, 1919, 1921, 1931 гадоў, статыстычнымі дадзенымі 1939 года неабходна ўлічваць іншыя матэрыялы, напрыклад, выяўленыя аўтарам у Нацыянальнам гістарычным архіве Беларусі ў Мінску карткі суцэльнага абследвання гаспадарак сялянскага тыпу, якія былі складзены ў ходзе Усерасійскага сельскагаспадарчага перапісу 1916 года, які быў праведзены на неакупаванай германскімі войскамі тэрыторыі Беларусі. Некаторыя адзінкі захоўвання (Ф. 325. Воп. 2. Спр. 397. Карточки сплошного обследования хозяйств крестьянского типа Погост-Загородской волости, Пинского уезда за 1916 год) утрымліваюць карткі, якія, акрамя звестак за 1915 год і 1916 год. аб складзе сям’і, спажыванні солі, цукру, памеры зямельнага надзелу, катэгорыі глебы, колькасці хатняй жывёлы, пасевах і памеры розных культур, колькасці фуражу, змяшчаюць інфармацыю аб сацыяльным стане і нацыянальнальнасці гаспадара – землеўладальніка.

Такім чынам, айчынная гістарыяграфія Заходняй Беларусі, нацыянальна-вызваленчага руху атрымала вырашальнае ўздзеянне ў выніку трансфармацый грамадска-палітычнага жыцця ў пачатку 1990-х гадоў. Незалежнасць Рэспублікі Беларусь з’явілася вырашальнай падзеяй, якая ажывіла нацыянальную гістарыяграфію, адкрываючы доступ да дакументаў сакрэтнага захоўвання, лібералізавала архіўнае справаводства, стымулявала пераасэнсаванне і ўдакладненне гісторыі заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху, рэабілітацыю і вяртанне ў яе нацыянальных дзеячаў. Даследаванні бягучага перыяду карэнным чынам змянілі навуковае бачанне сацыяльна-эканамічных і дзяржаўна-прававых працэсаў, якія адбываліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі, і былі падставай для незадаволенасці заходнебеларускага насельніцтва польскай палітыкай і фонам, на якім адбываўся беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Гэта значным чынам абумоўлівала пазіцыі даследчыкаў і іх ацэнкі ў асэнсаванні адпаведных пытанняў.

## 4.2. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў айчынных даследаваннях 1990–2000-х гадоў

На працягу больш чым дваццаці апошніх гадоў айчынная гістарычная навука прадэманстравала заўважны паварот да стварэння аб'ектыўнай гісторыі Заходняй Беларусі, нацыянальна-вызваленчага руху. Аднаўленне і пашырэнне прадмета заходнебеларускай праблематыкі можна назіраць на прыкладзе даследаванняў А.М. Вабішчэвіча, А.Ф. Вашкевіча, В.В. Даніловіча, А.М. Загідуліна, У.Ф. Ладысева, Р.Р. Лазько, Т.В. Лісоўскай, Э.А. Мазько, А.В. Пашкевіча, А.І. Пашковіч, А.А. Румака, М.Б. Сямёнчыка, А.Г. Цымбала, А.М. Чарнякевіча і іншых аўтараў. Так, напрыклад, у кандыдацкай і доктарскай дысертацыях і апублікаваных больш чым 120 працах А.М. Вабішчэвіча [67, с. 284–297] атрымалі адлюстраванне стан і праблемы развіцця і захавання беларускіх нацыянальна-культурных каштоўнасцей у Заходняй Беларусі на фоне складаных трансфармацый сацыяльна-эканамічнага і палітыка-прававога характару. Культурна-асветніцкія пытанні, барацьба за школу на роднай мове, паводле меркавання даследчыка, былі ў якасці найважнейшых перадумоў і асноўных накірункаў нацыянальна-вызваленчага руху. Аўтар пазначыў асноўныя фактары, якія вызначалі формы і змест барацьбы за беларускую школу, палітыку польскіх уладаў у галіне асветы, колькасныя і якасныя паказчыкі ажыццяўлення беларусізацыі культурна-асветніцкага жыцця. У гэтым кантэксце даследчык паказаў дзейнасць беларускіх палітычных партый і арганізацый рознай скіраванасці, якія адстойвалі культурна-асветніцкія інтарэсы беларускага народа ці актыўна выкарыстоўвалі адпаведныя лозунгі, у першую чаргу Беларускага пасольскага клубу, КПЗБ, БХД, БіГіК і інш., іх уздзеянне на культурна-асветніцкі рух, барацьбу за школу на роднай мове, пытанні супрацоўніцтва паміж беларускімі нацыянальна-дэмакратычнымі арганізацыямі. Асаблівую ўвагу звярнуў аўтар на Таварыства беларускай школы, у тым ліку на першыя гады яго існавання, акцэнтуючы ўвагу пры гэтым на цяжкасці арганізацыйнага характару, звязаныя з супрацьдзеяннем у справе арганізацыі беларускай асветы польскіх уладаў шляхам стварэння паланафільскіх палітычных і культурных арганізацый [77].

А.М. Вабішчэвіч адлюстраваў адмоўныя па сваім уплыве на развіццё ТБШ і ўвогуле руху за беларускую асвету і культуру наступствы палітычных спрэчак, якія мелі месца паміж леварадыкальным крылом, прадстаўленым КПЗБ, і нацыянальна-дэмакратычнымі дзеячамі – А. Луцкевіч, Р. Астроўскі, Я. Шнаркевіч і інш. Гаворачы пра палітызацыю кампартыяй ТБШ у канцы 1920-х гадоў, наклейванне камуністамі ярлыкоў "нацыянал-фашысты" на беларускую дэмакратычную інтэлігенцыю, аўтар

адзначыў, што гэта ўсё аслабляла беларускі нацыянальна-культурны рух, было на руку польскім уладам, якія выкарыстоўвалі сітуацыю для звужэння магчымасцей беларускіх дзеячаў плённа працаваць на ніве беларускай асветы і культуры [76].

Навуковыя напрацоўкі А.М. Вабішчэвіча былі акумуляваны на старонках двух манаграфій, якія сталі значнай з’явай беларускай гістарыяграфіі пачатку 2000-х гадоў [60; 68]. Першая з іх падрыхтавана на падставе кандыдацкай дысертацыі, у якасці прадмета даследавання мае стан і праблемы нацыянальнай беларускай адукацыі ў Заходняй Беларусі ў акрэслены час, таму відавочны дысананс з заяўленай назвай кнігі. Гэтая супярэчнасць у духу паліткарэктнасці была пераадолена аўтарам у манаграфіі 2008 года, А.М. Вабішчэвіч зрабіў важнае ўдакладненне метадалагічнага характару, звязанае са сцверджаннем Заходняй Беларусі як поліэтнічнага абшару, на якім, хоць і колькасна пераважаў беларускі народ, з рознай актыўнасцю і поспехам развівалі свае культуры прадстаўнікі некалькіх этнасаў: палякі, яўрэі, украінцы, літоўцы, татары. Справядлівасць гэтага меркавання відавочная, яна падкрэсліваецца і на старонках публікацый, якія прысвечаны, у прыватнасці, палітычнаму ўзаемадзеянню беларускіх палітыкаў у час выбараў у сейм, сеймавай і пазасеймавай дзейнасці з дзеячамі іншых этнасаў Заходняй Беларусі [635; 637; 639; 650; 651].

У дачыненні да грамадска-палітычнай гісторыі неабходна адзначыць своеасаблівую гістарычую рэабілітацыю, якая адбылася на працягу 1990–2000-х гадоў у адносінах да заходнебеларускіх палітыкаў і арганізацый. Прыведзеныя вышэй сцвярджэнні савецкіх гісторыкаў аб нікчэмнасці беларускіх дзеячаў, іх здрадзе інтарэсам працоўнага народа былі адкінуты сучаснымі даследчыкамі. “Азнаямленне з прамовамі паслоў і сенатараў з Беларускага пасольскага клубу пасля падзелу і аналіз пададзеных імі інтэрпеляцый поўнасцю разбурае гэтыя сцверджанні”, – слушна выказаўся А.В. Пашкевіч [634, с. 239], маючы на ўвазе беспадстаўнасць негатыўных ацэнак беларускіх паслоў нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі грамадоўскай прэсай, якая ў значнай ступені выдавалася з дапамогай атрыманых з Савецкай Беларусі сродкаў, і савецкай гістарыяграфіяй. Больш таго, нягледзячы на вядомыя разыходжанні, у першыя месяцы існавання двух беларускіх фракцый паміж іх членамі не даходзіла да вялікіх ідэалагічных дыскусіяў, таму іх у гэты час можна ацэньваць хутчэй не як праціўнікаў, а як саюзнікаў [647, с. 60]. Відавочна, што дыферанцыяцыя беларускага руху адбывалася не столькі з-за амбіцый яго правадыроў, якія мелі месца, але і ў выніку разнастайнага ўплыву на іх прадстаўнікоў польскай, савецкай, літоўскай палітыкі і інш., якія рознымі шляхамі, пад розным прыкрыццём уваходзілі ў кантакты з

беларускімі дзеячамі, парушаючы іх адзінства. Красамоўным прыкладам такіх уплываў з’яўляецца гісторыя БСРГ, разгром якой стаў, у тым ліку, і вынікам эскалацыі ваяўнічасці яе пракамуністычных кіраўнікоў і іх павадыроў з КПЗБ, а таксама прадстаўнікоў правых польскіх палітычных колаў, напужаных ростам грамадоўскіх уплываў [430; 462].

Відавочным імкненнем да аб’ектыўнага адлюстравання гісторыі беларускага прадстаўніцтва ў польскім сейме характарызуюцца даследаванні В.В. Даніловіча і А.В. Пашкевіча. На падставе шырокага кола крыніц, з улікам разнастайных гістарыяграфічных меркаванняў, а таксама пазіцый удзельнікаў грамадска-палітычнага працэсу Заходняй Беларусі даследчыкі здолелі стварыць пераканаўчыя вобразы ўдзелу беларускіх прадстаўнікоў у парламенцкім жыцці, ва ўзаемадзеянні і ў апазіцыі да розных дзяржаўных і іншанацыянальных палітычных груповак. Важнай аклічнасцю названых даследаванняў з’яўляецца паспяхова рэалізаванае імкненне адлюстраваць і патлумачыць, апрача іншага, міжасабовыя і міжпартыйныя спрэчкі беларускіх дзеячаў, якія ў складаных умовах супраціўляліся знішчальнаму для беларускага руху ўплыву чужых сілаў. У прыватнасці, В.В. Даніловіч звярнуў увагу на неаднароднасць складу сябраў “Змагання”, сярод якіх існавала незадаволенасць навязаным звонку прыярытэтам сацыяльна-класавых мэт над нацыянальна-вызваленчымі. Даследчык рэканструяваў вобраз “Змагання” як партыі, якая пад сабой мела трывалы ідэйна-палітычны грунт у выглядзе спадчыны Грамады, памяць аб якой аб’ядноўвала вакол відавочна пракамуністычнай арганізацыі найбольш свядомыя нацыянальна арыентаваныя сілы. Пры гэтым аўтар адзначыў характэрны стыль адносін да “Змагання” з боку кампартыі, якая задавала тон усім дзеянням левых радыкалаў, прытрымлівалася жорсткага ізаляцыянізму ў адносінах да ўлад: нават рашэнне пасольскага клубу “Змаганне” накіраваць уладам ад імя ТБШ мемарыял-пратэст кваліфікавалася як ледзьве не супрацоўніцтва з дыктатурай Пілсудскага [194, с. 67–68, 99]. На дзейнасць беларускага прадстаўніцтва ў польскім парламенце значны ўплыў аказалі знешнія фактары, пераканаўча сцвярджае А.В. Пашкевіч. Галоўным з іх была ўнутраная і замежная палітыка, якую ажыццяўлялі камуністычныя ўлады суседняга СССР. Менавіта пад уплывам камуністаў у чэрвені 1925 года адбыўся падзел БПК, пасля чаго беларускае парламенцкае прадстаўніцтва перастала існаваць як інстытут, што аб’ядноўваў заходнебеларускі нацыянальны рух. Аднак, акрамя шчыльных кантактаў левааарыентаваных беларускіх палітыкаў з камуністычнымі дзеячамі, беларускія паслы ў час арганізацыі сеймавых кампаній шчыльна ўзаемадзейнічалі з прадстаўнікамі іншаэтнічных палітычных сілаў, дзякуючы чаму атрымалі відавочныя поспехі ў легальнай палітычнай дзейнасці [647, с. 38–39, 42].

Важнай прыкметай вывучэння гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў 1990–2000-я гады была яго персаніфікацыя, якая на падставе новых метадалагічных падыходаў дазволіла пашырыць гістарычную рэтраспек-тыву за кошт асэнсавання індывідуальных духоўных, ідэйна-палітычных аспектаў. Навуковы аналіз узаемаадносін удзельнікаў грамадска-палітычных працэсаў, адносін з афіцыйнымі ўрадавымі і праўрадавымі арганізацыямі, стаўлення да разнастайных дзяржаўных мерапрыемстваў, дыскусій па разнастайных пытаннях палітычнай дзейнасці, асэнсаванне ўплыву на беларускіх дзеячаў на падставе адпаведных ідэалагічных і сацыяльна-эканамічных дактрын, вырашэння фінансава-матэрыяльных пытанняў дазволілі своеасаблівым чынам “ажывіць” гісторыю Заходняй Беларусі. У такім асвятленні сталі больш абгрунтаванымі высновы і зразумелымі паводзіны і ўчынкі актыўных удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху. І гэта тычылася не толькі “дазволеных” у савецкія часы біяграфій дзеячаў такіх, як Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхаўлоўскі, І. Дварчанін, С. Прытыцкі і іншых [4; 5; 7; 32; 42; 313; 413; 695; 861], але і тых, дзейнасць якіх не ўпісвалася ва ўсталяваныя дагматы, стараннымі намаганнямі савецкіх гісторыкаў заціраліся ў тлум мінулага – А. Луцкевіча, А. Станкевіча, В. Гадлеўскага, Р. Скірмунта, В. Багдановіча, А. Уласава і іншых асоб [92; 93; 97; 171; 172; 306–309; 354–357; 398; 399; 463; 485–487; 490; 608; 628; 629; 631; 653; 659; 717; 760–774; 775; 872; 876]. Гэтыя і іншыя палітыкі савецкімі гісторыкамі фактычна былі выключаны з гісторыі беларускага руху, а некаторыя, як, напрыклад, С. Булак-Балаховіч, які ў пачатку 1920-х гадоў з’яўляўся бадай што ключавой фігурай беларускай ваенна-палітычнай іерархіі ў Заходняй Беларусі, і сёння маюць супярэчлівую ацэнку ў сувязі з правядзеннем антысавецкай дзейнасці, у тым ліку звязанай з арганізацыяй вайсковых фарміраванняў супраць пракамуністычных партызанскіх атрадаў [721; 802; 871; 904]. На неабходнасць аб’ектыўнага даследавання асобы С. Булак-Балаховіча звяртаў увагу А. Грыцкевіч [170, с. 93–97]. Архіўныя матэрыялы даюць падставы меркаваць аб арганізаванай супраць С. Булак-Балаховіча аператыўна-агітацыйнай кампаніі па яго ўсемагчымым ачарненні. У рапартах дэфензівы маецца інфармацыя пра мэтанакіраваную дыскрэдытацыю С. Булак-Балаховіча, якая адбывалася ў выніку таго, што “банды, грацуёнцыя ў пасе надгранічным, падаюцца як арганізаваныя Балаховічам паўстанцкія аддзелы, якія змагаюцца з бальшавіцкімі”. У выніку гэтага ваенна-палітычнага супрацьстаяння асобныя рэгёны падвяргаліся нападам, рабаўніцтву, жыхары былі стэрарызаваны [211, арк. 156].

Недабразычлівыя адносіны ў дачыненні да дзеячаў, якія першапачаткова дэманстравалі незалежныя ад савецка-бальшавіцкіх структур погляды і адстойвалі асноўныя ідэі беларускай дзяржаўнасці, рэалізаваныя сёння ў выглядзе Рэспублікі Беларусь, маюцца і ў пачатку

XXI ст. Пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца праявы неабгрунтаванага скептыцызму да дзейнасці беларускіх нацыянальна-дэмакратычных дзеячаў. Разважаючы аб "змене арыенціраў беларускай палітычнай эміграцыі" ў кантэксце разважанняў пра эвалюцыю БСДП і Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, П. Валошына, П. Мятлы, В.Ф. Гігін кваліфікаваў названых палітыкаў як апазіцыю кампартыі [131, № 3, с. 45–46]. Па-першае, наўрад ці яны лічылі сябе эмігрантамі і, жывучы ў Беларусі, хоць і Заходняй, імі не былі. Па-другое, адназначнае прыпісванне "беларускай апазіцыі" жадання канкурыраваць з кампартыяй бачыцца беспадстаўным. Згадаем тут тэорыю двухкарэннасці і КП(б)Б і КПЗБ, якая мела месца ў беларускай савецкай гістарыяграфіі 1920-х гадоў, дарэчы даследчык закранае гэтыя пытанні. На тэрыторыі Заходняй Беларусі вядомы шматлікія прыклады супрацоўніцтва дэмакратаў і сацыялістаў з кампартыяй. У сярэдзіне 1920-х гадоў беларускія палітычныя сілы ў Польшчы, і не толькі, каардынаваліся функцыянерамі з БССР і ў большых ці меншых памерах знаходзіліся ва ўзаемакантактах з "камуністычным цэнтрам" – КП(б)Б [298, с. 158, 159, 160, 176, 177, 187]. Б. Тарашкевіч ва ўспамінах узгадваў пра тое, што беларускія дзеячы (Рак-Міхайлоўскі, Рагуля, Кахановіч, Мятла і Валошын) ужо на працягу 1923 года наведвалі савецкае паўнамоцнае прадстаўніцтва ў Варшаве. Сам палітык гаварыў аб сваім супрацоўніцтве з камуністамі наступнае: "…з партыяй і пад кіраўніцтвам яе я стаў працаваць з вясны 1924 году" [29, № 5, С. 132–133]. Пра трывалыя сувязі іншых дзеячаў з прадстаўнікамі БССР паведамляў Р. Зямкевіч у сваіх рапартах "двуйцы": "Ярэміч хоча любой цаной зваліць Луцкевіча. Ён мае поўны давер Менска. Ярэміч за савецкія грошы выдае "Вольны сьцяг", у якім аплёўваюцца польскія парадкі, затое хваляцца савецкія парадкі і свабода. Ярэміч цяпер у беларускім руху – самая небяспечная гадзіна" [873]. Не можа быць падтрымана і жаданне прынізіць палітыка-дыпламатычны статус і ролю ўрадаў БНР, якія падаюцца ў двухкоссі, падкрэсліць яе варожасць у дачыненні да БССР. Наадварот, уважліва аналізуючы дакументы 1920-х гадоў, якія тычацца шматпланавых і шматаспектных узаемадачыненняў БНР і БССР, можна зрабіць лагічную выснову аб своеасаблівай рэабілітацыі і шмат у чым станоўчым успрыняцці БНР і яе структураў у партыйна-дзяржаўным асяродку Савецкай Беларусі. Складанасці ж ідэйна-палітычнага выбару, матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйна-фінансавага характару якраз і падкрэсліваюць станоўчыя, стваральныя справы дзеячаў БНР. Сёння наўрад ці хтосьці будзе аспрэчваць думку аб тым, што поспехі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва БССР, у тым ліку і ўзбуйненні тэрыторыі, у значнай ступені абумоўліваліся прынцыповай пазіцыяй і актыўнай дзейнасцю прадстаўнікоў "беларускай нацыянальна-дэмакратычнай апазіцыі". Тым больш немагчыма пагадзіцца з аўтарскім

імкненнем адрадзіць у змененым выглядзе ўсталяваны яшчэ ў 1920-я гады тэзіс аб палітычным банкруцтве і нікчэмнасці "белбурнацаў": "Ідэалогія нацыянал-дэмакратаў была адарвана ад светапогляду большасці беларускага народа: прэваліраванне нацыянальных патрабаванняў над сацыяльнымі не мела актуальнасці, ва ўсялякім выпадку, для Цэнтральнай і Усходняй Беларусі" [131, № 4, с. 58].

Спагадлівыя ўзаемаадносіны з беларускімі дзеячамі мэтанакіравана гадаваліся прадстаўнікамі савецкай улады рознага ўзроўню. У гэтым сэнсе метадалагічную значнасць маюць звесткі пра падзеі, якія дапамагаюць высветліць матывацыю і паводзіны прадстаўнікоў савецкай дыпламатыі, у тым ліку паўнамоцных прадстаўнікоў у Польшчы, у дачыненні да беларускага руху, у прыватнасці інфармацыя Р.Р. Лазько і М.М. Мезгі аб стаўленні савецкага кіраўніцтва да беларускага пытання ў Польшчы. Зафіксавана зацікаўленасць савецкага боку аслабленнем Польшчы на яе ўсходніх ускраінах, пагаршэннем беларуска-польскіх адносін, прадпрымаліся захады арганізацыйнага характару, накіраваныя на падтрымку антыпольскіх груп у Заходняй Беларусі. Напрыклад, "Войкаў прасіў тэрмінова павялічыць матэрыяльную дапамогу менавіта радыкальным нацыянальным элементам на гэтай тэрыторыі. У той жа час савецкае кіраўніцтва прыкладала актыўныя намаганні, каб не дапусціць стварэння і ўмацавання нацыянальных аб'яднанняў, гатовых да супрацоўніцтва з польскім урадам" [519, с. 31]. Адзначым, што грэблівыя фармулёўкі ў дачыненні да беларускіх дзеячаў ("беларускія нацыянал-фашысты", "згоднікі" і інш.), а таксама звесткі аб безумоўным фінансаванні польскай уладай беларускіх арганізацый, непадкантрольных КПЗБ, былі народжаны савецкімі дыпламатамі, якія курыравалі беларускае пытанне ў Польшчы, і партыйнымі функцыянерамі [564, арк. 56адв–57; 569]. Пазней гэтая інфармацыя шырока ўжывалася савецкімі гісторыкамі для сцвярджэння думкі аб неахайнасці і амаральнасці "белбурнацаў". "Праз Польшчу з Масквы на Берлін ляжаў галоўны напрамак сусветнай рэвалюцыі, на думку кіраўніцтва УКП(б)", – лічыў Р.Р. Лазько, гаворачы пра спробы савецкага кіраўніцтва рэалізаваць тактыку Камінтэрна "распароць цяперашнюю польскую дзяржаву па нацыянальных швах" пры дапамозе масавага сялянскага руху і Грамады [430, с. 48]. У выніку прымянення такога кшталту "рэцэптаў" беларускае пытанне рабілася сродкам уздзеяння, дыпламатычнай картай, пры дапамозе і за кошт якой адбывалася ўладкаванне савецка-польскіх адносін [428, с. 53, 202].

Спажывецкія адносіны праваднікоў бальшавіцкай палітыкі ў Заходняй Беларусі пацвярджаюцца архіўнымі матэрыяламі. Так, яшчэ ў канцы верасня 1922 года ў час парламенцкай кампаніі партыйны функцыянер у лісце з Заходняй Беларусі, магчыма да У.М. Ігнатоўскага, паведамляў

цікавую інфармацыю. Паводле яе, аўтар карэспандэнцыі выкарыстаў адзін з лістоў адрасата на імя Т. і Р. (магчыма, Тарашкевіча і Рагулі. – *А.С.*) і асабіста з імі размаўляў, адзначыў, што яны вельмі згаворлівыя, “маюць цягу да вас, але баяцца рэпрэсій. Я іх супакоіў. …пакуль цяжка сказаць, што з імі можна зрабіць. Маё меркаванне: іх знішчаць не ў нашых інтарэсах. Як бы гэта ні было яны – апазіцыя. У два месяцы іх не апрацуеш, адзінае, што можна зрабіць 3-5 уцягнуць да нас, а астатнія стануць абывацелямі. …Кланяйцеся Аляксандру Рыгоравічу (Магчыма, А.Р. Чарвякову. – *А.С.*)”. Не менш паказальным з’яўляецца змест яшчэ аднаго ліста ад 14.12.1922. У ім аўтар, аналізуючы вынікі выбараў у польскі парламент, у дачыненні да беларусаў выказаўся так, што яны “правялі каля 14. У большасці сваёй бясцветныя твары. Будуць марыянеткамі ў руках Луцк… (Антона Луцкевіча. – А.С.). Некаторых з іх можна будзе спакусіць у працэсе працы і тым павялічыць свае сілы” [576, арк. 39адв, 49]. Што і было зроблена праз некалькі гадоў, калі Беларускі пасольскі клуб быў падзелены на дзве часткі і ўтварылася падкантрольная КПЗБ Грамада. У сярэдзіне лета 1928 года прадстаўнікі савецкай дыпламатыі ў Польшчы мелі вялікі ўплыў на беларускі рух і падтрымлівалі сувязі як з пракамуністычнымі, так і з нацыянальна-дэмакратычнымі беларускімі дзеячамі. Планавалася нават аб’яднаць беларускіх прадстаўнікоў у новым сейме, аднак і гэты варыянт развіцця падзей у канчатковым выніку быў накіраваны на дыскрэдытацыю Ф. Ярэміча [299, с. 35].

Акрамя чыста палітычных кампаній савецкія дыпламаты арганізоўвалі і акцыі помсты ў дачыненні да непажаданых асобаў, як гэта было з М. Гурыным-Маразоўскім. Савецкі паўнамоцны прадстаўнік у Варшаве А. Загорны 19.06.1926 у лісце ў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ настойліва рэкамендаваў “пры абставінах, якія склаліся, Стаха (М. Гурын-Маразоўскі. – *А.С.*) трэба пастарацца неадкладна прыбраць з гарызонта. Зразумейце, што ён ведае Роберта, Дзіка, Корчыка (партыйныя псеўданімы дзеячаў КПЗБ. – *А.С.*) і ўсіх, усіх і што ён саромецца не будзе” [588, арк. 128]. Вядома, што М. Гурын-Маразоўскі пасля няўдалай спробы рэалізаваць свае палітычныя планы быў абвінавачаны камуністамі ў супрацоўніцтве з дэфензівай і 16 сакавіка 1928 года забіты як правакатар С. Клінцэвічам. Прыклады адкрытага запужвання і шантажу беларускіх дзеячаў – членаў Грамады, якія пасля забароны арганізацыі і пераследу польскай уладай адышлі ад супрацоўніцтва з камуністамі, пацвярджаюць, што рэпрэсіўныя памкненні прадстаўнікоў камінтэрнаўскіх сілаў не абмяжоўваліся прыведзеным актам помсты. Камуністы баяліся, што важная інфармацыя аб дэталях іх шырокага нелегальнага пранікнення ў грамадска-палітычнае жыццё можа стаць вядомай польскім уладам, таму пагражалі фізічнай расправай тым сваім былым саюзнікам, якія валодалі

адпаведнай інфармацыяй і маглі патэнцыяльна стаць крыніцай для дэфензівы. Так, Войцік (верагодна, А.І. Войцік, рэдактар-выдавец газеты "Сялянская праўда". – *А.С.* [456]) на пагрозы аб прыгатаваным для яго "лёсе ГУРЫНА", адказаў, што "на выпадак яго смерці ўсё паднаготнае будзе напісана ў некалькіх лістах і будзе ляжаць у надзейных асоб і пасля смерці ўсё будзе апублікавана, дзякуючы чаму праціўнікі пабаяцца яго застрэліць". Па словах А.І. Войціка, забойства "было б ужо зроблена з Астроўскім, калі б "там" (у кіраўніцтве КПП-КПЗБ. – *А.С.*) не ведалі, што ў Астроўскага ўсё падрыхтавана да апублікавання на выпадак яго забойства" [571, арк. 38]. Напэўна, інфармацыя, якой валодалі Р. Астроўскі, А. Войцік і іншыя, была настолькі канфідэнцыйнай, што валоданне ёй захавала жыццё гэтым і, магчыма, іншым дзеячам беларускага нацыянальнага руху. Што, аднак, не пазбавіла Р. Астроўскага ад вялікай колькасці бруду, які канцэнтраваўся ў камуністычных асяродках і змяшчаўся на старонках пракамінтэрнаўскіх выданняў [571, арк. 66–78].

У публікацыях была даказана шырока ўжывальная практыка фінансавання савецкімі дзяржаўнымі ўстановамі апазіцыйных арганізацый у Заходняй Беларусі. Менавіта пытанні фінансавання савецкім бокам беларускіх арганізацый займалі важнае месца ва ўзаемаадносінах паміж прадстаўнікамі беларускага руху і іх партнёрамі з БССР. Так, напрыклад, з дзяржаўных сродкаў БССР, паводле каштарысу на 1926/1927 гады, на КПЗБ выдзялялася 468 965 руб. Пры гэтым на ўтрыманне арганізацый ЦК КПЗБ выдаткоўвалася 153 тыс. руб. на год: на школу КПЗБ, дапамогу Беларускай школьнай радзе, беларускім гімназіям, газеце, спартыўным арганізацыям, на прадстаўніка КП(Б)Б і КПЗБ у Варшаве, прадстаўніцтва КПЗБ у БССР [298, с. 251–252; 692, с. 70–71].

Нельга выключаць савецкай фінансавай складовай у дзейнасці іншых арганізацый, а таксама перыядычных выданняў у Заходняй Беларусі. Так, напрыклад, паводле В. Пануцэвіча, у "канцы 1935 г. Масква мантавала ў заходніх краінах і ў Заходняй Беларусі так званы "народны фронт", быццам супрацьвагу на рост нацыяналізму й фашызму. У запраўднасці гэта была маскоўская надбудоўка для праводжаньня сваіх сымпатыяў, чаго нельга было рабіць пад камуністычнай ці сацыялістычнай вывескай. У Вільні промотарам "народнага фронту" была група левых Дэмбінскага, што выдавала часопіс "Папросту". Група гэтая спагадна выказвалася да беларускага вызвольнага руху ды востра крытыкавала польскую шавіністычную палітыку. Кс. Станкевіч сымпатызаваў гэтай групе…" [626, № 3, с. 64]. Цалкам магчыма, названыя дзеячы атрымлівалі фундацыі ад савецкіх прадстаўніцтваў, у тым ліку і А. Станкевіч, да якога бальшавіцкія агенты звярталіся з прапановай аб супрацоўніцтве яшчэ ў сярэдзіне 1920-х гадоў [794, с. 525]. Верагодна, гэта можна сказаць і аб

іншых выданнях, напрыклад двутыднёвіку “Асва”, які пачаў выходзіць з сакавіка 1934 года і галоўным аб’ектам крытыкі абраў розных “нацыянал-здраднікаў, кшталту Луцкевіча, Астроўскага, Клімовіча, Станкевіча, а таксама новаспечаных нацдэмаў з ТБШ Шырмы і Марцінчыка. Ідэалагічны падтэкст артыкулаў “Асвы” прасочваўся лёгка: кампраметацыя беларускага нацыянальна-вызваленчага руху” [94]. Пытанні ўнушальнай арганізацыйна-кадравай (перакід на кіраўнічыя пасады ў КПЗБ грамадзян БССР, навучанне кадраў у школе КПЗБ), матэрыяльна-тэхнічнай (дзейнасць друкарні КПЗБ, выданне падпольнай літаратуры, перакід зброі і да т.п.), фінансавай (як з дапамогай сродкаў самой БССР, так і Масквы) падтрымкі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі сістэматызавана і абгрунтавана прадстаўлены ў кандыдацкай дысертацыі В.М. Цынкевіча [865; 866]. Больш падрабязную інфармацыю пра фінансаванне КПЗБ савецкімі дзяржаўнымі і грамадскімі органамі можна атрымаць ў некаторых архіўных справах у фондзе Прадстаўніцтва ЦК Кампартыі Заходняй Беларусі [569; 583; 590].

У пачатку 1990-х гадоў у выніку паглыблення архіўна-пошукавай справы атрымала пастаноўку праблема гісторыі масонства ў Беларусі [535; 538]. Паводле выяўленых дакументаў, а гэта ў асноўным матэрыялы допытаў НКУС [29; 80], трывалыя сувязі ў асяродку беларускіх масонаў мелі А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, К. Дуж-Душэўскі і іншыя ўдзельнікі заходнебеларускага руху. Аднак далейшую распрацоўку масонская праблематыка не атрымала ў сувязі з абмежаванасцю і спецыфікай выяўленых крыніц.

Можна ўпэўнена гаварыць аб значным зруху ў вывучэнні гісторыі беларускіх палітычных партый. Яшчэ ў першай палове 1990-х гадоў калектыў аўтараў падрыхтаваў і выдаў змястоўныя нарысы [619]. У іх былі змешчаны і артыкулы У.Ф. Ладысева [405; 408; 409]. Паступова пачалі ствараццa і прыцягваць увагу даследаванні, якія паглыблялі гісторыка-партыйную праблематыку, у тым ліку ў рэчышчы фарміравання аднапартыйнай сістэмы ў БССР [132]. Гісторыя найбольш уплывовых беларускіх палітычных арганізацый і партый была адлюстравана А.М. Вабішчэвічам у кантэксце нацыянальна-культурнага жыцця Заходняй Беларусі і ў абагульняльным выданні па гісторыі Беларусі, адпаведныя раздзелы якой напісаны А.М. Вабішчэвічам і У.А. Палуянам [67; 68; 136].

Даследчыкі, закранаючы тэму Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, справядліва адзначаючы высокі навуковы ўзровень даследаванасці праблемы, дзякуючы намаганням У.А. Палуяна і А. Бергман [430; 497], а часам і справядліва крытыкуючы (“сёньня яна безнадзейна састарэла”, – А.М. Сідарэвіч аб манаграфіі У.А. Палуяна [760]), тым не менш паглыбілі працэс метадалагічнага і крыніцазнаўчага

асэнсавання гісторыі БСРГ. Больш адэкватна зразумець абставіны, у якіх Грамада была арганізавана, ажыццяўляла сваю дзейнасць, а потым была забаронена, дапамагаюць матэрыялы арганізаванай у 2005 годзе Беларускім Гістарычным Таварыствам V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларуская сялянска-работніцкая грамада ў кантэксце нацыянальнага адраджэнння XIX–XX стст.”. Матэрыялы навуковага мерапрыемства змяшчаюць артыкулы ўдзельнікаў канферэнцыі, а таксама дакументальныя матэрыялы па гісторыі БСРГ [133]. Выклікаюць цікавасць фрагмент стэнаграфічнай справаздачы пасяджэння III канферэнцыі КПЗБ, на якой адбывалася вострае абмеркаванне пытання аб характары БСРГ [655], выступленні ў сейме беларускіх паслоў В. Рагулі і Ф. Ярэміча ў абарону Грамады [780], а таксама апублікаваныя раней наратыўныя матэрыялы польскіх палітыкаў, у прыватнасці ўспаміны і тэкст выступлення міністра юстыцыі А. Мэйштовіча, дзённікавыя запісы маршалка сейма М. Ратая, якія значна паглыбляюць разуменне матываў і механізмаў ліквідацыі польскімі ўладамі БСРГ [783]. Пашырэнне праблематыкі арганізацыі назіраецца на прыкладзе артыкулаў А. Пашкевіча аб першапачатковым перыядзе Грамады, А. Вашкевіча аб яе ўзаемадзеянні з БХД і А. Чарнякевіча – з беларускімі паланафіламі, а таксама Я. Мірановіча, А. Смалянчука і С. Токця [90; 528; 636; 784; 826; 870].

Разважаючы пра ўтварэнне БСРГ, неабходна ўлічваць меркаванні А.М. Сідарэвіча і А.Ф. Вашкевіча. Яны звярнулі ўвагу на той своеасаблівы ідэйна-палітычны грунт для ўзнікнення масавай беларускай сялянскай партыі, пра неабходнасць стварэння якой гаварылі, у прыватнасці, беларускія хадэкі [90, с. 37–38]. А.М. Сідарэвіч увогуле лічыць А. Луцкевіча бадай што большым “бацькам” Грамады, чым Б. Тарашкевіча [760]. Беларускія палітыкі бачылі, што ідэі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ўздымалі ў насельніцтва рашучы настрой, які неабходна было ўзначаліць і арганізацыйна аформіць. Планы стварэння масавай арганізацыі былі і ў бальшавіцкага кіраўніцтва, якое каштоўнасці нацыянальна-вызваленчага характару падмяняла сацыяльна-класавымі, разлічваючы рэалізаваць свае планы шляхам расколу БПК. Камуністы скарысталі сваю звычайную тактыку: ёсць амаль арганізаваны беларускі рух, значыць трэба гэты рух узначаліць. Што і адбылося, але камуністы, вызначаючы характар БСРГ у час працы III канферэнцыі КПЗБ (тэрытарыяльная ці нацыянальная арганізацыя), усё ж вымушаны былі азірацца на заснавальнікаў Грамады. Так, прапанова назваць арганізацыю толькі работніцка-сялянскай Грамадой не прайшла, бо прадстаўнік Грамады “указал”, што яны (грамадоўцы. – *А.С.*) ужо даўно называюцца беларускай сялянска-работніцкай Грамадой, таму функцыянеры КПЗБ вымушаны былі з гэтым пагадзіцца [655, с. 170]. Напэўна, яны мелі на

ўвазе тое, што штучны падзел беларускага парламенцкага прадстаўніцтва не азначаў канчатковы раскол адзінага беларускага фронту (што і назіралася на працягу чэрвеня-снежня 1925 года [636]) і пры першай магчымасці, у выніку нейкага “збою” ў праграме камуністаў па апанаванні Грамадой, адбудзецца аб’яднанне падзеленага БПК на грунце беларускіх нацыянальна-дзяржаўных каштоўнасцей.

Актуальнымі застаюцца думкі А. Бергман адносна гісторыі БСРГ. Разважанні аб крыніцах і скіраванасці партыі ўтрымліваюцца ў яе працы “Слова пра Браніслава Тарашкевіча”, дзе ўзнята пытанне аб ступені пранікнення ў грамадоўскі рух рэвалюцыйных і камуністычных уплываў. Яна лічыла, што камуністы, якія на месцах належылі да Грамады, былі яе вядучай сілай, але па колькасці складалі нязначны працэнт. Стрыжнем руху з’яўляліся сяляне, для якіх барацьба за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне была чымсці непадзельным. Магутная хваля масавага руху захапіла нават далёкія ад камунізму элементы, для якіх галоўнымі былі нацыянальныя пастулаты. Гэтае меркаванне даследчыцы пацвярджаецца ўспамінамі актыўнага ўдзельніка Грамады і “Змагання” С. Хмары, які звязваў поспех Грамады з шырокім распаўсюджваннем у пачатку 1920-х гадоў “БНР-партызанкі”. Амаль у кожнай вёсцы жылі даўнейшыя партызаны, якія падтрымлівалі паміж сабой сталую сувязь. Што тычыцца вышэй згаданага выказвання А. Бергман аб вядучай ролі камуністаў на месцах, то С. Хмара выказаў адваротную думку: больш шпарка рост грамадоўскіх ячэек ішоў там, дзе не было ячэек камуністычных, КПЗБ напачатку выдала загад “камуністам не ўступаць да Грамады, а толькі “супрацоўнічаць”, ды папіхаць на рэвалюцыйныя дзеі” [847, № 2, с. 5]. Здаецца, правакацыйнасць дзеянняў камуністаў і спрычынілася да таго, што да руху далучыліся свядомыя праціўнікі яго рэвалюцыйных тэндэнцыяў, якія хацелі стрымаць радыкалізацыю легальнай партыі і на яе падставе дабівацца паляпшэння беларускай справы. Як справядліва выказалася А. Бергман, яны мелі намер пры першай жа магчымасці скіраваць гэты рух у спакайнейшую каляіну. Аднак гэтыя апошнія ўяўлялі сабой ледзь прыкметны струменьчык у моры масавага руху. Большасць не паддавалася ілюзіям, не верыла ў магчымасць задавальнення сваіх патрэб польскімі ўладамі і ўскладвала надзеі на рэвалюцыйную барацьбу і ўз’яднанне з БССР [42, с. 95–96]. Небеспадстаўна А. Бергман лічыла, што ніякі радыкальны масавы рух у Заходняй Беларусі не мог бы арганізацыйна сфарміравацца зусім легальна. Ён быў бы задушаны ў зародку. Да пачатку грамадоўскага руху была праведзена прадуманая падрыхтоўчая акцыя, у якой камуністычныя арганізацыі і НПХ адыгралі значную ролю. Называючы Б.А. Тарашкевіча заснавальнікам і правадыром гэтага руху, даследчыца сцвярджала, што Грамада магла расці так хутка таму, што ўзнікла ў асабліва

спрыяльным палітычным клімаце, ва ўмовах росту прасавецкіх настрояў і поўнай падтрымкі нацыянальнай і сялянскай палітыкі ў БССР [42, с. 97–98]. Але не трэба забываць адмоўныя для беларускай нацыянальна-вызваленчай справы наступствы ўзаемадзеяння з камуністамі і НПХ, якія праводзілі раскольніцкую палітыку камінтэрнаўскага кіраўніцтва. Неабходна ўлічваць інфармацыю пра ціск, які адчувалі на сабе апаненты пракамуністычнай арыентацыі. Так Б. Каверда, забойца савецкага паўпрада П. Войкава, на судзе гаварыў “аб тэроры, які прымяняўся ў адносінах да людзей, якія выступалі супраць Беларускай грамады” [171, с. 75]. Мае пад сабой грунт меркаванне А. Станкевіча, які лічыў, што паглыбленне супрацоўніцтва з НПХ сімвалізуе поўнае банкруцтва беларускага незалежнага руху ў Польшчы [636, с. 34].

Неабходна адзначыць своеасаблівую дыскусію аб ліквідацыі БСРГ на старонках ”Беларускай мінуўшчыны”. Звяртаючы ўвагу на вераломнасць бальшавіцкага кіраўніцтва – з аднаго боку, ідэалізуючы дзяржаўны і грамадска-палітычны лад Польшчы (“нармальны дэмакратычны працэс у цывілізаванай дзяржаве”, “падбухторванне беларускага насельніцтва супраць законных польскіх улад”) – з другога, Л. Герасімаў справу знішчэння адной з самых масавых нацыянальных беларускіх арганізацый прыпісаў савецкай уладзе, КПЗБ пры дапамозе Камінтэрна і яго баявога атрада – чэкістаў [128]. На такі аднабаковы падыход, які відавочна спрашчае гісторыю пытання, калі ў выніку эмацыянальнай рэакцыі на аднабаковае вывучэнне гісторыі Беларусі ўзнікае другая небяспечная тэндэнцыя – стварэнне новых міфаў, крытычна адрэагаваў Р.Р. Лазько. Ён, звяртаючы ўвагу на імкненнне камінтэрнаўскага кіраўніцтва выкарыстаць БСРГ у “працярэбліванні” шляху ў Еўропу для будучай сацыялістычнай рэвалюцыі, удакладніў меркаванне свайго апанента і абгрунтавана заявіў: БСРГ стала ахвярай дзвюх дыктатур – бальшавіцкай і санацыйнай [430]. Грамада не стала марыянеткай бальшавікоў, за што і паплацілася [827, с. 126], а безэмацыйны аналіз тагачаснай сітуацыі прыводзіць да высновы, што савецкае кіраўніцтва прагматычна вырашыла не распачынаць вайну з Польшчай (ці з Еўропай?) з-за беларускага пытання. Дакументы Прадстаўніцтва КПЗБ адлюстроўваюць насцярожанае стаўленне да сітуацыі, якая склалася вакол БСРГ і яе настойлівага руху да ўзброенага паўстання, што непакоіла партыйнае кіраўніцтва [584; 591]. У сувязі з прыведзенымі разважаннямі варта будзе ўзгадаць меркаванне па гэтым пытанні Янкі Купалы, які ў размове пра А. Ульянава выказаўся аб ім: “…вялікі правакатар… Перш дапамог Тарашкевічу стварыць Рабоча-сялянскую Грамаду, а пасля памог разграміць яе і пасадзіць Тарашкевіча за краты” [310, с. 10].

Застаецца нявырашанай праблема вызначэння колькасных паказчыкаў БСРГ. У гістарыяграфіі існуе шэраг стэрэатыпных лічбаў, якія адлюстроўваць колькасць сябраў БСРГ у больш чым 100 тысяч, каля 120 тысяч, каля 150 тысяч, газета “Известия” 5 лютага 1928 года падала нават 160 тысяч [5, с. 28]. Таму не дзіўна, што ўкраінскі даследчык Г.Г. Дзедурын у сваёй працы двойчы прыводзіць колькасць Грамады, прычым двойчы паказчыкі істотна адрозніваюцца. Так, спачатку аўтар гаворыць, што да пачатку 1927 года арганізацыя ўжо перавышала 100 тысяч, а потым своеасаблівым чынам павялічвае колькасць грамадаўцаў на 20 тысяч чалавек – “да студзеня 1927 г. як ужо адзначалася колькасць Грамады дасягнула 100–120 тыс. чалавек” [202, с. 23, 25]. У.А. Палуян у сваіх працах падаваў колькасць сябраў БСРГ: на 1 лютага 1927 года каля 120 (117) тыс. чалавек [624, с. 152–153] і на студзень 1927 года каля 120 тысяч, якія былі аб’яднаны ў каля 2 тысяч гурткоў [623; 625, с. 231]. Відавочна, У.А. Палуян меў на ўвазе звесткі “генеральнага сакратара БСРГ” М. Бурсевіча, які на 22 сакавіка – дзень афіцыйнага зачынення Грамады як арганізацыі – падаў колькасць арганізацыі ў 150 тыс. асоб [53, с. 554]. Аднак і лічба “каля 120 тыс.” хутчэй за ўсё завышаная і была наступствам прапагандысцкага жадання кіроўнікоў БСРГ і КПЗБ павялічыць колькасць рэвалюцыйна настроеных сялян і рабочых Заходняй Беларусі. Выяўленыя ў НАРБ дадзеныя даюць падставу крытычна ставіцца да вышэй прыведзеных паказчыкаў. Так, паводле наяўнай інфармацыі, да 10 снежня 1926 года Грамада мела 66 996 членаў, якія аб’ядноўваліся ў 1 720 гурткоў. Пададзена і дынаміка росту Грамады ў другой палове 1926 года: чэрвень: 569 чалавек – 19 гурткоў; ліпень: 3 144 – 122; жнівень: 12 529 – 561; верасень: 30 828 – 1 062; кастрычнік: 43 570 – 1 374; лістапад: 62 092 – 1 658 [568, арк. 50–51]. Наўрад ці партыйныя функцыянеры, якія складалі адпаведныя справаздачы, мэтанакіравана заніжалі адпаведныя паказчыкі, хутчэй наадварот, і наўрад ці за месяц колькасць БСРГ магла падскочыць амаль удвая. Нават з улікам шырока распаўсюджаных у Заходняй Беларусі паўстанцкіх настрояў і папулярнасці Грамады. Да таго ж сумніўным выглядае рост БСРГ на фоне фактычна распачатай ужо ў канцы 1926 года акцыі паліцэйскіх органаў па закрыцці грамадоўскіх гурткоў. У.А. Палуян звярнуў на гэта ўвагу, адзначаючы, што “ў шэрагу месц паліцыя пачала ліквідацыю гурткоў Грамады, суправаджаючы гэта масавымі арыштамі. Так, толькі ў Нясвіжскім павеце ў снежні 1926 года было ліквідавана 11 гурткоў” [624, с. 168–169].

Нягледзячы на зняцце грыфа сакрэтнасці з ахіўных спраў з дакументамі пра дзейнасць ТБШ, гісторыя гэтай беларускай арганізацыі нацыянальна-вызваленчага характару не стала прадметам спецыяльнага

даследавання, за выключэннем некалькіх артыкулаў і дысертацыйных даследаванняў А.М. Вабішчэвіча, В.В. Даніловіча і А.В. Пашкевіча, атрымаўшы ў іх пашырэнне прадметнага поля [60; 67; 68; 70; 72; 76; 77; 193; 194; 197; 200; 647]. Наяўнасць у НАРБ асобнага фонду таварыства, змястоўных спраў з разнастайнымі па форме і сутнасці дакументамі пра дзейнасць ТБШ і яе актывістаў у іншых архівах дае пэўныя крыніцавыя падставы для стварэння цэласнай гісторыі арганізацыі [252; 594–597]. У ёй павінны знайсці адлюстраванне не толькі станоўчыя бакі дзейнасці таварыства і яго членаў, але і прыкрыя старонкі, звязаныя, напрыклад, з узаемакантактамі асобных дзеячаў сярэдняга звяна ТБШ з паліцэйскімі органамі [239, арк. 1; 591, арк. 5–7].

Найбольш актыўнай распрацоўцы ў параўнанні з перыядам савецкай гістарыяграфіі падверглася дзейнасць Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі. Падкрэсліваючы значнасць намаганняў партыі ў барацьбе за беларускія справы, гісторыкі звярнулі ўвагу на замоўчванне ролі хадэкаў у грамадскім жыцці Заходняй Беларусі і выключна негатыўным стаўленні да БХД савецкай гістарыяграфіі. У дысертацыйных даследаваннях і артыкулах А.М. Вабішчэвіча, І.І. Траццяка, Э.А. Мазько, а таксама працах А.Ф. Вашкевіча, У.М. Конана і іншых аўтараў [67; 68; 87; 89–96; 354–357; 492–496; 498; 828–833; 839; 876] у традыцыях нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі атрымалі адлюстраванне шматлікія аспекты грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай дзейнасці партыі. Асаблівай увагі заслугоўваюць факты, якія красамоўна акцэнтуюць увагу на прыкладах арганізацыі і правядзення мерапрыемстваў, накіраваных на беларусізацыю касцёла. Дзеянні А. Станкевіча, В. Гадлеўскага, В. Шутовіча і іншых дзеячаў хадэцыі выклікалі як у польскіх чыноўнікаў, так і ў каталіцкіх іерархаў асуджэнне і пераслед аж да высылкі і зняволення [68, 107–113]. Таму сцвярджэнні савецкіх гісторыкаў накшталт “беларуская хадэцыя ўяўляла сабой кучку здраднікаў і лёкаяў, ад якіх народныя масы адвярнуліся” [504, с. 60–61], не адлюстроўвалі сапраўднага стану падзей. Факты супрацоўніцтва беларускіх хадэкаў з польскімі дзяржаўнымі органамі, у прыватнасці з паліцыяй і дэфензівай, атрымання ад іх фінансавай і арганізацыйнай дапамогі сёння, па пераканаўчым меркаванні А.Ф. Вашкевіча, можна абвергнуць дакументальна. У матэрыялах дэфензівы правадыры хадэцыі праходзяць як пераканаўчыя прыхільнікі незалежнасці Беларусі. У прыватнасці, В. Гадлеўскі характарызуецца як асоба, папулярная сярод беларусаў і вядомая сваёй антыўрадавай дзейнасцю, А. Станкевіч стаіць на пазіцыі незалежнасці Беларусі ў яе этнаграфічных межах і варожа ставіцца да польскай дзяржаўнасці. Больш таго, усталяванае сцвярджэнне пра адназначную варожасць БХД да КПЗБ і падкантрольных ёй арганізацый таксама не вытрымлівае крытыкі, бо,

аказваецца, абедзве партыі часам наладжвалі ўзаемнавыгаднае супрацоўніцтва, у прыватнасці ў выдавецкай справе [89, с. 70–71, 80].

Можна пагадзіцца з меркаваннем В.І. Крывуця, які лічыць, што “буржуазны характар” БХД абвяргаецца яе класавым складам (у асноўным сяляне і інтэлігенцыя) і фінансавымі цяжкасцямі, што было б немагчымым, калі б яна карысталася падтрымкай буржуазіі. Аднак пры гэтым нельга пагадзіцца з меркаваннем аўтара адносна таго, што беларускі нацыянальна-дэмакратычны маладзёжны рух у асноўным знаходзіўся пад уплывам БХД-БНА. У маладзёжным асяродку Заходняй Беларусі былі арганізацыі, непадкантрольныя БХД. Пра гэта гаварыў і В.І. Крывуць, згадваючы барацьбу паміж БХД і групай Луцкевіча-Астроўскага – “Цэнтрасаюзам” – за Беларускі студэнцкі саюз і “Скарынію”, якая стваралася апанентамі БХД [373, с. 78–79, 86, 88]. У.Ф. Ладысеў і П.І. Брыгадзін лічылі, што Беларускі студэнцкі саюз знаходзіўся пад арганізацыйным кіраўніцтвам А. Луцкевіча і Р. Астроўскага [418, с. 184], а У. Серпухаў зыходзіць з пастаяннага ўплыву на БСС на працягу яго дваццацігадовага існавання “нейкай палітычнай плыні”, самымі вызначальнымі былі БХД, КПЗБ, а пазней група Астроўскага-Луцкевіча [758, с. 57]. Манаграфічнае даследаванне гісторыі Беларускага студэнцкага саюза ў выглядзе бакалаўрскай дысертацыі ажыццявіў М. Мастыка, які адзначыў, што “сярод сяброў БСС былі прыхільнікі розных палітычных кірункаў, якія існавалі ў беларускім грамадстве, а найперш буйнейшых партый такія як Сацыял-дэмакратычная партыя, партыя беларускіх эсэраў, хрысціянская дэмакратыя Адама Станкевіча, пазней БСРГ, мелі ўплывы паланафільскія арганізацыі, значная вага КПЗБ была на працягу існавання арганізацыі”. Аналіз этапу станаўлення саюза даў падставы аўтару гаварыць аб тым, што ад самага пачатку за плячыма арганізацыі стаяла Беларуская хрысціянская дэмакратыя. У прыватнасці, выданне часопіса “Наш шлях” “амаль цалкам фінансавалася дзеячамі хрысціянскай дэмакратыі Знамяроўскім, кс. Германовічам і кс. Станкевічам” [507, с. 47].

Адносна ўплыву на Беларускі студэнцкі саюз трэба прывесці дадзеныя архіўных матэрыялаў, якія разам з інфармацыяй пра сувязі з беларускімі нацыянальна-дэмакратычнымі палітыкамі змяшчаюць звесткі пра значны кантроль за дзейнасцю арганізацыі з боку прасавецкіх дзеячаў у Польшчы [598; 599]. Напрыклад, са справаздачы невядомай асобы, магчыма прадстаўніка цэнтральнага кіраўніцтва КПЗБ, аб дзейнасці сярод беларускіх арганізацый і іх стане, вынікае, што “ў 1932 годзе ў БСС (Беларускім студэнцкім саюзе. – *А.С.*) праводзілася работа намі, якой кіраваў Лазар праз студэнта Давідовіча, які ў той час быў старшынёй БСС. …Як вядома ў 1933 г. была абрана новая ўправа. Старшынёй з’яўляецца Кепель, сын таго Кепеля, які з’яўляецца членам Г.У. ТБШ. …Асабіста маё меркаванне – чалавек, з

якім можна было б паспрабаваць працаваць”. Аўтара справаздачы, які, відаць, курыраваў у Польшчы беларускі рух, цікавіла перспектыва пашырэння камуністычнага ўплыву за кошт беларускіх арганізацый, у тым ліку за кошт беларускага студэнцтва. Пры гэтым яго не турбавалі ідэйна-палітычныя погляды аб’ектаў увагі, бо “астатнія члены ўправы БСС – відавочныя стаўленікі БХД. …БСС – гэта кангламерат усялякіх тыпаў, пачынаючы з нацфашыстаў і заканчваючы такімі людзьмі, з якімі не толькі можна працаваць, але абавязкова патрэбна гэта зрабіць” [574, арк. 29–30].

Значным дапаўненнем да гісторыі беларускай хадэцыі з’яўляюцца даследаванні, прысвечаныя ідэйнаму размежаванню ў асяродку БХД-БНА, што прывяло да стварэння Беларускага народнага фронту на чале з В. Гадлеўскім, які ў сваім духоўным і палітычным жыцці прайшоў няпросты шлях эвалюцыі ад “беларускага святара, рупліўцы вяртання роднай мовы ў святыні” да нацыянальна-палітычнага дзеяча з яскрава выражаным радыкальна-нацыянальным характарам [830, с. 117]. Ён адкідваў любыя прапановы з боку камуністаў, у тым ліку накіраваныя на адзінафронтавае супрацоўніцтва, на якія рэагаваў А. Станкевіч [95, с. 90–91].

Паглыбленне гістарыяграфіі БХД адбылося ў выніку манаграфічнага даследавання К.С. Разуванавай гісторыі Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГіК), арганізацыі, якая была заснавана пры ўдзеле кіраўнікоў БХД і ў савецкай гістарычнай навуцы атрымала ацэнку як своеасаблівы прыдатак хадэкаў [700–708]. І хоць аўтар займае пазіцыю адмаўлення ролі БІГіКа як нізавой структуры БХД, сцвярджэння таварыства як самастойнай легальнай непалітычнай арганізацыі, што фармальна і было зафіксавана статутнымі дакументамі, немагчыма адасобіць БІГіК ад той палітычнай дзейнасці, арганізатарам якой была БХД і яе правадыры. А.М. Вабішчэвіч і У.А. Палуян лічаць БІГіК культурна-асветніцкай арганізацыяй беларускай хадэцыі [136, с. 405].

Атрымалі даследаванне Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя і “Цэнтрасаюз”, у асноўным дзякуючы працам А.М. Сідарэвіча, прысвечаным А. Луцкевічу – правадыру партый. Навукова-публіцыстычная дзейнасць А.М. Сідарэвіча па вывучэнні грамадска-палітычнай спадчыны А. Луцкевіча, якая ў савецкай навуковай літаратуры атрымала выразна негатыўнае асвятленне, з’яўляецца яскравым прыкладам разумення тагачасных рэалій праз разнапланавае асэнсаванне асобы. Разам з наратыўнымі матэрыяламі А. Луцкевіча [475–480] А.М. Сідарэвіч падрыхтаваў і апублікаваў аналітычныя працы, прысвечаныя асэнсаванню месца палітыка ў беларускім нацыянальным руху [760–766; 768–774]. У выніку гэтага перад намі з’явіўся партрэт асобы, якая мае свае палітычныя прыярытэты і бачанне перспектыў вызваленчага руху, сумняваецца, баіцца, церпіць крыўду і нястачы. Пакутуе ад трагедыі нацыянальнага маштабу, звязанага

з распраўай бальшавікоў над правадырамі беларускага руху ў БССР у пачатку 1930-х гадоў, спрабуе даць тлумачэнне гэтай трагедыі, шукае і называе вінаватых [480; 768].

Трэба адзначыць, што як “Цэнтрасаюз”, так і Беларускі сялянскі саюз да гэтага часу ў гістарыяграфіі з’яўляюцца арганізацыямі сваіх лідэраў – адпаведна А. Луцкевіча і Р. Астроўскага, Ф. Ярэміча і В. Рагулі. Гэта натуральна вынікае з абставін іх грамадска-палітычнай дзейнасці, накіраваных на стварэнне названых груповак, якія не атрымалі шырокай падтрымкі і ўдзелу з боку насельніцтва. Таму ў адлюстраванні выяўленых архіўных дакументаў гэтыя палітыкі, як правіла, заслугоўвалі ўвагі як асобныя палітычныя дзеячы, а не правадыры ўплывовых партый. Адносна “Цэнтрасаюза” дарэчы будзе прывесці меркаванне А.М. Сідарэвіча наконт задумы стварыць дадзеную арганізацыю як паўтарэнне Беларускага выбарчага камітэта 1922 года. На падставе архіўных дакументаў даследчык сцвярджае, што “Цэнтрасаюз” быў якраз выбарчым камітэтам і што ўзначальваў яго Ф. Акінчыц [765, с. 13]. З гэтага вынікае беспадстаўнасць разважанняў пра арганізацыю як пра палітычную партыю.

З новых метадалагічных пазіцый атрымала асвятленне партыя беларускіх эсэраў [142–150; 446; 459; 550], у першую чаргу ў кантэксце гісторыі партызанскага руху ў Заходняй Беларусі. Па слушным меркаванні А.І. Мурашкі, менавіта БПС-Р узначаліла радыкальную плынь нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі на першапачатковым яго этапе [550].

Можна пагадзіцца з В.Ф. Гігіным у тым, што беларускія нацыянальныя дэмакраты і сацыялісты “аказаліся не ў стане канкурыраваць са згуртаванай і жорстка структурыраванай Камуністычнай партыяй, якая мела дэталёва распрацаваную ідэалогію, апіралася на значныя, у тым ліку ўзброеныя, рэсурсы агромністай Расіі” [131, № 4, с. 58]. Названыя акалічнасці ў асноўным вызначылі збег палітычных абставін і ў заходнебеларускім нацыянальным руху.

У параўнанні з папярэднім перыядам значную ўвагу даследчыкаў атрымала дзейнасць беларускіх “паланафілаў”, дзякуючы чаму цэлы шэраг беларускіх дзеячаў і арганізацый гэтага накірунку былі вернуты гісторыі ці натуральна ўведзены ў заходнебеларускі кантэкст, у тым ліку сялянская партыя “Зялёны Дуб” [71; 306; 307; 629; 631; 638; 805–807; 810; 867–871]. Супярэчлівыя падзеі паходу С. Булак-Балаховіча, Слуцкага паўстання, дзейнасці зялёнадубцаў пэўным чынам прадвызначылі развіццё палітычнага змагання, міжпартыйных і міжасабовых размежаванняў, спрэчак-сварак, у тым ліку на заходнебеларускім палітычным грунце, не дазволілі забяспечыць стварэнне адзінага беларускага фронту. Тут маецца на ўвазе вострая канкурэнцыя паміж С. Булак-Балаховічам, яго прыхільнікамі і апанентамі, у першую чаргу беларускімі эсэрамі.

На падставе трывалай архіўна-дакументальнай базы, на фоне сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў, якія адбываліся ў Беларусі і вакол яе, даследчыкі фактычна "з чыстага аркуша" прапанавалі дастаткова аб'ектыўную версію гісторыі гэтай ідэйна-палітычнай плыні, якая выявілася ў стварэнні і некаторай дзейнасці Беларускага палітычнага камітэта, "Зялёнага дуба", "Краёвай сувязі", Варшаўскага БНК, Арганізацыі беспартыйных актывістаў, Беларускага грамадзянскага сходу, Цэнтральнага камітэта беларускіх спраў, Часовай беларускай рады, "Прасветы", Беларускай нацыянальнай рады і іншых.

Аднак, гаворачы пра паланафільства С. Булак-Балаховіча, П. Аляксюка, А. Паўлюкевіча, сына і бацькі Адамовічаў, Л. Дубейкаўскага, Т. Вернікоўскага, Ф. Умястоўскага і іншых дзеячаў, трэба мець на ўвазе тое, што ў дачыненні да іх дзейнасці ў гістарыяграфіі сёння прысутнічаюць рознаскіраваныя погляды. Напрыклад, яшчэ ў 1994 годзе А. Ліс назваў беларускіх паланафілаў "шушамеццю" [461, с. 102]. І калі іх паланафільства ў А.В. Пашкевіча і А.М. Чарнякевіча падаецца як пэўная прыкрасць, то Н.І. Стужынская схільная пэўным чынам рамантызаваць і гераізаваць дзейнасць прадстаўнікоў прапольскай арыентацыі. І першыя, і другая адпаведна пазіцыянуюць названых дзеячаў на падставе архіўных матэрыялаў, у тым ліку польскіх спецслужбаў. Трэба дадаць, што ў дакументах польскай дзяржаўнай паліцыі, цывільных органаў маецца інфармацыя, якая з'явілася ў выніку мэтанакіраванага нагляду за адпаведнымі асобамі і ў якой дзеянні некаторых "паланафілаў" самі палякі кваліфікуюць як небяспечныя польскай дзяржаве. Напрыклад, у сітуацыйным рапарце Брэсцкай павятовай каменды з відавочнай насцярожанасцю браты Булак-Балаховічы згадваюцца ў сувязі з "Беларускім саюзам", арганізаваным імі пад лозунгам "самастойнасці Беларусі" [212, арк. 4]. Паводле данясення экспазітуры секцыі дэфензівы № 5, беларускія незалежніцкія ідэі выказваў вясной 1921 года В. Адамовіч (Дзяргач): "Сам атаман і яго людзі як ідэю мелі стварыць незалежную беларускую дзяржаву ў складзе ўсіх беларускіх земляў" [211, арк. 120адв.]. Гэта тычыцца і А. Паўлюкевіча, які нават быў арыштаваны польскімі ўладамі за стварэнне беларускай арганізацыі "Народны хаўрус за Бацькаўшчыну". Інфармацыя такога парадку ў дачыненні да яго і іншых беларускіх дзеячаў утрымліваецца ў працах Н. Стужынскай і А. Чарнякевіча [805, с. 179; 870, с. 69]. Аналагічнага кшталту трансфармацыі ў заходнебеларускіх умовах гісторыкі ўзгадваюць яшчэ і ў сувязі з палітычнай дзейнасцю М. Гурына-Маразоўскага. Л. Дубейкаўскі ажыццявіў адваротнае: калі ў 1923 годзе палітык актыўна дзейнічаў у рэчышчы Варшаўскага БНК, а, паводле афіцэра польскай контрразведкі, выкарыстоўваўся "двуйкай", то ў 1935 годзе ён меў

дачыненне да “Беларускага фронту” В. Гадлеўскага [626, с. 64]. Дарэчы, А. Чарнякевіч пазначыў праблему асэнсавання самога паняцця “паланафілы”, называючы ў якасці такіх А. Луцкевіча, Б. Тарашкевіча, С. Рака-Міхайлоўскага і іншых, якія пазней змянілі сваю палітычную арыентацыю [869, с. 77–78].

Чым тады адрозніваецца па-сутнасці і форме “паланафільства” ад “саветафільства”, ці ёсць гэта два віды “ўгодніцтва”, калі мець на ўвазе далёка не самыя добразычлівыя адносіны да беларускага руху не толькі з боку Варшавы, але і Масквы. Адзін з самых вядомых паланафілаў П. Аляксюк у верасні 1921 года на Беларускай палітычнай канферэнцыі ў Празе агучыў план дзеянняў, які пазней ажыццявіў на той час таксама паланафіл Б.А. Тарашкевіч: “Мы можам ісці на кампрамісы з польскаю ўладаю да тых пор, пакуль мы ня бачым змены ў польскіх адносінах, а калі гэта ня зменіцца, мы ўзарвём тое зданіе, якое мы збудавалі” [870, с. 65]. Сёння несузмяральнымі бачацца П. Аляксюк і Б. Тарашкевіч і іх палітычная вага, але можа і сапраўды П. Аляксюк шчыра планаваў ажыццявіць абяцанае, аднак яму, магчыма, не дазволілі тое, што даручылі будучаму правадыру Грамады, забяспечыўшы яго адпаведнымі рэсурсамі. Так ці інакш, але цяжка будзе знайсці “чыстага незалежніка”, які не рабіў бы “ўгоды”, бо нават такі пераканаць ідэолаг беларускай дзяржаўнасці, як А. Станкевіч, па словах В. Гадлеўскага, “пайшоў на ўгоду” з камуністамі, з-за чаго “маскоўская правакацыя з “народным фронтам” зусім зьліквідуе беларускі незалежніцкі рух” [95, с. 90–91; 626, № 3, с. 64].

Што тычыцца дзейнасці сялянскай партыі “Зялёны Дуб”, то ў першую чаргу трэба мець на ўвазе яе выразна дэклараваную арыентацыю на стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы, што само па сабе падразумявала антыпольскасць і выстаўляла неабходнасць ажыццяўлення антыпольскіх захадаў. Ёсць падставы для разважанняў пра супрацоўніцтва зялёнадубаўцаў з польскімі органамі, аднак не трэба ігнараваць і іх дзеянні антыпольскай скіраванасці [805; 810].

Разважаючы пра “паланафільства”, “саветафільства”, “ўгодніцтва”, трэба разабрацца – што гэта: цяжкі пошук кампрамісу ці свядомы шлях да канфрантацыі. Таму неабходна ўдакладніць гэтыя паняцці, якія ўзніклі ў 1920–1930-я гады ва ўмовах вострых палітычных дыскусій, барацьбы, і атаясамліваліся са здрадай нацыянальным ці рэвалюцыйным інтарэсам. Імі зручна было карыстацца як своеасаблівым штампам, якім кляймілі апанентаў, што так ці інакш былі звязаны з “чужымі” сіламі.

Гэта тычыцца і фінансавага боку справы, улічваючы слабасць беларускай буржуазіі. Паглыбленню праблематыкі патаемнага супрацоўніцтва беларускіх дзеячаў з польскімі органамі спрыяла публікацыя наратыўных матэрыялаў беларускіх дзеячаў і знаёмства з

дакументамі польскіх спецслужбаў, якія ў рознай ступені пацвярджаюць супрацоўніцтва беларускіх "паланафілаў" з польскімі дзяржаўнымі органамі і атрыманне за гэта грошай. Нават Б. Тарашкевіч прызнаваў факт атрымання ад польскіх службоўцаў фінансавых сродкаў на правядзенне палітычных кампаній [29, № 4, с. 122–124].

Дзеля аб'ектыўнасці неабходна ўзгадаць даказаныя і шырока вядомыя сёння факты фінансавання беларускіх арганізацый, а значыць і палітыкаў, па лініі камінтэрнаўскіх асяродкаў. Такіх дзеячаў польскія сродкі называлі савецкімі "шпегамі" і "дыверсантамі". І "паланафілы", і "саветафілы", першапачаткова выяўляючы беларускія нацыянальна-дзяржаўныя погляды, з рознай паспяховасцю рэалізоўваючы свае палітычныя прыярытэты, у рэшце-рэшт прыйшлі да палітычнага фіяска, што самым трагічным чынам адбілася як на іх асабістым лёсе, так і ўвогуле на беларускай справе. Таму можна падтрымаць выказванне Н.І. Стужынскай, якая трапна адзначыла, маючы на ўвазе партызанаў, што беларусы па абодва бакі мяжы "згодна з чужымі палітычнымі планамі… уцягваліся ў грамадзянскую вайну" [805, с. 258]. Вырашальнае ўмяшальніцтва ў беларускія справы з боку суседніх агентур, шматлікія сутыкненні, частыя правакацыі садзейнічалі дэмаралізацыі людзей, пазбаўленню іх палітычнай волі і ідэалаў. І сёння не трэба спяшацца адназначна і канчаткова рэабілітаваць ці ачарняць – неабходна планамерна ажыццяўляць даследаванні на падставе верыфікаваных крыніц.

Трывалай падставай для асэнсавання пазіцый беларускіх дзеячаў, больш ці менш лаяльных Польшчы, з'яўляюцца наратыўныя матэрыялы П. Сяўрука і Г. Шыманоўскага [663; 935]. Неабходна звярнуць увагу на вядомыя прыклады свядомага і перакананага супрацоўніцтва беларусаў з польскай уладай у складзе праўрадавых палітычных аб'яднанняў. У гэтым сэнсе паказальным з'яўляецца прыклад Г. Шыманоўскага, беларускага пасла ў сейме ў 1930–1939 гадах, праваслаўнага, які адносіўся да тых беларусаў, "якія польскую дзяржаву ўспрыймалі як сваю, называлі сябе беларусамі польскай культуры і хацелі быць нармальнымі грамадзянамі і выконваць публічныя функцыі, не выракаючыся сваёй адметнай нацыянальнасці" [936]. Падобныя думкі выказваў і П. Сяўрук, які, аднак, быў больш апазіцыйным дзеячам, актыўным сябрам ТБШ.

У 2000-я гады беларуская гістарыяграфія смела прыступіла да разгляду і асэнсавання складаных і неадназначных пытанняў, якія тычацца кантактаў беларускіх нацыянальных дзеячаў, увогуле беларускага нацыянальнага руху, з прадстаўнікамі польскай, савецкай, нямецкай, англійскай, французскай і нават японскай палітыкі. У першую чаргу гутарка ідзе пра ўзаемадзеянне беларусаў з польскімі спецслужбамі, якое вельмі часта падпадае пад фармулёўку "правакацыя". Яскравым прыкладам

такіх узаемаадносін з'яўляюцца факты з біяграфіі Р. Зямкевіча, В. Адамовіча (Дзяргача) і іншых [306; 307; 629; 715; 867; 871; 873]. Агульнаметадалагічная складанасць гэтых пытанняў заключаецца ў неадназначнасці інфармацыі крыніц, пра што гаварылася вышэй. Канстатуючы гэта, неабходна адзначыць, што дадзеная праблема мае надзвычай важнае значэнне. Асцярожная, далікатная апрацоўка дадзеных архіўных дакументаў рознага паходжання павінна стаць безумоўнай падставай для незаангажаванага нацыянальнай і палітычнай кан'юнктурай даследавання. Такія падыходы ў асноўным дэманструюць публікацыі А.Ф. Вашкевіча, А.В. Пашкевіча, А.М. Чарнякевіча [97; 629; 631; 642; 653; 659; 867; 871; 873], што з'яўляецца добрай падставай для далейшага даследавання адзначаных пытанняў. Адзначым, што і ў прыведзеных працах сустракаецца акцэнтацыя і аргументацыя, знаёмства з якой непадрыхтаванага чытача можа прывесці да адназначнай згоды з адыёзнымі савецкімі фармулёўкамі пра "здрадніцтва, запраданства, банкруцтва" "белбурнацаў", абгрунтаванасць і апраўданасць рэпрэсій у дачыненні да дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху як з боку польскага, так і савецкага рэжымаў. Так, напрыклад, ёсць звесткі пра тое, што "Пракулевіч, Жаўрыд, Тарашкевіч зьяўляюцца канфідэнтамі экспазытуры і даюць вельмі сур'ёзныя і праверaныя (асабліва гэты апошні) гарантыі ляяльнага стаўленьня да Польшчы" [871, с. 63]. Сіметрычнага характару выказванні маем у дачыненні да высветленых патаемных адносін некаторых відавочна па-незалежніцку арыентаваных дзеячаў, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні савецкіх спецслужбаў, напрыклад С. Якавюка [97]. Дзеля аб'ектыўнасці неабходна мець на ўвазе шчыльныя сувязі беларускіх дзеячаў з савецкімі органамі, што займаліся мерапрыемствамі разведвальніцкага характару (Чырвоная армія, ДПУ-НКУС, Камінтэрн, які таксама ўдзельнічаў у арганізацыі адпаведнай дзейнасці [449]), а ў такім выпадку той самы Б. Тарашкевіч становіцца савецкім агентам.

Прыведзены аналіз дазваляе пераканацца ў тым, што беларускія палітычныя партыі і арганізацыі ва ўмовах 1920–1930-х гадоў праявілі сябе як прадстаўнікі беларускага народа, якія па-рознаму, з неаднолькавых грамадска-палітычных пазіцый абаранялі надзённыя патрэбы беларусаў у Польшчы. Пры гэтым трэба адзначыць, што найважнейшай і асаблівай прычынай беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, якая абумоўлівала дзейнасць партый і арганізацый, была барацьба за незалежнасць Беларусі ў розных формах на падставе геапалітычных поглядаў яго правадыроў. Савецкая гістарычная навука гэтую акалічнасць замоўчвала, пераконваючы чытача ў тым, што паўнавартасная дзяржава беларускага народа будуецца ў выглядзе БССР, а ў Заходняй Беларусі трэба змагацца за "сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне" і ўз'яднанне з Савецкаю Беларуссю.

Што тычыцца гісторыі КПЗБ, то яе гістарыяграфія характарызуецца красамоўнай акалічнасцю: калі ў 1960–1980-я падаўляльная большасць кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, звязаных з вывучэннем пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі, была прысвечана прама ці ўскосна асвятленню розных пытанняў гісторыі КПЗБ, то ў дысертацыях 1990–2000-х гадоў гісторыя кампартыі асвятляліся толькі ў рэчышчы пастаўленых у даследаваннях праблем. Больш таго, даследчыкі акцэнтавалі ўвагу на памылках і праліках КПЗБ, якія прынеслі шкоду беларускаму руху. Яскравым сведчаннем звужэння праблематыкі КПЗБ сведчыць гістарыяграфічны факт адсутнасці выступлення па тэме гісторыі КПЗБ у час працы канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР [106].

Гісторыя КПЗБ атрымала ў дысертацыйных даследаваннях асобныя згадкі назыўнога характару. Так А.А. Румак у даследаванні, прысвечаным разгляду пытанняў прафсаюзнага руху ў Заходняй Беларусі і яго ролі ў нацыянальна-вызваленчым руху, закрануў асобныя праблемы гісторыі КПЗБ, звязаныя з развіццём прафсаюзнага руху, у прыватнасці, прыйшоў да высновы, што раскол у класавых прафсаюзах быў шмат у чым наступствам дзеянняў КПП і КПЗБ [722–724]. У такім рэчышчы гісторыя кампартыі праходзіла ў даследаваннях А.М. Вабішчэвіча, М.Б. Сямёнчыка [66; 67; 70; 817; 818]. Больш шырока адлюстраваны пытанні камуністычнага руху В.В. Даніловічам і А.В. Пашкевічам [192; 193; 646; 647]. Акрамя названых дысертацыйных даследаванняў, асобныя пытанні гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі асвятляюцца ў артыкулах У.І. Адамушкі, У.Ф. Ладысева, В.Ф. Кушнера, А.М. Мацко, С.У. Кабяка, кнігах успамінаў В.П. Ласковіча і іншых [4, 5; 7; 58; 316; 317; 347; 396; 411; 413; 420; 433; 442; 515].

У гэтым шэрагу неабходна асобна выдзеліць працы У.Ф. Ладысева. У іх з выкарыстаннем раней закрытых архіўных матэрыялаў паказана складанасць узаемаадносін паміж рознымі палітычнымі партыямі Заходняй Беларусі і Польшчы, палітыка КП(б)Б і КПЗБ, якая не заўсёды спрыяла адзінству беларускіх арганізацый у нацыянальна-вызваленчым руху. Даследчык адзначыў неабгрунтаванасць абвінавачанняў і рэпрэсій супраць палітычных дзеячаў Заходняй Беларусі, у прыватнасці, кіраўнікоў КПП і КПЗБ [419, с. 88]. На фоне складанага і супярэчлівага лёсу І.К. Лагіновіча У.Ф. Ладысеў паказаў карціну ўнутрыпартыйнага жыцця КПП і КПЗБ, сімвалічна назваў І.К. Лагіновіча “шрубкай” партыйна-бюракратычнага механізму і выканаўцам палітычнай лініі Камінтэрна, якая грунтавалася на тэорыі Сталіна, пры гэтым маючы на ўвазе трагічны лёс іншых членаў КПЗБ [413, № 4, с. 166]. У.Ф. Ладысеў адышоў ад традыцыйнай у савецкія часы канцэпцыі адносна кіруючай ролі КПЗБ у нацыянальна-вызваленчым

руху ў Заходняй Беларусі. Даследчык акцэнтаваў увагу на тым, што КПЗБ не была адзінай палітычнай сілай, якая арганізоўвала нацыянальна-вызваленчы, у прыватнасці, рэвалюцыйны рух. Такім чынам, карэкціравалася раней існаваўшая думка пра выключнасць ролі КПЗБ у нацыянальна-вызваленчай барацьбе ў Заходняй Беларусі.

Асаблівасцю артыкулаў А.М. Мацко і С.У. Кабяка з'ўляецца спроба аднавіць праўду пра роспуск у 1938 годзе КПП. Яны звярнулі ўвагу на тое, што трагедыя польскага, заходнебеларускага і заходнеўкраінскага руху пачалася яшчэ ў 1933–1934 гадах, калі шмат вядомых дзеячоў партыі былі ілжыва абвінавачаны ў "здрадніцтве" і падвергнуты жорсткім рэпрэсіям. Гісторыкі паведамілі, што ў сакавіку 1936 года бюро ЦК КПЗБ зацвердзіла камісію для праверкі кіруючага актыву партыі. На месцах пры акруговых камітэтах КПЗБ склікаліся спецыяльныя "камісіі чысткі" для барацьбы з "правакацыяй", якія па прычыне як быццам бы сувязі з дэфензівай выключалі людзей з партыі. Праект жа пастановы Выканкама Камінтэрна аб роспуску КПП з'явіўся яшчэ ў 1937 годзе. Акцэнтуючы ўвагу на незаконнасці роспуску гэтых партый, даследчыкі пераканаўча сцвярджалі, што кіраўніцтва Камінтэрна не мела права распускаць партыю, тым больш тую, якая ўдзельнічала ў яго стварэнні [347; 515, с. 93–94].

Прыцягвае ўвагу грунтоўнае даследаванне Ю.В. Грыбоўскага, прысвечанае знаходжанню беларусаў у польскіх вайсковых фарміраваннях, якое змяшчае асобны раздзел "Дзейнасць палітычных партый сярод вайскоўцаў-беларусаў" [168, с. 114–155]. Аўтар адзначыў найбольшую актыўнасць КПЗБ і БСРГ у правядзенні палітычнай агітацыі сярод вайскоўцаў, а таксама арганізацыі шпіянажу, схілення да дэзерцірства. На прыкладзе 9-га корпуса аўтар сцвярджае, што ў параўнанні з вайскоўцамі-яўрэямі, менавіта сярод якіх былі заўважаны найчасцейшыя выпадкі ўдзелу ў распаўсюджванні літаратуры КПЗБ, вайскоўцы-беларусы ў асноўным заставаліся ў баку ад палітычнага жыцця [168, с. 125].

Няма падстаў ігнараваць публікацыі В.П. Ласковіча, загартаванага і дысцыплінаванага камуніста, які ў сваіх кнігах ажыццявіў спробу стварэння ўласнага вобраза КПЗБ, закрануў асноўныя пытанні яе гісторыі, у тым ліку роспуск партыі [442; 745]. У сувязі з апошнім неабходна адзначыць, што пытанне афіцыйнага спынення дзейнасці КПП, КПЗБ і КПЗУ трэба разглядваць у тым ліку ў сувязі з палітычнымі рэпрэсіямі ў БССР і СССР і храналагічна раней, чым у 1938 годзе. Вядома, што яшчэ ў 1935 годзе недавер да КПЗБ з боку НКУС рэалізаваўся ў выглядзе звужэння магчымасцей для ажыццяўлення канспіратыўнай сувязі кампартыі з тэрыторыяй БССР. 3 снежня 1935 года кіраўнікі пагранічных атрадаў атрымалі ад начальства сакрэтную шыфратэлеграму, паводле якой трэба было тэрмінова ліквідаваць "усе асаблівыя пераправы КПЗБ", лічыць

несапраўднымі "ўсе раней дзейсныя правілы, прынятыя паролі для ўезду ў СССР з Польшчы па лініі МОПРа ці іншых арганізацый (Камінтэрн)" [692, с. 47]. Наколькі апраўданымі былі такія дзеянні ў тагачасных умовах можна меркаваць з таго, што ў шэрагах кіруючага складу кампартыі сапраўды працавалі агенты і канфідэнты польскіх выведак [933]. Пра гэта сведчаць і дакументы дзяржпаліцыі. У прыватнасці, 17 красавіка 1934 года павятовая ўправа дзяржаўнай паліцыі ў Століне разаслала паведамеленне камендантам усіх пастарункаў аб тым, што ў снежні 1933 года на XIII пленуме Выканкама Камінтэрна прынята рашэнне аб правядзенні ў другой палове 1934 года VII кангрэса Камінтэрна (адбыўся 25 ліпеня – 20 жніўня 1935 года ў Маскве). Прэзідыум Выканкама камінтэрна павінен прыгатаваць на 1 красавіка 1934 года парадак дня, вызначыць дакладчыкаў і прадстаўніцтвы дэлегацый на пасяджэннях секцый Камінтэрна, да гэтага часу цэнтральныя камітэты ўсіх кампартый павінны ўнесці свае прапановы ў парадак дня [237, арк. 44]. Зразумела, што такога кшталту інфармацыя магла зыходзіць толькі ад вышэйшых партыйных функцыянераў.

Прыняццю канчатковага рашэння аб спыненні дзейнасці КПП, КПЗБ і КПЗУ садзейнічала сітуацыя пасіўнасці і апатыі, якая склалася ў сярэдзіне 1930-х гадоў у камуністычных арганізацыях Польшчы, у прыватнасці ў КПЗБ. Так, паводле справаздачы партыйнага функцыянера КПЗБ Юркі (псеўданім А.А. Альшэўскага) аб становішчы ў Заходняй Беларусі, якая датавана 1936 годам, складваецца сумная карціна: "Райкамы ў нас звычайна збіраюцца тады, калі гэтага патрабуе член АК ці сакратар АК. А калі да іх ніхто не прыйдзе, то камітэты ў большасці выпадкаў і не збіраюцца". Тое самае канстатавалася ў дачыненні і да мясцовых ячэек КПЗБ [593, арк. 36, 37].

Разважаючы адносна падзей, якія суправаджалі роспуск КПЗБ, неабходна асобна спыніцца на праблеме рэпрэсій у адносінах да былых членаў КПЗБ з боку савецкай улады. У навуковай літаратуры маюцца толькі згадкі пра гэтую трагічную старонку гісторыі [728; 729; 744; 745]. Пра апошнія дні нават Б. Тарашкевіча маем толькі фрагментарныя звесткі, не кажучы пра менш знакамітых рэпрэсаваных, напрыклад, І.Ф. Сяменікава, які "выстаяў, не падпісаў ілжэпратаколаў, як патрабавала следства", і тым самым выратаваў ад растрэльнага лёсу сябе і многіх іншых [875]. Акалічнасці арышту, знаходжання пад следствам, пакарання, умовы партыйнай рэабілітацыі і наступны лёс былых сяброў КПЗБ патрабуюць мэтанакіраванай пошукавай працы ў архівах і актуалізуюць падрыхтоўку адпаведнага выдання.

Выклікае цікавасць сваім крыніцавым забеспячэннем даследаванне М.С. Міцковіча, якое дэталізуе і ўдакладняе гісторыю камуністычнага падполля на тэрыторыі сучасных Брэскага, Жабінкоўскага і Кобрынскага

раёнаў. На падставе польскіх крыніц, у асноўным судовых спраў, аўтар раскрывае драматычныя аспекты ўнутрыпартыйнага жыцця як часткі сацыяльна-эканамічнай паўсядзённасці сельскага насельніцтва Заходняй Беларусі, выкрывае і асуджае наўмыснасць камуністычных дзеячаў у распальванні сацыяльнай варожасці, эскалацыі напружанасці і канфрантацыі на мясцовым узроўні [544].

Аналізуючы даследаванні і публікацыі 1990–2000-х гадоў, неабходна адзначыць іх унёсак у паглыбленне аб’ектыўнай гісторыі КПЗБ. У прыватнасці гэта тычыцца праблемы “сэцэсіі” – беларускай нацыянальнай фракцыі ў КПЗБ, якая мела важнае значэнне для заходнебеларускага камуністычнага руху ў сярэдзіне 1920-х гадоў [730; 737; 751; 752]. Сёння відавочна палітызаванымі бачацца высновы савецкіх даследчыкаў аб варожасці ўдзельнікаў названай беларускай партыйнай групоўкі, якія грунтаваліся на ўяўленнях, што сфарміраваліся ў 1920–1930-я гады ва ўмовах вострага ідэйна-палітычнага супрацьстаяння. У тым ліку з падачы і “падказкі” следчых НКУС, якія выбівалі паказанні накшталт тых, што даў А. Капуцкі пра “сэцэсію”, якая, “як і Грамада, Змаганне, ТБШ – форма барацьбы польскай дэфензівы з камуністычным рухам у Заходняй Беларусі” [6, с. 56], а таксама Б. Тарашкевіч [29; 80]. Дзеля далейшага асэнсавання феномену “сэцэсіі” значнай падставай павінны быць адносіны да яе А. Луцкевіча, які назіраў, як “дружна Масква і Варшава “выкручвалі рукі” сэцэсіянэрам, запалохвалі іх і спакушалі дабротамі, як наладзілі паляваньне на Міхала Гурына-Маразоўскага”, і пісаў пра крывадушнасць польскіх камуністаў і пратэст беларускіх камуністаў “проці нацыянальнае палітыкі Варшавы… проці вялікадзяржаўных імкненьняў польскага камунізму” [760]. Трэба ўлічваць і меркаванне А.В. Пашкевіча, які акцэнтаваў увагу на канструктыўнай пазіцыі “сэцэсіі” і яе правадыра М. Гурына-Маразоўскага (Ханевіча) ў беларускім вызваленчым руху [647]. Дзейнасць М. Гурына-Маразоўскага звязана з У.М. Ігнатоўскім, які, накіроўваючы М. Гурына-Маразоўскага ў Заходнюю Беларусь, даваў рэкамендацыі для правядзення адпаведнай працы ў асяродку беларускіх паслоў. Як прызнаў у час допыта У.М. Ігнатоўскі, яго парады, зробленыя разам з А.Р. Чарвяковым, “штурхалі Стаха на вырашэнне пытання, як ён меў месца, г.зн. на раскол. Такім чынам, я прымаў удзел у гэтым расколе, рыхтаваў яго. Я і ўсе мае аднадумцы былі рады расколу. …Частку лістоў да Стаха – якія былі не на карысць мяне, я знішчыў” [8, с. 185–186]. Сувязь удзельнікаў групоўкі з БССР пацвярджаецца членам КПЗБ Гінекманам, які ў сваёй справаздачы ад 8 мая 1925 года распавядаў пра сітуацыю ў партыі ў сувязі з узнікненнем “сэцэсіі”. У гутарцы з ім актыўны ўдзельнік групоўкі Антось (партыйны псеўданім Л. Родзевіча. – *А.С.*) лічыў апублікаванне камуніката “рэвалюцыйным крокам… яны маюць указанне з

Савецкай Беларусі ад адказных работнікаў” [586, арк. 22–23]. Падставай жа для своеасаблівай гістарычнай рэабілітацыі М. Гурына з’яўляюцца словы Янкі Купалы, які асабіста быў знаёмы з ім, і, даведаўшыся пра драматычныя абставіны беларускага руху ў Заходняй Беларусі, забойства Гурына, сказаў: “Мо Гурын не такі ўжо і вінаваты, і суд гісторыі яго апраўдае” [725, с. 76]. В.М. Гліна небеспадстаўна гаварыў пра “сэцэсію” як частку беларускай рэвалюцыйнай інтэлігенцыі, якая прадпрыняла спробу “адмаўлення ад ужывання бальшавізму на Беларусі і пераарыентацыі на сацыял-дэмакратычны шлях развіцця” [137, с. 9]. Магчыма, у справе “сэцэсіі” існавала рука польскіх спецслужбаў, якія, кантралюючы падпольны камуністычны рух, былі зацікаўлены ў яго стратыфікацыі па нацыянальных паказчыках, аслаблялі яго вастрыню. У гэтым сэнсе асоба аднаго з кіраўнікоў “сэцэсіі” “Старога” (Тамашэўскага, Ясінскага) разглядаецца не толькі як ідэйнага правадыра, але і глыбока законспіраванага “чалавека з-за шырмы”, польскага службіста-дэфензіўшчыка, даверанай асобы Ю. Пілсудскага [659].

У айчынных архівах знаходзяцца дакументы, якія дазваляюць карэнным чынам змяніць уяўленне аб гісторыі КПЗБ, асабліва яе пачатковага перыяду. Напрыклад, савецкая гістарыяграфія сцвярджала, што камуністычныя настроі былі натуральнай з’явай грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі, што вытокі камуністычнага руху трэба шукаць у мясцовых арганізацыях Вільні, Беластока, Брэста, Гродна. Аднак ёсць дакументы, якія паказваюць працэс штучнага стварэння камуністычнага асяродку ў выніку актыўнай перакідкі камуністычных элементаў у Польшчу і Заходнюю Беларусь з БССР і СССР, у тым ліку па лініі разведкі 16 арміі [577, арк. 27]. У іх адлюстраваны механізм і сродкі ажыццяўлення гэтых мерапрыемстваў, фінансаванне і арганізацыйнае забеспячэнне. Такім чынам, камуністычны рух фактычна ствараўся савецкімі партыйнымі і вайсковымі органамі. Прынцыпова трэба адзначыць тое, што за ўплыў на тэрыторыі Заходняй Беларусі адбывалася вострае канкурэнтнае суперніцтва паміж КПРП-КПП і КП(б)Б, якія на месцах праз сваіх агентаў стваралі камуністычныя асяродкі, выкарыстоўваючы камуністычныя сродкі Варшавы ці Мінска, ажыццяўлялі агітацыю сярод мясцовага насельніцтва. Пры гэтым камуністычныя дзеячы з Мінска звярталі ўвагу на неабходнасць агітацыі сярод мясцовага сельскага насельніцтва – беларусаў, у той час як “варшавякі” грэбавалі гэтай справай. Таму, відавочна, стварэнне КПЗБ як складовай часткі КПП трэба разглядваць як перамогу польскіх камуністаў і няўдачу беларускіх камуністычных дзеячаў. Характэрным з’яўляецца той факт, што ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь дакументы за 1921–1922 гады, якія ілюструюць працэс стварэння камуністычнага

асяродку ў Брэсце, Беластоку, Вільні, згрупаваны па справах, у назвах якіх маюцца фармулёўкі “Брэсцкая арганізацыя КП(б)Б”, “Беластоцкі акруговы камітэт КП(б)Б” [576; 577].

Што тычыцца ўсталяванага савецкай гістарыяграфіяй тэзіса аб пастаяннай актыўнасці і ўплыве КПЗБ сярод насельніцтва Заходняй Беларусі, то такія сцверджанні абвяргаюцца неаднойчы прыведзенай вышэй архіўнай інфармацыяй. Усталяванню такіх беспадстаўных вобразаў даследчыкамі, акрамя неабходнасці вытрымліваць адпаведныя ідэйна-палітычныя каноны, садзейнічала схільнасць да некрытычнага ўспрыняцця афіцыйнай партыйнай дакументацыі ў выглядзе лозунгаў, улётак, рэзалюцый, якая радыкальна разыходзілася з аналітычнымі паведамленнямі з раёнаў і акругаў. “Арганізацыі ўжо 2 месяцы нічога не рабілі, нягледзячы на тое, што на канферэнцыях прадстаўнік заяўляў, што ў іх праца ідзе добра”, – паведамляў функцыянер ЦК КПЗБ [564, арк. 13].

Існуюць важкія дакументальныя рэсурсы, у першую чаргу асобны 242п фонд у НАРБе, для стварэння гісторыі дзейнасці Бюро дапамогі, а потым Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б, якое было сапраўдным штабам рэвалюцыйнага руху, рэалізоўвала камінтэрнаўскую лінію ў Заходняй Беларусі, аказвала вырашальнае ўздзеянне на заходнебеларускі нацыянальны рух. Ёсць відавочныя крыніцазнаўчыя падставы для паглыблення аб’ектыўнай гісторыі “сэцэсіі”. Напрыклад, у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (Ф. 60. – Воп. 2. – Спр. 253; Спр. 289) захоўваецца згаданае вышэй даследаванне В. Шэваховіча пра БРА і “сэцэсію” [659, с. 60–61; 866], а таксама цэлы шэраг архіўных спраў, якія змяшчаюць інфармацыю пра дадзеную партыйную групоўку і яе правадыроў [581–583; 584, арк. 23–24; 586, арк. 22–23; 588]. Пры гэтым адзначым, што дзеянні “сэцэсіі” ў адносінах да кіраўніцтва партыі не вычэрпваюць апазіцыйнасці і няўзгодненасці ў шэрагах КПЗБ. Напрыклад, рэзалюцыя ЦК КПЗБ па дакладзе Гродзенскага акруговага камітэта ад 20 кастрычніка 1926 года канстатавала “несур’ёзныя адносіны АК да дырэктыў ЦК, а ў адным выпадку нават прамое парушэнне іх…” [563, арк. 58–59].

Уважлівае знаёмства з айчыннай гістарыяграфіяй гісторыі КПЗБ патрабуе кваліфікаванага навуковага адказу на пытанні: “Наколькі Камуністычная партыя Заходняй Беларусі была не па назве, а па сутнасці беларускай палітычнай арганізацыяй?” “Ці былі накіраваны яе лозунгі барацьбы за беларускую мову, нацыянальную школу, самавызначэнне Заходняй Беларусі на карысць беларускага народа, а не з’яўляліся тактычным захадам для ўмацавання пракамінтэрнаўскіх пазіцый і нівіліявання нацыянальнага кампанента ў рэвалюцыйным руху ўвогуле?” [734; 735; 748–750].

Ужо ў сярэдзіне 1990-х гадоў у беларускім друку з’явіліся спачатку ў перыядычных публіцыстычных выданнях, а потым на старонках навуковых гістарычных часопісаў публікацыі, якія ўдакладнялі савецкую гістарыяграфію партызанскага руху ў Заходняй Беларусі. Была выяўлена ваенна-палітычная зацікаўленасць заходнебеларускай партызанкай з боку савецкіх ваенна-палітычных дзеячаў і выкарыстанне яе ў адпаведедных геапалітычных схемах, арганізацыйнае і аператыўнае падпарадкаванне партызанскіх атрадаў аддзелам ДПУ, падтрымка савецкім бокам пракамуністычных партызанскіх аддзелаў. На падрыўную дзейнасць чэкісцкіх “партызанаў” Масква не шкадавала ні зброі, ні чырвонцаў, адрываючы сродкі ад галадаючых расіян, даводзіў Л. Фадзееў, называючы К.П. Арлоўскага маскоўскім чэкістам, спецыяльна падрыхтаваным Масквой для дыверсійнай і выведвальніцкай работы супраць Польшчы [837].

Больш змястоўным з’яўляецца артыкул Ю. Стасевіча, які ў свой час сам быў удзельнікам партызанскага руху ў Заходняй Беларусі. Гэтая праца выйшла яшчэ ў 1978 годзе ў эміграцыі і была перавыдадзена ў Беларусі ў 1995 годзе. Ю. Стасевіч назваў Ваўпшасава, Арлоўскага, Каржа і Рабцэвіча чэкістамі-дыверсантамі, бо яны былі не партызанамі, але працаўнікамі савецкай контрразведкі – “Чака”, перакінутыя ў Заходнюю Беларусь для дыверсійных акцый. Аўтар звярнуў увагу на самы актыўны ўдзел у “партызанцы” эсэраў (Г. Шыманюк – “актыўны эсэр Горадні”). Па інфармацыі даследчыка, у Вільні дзейнічала група левых эсэраў на чале з братамі Канчэўскімі і Лагіновічамі, якія на грунце БНР перайменаваліся ў БРА і пачалі ствараць баявыя ўзброеныя атрады для паўстання. Але партызанскія фарміраванні БРА пасля ўліцця яе ў склад КПЗБ былі падпарадкаваны кіраўніцтву савецкага чэкіста-дыверсанта – не беларуса, Ваўпшасава, і выконвалі загады Масквы.

Ю. Стасевіч узняў важную праблему спынення ўзброенай барацьбы, лічыў, што з 1924 года польскія камуністы дамагаліся спынення партызанскай барацьбы ў Заходняй Беларусі, бо гэта як быццам бы аслабляла рэвалюцыйны рух у самой Польшчы. Беларускія камуністы, наадварот, дамагаліся ісці за хваляй партызаніўшых сялян, дапамагаць ім у гэтым. У многім з гэтай спрэчкай было звязана ўтварэнне ў КПЗБ “сэцэсіі”, калі ўсе беларусы з ЦК КПЗБ, з акругаў, сельскіх ячэек адкрыта выступілі супраць “расейскага і польскага камандавання”. Але паколькі ў гэтай спрэчцы атрымала перамогу “маскоўская лінія” на згортванне партызанскага руху, заходнебеларуская партызанка была спынена, сцвярджаў Ю. Стасевіч. Увогуле ж партызанка Заходняй Беларусі 1919–1925 гадоў была спачатку часткова стыхійнай, а потым “арганізавана сцісла пад сцягам БНР”. Застаецца незразумелым, чаму разважанні аб “нейкіх сутыках яе (заходнебеларускай партызанкі. – *А.С.*) з Польскай

уладай” аўтар назваў “звычайнай брахнёй” [799]: антыпольскія дыверсійна-тэрарыстычныя акцыі беларускіх паўстанцаў у Заходняй Беларусі мелі месца [800, с. 279; 845, с. 99–100].

На адчувальнае значэнне эсэраў у партызанскім руху і вызначальнай ролі савецкага кіраўніцтва ў дзейнасці камуністычных партызанскіх аддзелаў звярнуў увагу і А.П. Грыцкевіч. Выкрываючы крывадушнасць бальшавіцкага кіраўніцтва, аўтар асудзіў Савецкую Расію – СССР, якая, падпісаўшы мірную дамову з Польшчай, пачала “рыхтаваць ды інспіраваць паўстанцкі рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1922 гг. І хаця значная частка партызанскіх аддзелаў ствралася беларускімі эсэрамі, паступова Кампартыя Заходняй Беларусі, якая накіроўвалася зь Менска й Масквы, у 1924–1925 гг. апанавала кіраўніцтва партызанскім рухам”. Даследчык у агульных рысах паведаміў пра стварэнне ў БССР і наступную перакідку праз мяжу партызанскіх аддзелаў, якія ў Заходняй Беларусі абрасталі мясцовымі сіламі, дадаючы інфармацыю пра “чэкісцкае” паходжанне камандзіраў такіх партызанскіх адзінак. Так, на думку А. Грыцкевіча, “ішоў экспарт рэвалюцыі” [169, с. 56]. Пра імкненне Масквы прадставіць партызанскі рух як вызваленчую барацьбу беларускага і ўкраінскага народаў супраць польскай акупацыі, падрыхтоўку грамадскай думкі да будучага далучэння Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі да СССР гаварыў М.М. Мезга [519, с. 29–31].

Тэзіс аб вызначальнай ролі КПЗБ у арганізацыі ўзброенага супраціўлення з цяжкасцю, але паступова паддавалася ўдакладненню. Так, У.Ф. Ладысеў у працах сярэдзіны 1990-х гадоў звярнуў увагу на ўдзел у партызанскай барацьбе пачатку 1920-х гадоў прадстаўнікоў розных палітычных плыняў – камуністычнага напрамку і дэмакратычнага беларускага лагеру. Аднак пра “актыўны ўдзел Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў” у разгортванні партызанскай барацьбы ў шэрагу паветаў Заходняй Беларусі ў 1921–1923 гадах даследчык згадаў “разам з падпольнымі камуністычнымі арганізацыямі” [417, с. 179; 420, с. 82]. Вядома, што камуністычны ўплыў у партызанскім руху пачаў выразна праяўляць сябе толькі пасля стварэння КПЗБ, якая павінна была перахапіць ініцыятыву ад беларускіх груповак, у тым ліку і эсэраўскіх, якія да гэтага часу паспелі закласці арганізацыйныя падмуркі партызанкі і ажыццявіць вялікую колькасць гучных акцыяў. Больш таго, па слушным меркаванні А.І. Мурашкі, менавіта БПС-Р узначаліла радыкальную плынь нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі на першапачатковым яго этапе [550, с. 16].

Паступова гістарыяграфія праблемы пачала ўзбагачацца напрацоўкамі, якія грунтаваліся на значнай крыніцазнаўчай базе. Заўважанай з’явай у гістарыяграфіі партызанскага руху ў Заходняй Беларусі

пачатку 1920-х гадоў стала даследаванне М.П. Касцюка [335, с. 180–195]. У ім аўтар на падставе расійскіх архіўных матэрыялаў пацвердзіў думку аб прамой падтрымцы партызанскага руху ў Заходняй Беларусі з боку кіраўніцтва СССР і БССР. Пэўнай навізной адрозніваліся працы У.Ф. Ладысева [420], І.І. Коўкеля і А.М. Чарнякевіча [365; 366] і В.М. Хвірысюка, які даследаваў паўстанцкі рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі [845; 846]. У іх пададзены асноўныя падзеі арганізацыі партызанскага руху, у першую чаргу эсэраўскага накірунку, яго сувязі і падтрымкі з боку Літвы і ўраду БНР В. Ластоўскага, супрацоўніцтва беларускіх эсэраў з камуністычнымі ўладамі БССР.

Неабходна звярнуць увагу на штучны разрыў храналогіі гісторыі "заходнебеларускай партызанкі", як і ўвогуле беларускага нацыянальнага руху, падпісаннем Рыжскага міру і ўстанаўленнем традыцыі разгляду адпаведных падзей у рамках перыяду 1921–1939 гадоў. Адзначаныя падзеі атрымалі свой пачатак яшчэ раней, напрыклад, партызанскі рух у Заходняй Беларусі быў лагічным працягам антыпольскага змагання ў часы польска-савецкай вайны. На гэта звярталі ўвагу беларускія даследчыкі яшчэ ў канцы 1930-х гадоў [289, с. 53]. І.І. Коўкель і А.М. Чарнякевіч небеспадстаўна вытокі антыпольскага партызанскага руху бачаць яшчэ ў 1915 годзе, калі ў выніку амаль суцэльнай эвакуацыі Віленскай і Гродзенскай губерняў была парушана нацыянальна-рэлігійная раўнавага: большая частка праваслаўнага насельніцтва пакінула сваю гаспадарку, а каталікі ў большасці засталіся, так польская меншасць стала дамінаваць у краі [365, с. 254].

Такім чынам, у айчыннай гістарыяграфіі існуюць падставы метадалагічнага і крыніцазнаўчага характару для распрацоўкі гісторыі партызанскага руху на манаграфічным узроўні. Асаблівай увагі патрабуе вызначэнне ролі і адносін у арганізацыі "партызанкі" Беларускага вайскова-палітычнага камітэту, Беларускага брацтва, Саюза сялянскай самаабароны, Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі і інш.

У параўнанні з папярэднім перыядам у постсавецкі час атрымала паглыбленае даследаванне гісторыя беларуска-польскага памежжа, на фоне якога ў 1920–1930-я гады інтэнсіўна разгортваліся падзеі ўзброенага і эканамічнага характару, якія стваралі добрую глебу для выказвання свайго незадавальнення станам жыцця па абодва бакі мяжы. Гэта актыўна выкарыстоўвалі розныя палітычныя сілы для інспірацыі адпаведных ваенна-палітычных настрояў і асяродкаў [181; 182; 278–280; 381–384; 519; 713; 714; 843]. "Памежны пас" быў той тэрыторыяй, на якой разгортваліся нябачныя падзеі не толькі актыўнай дзейнасці кантрабандыстаў-перамытнікаў, пра якія захапляльна расказаў С. Пясецкі [694]. Тут адбывалася супрацьстаянне польскай і савецкай спецслужбаў. Савецкая разведка шырока выкарыстоўвала падпольныя магчымасці камуністычнай

партыі, забяспечваючы функцыянаванне праходаў праз мяжу, пераправу грошай і літаратуры ва ўзаемадзеянні з пагранатрадамі [449; 589]. Польскія ўлады пра гэта ведалі, паводле інфармацыі Брэсцкай павятовай каменды да камісараў усіх пастарункаў ад 25 лютага 1927 года, “усе камуністычныя ці камунізуючыя арганізацыі застаюцца на паслугах савецкай разведкі” [225, арк. 140]. У гэтае супрацьстаянне ўцягваліся прадстаўнікі самых розных слаёў насельніцтва, але найперш беспрацоўныя жыхары мястэчак і вёсак, нават дзеці. Паказальнай з’яўляецца справа Фёдара Паўлючэнкі, уцягнутага ў дзейнасць разведвальна-дыверсійнай групы, створанай на палескім памежжы прадстаўнікамі ДПУ Магазінэрам, Веліканавым, Майбуком, пакаранага смерцю польскай уладай, і яго апанента – Міхаіла Борсука, які арганізоўваў разведку на савецкай тэрыторыі і напады на “савецкія дыверсійныя атрады”. Пазней быў выкрадзены завербаванымі ДПУ польскімі грамадзянамі і памёр ад ран, атрыманых у час яго затрымання савецкімі агентамі [219, арк. 2, 4, 5, 11, 13–16 адв., 21, 47–55; 234, арк. 82–90]. Аналагічную цікавасць выклікае гісторыя этнічнага паляка, каталіка Юзафа Сцяблеўскага, які браў удзел у разведвальна-дыверсійных акцыях, арганізаваных ДПУ, быў прыгавораны да пакарання смерцю, але пайшоў на супрацоўніцтва са следствам і атрымаў доўгае турэмнае зняволенне [220, арк 41–46, 53–54]. Паралельна з падзеямі такога кшталту адбывалася арганізацыйнае і матэрыяльна-фінансавае забеспячэнне левaрадыкальных беларускіх арганізацый.

Архіўныя дакументы змяшчаюць шмат інфармацыі пра выкарыстанне актуалізаванага і пэўным чынам рэалізаванага беларускага пытання разнастайнымі палітычнымі сіламі, якія на беларуска-польскім памежжы стваралі ўзброеныя атрады як быццам з мэтай вызвалення Беларусі [211; 234–237; 240; 241; 246]. Такая інфармацыя патрабуе ўважлівага навуковага аналізу, суаднясення і супастаўлення з дакладнымі звесткамі аб узброеных сутычках у пачатку 1920-х гадоў паміж савецкімі, польскімі, літоўскімі і беларускімі сіламі. Тым больш, што, паводле справаздачы Пінскай экспазітуры дэфензівы камандавання 2 Арміі адносна выкрытай бальшавіцкай паўстанцкай арганізацыі прадстаўніка рэўваенсавета Заходняга фронту Ёўлева (Jowlewa), “праца тая праводзілася патаемна, што нават не ўсе члены той арганізацыі ведалі, што акцыяй кіруюць саветы”, а былі перакананы, што гэта ёсць рух беларускі [211, арк. 201].

На фоне ваяўнічага атэізму і выразна негатыўнага стаўлення савецкай гістарыяграфіі да рэлігіі, асабліва каталіцкай царквы, відавочнай адметнасцю айчыннай гістарыяграфіі Заходняй Беларусі 1990–2000-х гадоў з’яўляецца імкненне ўсебакова даследаваць канфесійную гісторыю, вызначыць месца і ролю рэлігійных дзеячаў у барацьбе за свабоду сумлення і іх значэнне ў нацыянальна-вызваленчым руху. Пашырэнне

прадмета заходнебеларускай праблематыкі можна назіраць і ў дачыненні гісторыка-канфесійнай праблематыкі. На старонках беларускіх выданняў айчынныя гісторыкі шматаспектна адлюстравалі праблемы ўдзелу праваслаўных, каталіцкіх, уніяцкіх і пратэстанцкіх святароў і вернікаў у вырашэнні задач нацыянальна-вызваленчага руху. Такі падыход выразна выяўляецца ў згаданых даследаваннях А.М. Вабішчэвіча, Т.В. Лісоўскай (Пісарук), Э.А. Мазько, А.М. Свірыда, А.Г. Цымбала і іншых працах [160–162; 272; 273; 309; 466; 467; 471; 490; 690; 808].

Адной з праблем царкоўнага жыцця Заходняй Беларусі была неабходнасць правядзення яго беларусізацыі, якая сустракала перашкоды як з боку каталіцкага (пераважна палякі), так і з боку праваслаўнага духавенства (пераважна рускія). Як справядліва адзначыў А. Загідулін, “беларусізацыя царквы мела для Польшчы шэраг непажаданых момантаў, бо царква як духоўная арганізацыя магла паспрыяць росту беларускай нацыянальнай самасвядомасці і актывізацыі беларускага нацыянальнага руху. ...Галоўнай мэтай польскіх улад адносна праваслаўнай царквы было імкненне адаптаваць яе да ўмоў польскай дзяржавы, стварыўшы з яе інструмент для ўплыву на праваслаўнае насельніцтва Заходняй Беларусі” [274, с. 231]. Варта адзначыць тое, што БХД, правадырамі якой былі каталікі, праяўляючы найбольшую актыўнасць у справе ўвядзення беларускай мовы ў набажэнства, шмат увагі надавала праблемам беларусізацыі праваслаўнай царквы, адстойвала ідэі спрадвечнага адзінства беларускага народа ў яго гістарычным жыцці [493, с. 190]. Некаторыя праваслаўныя святары, сустракаючы адпаведную агітацыю з боку БХД, схільныя былі ўспрымаць яе і пашыраць сярод вернікаў, як, напрыклад, А. Бяляеў, які ў вёсцы Бабры Лябядскай гміны Лідскага павета распаўсюджваў “Беларускую крыніцу” [242, арк. 87].

Аб палітычным значэнні ўніяцкага пытання пісаў А.М. Свірыд, адзначаючы, што ў рэалізацыі ідэй уніі адбывалася вострая канкурэнцыя, у тым ліку паміж польскімі і беларускімі рэлігійнымі дзеячамі. Так, БХД адзіным шляхам дасягнення рэлігійнага і нацыянальнага адзінства беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі лічыла царкоўную унію, таму заўсёды гаварыла пра неабходнасць новай спробы аб’яднаць каталіцкую і праваслаўную цэрквы. Беларуская хадэцыя заклікала асцерагацца ўсялякіх спроб польскіх палітыкаў пашырыць унію, бо “лічыла неаунію палітычным актам, з дапамогай якога Польшча імкнулася пашырыць свой уплыў на беларускае насельніцтва”, таму “пакуль гэтая справа не будзе вырвана з польскіх рук, яна асуджана на смерць” [755, с. 65–66, 70]. Ідэі нівелявання адрозненняў паміж праваслаўнымі і каталікамі і аб’яднання ўсіх беларусаў у “адзінай нацыянальнай сям’і” выспявалі і ў асяродку актывістаў Праваслаўнага беларускага дэмакратычнага аб’яднання [864, с. 268].

Важна адзначыць фарміраванне навуковага інтарэсу да пратэстанцкай праблематыкі як перадумовы для палітычнага аб'яднання заходнебеларускага грамадства ў накірунку рэалізацыі задач нацыянальна-вызваленчага руху [465–467; 471; 669–671; 690]. Як адзначыў А.В. Пашкевіч, "многія беларускія дзеячы зь ліку тых, якія тым ці іншым чынам супрацоўнічалі з пратэстантамі, мелі ў душы надзею, што пратэстанцтву можна будзе надаць беларускі нацыянальны характар і зрабіць яго альтэрнатывай глыбока прапольскаму Рыма-Каталіцкаму касьцёлу і ня менш глыбока прарасейскай Праваслаўнай царкве". Пры гэтым многія беларускія дзеячы, якія станоўча пазіцыянавалі сябе ў дачыненні да пратэстанцкіх дэнамінацый, глядзелі на пратэстантызм як на сродак палітычнай агітацыі і вырашэння фінансавых пытанняў, "бальшыня… беларускіх дзеячоў, падобна на тое, наагул ад пачатку і да канца глядзела на справу стасункаў з мэтадыстамі выключна прагматычна" [649].

Што тычыцца праблематыкі рабочага і сялянскага руху, то поспехі яе распрацоўкі і пашырэння ў асноўным былі звязаны з даследаваннямі А.А. Румака, В.В. Даніловіча, М.Б. Сямёнчыка, А.В. Пашкевіча. Яны надалі метадалагічную дакладнасць фактаграфічным напрацоўкам савецкага перыяду, разам з гэтым значна абнавілі і пашырылі прадметны бок даследуемай праблематыкі. У першую чаргу гэта тычылася пастаноўкі і вырашэння пытанняў арганізацыі рабочага і сялянскага руху на ўзроўні міжпартыйнага ўзаемадзеяння. Аднак трэба адзначыць наяўнасць у асобных працах схільнасці да ўспрымання і трансляцыі гістарыяграфічных схем савецкага часу на падзеі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Некаторыя публікацыі, прысвечаныя сялянскаму руху, выразна праяўляюць своеасаблівы КПЗБцэнтрызм. Гэта прыводзіць, у прыватнасці, пры перыядызацыі сялянскага руху да выдзялення асобнага перыяду "Сялянскі рух у гады нарастання пагрозы вайны і ліквідацыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (1934 – верасень 1939 г.)" [124; 174; 180]. Дадзеныя высновы прыводзяць да замоўчвання ролі іншых партый у арганізацыі масавага руху, у тым ліку буйных агульнапольскіх аб'яднанняў – ППС, "Вызволення", Бунда. А між іншым менавіта гэтыя партыі верхаводзілі ў рабочым і сялянскім руху, удала супрацьстаялі рашучым спробам кампартыі перахапіць ініцыятыву ў арганізацыі рабочых і сялянскім мас, канкурыравалі з кампартыяй і падкантрольнымі ёй беларускімі арганізацыямі.

Па пытаннях рабочага руху з пачатку 1990-х гадоў пачаў заўважацца паступовы адыход ад усталяваных марксісцка-ленінскай традыцыяй пастулатаў. Паказальным у гэтым сэнсе з'яўляецца даследаванне І.В. Палуяна. Разважаючы аб развіцці рабочага руху ў 1929–1933 гадах, даследчык традыцыйна гаварыў пра выключнасць становішча і ролі рабочага класу ў нацыянальна-вызваленчым і асабліва ў рэвалюцыйным

руху, нагадаў, што “прамысловы пралетарыят быў у авангардзе рэвалюцыйных сіл, стаяў на пярэднім краі класавых бітваў”. Аднак, маючы на ўвазе раскол у рабочым руху як галоўную прычыну яго слабасці, частых няўдач і паражэнняў, І.В. Палуян адказнасць за іх “падзяліў” паміж усімі ўдзельнікамі тагачаснага палітычнага працэсу, у тым ліку ўсклаў яе на КПЗБ. Супярэчнасці паміж камуністамі і сацыялістамі, іншымі дэмакратамі аказаліся надта глыбокімі, а намаганні іх пераадолець несуразмерна малымі, лічыў даследчык. Да ўсведамлення гэтай ісціны многія камуністы, кіраўнікі партый прыйшлі са значным спазненнем, падвёў рысу гісторык [684, с. 134–135].

Суперніцтву палітычных партый і арганізацый за ўплыў на прафсаюзы шмат увагі ўдзяліў А.А. Румак [722–724]. Ён справядліва абумоўліваў удзел прафсаюзаў Заходняй Беларусі ў палітычным жыцці грамадства галоўнай мэтай – абаронай сацыяльна-эканамічных інтарэсаў працоўных. Палітычныя партыі імкнуліся да распаўсюджвання сваіх уплываў на прафсаюзы, самыя масавыя і арганізаваныя аб’яднанні працоўнага насельніцтва, каб падпарадкаваць іх дзейнасць дасягненню сваіх палітычных мэтаў. Барацьба палітычных партый паміж сабой за прафсаюзы наносіла сур’ёзную шкоду адзінству класавага прафесійнага руху. Закранаючы пазіцыю і тактыку КПП і КПЗБ адносна прафсаюзаў у канцы 1920-х гадоў, А.А. Румак сцвярджаў, што прэтэнзіі камуністаў на аднаасобнае кіраўніцтва рабочым рухам, непрыманне імі любых мірных форм абароны сацыяльна-эканамічных інтарэсаў працоўных і беспадстаўнае абвінавачванне сацыял-дэмакратаў у фашызме пашырала мяжу паміж рабочымі рознай палітычнай арыентацыі. Але, даводзіў даследчык, гэты паварот у дзейнасці камапртый быў выкліканы працэсамі ва ўсім камуністычным руху таго часу [722, с. 16–17].

Пытанні рабочага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў сталі прадметам даследавання М.Б. Сямёнчыка [812–815; 817; 818]. Гісторык даводзіў, што рабочы рух у Заходняй Беларусі быў раз’яднаны і ідэйна, і арганізацыйна. Даследчык выдзяліў тры асноўныя палітычныя сілы, якія змагаліся за дамінуючае становішча ў асяродку рабочага класа: камуністычная (КПП, КПЗБ і шэраг арганізацый, што знаходзіліся пад іх уплывам); рэфармісцкая (у першую чаргу ППС, потым Партыя Беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Беларуская партыя незалежных сацыялістаў, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Бунд, Паалей-Цыён (левіца і правіца) і некаторыя іншыя); праўрадавая плынь, у якую ўваходзілі праўрадавыя (санацыйныя) партыі. Адным з вынікаў працы М.Б. Сямёнчыка стала выпрацаваная ім перыядызацыя прафсаюзнага руху ў Заходняй Беларусі [817, с. 9–10]. Аднак, аўтару не заўсёды ўдавалася пазбегнуць выразнага імкнення паказаць станоўчую ролю камуністаў у рабочым руху. Іх

удзел, даводзіў М.Б. Сямёнчык, надаваў выступленням востры, наступальны і палітычны характар. Паколькі дзейнасць КПЗБ арыентавалася на аб'яднанне намаганняў усіх сіл рабочых, вынікала, што рабочыя выступленні абавязкова павінны былі мець рэвалюцыйную скіраванасць. Адначасова аўтар прызнаў важную ролю ў рабочым руху ППС і Бунда, якія арганізавалі многія выступленні рабочых. Пад вывескамі гэтых партый і ў рамках іх левага крыла дзейнічалі камуністы, меркаваў аўтар.

Агульнавядома, што колькасць беларусаў сярод рабочых, у параўнанні з колькасцю яўрэяў і палякаў, была невялікай. Разлічваць на беларусаў у рабочым руху – справа, відавочна, ненадзейная. Нельга гаварыць і пра сур'ёзную канкурэнцыю з боку беларускіх палітычных партый буйным агульнапольскім партыям ППС і Бунду, якія лідзіравалі ў рабочым руху. Беспадстаўнай уяўляецца гаворка пра імкненне беларускіх эсэраў, партыі з відавочна сялянскай скіраванасцю, верхаводзіць у рабочым асяродку, як і нельга адносіць БПС-Р да рэфармісцкіх сілаў. М.Б. Сямёнчык, напрыклад, як адмоўную рысу ППС і Бунда сцвярджаў, што яны, як і праўрадавыя партыі, імкнуліся раз'яднаць агульнарабочы рух за паляпшэнне эканамічнага і сацыяльнага становішча, што яны на працягу ўсяго перыяду цвёрда стаялі на пазіцыі стварэння прафесійных аб'яднанняў рабочых па нацыянальнай прыкмеце, што выступленні і патрабаванні рабочых яны імкнуліся звесці да вырашэння толькі эканамічных праблем. Такая пастаноўка пытання, як падаецца, не зусім лагічная, бо гэтыя партыі – рэфармісцкі – аб'ядноўвалі рабочых пад адпаведнымі нацыянальнымі сцягамі, дабіваліся вырашэння пастаўленых пытанняў, не даводзячы справу да прымянення радыкальных сродкаў. Таму неабгрунтаваным з'яўляецца сцвярджэнне пра мэтанакіраванае раз'яднанне рабочага руху ППС і Бундам.

Такім чынам, у 1990–2000-я гады ў выніку бачнага ажыўлення даследавання заходнебеларускай праблематыкі, гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху адбылася якасная карэкціроўка канцэптуальнага бачання акрэсленых пытанняў. Адбыўся перагляд і ўдакладненне пытанняў сацыяльна-эканамічнага і дзяржаўна-прававога стану Заходняй Беларусі, адпаведная падача якіх у савецкай гістарыяграфіі прадстаўлялася прычынай незадаволенасці беларускага насельніцтва і ўключэння яго ў барацьбу з “акупацыйным рэжымам”. Аб'ектыўнасць даследаванняў павялічылася за кошт асэнсавання асобных пытанняў на больш шырокім гістарычным фоне, з улікам тэндэнцый сацыяльна-эканамічнага жыцця ў БССР, Заходняй Беларусі і Польшчы ўвогуле. Створаныя яшчэ ў 1920–1930-я гады канцэпцыі аб непрыняцці беларускім народам “улады польскіх паноў”, “польскага фашыстоўскага рэжыму” на самой справе сёння не пацвярджаюцца даследаваннямі і крыніцамі. Ва ўмовах частай

змены палітычных рэжымаў, знаходжання Беларусі на лініі барацьбы паміж Польшчай і Савецкай Расіяй беларускае грамадства, асабліва сялянства, схільна было ўспрымаць любую ўладу, якая забяспечвала нават адносную палітычную стабільнасць і, як мінімум, не перашкаджала наладжваць сваё жыццё. Польская ўлада такую магчымасць давала. Таму не дзіўна, што на беларускім палітычным небасхіле ў 1920–1930-я гады дзейнічалі апрача іншых і паланафільскія арганізацыі, што памяркоўна, лаяльна ставіліся да польскай дзяржаўнасці. Нават свядомыя беларусы, такія як П. Сяўрук, які, па словах польскага гісторыка Е. Тамашэўскага, заслугоўвае памяці як адзін з пачынальнікаў сучаснай беларускай ідэі нацыянальнай незалежнасці. П. Сяўрук гаварыў аб II Рэчы Паспалітай як аб сваёй дзяржаве, якая мае перад сваімі грамадзянамі пэўныя абавязкі і “мусіць задаволіць сваіх грамадзян, а калі яна не хоча іх задаволіць, дык змушана будзе йсці да развалу” [663, с. 7, 51]. Аналагічнага кшталту выказванні аб польскай уладзе выказваюцца і ў іншых публікацыях гісторыка-публіцыстычнага і мемуарнага характару [183–185; 320; 825].

З пачатку 1990-х гадоў у беларускай гістарыяграфіі пачалося ўдакладненне ранейшых фармулёвак, а таксама далейшае паглыбленне праблематыкі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Яны больш глыбока закранaлі прычыны і перадумовы нацыянальна-вызваленчага руху, у тым ліку рэвалюцыйнага, яго накіраванасць і характар. Пацверджана, што рэвалюцыйны рух пад кіраўніцтвам КПЗБ, якая з’яўлялася праваднікам палітычнай лініі УКП(б) і Камінтэрна, быў прыкладам рэалізацыі намераў і імкнення Масквы распаўсюдзіць па Еўропе сусветную рэвалюцыю. Гісторыкі акцэнтавалі ўвагу на тым, што ранейшыя падыходы замоўчвання, ігнаравання беларускіх некамуністычных партый і арганізацый, іх ролі ў нацыянальна-вызваленчым руху прывялі да сур’ёзных дэфармацый прэзентацыі мінулага, бо менавіта яны былі пачынальнікамі барацьбы, яны сфармулявалі асноўныя ідэі беларускага руху, заклалі яго асновы, з якім вымушаны былі лічыцца як польскія ўрадавыя і грамадскія органы, так і арганізацыі іншых сацыяльна-палітычных, нацыянальных накірункаў. Даследаванні беларускіх гісторыкаў 1990–2000-х гадоў відавочна бачацца больш патрыятычнымі, скіраванымі на асэнсаванне заходнебеларускай гісторыі з пазіцый нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў Беларусі. Адбыўся відавочны зрух у накірунку да аб’ектыўнай ацэнкі беларускіх нацыянальных дзеячаў, якія сваімі намаганнямі ажыццяўлялі складаную і, часам, рызыкоўную справу актывізацыі беларускага насельніцтва ў барацьбе за ўсталяванне беларускіх палітыка-ідэалагічных, сацыяльна-эканамічных і этнакультурных прыярытэтаў. Аднак нельга адназначна гаварыць пра дэтэрмінаваны ўласнымі навукова-палітычнымі поглядамі суб’ектывізм беларускіх

гісторыкаў: акрамя станоўчага ў дзейнасці правадыроў беларускага руху ў Польшчы 1921–1939 гадоў гісторыкі не хаваюць ад чытача прыкрыя хібы ў іх поглядах і дзейнасці, якія, разам з неспрыяльнай міжнароднай, унутрыпалітычнай сітуацыяй у Польшчы, БССР і СССР, еўрапескіх краінах, негатыўна адбіваліся на справе кансалідацыі беларусаў вакол нацыянальных каштоўнасцей.

Сучасныя даследаванні звяртаюць увагу на пастаяннае імкненне пракамуністычных сілаў у Заходняй Беларусі актыўна эксплуатаваць лозунгі і здабыткі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Аднак да сёння ў публікацыях сустракаюцца прыклады своеасаблівага КПЗБцэнтрызму і скептычнага стаўлення да нацыянальных беларускіх арганізацый, ігнаравання іх укладу ў згуртаванне беларусаў для адстойвання сваіх інтарэсаў ва ўмовах міжваеннай Польшчы.

Пры вывучэнні беларускага нацыянальна-вызваленчага руху трэба ўлічваць уздзеянне трансфармацый грамадска-палітычнага характару, звязаных з эвалюцыяй падыходаў, поглядаў, форм і метадаў арганізацыі нацыянальна-вызваленчага руху, яго ўзаемадзеяння і залежнасці ад палітычных сіл, фракцый, груповак у польскай палітыцы, УКП(б), КП(б)Б, КПЗБ і Камінтэрна ўвогуле. Трэба мець на ўвазе тое, што польскія і савецкія дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі, не жадаючы ўспрымаць беларусаў як самастойную палітычную сілу, намагаліся так ці інакш скіраваць беларускі рух у зручным ім накірунку, дапасаваць да сваіх відавочных ці патаемных патрэб. Польскія інтарэсы ў дачыненні да беларусага руху былі накіраваны на выкананне планаў, якія зарадзіліся да Рыжскага міру. Напрыклад, памятная запіска арганізацыйнага аддзела “Стражы крэсовай”, адной са шматлікіх польскіх спецслужб, у снежні 1919 года рашуча і адназначна выказвалася аб немагчымасці ігнаравання беларускага руху, які толькі зараджаецца. Больш таго, калі беларускі рух пераўтворыцца ў “сур’ёзны нацыянальны рух”, то ён ні ў якім выпадку не павінен выйсці з поля зроку Польшчы і не павінен развівацца насуперак яе інтарэсам, наадварот, гэты рух павінен быць ёй выкарыстаны. “Аднак, каб гэта магло адбыцца, рух павінен адпаведным чынам карэкціравацца польскімі элементамі, задача якіх – стаць на чале і нават арганізоўваць яго” [297, с. 137]. Нядзіўна, што распачатая ў другой палове 1920-х гадоў у БССР барацьба з нацдэмамі, якая вылілася ў рэпрэсіі супраць беларускіх нацыянальных дзеячаў, у тым ліку тых, хто аддана працаваў на ўсталяванне палітыкі Камінтэрна ў заходнебеларускі руху, абапіралася на такога кшталту інфармацыю. Яскравым пацверджаннем гэтага з’яўляецца асэнсаванне асобы адказнага беларускага камуністычнага дзеяча-дыпламата А.Ф. Ульянава, які шмат зрабіў для рэалізацыі ў грамадска-палітычным руху Заходняй Беларусі прасавецкіх схем, але, нягледзячы на

гэта, быў расстраляны [310]. Відавочна, што інфармацыю аб разнастайных, у тым ліку афіцыйных, сувязях беларускіх дзеячаў з прадстаўнікамі польскай палітыкі мелі на ўвазе арганізатары роспуску КПП-КПЗБ.

Гэтыя, а таксама шматлікія іншыя аргументы і высновы гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў, ствараюць падставы для далейшага ўдасканалення працэсу паўнавартаснай навуковай рэканструкцыі беларускага руху на манаграфічным узроўні. Канцэптуальнае бачанне гісторыі Заходняй Беларусі і беларускага нацыянальна-вызваленчага руху можа быць значна ўзбагачана за кошт метадалагічнай пераарыентацыі даследаванняў ад звышабагульненняў у бок яе індывідуалізацыі і антрапалагізацыі, звароту да гісторыі паўсядзённасці, у прыватнасці паўсядзённасці ў жыцці камуністаў-падпольшчыкаў, мікрагісторыі, гендэрных аспектаў, якія ў цэнтр навуковага асэнсавання паставяць асобу – яна ёсць пачатак любых працэсаў. Неабходна выявіць матывацыю, якая падштурхоўвала людзей да ўдзелу ў падзеях нацыянальна-вызваленчага руху, у тым ліку яго рэвалюцыйнай плыні. А паколькі асноўная маса насельніцтва Заходняй Беларусі былі сялянамі, то асабліва важнай бачыцца неабходнасць распрацоўкі пытанняў гісторыі сельскай паўсядзённасці, мікрагісторыі вёскі – пытанняў, амаль некранутых навукоўцамі. У гэтым накірунку пэўнае значэнне мае прымяненне ў даследаваннях метадаў вуснай гісторыі. На парадку дня айчыннай гістарыяграфіі стаіць задача стварэння грунтоўнага абагульняльнага даследавання па гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.

## 4.3. Перыядызацыя гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі

Асаблівасцю і вартасцю некаторых айчынных даследаванняў былі пададзеныя іх аўтарамі розныя прыклады перыядызацыі вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі. На жаль, большасць даследчыкаў, якія ўздымалі праблемы перыядызацыі, не тлумачылі крытэрыі і не прыводзілі аргументы, па якіх яны дзялілі гэты працэс на адпаведныя перыяды.

Упершыню перыядызацыя вывучэння гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі прапанавана І.П. Хаўратовічам. Аўтар выдзеліў тры перыяды: першы – ад стварэння КПЗБ да яе роспуску, г.зн. 1923–1938 гады; другі перыяд – пасля роспуску КПЗБ да 1956 года; трэці – перыяд інтэнсіўнага вывучэння дзейнасці КПЗБ пачаўся ў другой палове 1950-х гадоў і звязаны з рашэннямі XX з’езда [849, с. 4–5]. Сугучнай думкі адносна перыядызацыі працэсу вывучэння гісторыі КПЗБ прытрымліваўся і К.К. Манкявічус у даследаванні, прысвечаным дзейнасці КПЗБ у Віленскім краі ў 1926–1938 гадах. Гісторык палічыў магчымым працы

савецкіх аўтараў па гістарычных абставінах іх напісання і па ўкладзе ў навуковую распрацоўку дзейнасці КПЗБ на Віленшчыне раздзяліць на тры групы. Да першай групы ён аднёс працы, напісаныя ў перыяд дзейнасці КПЗБ (1923–1938), да другой – даследаванні, якія выйшлі ў перыяд пасля роспуску партыі да яе рэабілітацыі (1938–1956), і да трэцяй – працы, якія выйшлі ў перыяд пасля рэабілітацыі партыі [548, с. 4].

У доктарскай дысертацыі У.Ф. Ладысеў выдзеліў два перыяды ў вывучэнні гісторыі КПЗБ: першы – з канца дваццатых гадоў па 1955 год і другі – з 1956 года, пасля зняцця несправядлівых абвінавачванняў з КПП, КПЗБ і КПЗУ. У сваю чаргу, у першым перыядзе, лічыў даследчык, праглядваюцца два этапы. Першы ахоплівае тэрмін з моманту ўтварэння КПЗБ і да яе роспуску ў 1938 годзе. У артыкулах і брашурах, апублікаваных у той час удзельнікамі рэвалюцыйных падзей, рабіліся спробы тэарэтычна абагульніць практыку рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Яны, справядліва адзначыў даследчык, уяўляюць вялікую цікавасць галоўным чынам як крыніцы, у асобных працах разам з правільнымі ёсць і памылковыя палажэнні і вывады, у прыватнасці, дапускалася пераацэнка правай небяспекі ў кампартыі, няправільна сцвярджалася, быццам бы галоўнымі ворагамі працоўных з’яўляліся не польскія капіталісты і памешчыкі, а “буржуазныя нацыяналісты прыгнечаных нацыянальнасцей”, перабольшвалася ступень рэвалюцыйнасці мас у асобныя перыяды класавай барацьбы. Другі этап, на думку У.Ф. Ладысева, ахоплівае час пасля роспуску партыі да яе рэабілітацыі ў 1956 годзе. У тыя гады гісторыя КПЗБ практычна не распрацоўвалася, а нешматлікія даследаванні былі прысвечаны вывучэнню галоўным чынам сацыяльна-эканамічнага становішча працоўных мас. Роля КПЗБ у развіцці рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху фактычна не паказвалася, што аб’ектыўна прыводзіла да перабольшвання стыхійнасці ў трактоўцы рэвалюцыйнага працэсу [403, с. 4–10].

Неабходна адзначыць, што нават у вывучэнні гісторыі КПЗБ яе афіцыйны роспуск у 1938 год не можа разглядацца як паваротная вяха, а тым больш у даследаванні ўсяго беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і ўвогуле Заходняй Беларусі. Такі паварот адбыўся ў пачатку 1930-х гадоў у выніку палітычных рэпрэсій у дачыненні да беларускіх палітычных дзеячаў, у якіх пацярпелі і беларускія гісторыкі, якія вывучалі Заходнюю Беларусь. Што тычыцца гісторыі КПЗБ, то ўжо ў 1935 годзе зафіксавана адмова ад тэорыі яе “двухкарэннасці”. У гэтым жа годзе савецкае кіраўніцтва пачало згортваць сваю дапамогу заходнебеларускім камуністам, а ў 1936 годзе адбыўся арышт правадыроў польскага і заходнебеларускага камуністычнага руху, што, безумоўна, садзейнічала замоўчванню партыі і яе ролі ў рэвалюцыйным руху, сцвярджэнню тэзіса аб яго стыхійнасці.

Менавіта такія палажэнні вызначалі канцэптуальныя пазіцыі публікацый, якія выходзілі пасля верасня 1939 года.

Закранаючы пытанні развіцця беларускай савецкай гістарыяграфіі Заходняй Беларусі, В.А. Астрога адзначыў няроўную, супярэчлівую і часам нават трагічную дынаміку яе развіцця. Гісторык прапанаваў наступную перыядызацыю па гэтай праблеме: I перыяд. 1921–1929 гады. Ад Рыжскай дамовы да роспуску першапачатковага складу Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі, галоўнай навуковай установы БССР у гэтай галіне, што знаменавала адмаўленне нацыянальна-дзяржаўнага прынцыпу ў даследаваннях па Заходняй Беларусі; II перыяд. 1930–1938 гады. Перыяд звышпалітызаваных і заідэалагізаваных даследаванняў толькі згодна марксісцкай метадалогіі. Значны адсотак займае праблема КПЗБ. У ім вызначаецца падперыяд 1936–1938 гадоў, час разгортвання і апагею рэпрэсій супраць сябраў КПЗБ, што прывяло да рэзкага скарачэння публікацый па ўказанай тэме; III перыяд. 1939–1956 гады. Перыяд пасля роспуску КПЗБ найбольш тэндэнцыйнай гістарыяграфіі рэвалюцыйнага, нацыянальна-вызваленчага руху, сацыялістычных пераўтварэнняў на заходнебеларускіх абшарах. Асобна выдзяляецца даваенны падперыяд 1939–1941 гадоў, першых гадоў пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР; IV перыяд. 1956 – канец 1980-х гадоў. Перыяд інтэнсіўнай навуковай распрацоўкі праблемы, які пачаўся пасля палітычнай рэабілітацыі КПЗБ. Але даследаванні праводзіліся ў рэчышчы афіцыйных патрабаванняў і былі моцна заідэалагізаваны; V перыяд. З канца 1980-х – 1991 гады. Пасля ліквідацыі ідэалагічнага дыктату КПСС, утварэння незалежнай Беларусі, грунтуючыся на разнастайных метадалагічных падыходах, пачынаецца шырокая навуковая дзейнасць па пераасэнсаванні гісторыі Заходняй Беларусі з нацыянальна-дзяржаўных пазіцый [26, с. 158–159].

Прыведзеныя падыходы да перыядызацыі акцэнтавалі ўвагу на 1938 годзе, калі была распушчана КПЗБ. Аднак пагадзіцца з гэтым меркаваннем няма падстаў, запаволенне і звужэнне заходнебеларускай гістарыяграфіі пачалося яшчэ раней. В.А. Астрога справядліва гаворыць пра рэзкае скарачэнне выданняў па ўказанай тэме ў 1936–1938 гадах. Лічаныя публікацыі брашурнага зместу канца 1930-х – пачатку 1940-х таксама не даюць падстаў для пачатку асобнага перыяду – этапу гістарыяграфіі праблемы.

Пытанні перыядызацыі гісторыі Заходняй Беларусі ўздымаліся і ў працах 2000-х гадоў. Пры гэтым трэба звярнуць увагу на відавочныя недакладнасці, якія ўтрымліваюць некаторыя дысертацыйныя даследаванні. Так, напрыклад, А.Т. Цымбал у гістарыяграфічнай частцы сваёй кандыдацкай дысертацыі “Палітыка польскіх улад у адносінах да праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)” гісторыю даследавання адзначанай

праблематыкі дзеліць на “тры асноўныя этапы: 1) міжваенны перыяд; 2) 1940-я – канец 1980-х гг.; 3) 1990-я гг. – пачатак XXI ст.”. Пры гэтым, разважаючы адносна вывучэння тэмы на працягу другога этапу (перыяду? – *А.С.*), аўтар небеспадстаўна сцвярджае, што асноўная ўвага ў даследаваннях “савецкага перыяду” надавалася праблемам нацыянальна-вызваленчай барацьбы рабочых і сялян. Аднак сярод вялікай колькасці навуковых прац па гісторыі КПЗБ аўтар назваў толькі даследаванне П. Зялінскага [862, с. 6–7; 863, с. 11]. Няма адказу на пытанні: што значыць “міжваенны перыяд”? паміж якімі войнамі ён знаходзіцца? што маецца на ўвазе пад выразам “савецкі перыяд”, у які, калі быць дакладнымі, трэба ўключаць 1920–1930-я гады, а таксама амаль цалкам 1991 год?

Э.А. Мазько ў вывучэнні ўплыву БХД на фарміраванне культурнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі вылучыў тры этапы: “1) 30 гг. XX ст. – станаўленне савецкай і заходнебеларускай гістарыяграфіі навуковых даследаванняў Заходняяй Беларусі; 2) 60–80 гг. – перыяд, калі пасля XX з’езда КПСС… пачынаецца комплекснае вывучэнне дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, а таксама партый і арганізацый, звязаных з ёю; 3) кан. 80 – 90 гг. – пачатак навуковага даследавання дзейнасці беларускіх некамуністычных партый і арганізацый міжваеннай Польшчы”. Далей аўтар паведаміў, што Заходняя Беларусь пачала вывучацца яшчэ ў 30–я гады XX ст., калі ў Акадэміі навук была створана спецыяльная навуковая камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі. Пачатак трэцяга перыяду Э.А. Мазько аднёс да канца 1980-х гадоў, звязаў яго з пачаткам дэмакратызацыі грамадства і ўзнікненнем цікавасці да недаследаваных момантаў гісторыі Беларусі, калі з’явілася шэраг работ, аўтары якіх, імкнучыся аб’ектыўна разгледзець дзейнасць партыі, адмаўляюцца ад ранейшай ідэалагічнай зададзенасці. У гэтым ключы напісаны новыя артыкулы У.Ф. Ладысева, дзе зроблены першыя спробы пераацэнкі ранейшых поглядаў [498, с. 5–7]. Агульнавядома, што асвятленне стану Заходняй Беларусі ў складзе II Рэчы Паспалітай пачалося яшчэ ў 1920-я гады, калі былі створаны адпаведныя навуковыя ўстановы, у тым ліку Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі (паводле У.М. Міхнюка створана пры Інбелкульце ў 1926 годзе). Развівалася гістарыяграфія праблемы і ў 1940–1950-я гады. Што тычыцца трэцяга перыяду, то пачынаць яго ў канцы 1980-х гадоў няма падстаў, сам даследчык спасылаецца на працы У.Ф. Ладысева, якія выйшлі ў 1993–1994 гадах. Падобная да гэтай і супярэчлівая думка В.Э. Рабышкі: у “другой палове 1980-х гадоў пачаўся новы этап у асвятленні заходнебеларускай праблематыкі”. Пры гэтым аўтар спасылаецца на даследаванні, самае ранняе з якіх было апублікавана ў 1998 годзе [697, с. 8].

Гістарыяграфічныя даследаванні Э.А. Мазько атрымалі працяг у выглядзе асобнага ёмістага артыкула, апублікаванага на старонках часопіса “Гістарычны альманах” [497]. Новае даследаванне аўтара разам з цікавымі разважаннямі і абгрунтаванымі высновамі адносна працэсу даследавання гісторыі беларускага нацыянальнага руху змяшчае недакладнасці і выклікае пытанні. Аўтар вызначыў тры этапы савецкай гістарыяграфіі беларускага нацыянальнага руху, аднак іх выдзяленне і абгрунтаванне выклікала відавочныя цяжкасці. Так, гісторык назваў першы *этап*[1] – “20-я – першая палова 30-х гг. 20 ст.”, пры гэтым дакладна не патлумачыў падставы такога бачання. Далей ён памылкова разважаў пра сталінскія рэпрэсіі “з сярэдзіны 1930-х гадоў” у дачыненні да камуністычных дзеячаў міжваеннай Польшчы і прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, актыўную распрацоўку органамі дзяржбяспекі версіі аб масавым пранікненні ў шэрагі камуністычнага руху шпіёнаў і агентаў дыфензівы, згадаў ліквідацыю КЗБ, ЗС, замежнай рэдакцыі КПЗБ, сцвярджаў, што “вынікам гэтай палітыкі сталася рашэнне Камуністычнага Інтэрнацыянала аб забароне дзейнасці КПП і КПЗБ у 1938 г.”. Далей названы без храналагічнага вылучэння “даваенны” (працы 1939–1940 гадоў Ю. Дашкевіча, Г. Ягорава, В. Мінаева, Г. Мінскага, Ц. Гарбунова, У. Пічэты, І. Лочмеля) і “паваенны” (манаграфія Ц. Гарбунова) *перыяды*. Аднак гэта не перашкодзіла даследчыку гаварыць пра 1939–1940-я гады як пра асобны перыяд-этап, у выніку чаго канстатавалася нечаканая выснова аб тым, што з’яўляецца “апраўданым вылучыць гэты час у асобны *перыяд* развіцця савецкай гістарыяграфіі беларускага нацыянальнага руху”. Далей у перыядызацыі Э.А. Мазько маецца прагал першай паловы 1950-х гадоў, якую гісторык “пераскочыў”, справядліва пачынаючы чарговы, а па сцвярджэнні аўтара, трэці *этап* “савецкай гістарыяграфіі, які ахапіў перыяд другой паловы 50–80-я гг.”. Акрамя перыядызацыі, артыкул перанасычаны іншымі недакладнасцямі, самай бадай што відавочнай з іх ёсць неаднаразова выяўленае жаданне адасобіць беларускі нацыянальны і сацыяльна-класавы рух, паводле якога атрымліваецца, што КПЗБ да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху аднесці немагчыма. Э.А. Мазько налічыў толькі 3 доктарскія дысертацыі па гісторыі праблемы (са спасылкай на працу У.М. Міхнюка і Л.М. Навіцкай [255, с. 19], якія не маглі ўлічыць доктарскія даследаванні Б.С. Клейна, П.І. Зялінскага і У.Ф. Ладысева, што былі абаронены ў 1988–1989 гадах), дадаўшы толькі дысертацыю У.Ф. Ладысева.

Своеасабліва аформіў сваё бачанне перыядызацыі заходнебеларускай гістарыяграфіі С.В. Грачоў, які гістарыяграфію нацыянальна-вызваленчага руху “ўмоўна” падзяліў на два перыяды: 1920-я – сярэдзіна

---

[1] Тут і далей курсіў аўтара.

1950-х і сярэдзіна 1950-х – 1990-я гады, не патлумачыўшы пераканаўча пры гэтым падставовасць такога падыходу [166]. Прычым у наступнай працы, у якой зафіксаваны няўдалыя спробы аўтара перыядызаваць гістарыяграфію аграрнага пытання, гісторык адзначыў істотныя змены ў падыходах да даследавання тэмы ў 1990-я гады [165]. С.М. Грэсь, паўтараючы думку С.В. Грачова аб двух перыядах, без лагічнага ўпарадкавання матэрыялу ў працы, прысвечанай праблематыцы аграрнага пытання Заходняй Беларусі, выдзеліў у "гістарыяграфіі нацыянальна-вызваленчага руху Беларусі перыяду 1919–1939 гг." (так у тэксце! – *А.С.*) два этапы: "1) 20-я – сяр. 50-х гадоў; 2) сяр. 50-х – 90-я гады" [177].

Што тычыцца перыядызацыі гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Заходняй Беларусі, то сама пастаноўка праблемы з улікам мізэрнай колькасці апублікаваных прац па названых пытаннях, як і астатніх накірункаў заходнебеларускай гістарыяграфіі, за выключэннем хіба што гісторыі КПЗБ, бачыцца надуманай. Да такой высновы прыводзіць і апублікаваны ў Польшчы артыкул В.П. Гарматнага, прысвечаны перыядызацыі вывучэння аграрнай гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў [125]. Беспадстаўнасць разважанняў пра асобную перыядызацыю гістарыяграфіі аграрнага пытання пацвярджаюць спасылкі аўтара. Яны ў падаўляльнай большасці зроблены на гістарыяграфічныя працы, а не на гістарычныя даследаванні аграрнай праблематыкі, якія ў працах айчынных савецкіх аўтараў уздымаліся, у асноўным, як тэарэтычная базісная прыступка пры вывучэнні ў рэчышчы дыялектычнага матэрыялізму "ўсенароднай рэвалюцыйнай барацьбы пад кіраўніцтвам КПЗБ". Частае выкарыстанне фармулёвак А.А. Савіча, праўда са спасылкамі на адпаведныя працы, не забяспечыла аднак пераканаўчага сцвярджэння выдзеленых В.П. Гарматным чатырох самастойных перыядаў у вывучэнні аграрнай гісторыі: 1) міжваенны, 1921–1939 гады; 2) 1940-я – першая палова 1950-х гадоў; 3) другая палова 1950-х – 1980-я гады; 4) сучасны, які пачаўся "пасля набыцця краінай дзяржаўнай незалежнасці". Напрыклад, аўтар беспадстаўна гаворыць пра "асаблівы ўсплёск" даследаванняў сельскай гаспадаркі ў 1939–1940 гады, насуперак уласнай логіцы звязваючы два першыя перыяды. Запаволенне вывучэння аграрнай гісторыі Заходняй Беларусі ў 1940-я – першай палове 1950-х гадоў аўтар тлумачыць "недаверам вышэйшых колаў Савецкага Саюза да КПЗБ", якой даўно ўжо не было.

Заслугоўваюць увагі гістарыяграфічныя даследаванні І.Р. Кулевіч [385–388]. У канцэптуальным плане, што вельмі важна, у агульным рэчышчы развіцця беларускага руху ў гістарыяграфічным аспекце разглядваюцца і асноўныя падзеі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў II Рэчы Паспалітай па 1925 год. І гэта зразумела: беларускі

нацыянальны рух не быў падзелены Рыжскім мірам. Наадварот, гэтае пагадненне стварыла перадумовы для разгортвання беларускага змагання ў новых гістарычных умовах, якія вымагалі выпрацоўкі адпаведных формаў і метадаў арганізацыі беларускага руху. Аднак аўтару не ўдалося паспяхова рэалізаваць такі падыход на практыцы. Праблемы нацыянальнага жыцця ў БССР і ў Заходняй Беларусі на старонках даследавання не падаюцца ў дыялектычным адзінстве. Напрыклад, І.Р. Кулевіч схільная падзяляць беларускі рух на рэвалюцыйны і нацыянальны як узаемнавыключныя, што прыводзіць да метадалагічнага тупіка: куды аднесці БСРГ? У рэшце-рэшт неапраўданай бачыцца пазіцыя, якая дапускае ігнараванне прац вядомых даследчыкаў беларускага руху ў Заходняй Беларусі, у тым ліку ўключна па 1925 год, А.М. Мацко, А.А. Сарокіна, С.У. Кабяка, Т.Ю. Глінскай і іншых. На фоне асноўных тэндэнцый грамадска-палітычнага жыцця Беларусі і Польшчы даследчыца прапанавала ўласную перыядызацыю вывучэння беларускага нацыянальнага руху, вызначыла этапы айчыннай і польскай гістарыяграфіі праблемы ў агульным кантэксце развіцця беларускай і польскай гістарычнай навукі. Так, І.Р. Кулевіч у айчыннай гістарыяграфіі выдзеліла шэсць этапаў: "першы – дакастрычніцкі, ад з'яўлення першых *гістарыяграфічных* (так у аўтара. – *А.С.*) прац да перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, другі – ад Кастрычніцкай рэвалюцыі да канца савецка-польскай вайны (1917–1920 гг.), трэці – 1921–1928 гг., чацвёрты – канец 20-х – першая палова 50-х гг., пяты – другая палова 50-х гг. – першая палова 80-х гг., шосты – другая палова 80-х гг. да сучаснага дня" [386, с. 52, 72, 97]. Па-першае, неабходна адзначыць слабую аргументацыю пазіцый аўтара, якая не патлумачыла свае прапановы, напрыклад, чаму трэці этап заканчваецца 1928 годам, а чацвёрты пачынаецца ў канцы 1920-х і ў дысертацыі разарваны дзвюма главамі. Па-другое, сумніўным выглядае вызначэнне пачатку сучаснага этапу гістарыяграфіі праблемы – сярэдзіна 1980-х гадоў, паводле аўтара "да сярэдзіны 80-х гг. айчынная гістарыяграфія, з'яўляючыся складовай часткай *савецкай гістарыяграфічнай* (так у аўтара. – *А.С.*) навукі, знаходзілася пад прэсам афіцыйнай ідэалогіі" [386, с. 73]. Ствараецца ўражанне, што быццам бы ўжо ў другой палове 1980-х беларуская гістарыяграфія відавочна атрымала новае аблічча, перастала быць часткай савецкай гістарычнай навукі і выйшла з-пад ціску афіцыйнай ідэалогіі.

Выклікае цікавасць гістарыяграфічны агляд манаграфіі А.М. Вабішчэвіча "Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)". Канстатуючы факт "адсутнасці цэласнага даследавання аб нацыянальна-культурным жыцці Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.", аўтар прапанаваў перыядызацыю гістарыяграфіі заходнебеларускай

праблематыкі, не акцэнтуючы на гэтым сваёй асаблівай увагі. Яе першы перыяд – 1920–1930-я гады, другі – канец 1950-х – 1980-я гады, трэці, сучасны, пачаўся ў 1980-х – 1990-я гады. Такі падыход выклікае пытанні, у першую чаргу таму, што выпадаюць з поля зроку 1940-я – першая палова 1950-х гадоў, калі заходнебеларуская гістарыяграфія, нягледзячы на складанасці і своеасаблівасць, безумоўна мела сваё развіццё (напрыклад, працы Ц.С. Гарбунова, у тым ліку яго першая кандыдацкая дысертацыя па гісторыі Заходняй Беларусі, кандыдацкія дысертацыі А.У. Царука і В.П. Панамарэнкі і іншыя публікацыі). Акрамя таго, разам з даследаваннямі айчынных (беларускіх савецкіх, а таксама прадстаўнікоў беларускай дыяспары) у прапанаваную перыядызацыю ўстаўлены даследаванні польскіх аўтараў, а таксама даследаванні прадстаўнікоў расійскай, украінскай, літоўскай і "заходняй" гістарычнай навукі. Аднак названыя нацыянальныя гістарыяграфіі, у тым ліку і па заходнебеларускай праблематыцы, стваралі змест асобных, гістарычна ўнутрана абумоўленых этапаў і перыядаў. Пры гэтым спрэчным бачыцца сцвярджэнне, што "менавіта ў канцы 1950-х – 1980-я гг. у айчыннай гістарыяграфіі былі выпрацаваны канцэптуальныя высновы па заходнебеларускай праблематыцы". Вядома, што такога кшталту высновы былі прапанаваны і замацаваны яшчэ ў 1920–1930-я гады, іншая справа з іх аб'ектыўнасцю, але гэта поўнасцю тычыцца і "канцэптуальных высноў па заходнебеларускай праблематыцы канца 1950-х – 1980-х гг.". Не знаходзіць свайго абгрунтавання і сцвярджэнне даследчыка, што "ў гістарычнай навуцы ПНР на працягу некалькіх пасляваенных дзесяцігоддзяў не займаліся заходнебеларускай праблематыкай" [68, с. 4–9]. Як мінімум вышэйзгаданыя даследаванні І.Р. Кулевіч і В.А. Матусевіч абвяргаюць гэтае меркаванне. Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што ў доктарскай дысертацыі А.М. Вабішчэвіч прадэманстраваў бачанне перыядызацыі гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў, якое не пярэчыць меркаванню аўтара дадзенай працы, заяўленаму ў ранейшых публікацыях.

Нельга не ўзгадаць артыкул Л.Ч. Дрожжы "Этапы вывучэння заходнебеларускай праблематыкі ў беларускай гістарыяграфіі (1930–2000)", якая прэтэндэнцыёзна прапанавала "выдзеліць сучасны трэці этап у вывучэнні заходнебеларускай праблематыкі" [261]. Аднак уважлівае прачытанне гэтага твора выяўляе відавочную непадрыхтаванасць даследчыцы да аналізу і стварэння пэўнага аблічча працэсу развіцця гістарычнай навукі па пазначанай праблематыцы. Па-першае, ужо назва артыкула патрабуе адказу на пытанне: чаму з гісторыі вывучэння "заходнебеларускай праблематыкі" выключаны 1920-я гады? Па-другое, у паняцці "заходнебеларуская праблематыка" аўтар адвольна, не абгрунтоўваючы сваёй пазіцыі, змяшала два, хоць і суседнія ў

храналагічным сэнсе, аднак розныя па змесце і сутнасці гістарыяграфічных фактаў, перыяды мінулага Заходняй Беларусі. Узнікае пытанне: чаму яна абмежавалася аб’яднаннем 1921–1939 гадоў і 1939–1941 гадоў у адзін перыяд? Да гэтага масіву гістарычных падзей, напэўна, заманліва было б, па логіцы Л.Ч. Дрожжы, далучыць і іншыя суседнія гістарычныя адрэзкі як да 1921 года, так і пасля 1941 года: яны лагічна і ў метадалагічным сэнсе дыялектычна цесна ўзаемазвязаны. Першы сказ артыкула выклікае шмат пытанняў: “У савецкі перыяд заходнебеларуская праблематыка вывучалася як з беларускіх нацыянальных пазіцый, так і ў рэчышчы расійска-савецкай вялікадзяржаўнай канцэпцыі “адзінства савецкага народа”. Другі сказ здзіўляе не менш: “Дамінуючымі тэмамі даследаванняў у 1940–1980-я гг. з’яўляліся…” Тут бачым, што ў сваім “наватарстве” аўтар пайшла яшчэ далей, адрэзаўшы ад працэсу вывучэння адпаведных пытанняў яшчэ дзесяць гадоў. Можна шмат цытаваць і надалей, узгадваючы, напрыклад, тое, што “на пачатку 1960-х і ў 1970-я гг. тэматыка прац беларускіх навукоўцаў засталася аналагічнай, толькі былі зроблены абагульненні і крыху змешчаны акцэнты”, “дэмакратычныя выбары ў Народны сход”, “тэза аб “завяршэнні пераўтварэння беларускай нацыі ў сацыялістычную” … прывяла да змены палітыкі “паланізацыі” на “саветызацыю” і “русіфікацыю”, “гісторыкі-неапазітывісты В.А. Астрога, А. Смалянчук, В.Ф. Кушнер”, “…М.П. Касцюк, У.І. Навіцкі, М.О. Біч, У.М. Міхнюк, У.Н. Сідарцоў, Г.М. Сагановіч, А.А. Краўцэвіч і інш. Дзякуючы іх намаганням, у канцы 1990-х гадоў была распрацавана нацыянальная канцэпцыя гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Беларусі” і многія іншыя перспектыўныя для навуковага аналізу выказванні аўтара.

Што тычыцца прапановы выдзеліць трэці сучасны этап у працэсе вывучэння “заходнебеларускай праблематыкі”, то гэта не з’яўляецца адкрыццём, яго выдзяленне бачыцца відавочным. Пры гэтым даследчыца павінна была б ведаць, што гэта было зроблена А.А. Савічам, ім абгрунтавана і адлюстравана ў аўтарэфераце і кандыдацкай дысертацыі, у некалькіх артыкулах, прысвечаных менавіта перыядызацыі гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў [732; 739]. Аўтар жа ўвогуле не згадвае нават пра тое, што А.А. Савіч займаўся акрэсленай праблемай, затое ў артыкуле Л.Ч. Дрожжы сустракаюцца прамыя запазычанні з яго тэкстаў без спасылак. Зноў жа дзеля аб’ектыўнасці трэба сказаць, што Л.Ч. Дрожжа прыводзіць аўтарэферат кандыдацкай дысертацыі А.А. Савіча, але для згадкі яго як аднаго з тых, хто “ў апошняе дзесяцігоддзе” прыступіў “да пераадолення недахопаў і стэрэатыпаў савецкай гістарыяграфіі заходнебеларускай праблематыкі”.

Такім чынам, праблема перыядызацыі гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі ў прыведзеных даследаваннях атрымала сваю

пастаноўку, аднак не атрымала лагічнага і абгрунтаванага вырашэння. Асноўнымі вехамі ў гісторыі развіцця навуковых ведаў па заходнебеларускай праблематыцы даследчыкі называлі ў асноўным стварэнне КПЗБ, яе роспуск і рэабілітацыю, што тлумачылася дамінантным становішчам у савецкі час праблем гісторыі КПЗБ, а таксама змяненне падыходаў да вывучэння адпаведных тэм, у тым ліку ў сярэдзіне 1950-х гадоў і ў пачатку 1990-х гадоў. Даследчыкі звярталі ўвагу і на актыўнасць вывучэння пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі, што выяўлялася ў росце колькасці апублікаваных прац.

Зыходзячы з гэтых меркаванняў, гісторыкі пакідалі па-за ўвагай шматлікія публіцыстычныя артыкулы аб становішчы ў Заходняй Беларусі і разгортванні супраціўлення польскай уладзе ў перыядычных выданнях пачатку 1920-х гадоў, у тым ліку і адразу пасля Рыжскай мірнай дамовы. Незаўважанымі (акрамя ўзгаданых прац В.А. Астрогі, манаграфіі і доктарскай дысертацыі І.І. Шаўчука) заставаліся і рэпрэсіі 1930-х гадоў у адносінах да вучоных-гісторыкаў, якія займаліся вывучэннем пытанняў заходнебеларускай праблематыкі, а таксама ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Гэтыя акцыі негатыўна адбіліся на вывучэнні акрэсленых пытанняў. На нашу думку, неабходна гаварыць аб актыўнасці ўплыву на даследчыкаў і распрацоўку праблем гісторыі Заходняй Беларусі на розных этапах з боку дзяржаўных і партыйных устаноў. Нельга пакідаць па-за ўвагай і такі найважнейшы аспект, як навуковая якасць і вартасць прац, аб’ём выкарыстання розных дакументальных матэрыялаў, у першую чаргу архіўных.

Маючы на ўвазе адзначанае, можна вызначыць наступныя перыяды ў станаўленні і развіцці гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі. Першы: 1920-я – сярэдзіна 1950-х гадоў; другі: другая палова 1950-х – пачатак 1990-х гадоў; трэці, сучасны: 1990–2000-я гады. Пры гэтым у першым перыядзе неабходна выдзеліць два этапы: першы – дваццатыя гады, другі этап – трыццатыя гады па сярэдзіну 1950-х гадоў. Важна адзначыць, што такая перыядызацыя, у прынцыпе, супадае з агульнапрынятай перыядызацыяй гісторыі гістарычнай навукі Беларусі [43; 664].

# Заключэнне

Гістарыяграфічнае даследаванне пытанняў гісторыі грамадска-палітычнай дзейнасці прадстаўнікоў беларускага народа на тэрыторыі Заходняй Беларусі дазваляе зрабіць шэраг падсумаванняў.

Вывучэнне гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў развівалася ў адным рэчышчы з усёй беларускай гістарычнай навукай, якая ў савецкія часы атаясамлівалася з афіцыйнай ідэалогіяй. Распрацоўка названых пытанняў забяспечвала патрэбы савецкіх партыйна-дзяржаўных органаў, якія адчувалі неабходнасць у аб’ектыўнай высокакваліфікаванай інфармацыі аб сітуацыі ў Польшчы і Заходняй Беларусі, стане і ўзроўні напружанасці грамадска-палітычнага жыцця суседняй краіны. З другога боку, сам працэс вывучэння і асвятлення ў друку пытанняў нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі напрамую залежыў ад стаўлення да гэтых праблем кіраўніцтва савецкай краіны, ад змянення грамадска-палітычнай сітуацыі ў Беларусі.

Працэс станаўлення і развіцця гістарыяграфіі гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў можна падзяліць на тры перыяды. У 1920-я гады, якія складаюць першапачатковы этап першага перыяду, партыйна-дзяржаўныя органы, іх ідэалагічныя структуры надавалі важнае значэнне зместу і накіраванасці гістарычных даследаванняў пераходу гісторыкаў на марксісцка-ленінскія пазіцыі. Пасля Рыжскай мірнай дамовы для савецкага кіраўніцтва паўстала задача вырашэння пытання аб Заходняй Беларусі, знаходжанне якой у складзе Польшчы лічылася часовай з’явай. Для прапаганды антыпольскіх, антыакупацыйных настрояў сярод насельніцтва ўзнікла неабходнасць ідэалагічнага забеспячэння мерапрыемстваў па практычнай рэалізацыі намераў савецкага боку па развіцці актыўнага рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. У гэты час у савецкім перыядычным, а таксама ў падпольным друку друкаваліся шматлікія публікацыі, галоўнай думкай якіх быў паказ цяжкага становішча насельніцтва Заходняй Беларусі пад Польшчай, а зыходзячы з гэтага выказвалася думка аб неабходнасці разгортвання рэвалюцыйнага руху за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз’яднанне з БССР.

З цягам часу ўзнікла неабходнасць грунтоўнай навуковай працы па вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі і Польшчы ўвогуле. Гэтую задачу павінны былі вырашаць Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Прэзідыуме Інбелкульта і АН БССР, а таксама Інстытут польскай пралетарскай культуры. З дадзенымі навуковымі ўстановамі была звязана асноўная навуковая і выдавецкая праца па праблемах гісторыі Заходняй Беларусі.

Другі этап прыпадае на 1930-я – першую палову 1950-х гадоў. У 1930-я гады ўзмацнілася ідэалагізацыя гістарычных даследаванняў, абсалютызацыя класавых падыходаў. Гісторыкі падпалі пад жорсткі ідэалагічны кантроль, мусілі пісаць амаль пад дыктоўку партыйна-дзяржаўных структур. На вывучэнне названых праблем сур’ёзны адбітак накладвала грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне, асабліва шматлікія палітычныя працэсы, рэпрэсіі і чысткі, у тым ліку ў навуковым асяродку і ў дачыненні да былых актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, якія прыехалі ў БССР у выніку абмену палітвязнямі. Актыўным чысткам і рэарганізацыям падвяргаліся КЗБ і ІППК. У 1931 годзе быў створаны пры Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б заходні сектар. Аднак названыя вышэй навуковыя цэнтры па вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі ў другой палове 1930-х гадоў былі ліквідаваны. Усё гэта, а таксама рэпрэсіі ў адносінах да заходнебеларускіх дзеячаў у пачатку-сярэдзіне 1930-х гадоў, роспуск у 1938 годзе КПП і далучэнне Заходняй Беларусі да БССР у выніку паходу Чырвонай Арміі ў версні 1939 года прычынілася да таго, што вывучэнне гісторыі Заходняй Беларусі, асабліва нацыянальна-вызваленчага руху, звузілася да канстатацыі ў схематычнай форме агульных пытанняў прычын, станаўлення і развіцця рэвалюцыйнай барацьбы. Калі да сярэдзіны 1930-х гадоў у гістарычнай літаратуры за КПЗБ трывала замацавалася становішча авангарду рэвалюцыйнага руху, то з сярэдзіны 1930-х і асабліва пасля роспуску КПП гісторыя КПЗБ амаль не вывучалася, яе значэнне ў заходнебеларускім нацыянальна-вызваленчым руху замоўчвалася і ігнаравалася. Адмоўную характарыстыку атрымала нават БСРГ, якую лічылі сродкам польскага ўрада разрому рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі. У літаратуры канца 1930-х – першай паловы 1950-х гадоў пры разглядзе праблем гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі назіраўся схематызм, перабольшвалася стыхійнасць і рэвалюцыйнасць выступленняў.

На працягу першага перыяду ў гістарыяграфіі праблемы ўзнікла і на доўгія часы ўсталявалася традыцыя непрызнання станоўчай ролі ў нацыянальна-вызваленчым руху беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, дзейнасць якіх адназначна падавалася як здрадніцкая, варожая і нязначная. Гэтак зневажальнаму шальмаванню падвергліся БХД, БПС-Р, БСС, “Цэнтрасаюз” і іншыя арганізацыі.

Другая палова 1950-х – 1980-я гады былі надзвычай плённымі і выніковымі ў развіцці гістарыяграфіі Заходняй Беларусі. Рэабілітацыя падчас працы ХХ з’езда КПСС Кампартыі Польшчы і яе складовых частак КПЗБ і КПЗУ дала магутны штуршок працэсу вывучэння пытанняў гісторыі рэвалюцыйнай плыні нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі і, у першую чаргу, гісторыі КПЗБ. Гісторыка-партыйная тэматыка

стала дамінуючай. Праблематыка КПЗБ і звязаныя з ёй пытанні гісторыі Заходняй Беларусі пачалі ўключацца ў планы навукова-даследчыцкай працы Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Інстытута гісторыі АН БССР, шэрагу кафедр ВНУ рэспублікі. У 1950–1980-я гады было падрыхтавана і абаронена 28 кандыдацкіх і 5 доктарскіх дысертацый па гісторыі Заходняй Беларусі, рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Нягледзячы на профіль, а большасць даследаванняў былі прысвечаныя розным аспектам дзейнасці КПЗБ, галоўная ідэя дысертацыйных прац заключалася ў падкрэсліванні авангарднай і кіруючай ролі кампартыі ў рэвалюцыйнай барацьбе, якая адназначна ўсталёўвалася як адзіна правамоцная і правільная форма нацыянальна-вызваленчага руху. На падставе абароненых дысертацыйных прац было выдадзена каля трыццаці манаграфій і брашур, некалькі соцен навуковых і навукова-папулярных артыкулаў, а таксама артыкулаў у энцыклапедычных выданнях. Але панаваўшая ў савецкай краіне ў навуковай сферы марксісцка-ленінская метадалогія абмяжоўвала магчымасці даследчыкаў па аб’ектыўным вывучэнні пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі. Дыфамацыя і дыскрэдытацыя беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і іх правадыроў на працягу гэтага перыяду працягвалася ў гістарыяграфічных традыцыях, закладзеных у 1920–1930-я гады.

Умовы аб’ектыўна-навуковага даследавання гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху з’явіліся ў пачатку 1990-х гадоў у сувязі з распадам СССР і станаўленнем суверэннай Рэспублікі Беларусь. Гэтая падзея стала пераломнай і ключавой у развіцці айчыннай гістарыяграфіі, садзейнічала вяртанню да нацыянальна-дзяржаўных каштоўнасцей у даследаванні гісторыі Беларусі, у тым ліку Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў. У гістарычнай навуцы быў пераадолены дыктат ідэалагічных структур КПСС-КПБ і манаполія марксісцка-ленінскай метадалогіі. Гэтыя падзеі далі пачатак новаму перыяду ў развіцці гістарыяграфіі Заходняй Беларусі, які характарызаваўся нябачным да гэтага ўсплескам навуковай актыўнасці, спрыялі з’яўленню навуковых прац, прысвечаных заходнебеларускай праблематыцы. Беларуская гістарычная навука за апошнія дваццаць гадоў здолела прадэманстраваць устойлівыя тэндэнцыі да абнаўлення гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі, адмаўлення ад стэрэатыпаў і догмаў савецкай гістарыяграфіі праблемы, усталявання нацыянальна арыентаваных вобразаў, гэта выявілася ў паглыбленні навуковых уяўленняў на складаныя і неадназначныя пытанні заходнебеларускай рэчаіснасці. Гісторыя беларускага нацыянальна-вызваленчага руху атрымала сваё больш паглыбленае і аб’ектыўнае даследаванне на старонках 22 кандыдацкіх і 1 доктарскай дысертацый. Сцвярджэнне 1990–2000 гадоў як самастойнага паўнавартаснага перыяду

гістарыяграфіі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў адбывалася ў выніку публікацыі навуковых манаграфій, а таксама вялікай колькасці артыкулаў у навуковых часопісах, матэрыялаў шматлікіх навуковых канферэнцый, энцыклапедычных выданняў і абагульняльных прац па гісторыі Беларусі.

Навуковаму асэнсаванню гісторыі Заходняй Беларусі спрыяла пашырэнне крыніцазнаўчай базы. Асабліва адчувальным і выніковым гэты працэс быў у другой палове 1950-х – 1980-я гады, калі савецкія гісторыкі атрымалі магчымасць доступу да фондаў архіваў, якія былі раней недаступныя для даследчыкаў, у тым ліку і архіваў ПНР. Гісторыкі ўвялі ў навуковы ўжытак вялікую колькасць архіўных матэрыялаў, што ўзняло на больш высокую ступень навуковую вартасць даследаванняў. Гэтаму садзейнічала і публікацыя дакументаў і матэрыялаў па пытаннях гісторыі Заходняй Беларусі, рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, а таксама ўспамінаў былых актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Разам з гэтым неабходна адзначыць, што гісторыкі вымушаны былі выкарыстоўваць толькі тыя матэрыялы, якія не супярэчылі палажэнням афіцыйнай гістарыяграфіі, каштоўным і аўтарытэтным матэрыялам для савецкіх даследчыкаў былі партыйныя дакументы, савецкі перыядычны і падпольны друк, спасылка на якія дазваляла лёгка падцвердзіць неабходныя высновы.

Шырокая пошукавая праца ў архівах была працягнута і ў 1990–2000-я гады, яна стварыла адчувальныя крыніцазнаўчыя падставы для метадалагічна-арганізацыйнага ўдасканалення даследаванняў гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі. Даследаванні былі падрыхтаваны на трывалай крыніцазнаўчай базе, якая фарміравалася ў выніку актыўнай навукова-пошукавай справы ў архівах Беларусі, Польшчы, Літвы, з улікам і на падставе поспехаў польскай і расійскай гістарыяграфій. Намаганнямі айчынных гісторыкаў было падрыхтавана і апублікавана шэраг выданняў дакументальна-наратыўнага характару. Аднак, нягледзячы на відавочныя поспехі па ўвядзенні ў навуковы ўжытак новых архіўных крыніц, разам з паглыбленнем і пашырэннем праблематыкі даследаванняў, існуюць бачныя складаснасці ў стварэнні цэласнай карціны нацыянальна-вызваленчага руху. У першую чаргу яны заключаюцца ў відавочнай немагчымасці ажыццяўлення хуткай праверкі і супастаўлення раней даступных і папярэдне ўведзеных ва ўжытак, і новых, атрыманых на працягу апошніх двух дзесяткаў гадоў, эмпірычных дадзеных, і як вынік – інтэрпрэтацыі атрыманых звестак, стварэнне на іх падставе несупярэчлівай карціны нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларусаў у польскай дзяржаве ў 1921–1939 гадах.

Даследаванне асобных пытанняў гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху на працягу 1920–1980-х гадоў характарызавалася тэндэнцыйнасцю і

схематызмам. Гэта прыводзіла да нераўнамернасці адлюстравання асобных накірункаў тэмы. Разам з тым, што КПЗБ надавалася асаблівая ўвага з боку гісторыкаў і шматлікія аспекты яе дзейнасці атрымалі даволі шырокае асвятленне, шэраг момантаў гісторыі партыі, рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху патрабуюць больш пільнай увагі і аб’ектыўнага вывучэння. Гэта тычыцца пытанняў стварэння і роспуску КПЗБ, яе ўзаемаадносінаў з КП(б)Б, КПП, КПЗУ, УКП(б), Выканкамам Камінтэрна, ДПУ-НКУС, пытанняў фінансавання падпольнай працы, дзейнасці Бюро дапамогі і Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. Больш дэталёвага вывучэння патрабуюць гісторыя БРА, г. зв. “сэцэсіі”, узаемаадносіны КПЗБ з іншымі нацыянальнымі партыямі і арганізацыямі. Адсутнасць асобнай працы па гісторыі КСМЗБ робіць актуальным правядзенне даследавання, прысвечанага гісторыі камсамолу Заходняй Беларусі ў агульным кантэксце нацыянальна-вызваленчага і маладзёжнага руху.

Нягледзячы на тэндэнцыі пераадолення дыспрапорцыі ў вывучэнні гісторыі заходнебеларускіх партый і арганізацый, даследаванне асобных партый на манаграфічным узроўні, у першую чаргу ”Змагання” і БХД, бачыцца актуальным стварэнне аналагічных выданняў па гісторыі дзейнасці ў Заходняй Беларусі БПС-Р, БРА, Беларускага сялянскага саюза, “Цэнтрасаюза”, паланафільскай плыні беларускага руху, культурніцкіх арганізацый.

